Адам Выгодскі

# Сузор'е дабрыні







АДАМ ВЫГОДСКІ

# СУЗОР'Е ДАБРЫНІ

Кніга прозы

Мінск
2000

**Выгодскі А.**
Сузор'е дабрыні. Кніга прозы. 2000. — 288 с.

Адам Выгодскі (Зайцаў Вячаслаў Іванавіч) — надзіва руплівы аўтар, самабытна дастатковы й нацыянальна выразны. Нарадзіўся ў 1948 годзе на Капыльшчыне ў вёсцы Выгода. Скончыў Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум і факультэт журналістыкі БДУ. Піша не толькі прозу (нарысы, замалёўкі, аповеды), але і вершы. З цеплынёй і глыбокай павагай распавядае аб нялёгкім жыцці вясковых людзей — гэтых адвечных рамантыкаў-аптымістаў, якія штодня адбіваюць нізкія паклоны зямліцы, і без дабрыні якіх, здаецца, даўно канулі б у нябыт і нашыя ўсё яшчэ неўпарадкаваныя вёскі, і бадай такія ж самыя гарады...

У кнігу «Сузор'е дабрыні» ўвайшлі лепшыя празаічныя творы, напісаныя А. Выгодскім за апошнія тры гады. Бадай усе яны пабачылі свет у мясцовым і рэспубліканскім друку.

© Аўтар А. Выгодскі, 2000
© Мастак А. Марачкін , 2000
© Укладанне А. Масарэнка, 2000

## СВЯТЛО ЗЯМНОЕ

Жыве ў Смалявічах лёгкі на пад'ём усмешлівы чалавек Вячаслаў Зайцаў, ён жа — Адам Выгодскі. Журналіст, адказны сакратар раённай газеты «Край Смалявіцкі», нарысіст, гумарыст, пісьменнік-бытапісальнік, тонкі знаўца вясковага побыту і сялянскай душы. Колькі гадоў запар я сам працаваў адказным сакратаром, быў «начальнікам штаба», як называюць гэтую няпростую пасаду іранічна-красамоўныя рагатуны. Але ж тое дзеелася ў літаратурным часопісе, у ціхім сталічным кабінеце, а тут — раёнка, шум, гвалт, сяўба, жніво! Бясконцы калаўрот спраў, рэзкія гукі і фарбы рэальнага, а не кінематаграфічнага жыцця. Трэба зазначыць, што Смалявіччына — спецыфічны раён. Побач — Мінск, гіганцкі паглынальнік маладой рабочай сілы. Аўтамабілебудаўнічае Жодзіна ўрэзалася гарачым металічным пятачком у самую сэрцавіну зялёнага хлебаробскага краю. Дзейнічае нацыянальны аэрапорт. І ўсюды — саўгасы, калгасы, фермерскія гаспадаркі...

Восем гадоў (так склаўся лёс) працую я ў Смалявіцкім раёне і ведаю ўсіх людзей, пра якіх піша Вячаслаў Зайцаў. Ведаю Мікалая Неўмяржыцкага, Фёдара Прывалава, Яўгена Кульваноўскага... Самабытныя людзі, моцныя кіраўнікі...

Вёска наша, як і ўсё наша жыццё, знаходзіцца сёння на пакутлівым раздарожжы. Спрачаюцца «левыя», спрачаюцца «правыя», хорам радзяць, як жыць, як сеяць, а я згодны з Вячаславам Зайцавым:

выратаванне вёскі ў адным — у разумнай стваральнай працы. Апошняе слова скажа гарачы вясенні плуг.

Вячаслаў Зайцаў, як і кожны беларус, цнатліва любіць прыроду. Не ярка-трапічную, не карнавальную, а сціплую, свойскую, з шэрым дожджыкам, з ветрам над чорным полем. Самі назвы кароценькіх удумлівых навелак, напісаных добраю беларускай моваю, кажуць пра гэта: «Урачысты гай», «Светлы сум бярозавы», «Салавей над асфальтам»...

А яшчэ ён — прыроджаны гумарыст, цудоўна валодае вострым і адначасна цёплым народным словам.

Вось і ўсё, што я надумваўся сказаць. Разгарніце гэтую кніжку, прайдзіце разам з аўтарам па зялёнай смалявіцкай зямлі.

Леанід ДАЙНЕКА,
пісьменнік

# АПОВЕДЫ

# ЗАМАЛЁЎКІ

## ЧУЖЫЯ

Васьмігадовы Косцік спешна ішоў па ўзмежку. У левай руцэ зыбалася доўгае, гнуткае вудзільна. З-пад пахі правай — выпіраў гладыш. Гліняны, крутабока-бліскучы, добра апалены. Ён быў заўсёды цёплы, быццам недзе ў ім у сяродку цеплілася нешта таемна-жывое і дужа блізкае, акурат як і сусед Якім — таўстапузы валацуга, бесклапотны нядбайца, які звычайна і вандраваў з аднаго сяла ў другое, дзе яго, як ён сам казаў, песцілі цёплыя ўдовы. Няйнакш таму Косцік і адушавіў гладыш, назваўшы яго Якімкам. Маленькі вудар заўсёды, калі выпраўляўся на рыбалку, браў гладыш з сабою, папярэдне кідаючы яму: «Хопіць, Якімка, песціцца, пайшлі...»

Сусед занядбаў сваю гаспадарку: панадворак ашчацініўся бадыллем і пустазелам. Нават вароны абміналі яго падворак, бо не было там чым пажывіцца. І Косцікаў дзед аднойчы даволі трапна ахарактарызаваў Якіма:

— Пусты, голы гладыш... Няма за што вачам зачапіцца. — І, падкруціўшы жоўта-шэры ад тытунёвага дыму кончык вуса, важна дадаў: — Торба і бесхацінец...

Косцік быў ужо ў канцы агарода. Пад ботамі злёгку пылеў і ціха пахрабуствваў леташні быльнёг. На густой прарасці азіміны, у лагчынцы, віднелася пацямнелае шумавінне веснавой павадзі. Узмежак скончыўся. Пачыналася прасёлкавая дарога, за якой ужо відаць было сляпучую зіхотнасць возера, калі Косцік пачуў вокліч маці. Вяртацца не хацелася, але яе незвычайна ласкавы голас, быццам хваля цёплага ветру, павабіў да сябе. Так яна клікала, калі прыносіла з крамы гасцінец альбо якую абноўку.

Гэты раз маці прыкметна хвалявалася. Прыхінула да сябе кудзелістую галаву сына, таропка пагладзіла і ціха, як не шэптам, сказала:

— Твой тата прыехаў, сынок... Ідзі... Прывітайся.

Першым інстынктыўным жаданнем Косціка было — кінуцца стрымгалоў у хату і павіснуць на бацькавай шыі. Хлопчык неаднойчы з зайздрасцюназіраў, як гэта робіць сябрук Мікола, калі яго тата вяртаецца з камандзіроўкі. Але такое жаданне ўспыхнула на адно імгненне. Яго тут жа змяніла няўпэўненасць і нават боязь. Косціку раптам захацелася ўцячы. І ўжо стаў пяціцца назад, спужана азірнуўся... Маці супакойліва пасміхнулася, падбадзёрыла:

— Ідзі, ідзі... Не бойся. Гэта ж твой родненькі татка... Той самы, да якога мы ездзілі.

Косцік быў не супраць зноў пабачыцца з бацькам. Але каб толькі не так адразу — вочы ў вочы, а нейкі час паназіраць за ім збоку, і каб той яго не адразу заўважыў, і каб не трэба было вітацца. Так, колькі гадоў назад ён ездзіў з мамай да бацькі ў госці, у горад. Два дні гасцявалі... Добра запомнілася сама паездка — цэлую ноч прасядзеў Косцік пры вагонным акне. Ехаў упершыню на цягніку, стараўся нічога не прапусціць — глядзеў на ўсё з захапленнем і стоенай радасцю.

Зніякавеласць сына расчуліла маці да слёз: Косцік застаўся без бацькі, калі толькі-толькі вылузаўся з пялёнак. Адзіная іх сустрэча, як відаць, была занадта кароткая, аблічча бацькі ў памяці не адбілася. Пасля, калі вярнуліся дадому, Косцік прызнаўся маці, што папрасіў у бацькі, калі засталіся адзін на адзін, зорачку з салдацкай шапкі, але такой не знайшлося, і ён атрымаў усяго толькі гузік з шыняля, у дадатак — каляровыя алоўкі... Маці ўзбурылася, і ён упершыню пачуў ад яе словы крыўды, якія яна часта пасля паўтарала: «Як яго бельмы бессаромныя на свет белы глядзяць! Зноў ад аліментаў хаваецца... Не клапоціцца ён пра цябе, сынок...»

Маці злёгку падпіхнула сына. У паўцемры сянец на момант зыркнуў адшліфаваны пальцамі грэбень клямкі. Пранізліва рыпнулі дзверы. Косцік нясмела пераступіў

парог. Ногі раптам знямелі й быццам прыстылі да маснічын. І без таго ўспацелая ад шпаркай хады спіна ўзмакрэла яшчэ больш. Ён толькі на момант зірнуў у бок стала, дзе разгружаў пакоўны чамадан знаёма-незнаёмы чалавек... Тата. Страх і радасць спляліся ў адзін клубок. Нерашучасць пераадолець страх і зрабіць крок насустрач радасці рабіла Косціка жаласным, гаротным. Плечы міжволі ўздрыгнулі, і ён заплакаў наўзрыд. І тут жа адчуў, як дужыя рукі, нязграбныя і нязвыклыя да пяшчоты, абхапілі яго. Твар пачала казытаць і калоць жорсткая шчэць непаголенай бацькавай барады. Косціка ап'яніла блізкасць роднага чалавека...

Сутонела. Косцік уладкаваўся на шырокім драўляным ложку і крадком пазіраў на бацьку, які стаяў ля акна, заклаўшы за спіну рукі. Рыжы, невялікага росту... Хлопчык бачыў у яго абліччы й рысы роднага чалавека, а разам з тым і далёкага, халоднага, чужога. Ён вывучаў бацьку, прызвычайваўся да яго.

Косціку раптам нясцерпна захацелася цукерак, якія прывёз бацька. Ён падсунуўся да маці й прашаптаў ёй на вуха:

— Мама, хоць адну цукерку дай...

— Папрасі ў таты... — шапнула ў адказ маці.

Косцік прыўзняўся, выструніў шыю, але вымавіць слова «тата» не змог. Нібы цяжкі камень напіраў на грудзі, зацінаў горла... Замест просьбы атрымаўся толькі цяжкі ўздых. Боязь вымавіць нязвыклае слова пераадолела жаданне хлопчыка.

Бацька наўрад каб учуў гэты іх перашэпт— хутчэй здагадаўся, што ўстурбавала сына, і свой пралік (замест таго, каб пачастунак адразу ўручыць сыну, ён паклаў кулёк на стол і забыў на яго) тут жа выправіў:

— Кастусь, а ці я не для цябе цукеркі вёз?.. Бяры, маці частуй... Яшчэ і сябрам застанецца.

Яны амаль кожны дзень, бацька і сын, хадзілі разам на рыбалку, майстравалі розныя рэчы. А вечарам сын

уважліва слухаў бацькавы расповеды аб прачытаных кнігах, аб вайне, у якой бацька прымаў удзел і быў колькі разоў паранены. Косціку часам здавалася, што бацька стаў для яго ўжо і блізкім, і родным, і ён, здавалася, зараз вось назаве яго ласкавым словам «тата». Але той жа момант бацька рабіў рэзкі рух ці не такі, як здавалася Косціку, кідаў позірк у яго бок, і душа, нібы трапяткія дзіцячыя рукі, зноў сціскала слова, бы злоўленую птушку.

Маці неяк папракнула сына:

— Татка ж да цябе — усёй душой, а ты нейкі дзікун...

Косцік адчуваў, як перажываюць бацька і маці, але нічога не мог з сабой зрабіць. Калі заставаўся ў хаце адзін, колькі часу гучна паўтараў слова «тата», а пасля ціха плакаў, прытуліўшы шчаку да халоднай шыбіны.

Неяк бацька раней з'явіўся з работы й прапанаваў пайсці ў грыбы. Сын з радасцю згадзіўся. Восеньскі лес спадабаўся малому. Адусюль нібы саленнямі пахла — з грыбоў, лісця, моху, якія, быццам прыправай, былі густа перасыпаныя ігліцай. Заціхла свіргітанне птушак. Толькі ў шатах высокіх хвой чуўся глухі шолах. Сосны падпіралі нізкае пахмурнае неба. На некаторых хвоях выдзяляліся асобныя галіны — былі яны падобныя на доўгія рукі. Галіны разгойдваў вецер. І здавалася, яны намагаліся дацягнуцца да хмар, каб разарваць на шматкі...

Косцік збіраў ледзь прыкметныя грыбы, халодныя, пругкія... Ён так захапіўся, што і не заўважыў, як адстаў ад бацькі. Шарэла... Кінуўся ў адзін, у другі бок. Аддаленыя кусты выцемніваліся markdownрознымі звярамі. Заставалася адно — клікаць бацьку... Але — зноў жа! — не хапала рашучасці.

Аказаўшыся паміж двух страхаў, хлопчык не мог ужо цярпець адзіноты — набраў поўныя грудзі паветра і... Замест галасістага воклічу атрымаўся самы звычайны шэпт: «Тата...» Непадалёку нешта хруснула. Густыя вершаліны дрэў зашумелі яшчэ больш пагрозліва. Новая

хваля страху прыдала больш рашучасці. Недарэчная спазма адпусціла горла, і нечакана для самога Косціка прагучаў надзіва ясна-звонкі вокліч: «Та-та!» Косціку неяк адразу стала лёгка, быццам у грудзях прарваў вельмі балючы нарыў. Хлопчык закрычаў на ўсе грудзі: «Т-а-а-та!» І бацька азваўся. Ён быў паблізу. Косцік падбег, торкнуўся тварам бацьку ў жывот і заплакаў...

— Спужаўся?.. Не плач, сынок... — Бацька гладзіў адной даланёй ускудлачаную галаву сына, а другой — сціраў са шчок слёзы. — Я не дам табе заблукаць...

Сын прызнаў бацьку, а бацька — сына. І дзякуй Богу.

## МЕЛЬНІЧЫХА

З глыбіні брыгаднага двара на Васіля Плужанка настырна сунулася пухнатая пасцілка Мельнічыхі, якая зноў, не зважаючы на забарону, несла падбіркі саўгаснага фуражу — з пасцілкі тапырылася сена. Насустрач старой спешна скідваў хуткасць «казялок» дырэктара саўгаса. Апынуўшыся паміж пасцілкай і легкавіком, Васіль неспадзеўна трапіў у нявыкрутнае становішча. Здрадлівы халадок разгубленасці працінаў свядомасць, у якой, бы ў бязважкасці, бязладна мітусіліся супярэчлівыя думкі. Аднак лёгкі штуршок у грудзі адкінутай дзверцы асадзіў каламуць ліхаманкавых разважанняў. З казытліва-даўкім пахам тытунёвага дыму Плужанок цяжка «ўдыхаў» і горкія словы дырэктара:

— За якую падмазку несунам такая папуста? Арыгінальны пачатак брыгадзірства!.. А калі б хто з раёна зараз вось заявіўся? — Васіля падмывала запярэчыць, але дырэктар сыпаў без перадыху: — Маўчы!.. Здаецца, не першы раз з табой на гэты конт красамоўнічаю. Словам, вось, каб яна, — ткнуў пальцам у бок Мельнічыхі, — тут болей ніколі не прагульвалася. Вось!

Гэтыя яго «вось» быццам утварылі рамку вакол грушападобнай галавы дырэктара, акрэсліваючы яе начальніцкую годнасць.

Машына зачэрпнула дзверцамі свежага паветра і праехала паўз Мельнічыху, галава якой патанала ў слаба ўціснутай лясёнцамі ношы. Вытыркаліся адно буйнакасцістыя локці старой. Здалёк і збоку здавалася, што даўгалыгія, спасцярожліва ступаючыя ногі належалі не Мельнічысе, а посцілцы.

Васіль пеўнем падляцеў да Мельнічыхі:

— Як вам не сорамна!.. — І на момант сцішэў — не ведаў, як зваць старую. — Вы ж абяцалі... Зараз жа скідвайце сена!

— Брыгадзі-і-рка!.. — праспявала Мельнічыха і амаль калодзежным жураўлём хіснулася да яго ног. Калі зноў выпрамілася, ён прыкмеціў у яе засмужана-стамлёных вачах зласлівую хітрынку, а ў бляклых складках шырокага твару, здавалася, заляглі спачыць пражытыя гады, знітаваныя густым павуціннем зморшчын. — У мяне ж, галубок, козачкі... І саўсім жа не крала я, а тое, што з прычэпа ўпала, падгрэбла.

— Усё роўна нельга... Трэба ўсё па законе рабіць, — даводзіў Плужанок. — Вытрэсвайце сена з посцілкі — і бягом дахаты... Чуеце?!. Бягом!

Ён ужо намерыўся быў забраць ношу ад старой, але ўбачыў, што паблізу людзі, чуюць іх размову. І няўзнак даўмеўся, што непрыстойна яму, амаль хлапчуку, турзацца з бабуляй, ды яшчэ навідавоку.

Мельнічыха і не думала спыняцца — сунулася далей са сваёй ношаю, прыкметна выкручваючы вонкі пяты хоць ужо і саслаблых, але ўсё яшчэ паслухмяных ног. Малады брыгадзір змушаны быў ісці за ёй услед, не ведаючы, як паставіцца да старое жанчыны. Сапраўды — яна ж усяго толькі патруху сабрала, людзі бачылі гэта...

Васіль Плужанок які месяц таму скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум і надта карцела паказаць сябе дбайным, здольным кіраўніком. Помніліся словы дырэктара: «У гэтай брыгадзе патрэбна цвёрдая рука. Мы

пакладаемся на цябе, вось!..» І на́ табе — Мельнічыха выявіла яго бездапаможнасць. Таму «ўціхамірыць» старую лічыў справай прынцыпу і гонару.

Ён абагнаў Мельнічыху і спыніўся ля яе варот — балазе хата старой непадалёк ад брыгаднага двара.

— Хачу ўрэшце пачуць ваша цвёрдае слова... — Плужанок прытрымаў вароты, каб Мельнічыха не змагла прайсці на падворак.

— Навошта ж, брыгадзірка, на вуліцы?.. Зойдзем у хату. — У голасе старой адчуваліся рашучасць і настойлівасць. — Пагамонім ладком, цішком...

Па якой іншай нагодзе ён абавязкова адмовіўся б, але цяпер, калі справа патрабавала неадкладнага вырашэння, не мог не завітаць. Яго сустрэў занядбалы, адвыклы ад мужчынскай рукі двор: не тое, што габлёўкі, але нават свежай сякернай залыскі не трапляла на вока. Каза і двое казлянятак з цікаўнасцю і бесцырымонна ўтаропіліся ў незнаёмца. Глядзелі насцярожана і моўчкі. Каб збавіцца ад іх пільнай увагі, рашуча прайшоў у сенцы...

У прасторнай хаце было няўтульна. Дух абжытасці ледзь адчуваўся — акурат разрэдзіўся ў стылым, сумотным міжсценні. Бель фіранак на вокнах і вышытага ручніка на асадцы з сямейнымі фотаздымкамі ўзрушыла і неяк ураз сагрэла душу надзіва простай сялянскай утульнасцю.

— Сядзь, сынок... Агледзься, — сказала Мельнічыха і ўвішна мітнулася за дашчаную пераборку.

Спачатку басіста прарыпелі, а пасля перайшлі на піск заржавелыя завесы куфэрка. Затым пачулася тонкае металічнае пазвоньванне. Праз нейкі момант зноў падаў голас куфэрак...

Васіль сядзеў на ўслоне. Нецярпліва і наструнена слухаў. Нечакана яго занепакоіла здагадка: «Ці не пачастунак?!.» І тут жа напеўніўся, спахмурнеў: «Хай толькі паспрабуе!..»

Мельнічыха не прымусіла доўга чакаць — спаважна выйшла да яго... І тая, і не тая. Што гэта з ёй? Ён ажно прыўстаў. У новай блакітнай сукенцы, з медалямі й ордэнам, Мельнічыха стаяла з горда ўзнятай галавой. Выпрасталася, пастатнела. Водсвет ад узнагарод урачысціў, асвяжаў твар. Але адчувала сябе ніякавата. Відаць, не часта даводзілася ёй паказвацца на людзях «пры ўсім парадзе».

Тым часам і Мельнічыха сачыла за хлопцам. Эйш, ваяўнічая напружанасць імгненна знікла з твару. З-пад пушку яшчэ няголеных шчок свіцілася сарамлівая чырвань. У вачах адбілася здзіўленне, якое паступова змянілася разгубленасцю.

— Як жа гэта вы?.. — Ён быў проста ашаломлены. — І пасведчанні на ўзнагароды ёсць?

— Аняго ж, галубок! — Старая падала яму цэлы стосік маленькіх кніжачак.

Разгарнуў верхнюю: «Вользе Міхайлаўне Варанец за праяўленую мужнасць...»

— І чаму ж гэта вы, Вольга Міхайлаўна, маючы такія заслугі, з посцілкай па сена ходзіце?.. Звярнуліся б да кіраўніцтва саўгаса...

— Шапкавала, саколік... Ім жартачкі — мой казіны клопат не роўня іхняму. Дырэктар мне так і заявіў: пенсію добрую атрымліваеш, вось і сядзі сабе на печы... А якая ж я гаспадыня без якой ні на ёсць жыўнасці ў хляве? З козкамі, бач, клопат нейкі маю. Чуюся хоць ім патрэбнай... Нікога ў мяне болей няма. Два сыночкі на вайне загінулі, тры гады як мужа пахавала...

Яна зноў згорбілася, вочы стухлі.

— А вы паказвалі ўзнагароды ў саўгасе, у сельскім Савеце?

— Навошта?.. Ніхто, апроч цябе, іх не бачыў... Я не тутэйшая. Гадкоў дзесяць тут жыву... Прызнацца, не хацелася б мне, каб ты, малады, які яшчэ толькі насупор жыцця выправіўся, блага думаў пра мяне...

— Што вы, Вольга Міхайлаўна, не лічу я вас злодзеем!..

— І добра, мой галубок... Я радая.

— Даруйце, Вольга Міхайлаўна, але чаму вас Мельнічыхай празвалі?

— Муж мой мукамолам працаваў. Тут раней ля рэчкі, побач з мостам, млын стаяў.

Васіль міжволі згадаў тое месца. Загату. Там і цяпер шуміць няўмоўчны вадаспад. Захаваўся шырокі замшэла-паўтрухлы латак, што скіроўваў імклівую ваду да млына, і таксама ляжаць на беразе, захаваліся, два вялікія адшліфаваныя круглыя камяні, ля якіх часта пасе сваіх коз Вольга Міхайлаўна. Мельнічыха.

На брыгадным двары Плужанок запыніў даглядчыка Язэпа, які вёз на кані каля трэці воза сена, сказаў:

— Завязеш Вользе Міхайлаўне!

— Каму гэта?

— У крайнюю хату.

— Мельнічысе?!

— Ей... І не марудзь. — Ён разлічваў, што Язэп яшчэ заспее Вольгу Міхайлаўну пры ордэне і медалях.

## ГАРАЧЫЯ ЦВІКІ

Спякота... Пясчаны ўзвышак дыхае распаленай патэльняй. Нават лёгкі ветрык не памешвае прысядзібнае смажыва. У ім млее і канае бурачнік. Ніжняе лісце, пажоўклае і пакручанае, бездапаможна распласталася па зямлі. Паўскладзенымі парасонамі абвіслі слановыя вушы гарбузніку.

Міхась майстраваў дах павеці. Спяшаўся. Сіноптыкі прадгадвалі папоўдні дождж. А тут прыстараўся сянца. Вышкі на хлеўчуку не надта пакоўныя. Дый леташняга сена троху засталося. Стажкі не любіў — нязручна ўзімку: скубі яго пасля, цягай жмакамі з-пад снегу ў халадэчу...

Хапатліва распластаў чарговы скрутак рубероиду. Нахлёстам на папярэдні. Нягуста палачаны дошкамі розных памераў і даўніны дах вымушаў асцярозе. Каб незнарок не пашкодзіць руберойд, што размяк на спёцы й смярдзюча патыхаў смалой.

Часам Міхась нават клаўся на жывот, выструньваўся — і ўсё каб забіць цвік бліжэй да вільчака. Нязручна... Двойчы выслізгваў і падаў долу малаток. І мусіў перабіраць нагамі папярочкі драбін — не было каму падаць малатка. Каб не давялося яшчэ раз спускацца, выбраў два цвікі паболей і падаўся ў хату. Напаліў іх на газавай пліце. Дабяла. Выпек у тронку адтуліну. Працягнуў шнурок. Звязаў. Павесіў малаток на руку і, задаволены, пабраўся зноў на страху. Але нечага раптам прыпаў да дошак і пачаў паволі спаўзаць уніз. Няпэўна намацаў нагамі драбіны й дрыготка слізгануў па іх жыватом...

За прысадамі, на суседскім двары, тупаў Язэп. Міхась запрыкмеціў сперш яго круглую лысіну ў пройме чорных як смоль валасоў. Перахапіла дых... Раптоўны затор пачуццяў, думак спустошыў, ахалодзіў душу: «Няўжо выявіў, здагадаўся?! Які сорам! Вунь, зыркае ў мой бок. Не, не дакажа...» Цяміў ліхаманкава. Хацелася хутчэй замесці сляды й схавацца. Машынальна схапіў пласкагубцы, згроб у жменю цвікі... Намерыўся падацца за хлеў, на агароды, як спахапіўся: «Яшчэ горай будзе. Адразу западозраць... Пачнуць шукаць. Калі што — буду ўсё адмаўляць. Хіба ж на дошках напісана, чые яны?» Гэты довад крыху супакоіў, надаў разважлівасці. І то — было б чаго нервавацца. З-за дзвюх паўгнілых дошак. Ну, не было болей сваіх. Усё падчысціў са двара. А тут дождж абяцаюць... Дый не краў, а ў злодзея забраў... Нялёгка яны даліся, дошкі гэтыя. Лінію фронту, мо, лягчэй перайсці. Апаўночы ажно дзве гадзіны перадольваў нейкую сотню крокаў. Так прыпадаў да травы, што, здавалася, дыханне яе чуў. Кожны шоргат гарматным стрэлам у скронях аддаваўся. Хіба ж смешачкі

— ніколі ні ў кога нават саломінкі не ўзяў, а тут... Тры гады ўжо дошкі трухлеюць. Воддаль Язэпавага двара складзеныя. Навідавоку. Маўляў, зайздросьце. Добрую капейчыну каштуюць, а я вось гнаю. Багацей...

Міхась неяк корпаўся ў агародзе, а Язэп з Рыгорам, лесніком, за кустом парэчак гаманілі. У Язэпа ў саду альтанка, і ён частаваў Рыгора — пазвоньвалі чаркамі, смакавіта пахрабуствалі агуркамі. Слухаў Міхась іх размову і дзіву даваўся з нахрапістасці свайго суседа.

— Дроў у лазеньку паспрыяй, Рыгорка.

— Пашанічненькіх?

— Ага, ага, бярозавенькіх.

— Без праблем, сваячок.

Праз колькі чарак Язэп пасмялеў і панахабнеў.

— Як бы швагрусю на дачку...

— Зробім. Лес калгасны...

Язэпа, як відаць, не цікавіла, чым займаецца сусед, бо туд-сюд прайшоўся па сваім падворку дый зноў схаваўся ў хату. Відаць, да ветру выходзіў.

Міхась уздыхнуў з палёгкай — пранесла. Але радасці не адчуў. На душы было брыдка: «Каб калі яшчэ...» Разняў далонь — абярэмца цвікоў было такое гарачае, што цвікі ажно ўеліся ў скуру і глыбока адбіліся на ёй.

## АПОШНЯЕ ДЗІВАЦТВА

Над павеццю востра духмяніла смолкай. Рыгор згроб у кучу свежыя габлёўкі й сеў на дошках побач з Хведарам.

— Агрыбеў я зусім... — стомлена сказаў Хведар. — Хворасць, бессань... А ты нічога — не зблажэў. Мацак.

— Ат, такі ж самы мацак, як і ты... Сілы ўжо таксама няма. Што і казаць — восьмы дзесятак...

Рыгор і Хведар — суседзі. Сябравалі з маладых гадоў. Але было ў іх адносінах шмат дзіўнага. Яны

ўвесь час бадай што спаборнічалі адзін з адным. І нярэдка такія іх «перацягі» заканчваліся разладам.

Неяк пайшлі яны касіць лажок. Раздзялілі яго на дзве роўныя часткі — і ўпрэгліся ў косы. Кожны імкнуўся закончыць касьбу першым. Рыгор так захапіўся, што не заўважыў, як крыху залез на пакос Хведара. Той жа, нічога не кажучы, адгроб траву, скошаную суседам на яго ўчастку, назад. Рыгору здалося, што той адгроб надта многа, і адкінуў частку травы сабе. Хведару гэта не спадабалася...

Карацей, дзялёжка закончылася лаянкай, пасля якой суседзі колькі дзён не размаўлялі. Затым памірыліся, але мірная перадышка цягнулася нядоўга.

Рыгор прыдбаў шыферу, каб перакрыць хату. Завітаў да Хведара і пачаў раіць, як лепш набыць шыфер. Той не вытрымаў:

— Я за цябе на пяць гадоў старэйшы, а ты вучыш... На тваіх петушыных грудзях не змесцяцца мае баявыя ўзнагароды!

Рыгор не сцярпеў такой абразы, грукнуў дзвярыма і скіраваў дадому. Праз колькі дзён Хведар таксама купіў шыферу. І што — знарок склаў яго насупраць суседавага акна. Гэтак адпомсціў Рыгору.

Пабудаваў Рыгор лазню і паклікаў папарыцца суседа. Усё, здавалася, ішло добра, пакуль Рыгор не сказаў, што Хведару агараць такую будову не ўдасца, бо кішка тонкая. Сусед нават не скончыў парыцца, накінуў на голае цела кажух, схапіў адзенне і — толькі й быў. Прайшло нямнога часу, і бадай такая ж самая лазня, калі не лепшая, з'явілася і ў Хведара.

Ды, як кажуць, з цягам часу ўсяму прыходзіць канец. Суседзі старэлі, асабліва здаў Хведар. Яму ўжо цяжка было ўгнацца за Рыгорам.

Аднойчы пагодлівым веснім днём Рыгор сядзеў на лазні й рамантаваў дах. Стары час ад часу пазіраў на сад, дзе радком стаялі вуллі. Пчолы нешта занепакоіліся, і гэта насцярожыла гаспадара. (У Хведара не было

пчол, бо не хацеў імі займацца, ды ўжо і не мог). Рыгор бачыў, як у сваім двары тупаў сусед. Ён быў без шапкі. З-за засені прысад свяцілася толькі лысая галава. І раптам яна нечага паплыла ў бок хляўка і праз колькі часу адтуль данеслася вохканне... Хведар кулём кінуўся ў хату.

Рыгор ажно зарагатаў: маўляў, не хадзі без шапкі, пчолы табе на жартачкі. Калі ж глянуў на сваіх пчол, то ад здзіўлення аж выпусціў з рук малаток: над вішнямі, на калу, пагойдваўся белы вузельчык, ад якога ў бок вулляў плылі ледзь прыкметныя воблачкі пылу. Едкі пах дусту ўшаляніў Рыгора — яго нібы ветрам здзьмула з лазні. Чалавек забыў і на сваю старасць — шпарка падбег да кала, зняў вузельчык і панёс да суседа... Той выйшаў з хаты, затрымаўся на ганку. Глядзець на яго было страхотна: нос распух, на ілбе — дзве велізарныя гулі-бульбіны, вачэй амаль не відаць... Але гэта не разжалобіла Рыгора.

— Ты, мабыць, звар'яцеў пад старасць! — шпурнуў ён пад ногі Хведару вузельчык з астаткамі дусту. — Нагі маёй у цябе не будзе... Пальцам не паварушу, каб дапамагчы!

— Я з-за тваіх пчол па ўласным двары прайсці не магу! — узбычыўся не на жарт Хведар. — Усіх патручу!

— А я тваіх курэй ператаўку!

Пасля гэтай сваркі суседзі доўга не размаўлялі. І невядома, колькі працягваўся б разлад, калі б не прыйшоў час садзіць бульбу.

Хведар не мог хадзіць за плугам, а брыгадзір даў яму на заўтрашні дзень каня. Хведар завітаў не ў адну хату ў пошуках аратага, але ў калгасе былі гарачыя дні, і нікога не знайшлося. На выхадныя абяцаўся прыехаць зяць, ды што карысці — каня не будзе. Коней мала ў калгасе, а кожнаму хочацца за выхадныя пасадзіць бульбу. Вось тут і круціся!.. Заставалася толькі адно — прасіць Рыгора. Але як, калі той і размаўляць на хоча...

Па суседству нярэдка бывае так: калі мужчыны жывуць не ў згодзе, іх жонкі сябруюць. І наадварот... Жонка Хведара не абмінула сваім клопатам і суседку, апошняя стала ўгаворваць Рыгора, каб адпусціўся і не трымаў зла.

— Не, ні за што! — устарчыўся Рыгор — зло кіпела ў ім, як вада ў катле.

Ён зайшоў у хлеў, кінуў у яслі абярэмак пахкага мурагу. Выйшаў. Спыніўся ля калодзежа. Прыгадаў, што яго капаў сусед... Хведар выбіраўся з калодзежа, але вяроўка не вытрымала, і ён шэсць кругоў ляцеў уніз. Зламаў нагу. З таго часу кульгае... Рыгор перавёў позірк на хлеў — будавалі разам. Кожны кругляк потам даўся. Пасля вайны — голад... Тралявалі на конях... Перажытае вірам ускалыхнулася ў памяці Рыгора. Яму стала адразу і сорамна, і няёмка. З болем у сэрцы адчуў, што Хведарава дзівацтва — апошняе водгулле іх маладосці. Рыгору стала сумна... Ён ціха спытаў у жонкі:

— Якога каня далі Хведару?

— Фермаўскага...

Рыгор няспешна падаўся ў бок канюшні. Хведар паглядзеў услед суседу і мусіў рыхтаваць плуг.

## ВЕРНАСЦЬ ЗЯМЛІ

Савелій Жураўскі прачнуўся на досвітку, спешна перакусіў, прыхапіў сякі-такі падмацунак на абед, засунуў яго ў кішэню і ціха зачыніў знадворныя дзверы...

Вось і машынны двор. Нікога... Галоўнае — няма старшыні. А з ім Савелію якраз і не хацелася сустракацца. Неўзабаве трактар загудзеў магутным маторам і мякка выкаціў за вароты.

Памяць Савелія чэпка занатавала ўражанні ўчарашняга дня. Здаецца, не такая ўжо значная правіннасць, а на душы — трывожна, неспакойна. З душы

нібы змыла наплыў паўсядзённай мітусні. Унутры віраваў пранізлівы вецер сумлення, наскрозь працінаў.

А ўчора... А ўчора яшчэ з раніцы жонка пачала дакараць:

— Усе людцы, як мурашкі, на сваіх участках корпаюцца... Бульбу капаюць. А табе няма калі...

— Выкапаем і мы... Усё паробім, Аксанка!

Праз гадзіну недзе прыстараўся капалку і разараў-такі колькі баразнаў. Трактар пакінуў ля ўзмежжа. Узяўся таксама падбіраць раструшаную па ворыву бульбу. Жонка адно бедавала:

— Такі няўрод сёлета... Можа, мяхоў сорак будзе, не болей.

Ён надзіва сур'ёзна выбуркнуўся — запярэчыў:

— Не сорак... Усяго толькі трыццаць дзевяць.

Жонцы ягоны жарт, як заўсёды, не спадабаўся. Суседка, якая прыйшла дапамагчы ім, шматзначна пасміхнулася. І Аксана не ўтрымала гнеў — пачала распісваць нядбайнасць мужа ды скардзіцца на свой горкі лёс. Суседка ўступілася за Савелія:

— Ды хопіць табе... Гаротніца знайшлася. Эйш, раскудахталася. Не падабаецца Саўка — разводзься, чарняўка, жыві-кукуй, на Саўку плюй.

— А што ён мне — вялікая радасць?!. Дзецям нават яблык не прывязе, хоць кожны дзень міма калгаснага сада ездзіць... Столькі яблыкаў прападае, а ён — праведнік, не крадзе. Узяў бы мяшок ды хоць падалкаў назбіраў. Студэнты, вунь, крыху паабіралі — збілі вяршкі... Летась палову яблыкаў зімаваць пакінулі. — Яна ўзяла пусты мех, прайшла да трактара і кінула ў кабіну. — Сёння без яблыкаў не вяртайся!

Вядома ж, Савелій жончыну пагрозу ўсур'ёз не ўспрыняў, бо ведаў, што Аксана лямантуе больш па звычцы, каб паказаць сябе дужа спраўнай гаспадыняй. Увогуле ж — яны жылі няблага. А вось перад суседкай трэба зганьбіць мужа, паказаць яго недарэчным.

Савелій быў сумленны калгаснік. Скажуць — робіць. Зрэшты, моўчкі падпарадкоўваўся не толькі жонцы, а і свайму начальству. Моўчкі ж і не згаджаўся з імі. У асабліва напружаныя перыяды, калі нават небу над калгаснымі палеткамі было горача ад людскіх клопатаў, дадому вяртаўся позна. І заўсёды адчуваў сябе як вінаваты, бо сапраўды ён мала ўдзяляў увагі як сям'і, так і ўласнай гаспадарцы. Але ж — клапаціўся пра дзяцей: нёс і цукеркі, і пернікі, кніжкі купляў... А вось з калгаснага саду яблыкамі не хацеў іх частаваць — яшчэ ніколі не браў чужое. Не краў. Жонка падбівае: чаму не ўзяць, калі дабро ўсё роўна прападае...

Чарговы восеньскі дзень-працаўнік спешна заканчваў свае апошнія справы. Бралася на вечар. З лесу выткнуўся лось. Прайшоўся па канюшынішчы. Стаў, агледзеўся і пачаў скубці траву.

Выбоістая прасёлкавая дарога гублялася ў вечаровай зацені калгаснага саду. Трактар правым бокам рэзка запаў у каляіну. Да ног Савелія скаціўся скручаны ў трубку мех... Выруліў трактар на роўнае месца, спыніў.

Не, ён зусім і не збіраўся налаташыць поўны мех яблыкаў. Так, для адчэпу ад жонкі, каб не дакучала. Сакавітыя, пругкія антонаўкі глуха бухалі ў мех і паскрыпвалі там, нібы новыя хромавыя боты. Толькі пачало бугрыцца дно ў мяху, як недзе зверху пачуўся ціхі свіст. Прыгледзеўся. На суседнім радзе з густой вершаліны вытыркаўся зарослы чорнай шчэццю твар вядомага бражніка Язэпа Канцавога. «Дык вунь яно што!.. Вось чые яблыкі ты на базары прадаеш!..» Язэп нечага ўстрывожана махнуў рукой і тут жа захінуўся галлём і стаіўся. Савелій з агідай паглядзеў на свой мех. Яму стала не па сабе ад таго, што іронія лёсу на нейкі момант зраўняла яго з Канцавым. «Ды не быць гэтаму!» — вырашыў ён і нагнуўся, каб высыпаць яблыкі, але

тут жа ўчуў позаду нечые крокі, азірнуўся. Старшыня!.. Імгненна зразумеў усю недарэчнасць свайго становішча. Хацелася ўцячы, праваліцца скрозь зямлю. Адчуў, як гарачая хваля сораму прыліла да твару. Мех выслізнуў з рук. Ногі нібы хто ўблытаў у каляна-шэрхлую, пажухлую траву.

— Не чакаў я ад вас, Савелій... — ціха, нязлосна сказаў старшыня. — Лепшы механізатар — і таксама злодзей. Як гэта разумець?

— Так і разумейце... Ніколі такога са мной не было, а вось жа, бачыце?.. Жонка надавумела, а я і рад старацца...

— А свой розум дзе? — строга спытаў старшыня.

— У Аксаны пад пятой... — Савелій паспрабаваў звесці размову на жарт, але жарту, адчуў, не атрымалася: у такім нявызначана-бязважкім становішчы ён яшчэ ніколі не быў.

Калі «газік» старшыні схаваўся за пагоркам, крыху апрытомнеў. У першую чаргу — ім апававала злосць на самога сябе: гэта ж так танна, лічы, спляжыў свой аўтарытэт. Высыпаў яблыкі, шпурнуў мех на дно прычэпа і рашуча накіраваўся да кабіны.

— Пачакай... Пастой! — падбег да яго Язэп. — Я ж цябе папярэджваў, а ты не сцяміў... — Маленькі, худы, прыціснуты напоўненым мехам так, што аж хістала ў бакі, ён умольна глядзеў на Савелія. — Дапамажы... Не стой — не шыла праглынуў, а ўсяго толькі ўтык атрымаў, гы-гы-гы... Прывыкай. У калгасе хто не крадзе, той турмы не міне... Чуеш? Ты мяне да павароткі падкінь. А я там — гародамі...

Савелію раптам здалося, што гэты варты жалю чалавек нагадвае зараз яго душу, на якую ўзваліўся страшэнны цяжар.

— Высыпай яблыкі! — прахрыпеў Савелій.

— Што-о?!! — крыва ўсміхнуўся Язэп. — Чэсным прыкідваешся?.. А сам ажно на трактары прыпёрся... Хто ж так крадзе?

Савелій сціснуў кулакі, ледзь стрымліваючы сябе, падступіўся да Язэпа і скавырнуў з яго спіны цяжар. Ухапіў мех і вытрусіў яблыкі, загадаў:

— Ідзі пусты, без яблыкаў... На цябе гледзячы, іншыя крадуць. І мяне, бачыш, чорт паблытаў.

У душы Савелія кіпела. Значыць, і ён такі ж, як і Язэп, нікчэмец? Цяпер у людзей складзецца ўражанне, што сотні гектараў узаранай ім зямлі — вынік не шчырага хлебаробскага імкнення, а ўсяго толькі прагнасць да нажывы. Няўжо так адразу, адным бязглуздым учынкам можна ўсё перакрэсліць?

З парога яшчэ кінуў ён пад ногі жонцы пусты мех, выгукнуў:

— Першы і апошні раз!.. Хто я цяпер, хто?!. Злодзей, хапуга!.. А ўсё з-за чаго?

Запахла свежай раллёй. Восенню ад узаранай зямлі цягне цвіллю, сырасцю. Глеба нібы страчвае сваю жыццёвую сілу, пусцее. Вясной жа ралля дыхае нястрымнай прагай жыцця. Гэты водар, здаецца, убірае ў сябе пах хлеба. Савелій летуценна прыжмурыў вочы. У памяці ўсплыў дзень, калі ў ім, Савелію, выспела, нібы колас, душа хлебароба. Працаваў ён тады на Мінскім трактарным. Заступаў у другую змену, таму раніцой не спяшаўся і заспаў. Порсткі вясновы вецер-свавольнік бразнуў форткай. Надзьмуў, як ветразь, фіранку і разам з рокатам трактара маладым пеўнем накінуўся на ўскудлачаную галаву Савелія. Хлопец умомант прачнуўся і падбег да акна. Адразу ж за сядзібай пачыналася калгаснае поле. Глебу прыпляскала дажджамі, ад чаго поле так запарылася, што аж млела пад сонечным агнявеем... Юркі колавы трактарок спрытна варочаў плугамі цёпла-падатны гумусны пласт. Савелій на ўсе грудзі ўдыхнуў пахі веснавой сельскай раніцы і, апынуўшыся ў іх палоне, упершыню да болю востра адчуў кроўную роднасць з дарагімі сэрцу мясцінамі. Ён толькі паду-

маў сесці за руль трактара, як далоні яго заказытала, а ногі нібы адчулі рычагі счаплення і тормаза. Хутка адзеўся і, радасна размахваючы рукамі, пабег наўздагон трактару. З кабіны высунуўся ўстрывожаны скуласты твар Максімыча, старога механізатара.

— Што здарылася?

— Дайце праехаць круг-другі! — У вачах Савелія свяцілася нецярпенне, нястрымная апантанасць.

— Цьфу ты! А я падумаў... Не развучыўся?

— Што вы — усё помню!

— Тады залазь... Я тым часам паснедаю. — Максімыч зняў з кручка кірзавую сумку, цяжка вылез з кабіны, пастаяў колькі часу і падумаў: «Бач, поле паклікала... І, відаць, сур'ёзна».

Успаміны аслабілі супярэчнасці ўчарашняга дня. А сённяшні — толькі пачынаўся. Савелій акінуў вокам узаранае поле і падумаў: «Яно павінна мне верыць...»

## ГРАД НАД ПОЛЕМ

Паваротак трапіўся надзвычай пагоркавы. Стары «ўазік» толькі паспяваў адсапціся на пакатым схіле, як зноў пачынаў высільвацца, адольваючы круты растоўчаны пад'ём. Паабапал палявой дарогі, што шарэла троху ўпластаваным пасля нядаўняга дажджу пылам, буйна віравала налітая сонцам канюшына. Легкавік правальваўся ў прарэху залаціста-зыркага зыбу, калываўся, і здалёк быў падобны на каротка-тупаносае судзёнца. Не баркас — хай кацярок. Але і яму хапала ўзлёту. І ў яго быў свой дзевяты вал.

Палі калгаса імя Арджанікідзе наўздзіў узгоркавыя. Як звычайна, наезджаных дарог падчас уборачнай запаркі трымацца не выпадае. Шыбуе хто як — і ўсе напрасткі. Абы хутчэй — на аб'езд няма часу. Дый паліва дарагое...

Галоўны аграном Аляксандр Васільевіч Палазкоў штодня праводзіць на калгасным палетку не менш як па адзінаццаць гадзін. Не было б то лета. Трэба ўсюды паспець. Праверыць, удакладніць, уладкаваць... Часам, здавалася б, немагчымае. Бывае, што ён свайму цягаві-та-слухмянаму «чатырохколаваму каняку» не-не дый кіне ў думках: «Не маеш права капрызіць... Не час!»

На выбоінах трэсла. І кіроўца злаваўся... Наракаў на дарогу. Хаця — прычына ягонай узрушанасці не ў дарозе. Ён гэта ведаў добра. Другое тут — травы пера-стойвалі. І ўсё з-за непагоды. І цяпер над палеткам ледзь не ўскіпваў млосны знясільваючы прыпар. Насяваў дождж.

А ўчора сенажаць наведалі «госці». Правяраючыя. Упраўленцы... Шустрыя прэспадборшчыкі спрытна пад-хоплівалі зранку падварушаныя валкі. Прасавалі... Звяз-валі... Выштурхвалі цюкі на колкае ржышча.

Правяраючыя раз-пораз схіляліся над цюкамі. Ма-цалі. Круцілі галовамі.

— Сыраватае сянцо...

— Не будзе ляжаць...

— Я гарантую захаванасць, — гарачыўся аграном і тут жа спрабаваў апраўдацца: — Былі б усе тры касілкі спраўныя... Што гаварыць — з трох ледзь адну сабралі.

— Пры чым тут касілкі?.. Цюкаваць сена распарадзіў-ся ты?

— А што — няхай згніе тут?.. — Аляксандр Васіль-евіч сумеўся. — Так, я распарадзіўся — мне і адказваць.

— Вось дык логіка!

— Думаць, круціцца трэба. Сабе, нябось, назапасіў?.. Сухенькага.

Аляксандр Васільевіч змоўчаў. Але падумаў: «Вядома ж, сабе мог... Ды як потым людзям у вочы глядзець?»

— Летась вы ўдосталь кармоў нарыхтавалі. Завалі-ся! У перадавіках апынуліся. Усім раёнам... І ўсё роўна худоба ледзь да вясны дацягнула.

— Не дапусцім нядбайства!

Аляксандр Васільевіч стоена пасміхнуўся: «Упраўленцы прэмій не адхапілі б, калі б у вярхах раён не заўважылі... Ага, сумленне заела!.. Хм, не дапусцім... У выпадку чаго, дык на ім, Палазкове, адыграюцца: як жа — папярэджвалі!»

Пад'ём быў стромы й працяглы. Нарэшце акрэсліўся край далёкага поля... На мяжы небасхілу і зямлі гойдалася хвалістая брынь нагрэтага паветра. Хмары раслі. Увачавідкі змрачнелі. «Недасушыў, кажаце?» — усё не ўціхамірваўся Аляксандр Васільевіч. Паўнаваты, вясёлы твар яго быў асветлены рахманай усмешкай, за якой, бы за шырмай, хавалася ў глыбіні вачэй утрапёна-жывая, з непасрэднай хітрынкай сялянская кемнасць.

Злосці ён не трымаў на ўчарашніх «візіцёраў». Дай-мала адно няёмкасць. І чаму ён стаў апраўдвацца?.. Няўжо меней за іх адукаваны? Балазе, спасцігнуў аграномію грунтоўна: тэхнікум, акадэмія. Веды замацаваныя шматгадовым вопытам: брыгадзір, насенневод, галоўны аграном. Не давяраюць? Няма падстаў. Справа, відаць, не ў гэтым... Упраўленцы — апякуюць, ушчуваюць. Выконваюць загады сваіх начальнікаў. Гэта — іх хлеб надзённы. Яны — дарадчыкі, а больш правільна — наглядчыкі... А хто ж мы? Няўжо самі не можам праявіць сваю гаспадарлівасць?

Аляксандр Васільевіч нервова цепнуў плячыма. Ён разумеў — тэхнічная, фінансавая, матэрыяльная немач калгасаў звязвае рукі. Дзе шукаць выйсця і ці ёсць яно? Можа, ударыцца ў прыватызацыю? Разгарнуць фермерства? Як у замежжы. Дык там аб фермерах клопат агульны. Дзяржаўны. Там фермер не толькі пад заданне атрымлівае сродкі. Спаўна. Але і на расшырэнне вытворчасці. Кампенсуюцца страты ад няўродаў, стыхійных бедстваў. У замежных фермераў — сучасная матэрыяльная, навуковая і тэхнічная базы. І тым не менш — імкнуцца аб'яднацца. Каб знізіць сабекошт прадукцыі, зменшыць

выдаткі. Павысіць прадукцыйнасць працы! Уласна, фермер там не адзінокі, у нас жа — сам-насам, бы круглы сірата, атулены адно сваімі бядотамі.

Фермерства... Знайшлі, як кажуць, тапор пад лаўкай — розуму шмат не трэба, каб расцягнуць калгасы па прыватніцкіх завулках. Каму ўдалося ўхапіць за бясцэнак тэхніку, хто ўлучыў атрымаць больш-менш урадлівы кавалак зямлі — тыя сёння ў выйгрышы. Але ж і тэхніка не вечная. І зямля без належнай апрацоўкі ды севазвароту абястлушчваецца, гібее. Сёння толькі адзінкі пасяхова вядуць гаспадарку. А астатнія?.. Скупяць іх землі багатыя дзялкі. І што ж? Селяніну зноў дарога ў батракі?

Памыляецеся, панове! Не той час — селяніна ў прыватніцкі хамут сілком не ўцiснеш, бо даўно зразумеў, што няма ўжо ў нашым грамадстве ні надта разумных людзей, як, зрэшты, і надта дурных. Ёсць толькі болей і меней інфармаваныя. Адукаваны чалавек, які валодае значнай інфармацыяй, карыстаецца ў сваёй працоўнай дзейнасці сучаснымі навуковымі распрацоўкамі, смялей ідзе на эксперыменты. Неадукаваны — спадзяецца больш на жыццёвы вопыт сваіх папярэднікаў, чым на свой. І селянін таксама хоча быць інфармаваным чалавекам. Ва ўсіх кірунках. А для гэтага патрэбны свабодны час. Не толькі паспаць. Належна адпачыць. Час не толькі на вучобу, але і самаадукацыю. А гэтаму якраз і спрыяе калектыўная, добра механізаваная гаспадарка. Хутарская, прымітыўна-аднаасобніцкая канула ў нябыт.

Трэба прызнаць, што і да так званай гарбачоўскай перабудовы ў калгасах было нямала «лайдакоў». Маўляў, ураўнілаўка спарадзіла. Сапраўды, чалавек выкладваецца тады, калі мае магчымасць зарабіць. А ўсё-ткі — гэта былі не зусім і лайдакі. Людзі жылі ў адзіным калектыве, хоць, праўда, карысці з іх калгасу аніякай не было. Аднак жа ўсе яны, як ні дзіўна, мелі такі-сякі пражытачны мінімум. Нехта нечым гандляваў, той-сёй займаўся сезонным адыходніцтвам. Ставала, вядома, і такіх,

хто проста сядзеў на карку ў сваіх бацькоў. Хай сабе і часова, бо сапраўды каму рупіць выкладвацца, як кажуць, адно за паядай...

Што б там ні казалі, а селяніна спаконвеку корміць зямля родная. І зрывацца з яе — самае што ні ёсць самагубства. Фізічная і духоўная смерць. Так, урбанізацыя «паглынае» пэўную колькасць вяскоўцаў. Але ж усяму ёсць мера. Колькі ні будуй новых гарадоў, толькі ж без моцнай вёскі гораду не выжыць. Дык не ж — дадумаліся, разумнікі, прадаваць зямлю замежным панам!.. Нішто сабе выйсце — запусці «казла-таўстасума» ва ўласны агарод, стой, склаўшы рукі, ды пацяшайся: «Скубі, набрыда, нашу патраўку, гарцуй і спачывай. А мы будзем клапаціцца пра твой ненаедны трыбух!»

Ну хіба ж не так? Што ад нас іншаземцам трэба?.. Каб захапіліся аднаўленнем колішняй хутарской сістэмы? Той-сёй з навуковых ашавуркаў пра Сталыпіна ўспомніў — тагачасная, маўляў, Расія збывала лішкі масла ды хлеба не толькі суседзям-еўрапейцам, але і ў Англію... Наваяўленыя пракрокі ў адзін голас патрабуюць павярнуць кола гісторыі назад. І толькі дзеля таго, каб адлучыць селяніна ад супольнай працы, ад высокаэфектыўнага гаспадарання. Нябось убачылі, што ён нарэшце такі прыстасаваўся і да калгасаў, стаў жыць заможна, на легкавіку ўласным раскатвае па Еўропе, эстрадныя зоркі зачасцілі ў калгасныя палацы з канцэртамі... То ў пельку яго! Зноў на выселкі балотныя, у камарэчу і глушыню. І пакуль ён будзе абжываць свой «новы кут» — тым часам замежныя «дабрадзеі» запрудзяць прывазнымі таварамі наш рынак. Айчынная ж вытворчасць згорнецца. Голымі рукамі возьмуць!

Дык вось, зямлю трэба не «новым беларусам» збываць, а — прыватызаваць, аддаць у вечнае карыстанне калгасам! Тым самым сялянам, хто жыве на гэтай зямлі, хто на ёй працуе! Вядома ж, і прадукцыя, вырашчаная сялянамі, будзе тады не проста дзяржаўнай, безаблічна

агульнай, а менавіта калгаснай! І за бясцэнак дзяржава ўжо анічога ў калгасе не возьме — дыктат яе скончыцца. А гэта значыць, што і патаргавацца можна!

...Цемрадзь насунулася раптоўна. Хоць фары ўключай. Набрынялая вільгаццю хмара, бы гіганцкая перасспелая сліва, прыкметна зніжаючыся, цяжка плыла над лесам. Вось яна раз кранулася пільчатых макушак елак, другі. І нейкая з іх усё ж успарола-такі разбусянелы трыбух!.. Хлынуў праліўны дождж. Тут жа аглушальна грымнула! Здрыганулася наваколле.

«Недзе смальнула», — падумаў Аляксандр Васільевіч, збавіў газ і прыпыніў машыну. Застукаў па брызентавай дахоўцы й капоце град. Барабаніла часта і напорыста-хвостка, нібыта над лесам толькі што разляцеўся ўшчэнт крыгападобны айсберг.

Апаноўваў неспакой. Стыхія ўражвала, гняла. Здаецца, нейкая жывая, варухліва-белая здань стала нібыта сціскаць машыну, курочыць, і ён паспяшаўся зноў запусціць матор — вымкнуў з абцужнай аблады й крута забраў направа.

Нечакана з-за кустоўя высунуўся конь. Ён рэзка, з намаганнем выкідваў ногі наперад. Быццам імкнуўся заглыбіцца ў зямлю, ды, падобна, яму не ўдавалася прабіць капытамі дарогу. Услед за ім з мройвы суцэльна-ледзяной шчэці выплыў воз сена. Ладны. Конь ліхаманкава паторгваў скурай — град бязлітасна сцябаў ледзянымі бізунамі... Вознік зашыўся ў сена — тырчэла адно яго галава, акрытая лёгкай адзежынай.

Аляксандр Васільевіч спыніў машыну. Міжволі падумалася: «Селянін — родны брат каню... Акурат! Яго дубасіць град жыццёвага бязладдзя, няшчадна, настойліва, а ён зацяў шыю ў хамут і цягне свой жыццёвы карагон, натужвае жылле, часам спатыкаецца на патырчаках, падае, тут жа падхопліваецца і, не адсопшыся, прастуе далей... Гм, і чаму чалавек не траваядны? Назапасіў стог сена — і досыць. Але ж — не!.. Было

б выгрызена ўсё, да апошняга каліўка. Жывёлы пагінулі б... Чалавек! Ён так усё арганізаваў, так унармаваў, што нават павучок і той яму служыць... Але ж — чаму ён такі недарэка, чалавек? Ну няўжо цяжка ўладкаваць сваю ўласную жытку?... Крыўдна. Няма канчатковага, галоўнага арыенціру. Куды ідзём?.. Зусім нядаўна шыбавалі з недаспелага — у саспелы камунізм... Цяпер вось няпэўна, з бояззю пагаворваем пра грамадства сацыяльнай справядлівасці. Не тупаем — на месцы стаім. Каторы год. Бо ўжо абрыдлі эксперыменты. Ці не досыць?!. Канешне ж, досыць. Сацыялізм з капіталізмам скрыжаваць нельга. Як казу з ваўком!

Трэба выйсці з цямрэчы. Вызначыцца. Даць людзям перспектыву. Надзею.

...Град пранёсся імгненна, быццам табун шалёна-дзікіх коней.

Было ўжо за поўдзень. І ён прыгадаў, што яшчэ не снедаў. Паспяшаўся дамоў. Яго сустрэлі сыны. Ужо дарослыя. Ва ўсялякім разе, так лічаць яны самі. Старэйшы, Віталь, збіраецца ў восьмы клас. Саша — у сёмы. Абодва трызняць прафесіяй бацькі. Далася яна ім. Спрабаваў адгаварыць. Дзе там — стаяць на сваім. Калі шчыра, дык ён ганарыцца сынамі за такі выбар, бо няма пачэсней занятку, як служыць зямлі. Любіць яе. Шчыраваць на ёй...

Аграном! Ніхто не пераканае яго ў адваротным — гэтая прафесія будзе заўсёды прэстыжнай. І разам з тым — клопатнай...

Сам лёс наканаваў Аляксандру Васільевічу гэтыя мясціны. Трэба ж — прыкіпеў да іх. З людзьмі зжыўся... Хлопец з вёскі Клін, што ў Шклоўскім раёне, сабраўся жаніцца. Паехаў з суджанай па фату ажно ў Мінск. Аўтобус спыніўся ля Кургана Славы. Выйшлі. Агледзеліся. Дужа ж вёска суседняя прыглянулася...

Цёпла прыняў іх тадышні старшыня калгаса Антон Вікенцьевіч Казлоўскі. На першым часе ўладкаваліся ў

сямейным інтэрнаце. Праз нейкі час атрымалі асобную кватэру. З выгодамі-зручнасцямі. Жыві й радуйся...

Пасвятлелі аблокі. Узвяселеныя думкі вярнулі тым часам Аляксандру Васільевічу Палазкову і пэўны настрой. Ну не стане ж ён перажываць-маркоціцца з таго, што град пасіціў троху лапушыстае лісце капусты ды пасек асобныя былкі кропу і салаты.

## КРЫЎДА

Захар Максімавіч даўно не затрымліваўся так пры люстэрку, але сёння ён доўга падкручваў кончыкі будзёнаўскіх вусоў, прыгладжваў набак сівыя валасы на прыкметна палыселай галаве. Прычапурваўся нездарма — прычына таму важная: у калгасе адбудзецца ўрачысты сход. Чалавек хоць і на пенсіі, аднак жа склаўшы рукі не сядзіць. І трэба меркаваць, што і пра яго, лепшага конюха ў калгасе, помняць. Усё ж, як ні кажы, а працаўнік ён не горшы за астатніх. Якія былі да яго коні ў гаспадарцы?.. Адно гора, асабліва пасля зімы — рэбры ды скура. А цяпер?.. Не наглядзецца, як лялькі: сытыя, уходжаныя. Ну так. Ён, уласна, адразу ўзяў старшыню ў абарот, заявіў:

— Вядома ж, наш век — механізацыі век, але і пра коней не варта забываць, бо яны пакуль яшчэ людзям патрэбныя... А людзей паважаць трэба!

Вось, прыкладна, гэтак і пачыналася ўсё...

— Матрона! — паклікаў жонку Захар Максімавіч. — Нясі пінжак...

Тоўстая, з шырокім і надзіва спакойным тварам бабуля прынесла апратку і паспрабавала дапамагчы старому адзецца, як той адступіўся ўбок, працадзіў скрозь два ацалелыя зубы-пярэднікі:

— Я табе не які-небудзь небарака... Я працоўны чалавек. І яшчэ доўга ўдарнічаць буду. Так што, прашу, не глядзець на мяне, як на нямоглага — сам апрануся,

без памагатых... Глядзі за сабой, не папускайся, а то і разлюбіць магу... Хе-хе-хе.

Клуб шумеў, як вулей. Стары ўсеўся на трэцім радзе. Ён высака трымаў галаву, плечы таксама расправіў. Са спіны паглядзець — маладзёнак, зух. Слухаў даклад старшыні ўважліва і ажно плячыма пацепваў, калі той гаварыў пра дасягненні калгаса. Прыемна было ўсведамляць, што і яго, Захараў, уклад тут ёсць таксама...

Старшыня калгаса скончыў прамову. Выйшаў за трыбуну яго намеснік і стаў называць па спісу прозвішчы лепшых калгаснікаў, якія, вядома ж, падлягалі ўзнагародзе. І па меры таго, як змяншаўся гэты спіс, усё ніжэй і ніжэй схілялася сівая галава ветэрана калгаса. «Не ўспомнілі...» — з горыччу адзначыў Захар Максімавіч. Ён сядзеў блізка да дзвярэй і, калі закончыўся сход, у ліку першых выйшаў з клуба і няспешна пабрыў у вячэрнім паўзмроку дахаты.

— Усё, хопіць!.. — яшчэ з парога выгукнуў ён. — Хопіць...

Жонка як не трухам падбегла да яго, занепакоена спытала:

— Хто цябе так пакрыўдзіў?

— Не заўважылі мяне... Нікому я непатрэбны.

— Ты гэта што кажаш, Захарка?.. Як гэта — нікому? І мне таксама?

— Нікому... Чуеш? Мне брыгадзірка сказала, што атрымаю транзістар... Стары пень, узрадаваўся. Знацца, гэты наш таўстун, сакратар парцейны, транзістар каму іншаму ўзучыць, га?.. Лізуну якому, хто дагаджаць умее... Ну хто я такі, Захар? Стары трухляк дый годзе.

Захар Максімавіч напісаў заяву аб звальненні, але панёс яе не сам, а ўпрасіў гэтае зрабіць сваю жонку. Тая аддала паперку ў рукі старшыні, і, калі заява была ім прачытана, якраз уваліўся ў кабінет яго намеснік. Ён, калі браў з рук старшыні паперку, дык ажно скалануўся — быццам яго апякло. Прачытаў і тут жа затараторыў:

— Прычына ўстаноўлена... Люська, машыністка, пры перадруку выпадкова прапусціла прозвішча конюха... Я недагледзеў... А калі шчыра — падумаў, што ты сам яго выкрасліў... Даруй, Іванавіч, але меў такі грэх — падумаў...

— Дзе транзістар? — строга спытаў старшыня, хаваючы ў нагрудную кішэню паперку-заяву.

— У маім сейфе...

— Нясі... Давядзецца мне самому вінавацconfiguration перад Захарам Максімавічам.

Старшыня як ні ўгаворваў Захарыху сесці ў яго легкавік, але не даў рады — паехаў адзін.

## КАЛІ ТЫ СЕЛЯНІН...

Вёска прачынаецца на досвітку. Яе будзяць званочкі-клопаты. Асабліва стае іх, гучна-брынклівых, патрабавальна-заходзістых, восенню.

Падвор'е майго суседа Антона Вольскага абуджаецца перш-наперш намаганнямі ягонай жонкі Алены, неспакойна-руплівай жанчыны, дбайнай і нястомнай.

Каровак падаіць трэба. На пашу выправіць... Яна не вельмі тузае мужа — спагадае, як звычайна. Хай часінку якую адпачне. Лішнюю. За дзень жа за рулём удосталь натоміцца — дай-ка столькі часу вытрымаць у адной позе (ні ўстаць, ні прылегчы), ды яшчэ пільным быць... І на сонцы напячэцца, і пылу наглытаецца... Ці то — на камбайне, ці як цяпер — на трактары.

Гулка дзвынкнулі дзверы. На ганак няспешна выйшаў сам гаспадар. Не атлетычнага складу, але вышэй сярэдняга росту. Ільняна-жытнёвага колеру валасы... Выраз твару спалучае дабрыню і мужнасць. Нават у стоме, у дрэнным настроі.

Жыццё імчыць... На яго лічыльніку пяцьдзесят. Знешне — яшчэ бадай што маладзёнак. Не па гадах рухавы, энергічны.

Пры сустрэчы звычайна мы перакідваемся колькімі словамі. Вось і гэты раз:

— Вітаю, Антон!

— О-о!.. Здарова, сусед! — Тым часам ён накіроўваецца да хлява. Мінае дабротны гараж. Да «ператрусу» пабудаваў. А вось машыну так і не набыў — зжэрла інфляцыя збераджэнні. Чалавек не разгубіўся — вымураваў у гаражы склеп, дзе і бульба добра захоўваецца, і саленне-варэнне. Прыпыніўся ля гаража, выгукнуў: — Бач!.. Гляну на гэты помнік перабудовы — у Бога-маць Горбі крыць хочацца... Гэта ж такі Саюз разваліў... Скулле яму на самым нязручным месцы!

Галоўны ранішні клопат Антона — вывесці на папас цялят. Яшу і Машу. Абодвух навязвае на доўгую вяроўку. Дзеля гэтага адзін канец яе раздвоены на ланцугі з зашчэмамі. На другім жа — завостраны шворан. І цяпер вось — выпусціў цялятак з хлява ўжо навязанымі, тыя ўподбрыкі выбеглі на вуліцу. Шворан цягнецца па асфальце, пазвоньвае. Гаспадар ухапіўся за сярэдзіну вяроўкі — стрымлівае цялят, укормлена-рослых, дужых. Яны цягнуць, і ён адчайна ўпіраецца нагамі, жартуе:

— Іванавіч, хочаш пагаварыць — хапайся за шворан... Удвух, можа, здужаем, га? — Сусед яўна задаволены маладняком.

Не сказаць, каб вельмі й даймалі цяляты гаспадара ці гаспадыню. Выган — побач. Толькі скаціцца з пагорка. Увогуле ж — Мікалаевічы (новы пасёлак) размешчаны зручна. Бадай, як і астатнія вёскі калгаса «Ленінскі шлях» — Загор'е, Забалоцце. Побач з імі — чыгунка, аўтастрада... Гэта і добра. І — не вельмі: дзень і ноч над аўтастрадай віруюць каўтуны выхлапных газаў — атрута самая што ні ёсць. Уздзейнічае і на чалавека. І на акаляючую расліннасць. Канешне ж, пасёлак мае больш значную адметнасць

— ад яго найбліжэй да возера, якое ўяўляе сабой своеасаблівы прытулак душы, аазіс чысціні.

Антон вярнуўся з поплава і яшчэ колькі часу ўходжваўся па гаспадарцы. Падсілкаваўся... Меркаваў хутка быць дома. Гной ад фермы вывезці нядоўга. Да абеду ўправіцца. А там — зерне трэба змалоць...

Паспяшаўся на механічны двор. У пакойчыку, дзе занараджвалі механізатараў, было нягуста. Сарвілін, інжынер па машынна-трактарным парку, нервова круціў у руках Антонаву пуцёўку.

— На камбайн сёння, — сказаў ён наўздзіў рашуча. — Насенную канюшыну, пакуль не задажджыла, абмалаціць трэба. Петрулевіч на рамонце... Канюшык грэчку дабівае... Так што — як у той песні: на табе сышоўся клінам свет.

— А як жа гной?

— Другога паставім... Сядзе на твой трактар.

— Не-е!

— На дзень-два трэба ўступіць!

— Па руках пойдзе — даб'юць... Майму трактару ўжо дзесяць гадоў.

— Эйш, прысвоіў... Нешта я не помню, калі ты яго выкупіў.

— Такі ж самы, вунь, даўно пад плотам ржавее...

— Ды зразумей ты: спраўныя трактары на пальцах адной рукі пералічыць можна!

— Тады ўпісвай у маю пуцёўку і вывазку гною.

— У пяць раніцы ўставаць давядзецца...

— Нічога, спраўлюся.

Антон Вольскі адным з першых у калгасе асядлаў трактар Т-150. Энерганасычаны. Шыроказахопным агрэгатам пуцёўку ў жыццё даў. З трыма сеялкамі ў счэпе ўпраўляўся. Роўных на сяўбе не меў. Дый на жніве не адзін год у перадавіках значыўся.

У яго, як і ў кожнага майстра, свой почырк. Адметны. Да тэхнікі ставіцца паважліва. Шануе. Своечасова і змажа, і што трэба падкруціць... Зрадніўся з Т-150.

Праўда, гэты, цяперашні, ужо другі па ліку. І ўсяго толькі. Не шмат, калі ўлічыць, што працоўны стаж механізатара шырокага профілю недзе ўжо за трыццаць гадоў.

Вядома ж, і канюшыну ён змалаціў, і гной у поле вывез. Зацемна ўставаў, зацемна вяртаўся дамоў.

Недзе адразу пасля ўборачнай мы шчыра, без спеху пагутарылі. Я пацікавіўся:

— Вось ты, Антон, пашчыраваў, як нямногія. А што маеш?

— Маю тое, што зарабіў... Ды плюс — натуральная аплата.

— Значыць, не ў крыўдзе на калгас?

— Я да працы прагны... Якая ж тут крыўда? Было б што рабіць.

— Скардзяцца, што цяжка. Заробкі малыя.

— А дзе сёння лёгка?.. Калі я селянін — сапраўдны селянін, то мушу жыць бязбедна. Інакай — грош мне цана. Ну, скажам, нехта там лічыць сябе вясковым інтэлігентам, не мае на сваім падвор'і ніякай жыўнасці, не кажучы пра карову ды свінчука, дык дзе ж такому бэйтуху са мной раўняцца?.. А во няхай-ка, як хоць бы й я, дзве кароўкі займеў, цялятак, свіней, гусак... Ды раз перазімаваў з такой хеўрай, другі, не даў ніводнаму свайму ўтрыманцу прапасці з галаду — от я, дальбог, такога руплíўца адразу запаважаў бы... І цябе, Іванавіч, цаню... Ты — крэўны вясковец, хоць і вывучыўся на пісарчука. Душой ты з намі. — Пасміхнуўся. — Прызнацца, я з табой бачуся часцей, чым са старшынёй. От праўда.

— Кажуць, старшыня ў вас мяккі... Не патрабавальны.

— Сёння быць жорсткім — не модна... Бесчалавечна караць людзей матэрыяльна, звальняць. Дый няма калі гэтым яму займацца. Старшыня вымушаны выбіваць грошы, паліва... На размовы з людзьмі ў яго проста няма часу. Таму з дысцыплінай сапраўды прабле-

мы... Парушальнікам выгадна анархія — ім лацьвей жыць з чужога мазаля... У мутнай вадзе карасёў лавіць ямчэй. Толькі адкуль ім быць, тым карасям, — звяліся!

Антон Вольскі летась як след папрацаваў на сваім трактары. Заняў шостае месца ў раёне. Увесь гнаёк пад караняплоды ў брыгадзе Мікалаевічы вывез ён. Адзін. І ўраджай буракоў сабралі неблагі.

Так, заўсёды трэба спадзявацца на лепшае. Аднак жа лепшы ад усіх спадзяванак той, калі чалавек спадзяецца найперш на самога сябе. Такі працаўнік — надзея калектыву, яго сумленне.

## ЯК БУДЗЕМ ЖЫЦЬ, СУСЕДЗЕ?

Вечарэла. Ужо вярталіся з пашы каровы, а Рыгор не паказваўся з хаты. Ён загадзя адчыніў вароты ў двор, каб карова сама зайшла ў хлеў. А яна — вялікая, з прыгожымі рагамі — крыху пастаяла ля варот, пэўна, чакала, калі насустрач выйдзе гаспадар, затым працяжна рыкнула колькі разоў і ўсё ж такі пакіравала да хлява.

Рыгор назіраў за ёй у акно. Яму не хацелася выходзіць з хаты, пакуль не ўцямнее, каб лішні раз не ўбачыць суседа, які жыў насупраць і, як здавалася Рыгору, наўмысна доўга тупаў па двары, нібы чакаў яго знарок, прагнуў сустрэчы. Бач, ён нават і статак саўгасны прыгнаў раней... З чаго б гэта?

А ўласна, тое, пабачанае і пачутае колькі гадзінаў назад, стаяла ў Рыгора перад вачыма, гучала-паўтаралася — хвалявала, не давала спакою...

Ён выпадкова ўзбрыў на дападнае месца — трава бадай што перастаяла ўжо, трэба тэрмінова касіць. Рака павярнула як бы назад, нібы хацела вярнуцца да вытока, але тут жа віхлянула ўбок, выструніла рэчышча, зноў зрабіла зігзаг дый папраставала далей. Утварылася доўгая і вузкая, падобная на цялячы язык, лука. Вядо-

ма ж, з касілкай тут не развярнуцца, і трава засталася нечапанай. Густая, як шчотка, высокая і ядкая. Не які там сівец — медуніца напалову з дзікай канюшынай ды дзе-нідзе пракідаліся кругловіны конскага шчаўя. Ад радасці зацёхкала, як салавей, Рыгорава сэрца. І недзе праз гадзіну ён быў ужо тут з касой і бутляй бярозавіку, добра ўкіслага, смачнага. Ён так захапіўся касьбой, што апрача густых пракосаў-шнуроў нічога больш і не бачыў перад сабой. На паўдзённую спёку таксама не зважаў, нават да бутлі з бярозавікам прыкладваўся ці не двойчы — гарэў чалавек работай. Шчыраваў бесперастанку. За адпачынак былі яму тыя колькі хвілінаў, калі мянташыў касу.

І ўсё ж спёка дастала — пот цурком цёк з-пад кепкі, кашуля прыліпла да спіны, і ён, калі ў чарговы раз скончыў пракос і апынуўся адзін на адзін з ракой, адкінуў раптам касу ўбок, раздзеўся і з ходу шчыбоўтнуўся ў прыбярэжны вір — нырцануў глыбока, і донны свяжак ураз схаладзіў яго, вярнуў бадзёрасць.

Прыцемкам ужо скончыў касіць. Закурыў і гаспадарскім вокам агледзеў пакос. Прыкінуў: «Вазы два будзе... — Хацелася заспяваць, але стрымаўся. — Яшчэ столькі — і кароўка з сенам...» Пасядзеў нейкі час на беражку, зашпурнуў недапалак якраз у ямінку, што ваўчком кружылася ў цэнтры віракрута, падняўся і стаў разбіваць кассём троху падвялыя пракосы...

Назаўтра, акурат апоўдні, ён выправіўся сушыць сена. Яшчэ здалёк запрыкмеціў скрай лукі, на ўзрэччы, свайго суседа. Захваляваўся, узбег на пагорак — аж на тым месцы, дзе касіў, пасвіўся статак саўгасных цялят. Прабегся лукой — пракосаў бадай што не было відаць: засталіся асобныя жмакі сена, разбэрсаныя і прыбітыя капытамі да зямлі, аб’едкі...

Рыгор нейкі час, як здранцвелы, стаяў у нерашучасці, пасля вылаяўся і паволі пайшоў да суседа. Злосці ў Рыгора не было, яму нават не хацелася размаўляць з

ім. Але на душы раптам пуста зрабілася, гола. І ён нечага ажно збаяўся гэтага свайго стану — адвёў вочы ўбок, каб не глядзець на суседа, бо адчуваў: гэта менавіта суседава душа такая, пустая і голая, і не трэба яму, Рыгору, нават і блізка знацца з нікчэмцам-панурам. Не, ён не шкадаваў сваёй працы — сорамна было за суседа, якога лічыў да гэтага моманту чалавечным, з якім гатовы быў падзяліцца, калі што, апошняй скарынкаю...

— Ты чаму так зрабіў, Мікола? — спытаў ён роспачна.

Мікола, кашчавы, з маленькімі рухавымі вочкамі, як здалося Рыгору — п'янымі, адно ўхмыльнуўся. Рыгор чакаў адказу, нерваваўся. І той адказаў-такі:

— У гэтай луцэ была мая трава... Я бярог яе, спяліў.

— І забраў бы, калі твая... А ты — цялят пусціў... Зглуміў, збаёдаў. Выходзіць, і сам не гам, і другому не дам. Ты, вось, аднарукі... Падзякаваў бы мне, што я паспяшаўся. Гатовае сена... Раздзялілі б пасуседску, га?.. Які ж ты гаспадар? Гарэлка да інвалідства давяла, свету белага не бачыў з кабіны трактара... Пустадомак!

— Не трэба было касіць! — злосна выбуркнуўся Мікола. — Папытаў бы ў мяне... Я пастух, ведаю дзе чыя трава.

— Адкуль жа мне знаць, дзе чыя вотчына?!. — Рыгор не кіпеў злосцю — ён хутчэй быў здзіўлены абыякавасцю суседа, яго безгаспадарчасцю. — Ты — гультай... Таму і не цэніш чалавечай працы. — Яму не хацелася ўжо ні павучаць суседа, ні лаяць. Зноў зазірнуў таму ў вочы — два вострыя шыльцы — і не без трывогі спытаў:

— Як будзем жыць далей, суседзе?..

## ТАНЕЦ НА ГРАЦКОЎІ

Магутны «Дон-1500» прыпыніўся на ўскрайку поля. З кабіны па прыступках няспешна спусціўся хударля-

вы, сярэдняга росту камбайнер. Прымяў кірзавікамі фіялетава-ружовае, коратка зрэзанае грацкоўе... Зухавата ўскінуў правую руку, тупнуў нагою раз, другі. Нарэшце па-заліхвацку ўдарыў даланёй па абцасе і нязграбна, але даволі ўпэўнена і часта пачаў выкідваць каленцы. Чалавек танцаваў...

Барвовы дыск сонца паволі асядаў за кудлатую, злёгку пазалочаную сонцам, чупрыну недалёкага бору.

Механізатар Іван Францавіч Петрулевіч сваім летуценна-ўзнёслым танцам як бы паставіў «апошнюю кропку» на старонцы сёлетняй касавіцы.

Ды скокі наваяўлены танцор гэтак жа нечакана скончыў, як і пачаў. Цяжка перавёў дых, дастаў цыгарэту, але так і не закурыў. Ён кінуў позірк у бок дарогі: а раптам хто заверне да яго, скажа добрае слова... Не, на шырокім абшары грацкоўя нікога больш не было. Паўзмрок пачынаў затушоўваць далягляд. З боку балацявіны цягнула прахалодай. Прызнацца, Івану Францавічу не хацелася пакідаць поле. Ён усё роўна як нечага чакаў...

А прыходзілі несуцяшальныя думкі. Апошнім часам яму вось так, аднаму, каторы ўжо год даводзілася завяршаць жніво. Раней жадаючых прыняць удзел у дажынках было нямала. Грэчкі больш як па 20 цэнтнераў намалочвалі з гектара!.. І канюшына радзіла, і ўсе культуры. Бо агранамічную службу ўзначальваў сапраўдны майстар сваёй справы Міхаіл Пятровіч Батоўскі. Здавалася, ён дняваў і начаваў у полі. Адно поле назвалі яго імем... «А што цяпер?.. Дэфіцыт адказнасці, сумлення». — Іван Францавіч цяжка ўздыхнуў.

Грэчка і сёлета не надта ўрадзіла, зарасла пустазеллем, і знакамітым камбайнерам, можна сказаць, не было дзе разгарнуцца. Петрулевіч узяўся адзін управіцца. Ён, безумоўна, не шукаў асабістай выгады. І ўсё зрабіў як след, па-гаспадарску: грэчку да каліва падабраў і вымалаціў. У выніку — «нашкроб» больш за 30 тон. Як ні кажы, а ў неўрадлівы год і гэта — здабытак. А пусцілі б

«шустрых», дык яны за якія дзве гадзіны ўправіліся б, затое і палову грэчкі ў поле ўтрамбавалі б. Няўдалай была і канюшына. Зноў жа — ахвотнікаў з «масцітых» убіраць не знайшлося. І гэтую нявыгадную работу выканаў ён, Іван Францавіч.

Дзіўна — скончыў чалавек працу, паплясаў, а цяпер стаіць і крыўдуе на сваіх аднавяскоўцаў за тое, што нібыта забылі пра яго, быццам апынуўся на нейкім незаселеным востраве. І нікому няма да яго справы... Не шануюць кіраўнікі свайго лепшага механізатара. Зрабіў — і ладна... Няйнакш паліва эканомяць. А можа — шкадобяць ужо і добрае слова, увагу?

Іван Францавіч паволі падаўся быў да камбайна. Але ўспомніў пра цыгарэту — адышоўся і закурыў. Тым часам яшчэ адзін нядаўні эпізод усплыў ва ўзбуджанай памяці. І тут — зноў-такі — зневажалася хлебаробская годнасць. Абед на поле прывезлі аўтобусам. Лепш і не трэба: сталоўка на колах. Да таго ж, прыгатавалі добры, наварысты боршч. Але вось хлеб... Ён быў сыры, з закальцам. І як тут не абурыцца:

— Такі хлеб еўшы — язву нажывеш!..— Петрулевіч рэзка адсунуў ад сябе лусту хлеба з плыўка-вадкім мякішам — жывое цеста.

— Хлябок свежанькі... А мякіш кволы таму, бо шчэ цёпленькі, — бессаромна пралепятала ў адказ паварыха.

— На, паглядзі! — не на жарт усхадзіўся Іван Францавіч. Гэты раз ён больш рэзка папіхнуў тую самую лусту ў бок паварыхі, дадаў: — Сама еш... Бяры, ну!.. Адмовішся — гідоту гэтую сілком у рот затаўку!

І трэба было бачыць і чуць, што пасля гэтага пачалося. Маўляў, з хлеба здзекуецца, са святыні!.. Але ж здзек гэты быў учынены не ім, а тым пекарам, хто так бязглузда абышоўся з народным дабром.

Іван Францавіч падняўся ў каб'іну. Супакойваючы, свяціліся агеньчыкі шчытка прыбораў. Нервовае напру-

жанне спадала паступова. І ён не вельмі каб і спяшаўся. Калі ж выруліў на гасцінец, адчуў, што зноў душа яго пачынае спяваць. Якраз у гэты момант камбайн апярэдзіў шустры «козлік» і спыніўся на ўзбочыне. З яго рупна выхапіўся механік і махнуў рукой — даў знак спыніцца.

Іван Францавіч на хвілю прыпыніў камбайн, вызірнуў з кабіны й не без гонару, урачыстасці й нават выкліку — прагалёкаў:

— Усё закончыў!.. Сёння ў мяне дажынкі... Гуляць буду ўсю ноч!

У адказ — не пачуў ні слова. Механік, пэўна, чакаў, што трактарыст спусціцца да яго і раскажа ўсё як мае быць, даложыць. Аж — не: камбайн пасля рэзкай прагазоўкі рашуча рвануў з месца і на хуткасці, як не ўпрыцірку, прагрукацеў паўз машыну механіка.

## КЛАДКІ ДАБРЫНІ

Не толькі лёсы людзей, але і вёсак непарыўна знітоўвае час. Межы падзелу Загор'я, Забалоцця і Мікалаевіч бадай што ўмоўныя. Калі жыццё першых дзвюх цячэ, лічы, у адным вясковым рэчышчы, то жыццё ў трэцяй з іх, Мікалаевічах, мае і свой адметны выток, і свае берагі.

Для тых, хто жыве на сярэдзіне вёскі, ёсць адна нязручнасць: далёка дабірацца да гасцінца. Хіба толькі напрасткі: па невялікім выгане, балацявіне, што патанае ў кустоўі, усцяж поля і цераз дзве меліярацыйныя канавы, праз якія перакінуты кладкі. Хто іх паклаў? І чаму яны заўсёды ў добрым стане? Наўрад ці хто, ступаючы па іх, задумваўся аб гэтым. Але дзесьці ў глыбіні душы, хай падсвядома, быў удзячны таму, хто бескарысліва паклапаціўся аб людзях. Учынак гэты, вядома ж, не маштабны па

выніках. Ды хіба чалавечнасць заўсёды павінна праяўляцца ў матэрыялізаваным эквіваленце?

Ужо дзесяць гадоў Іван Антонавіч Капытка адмервае шлях напрасткі ад Мікалаевіч да чыгуначнай станцыі, дзе ўладкаваўся манцёрам пуці. Раней працаваў сувязістам. Звычайна выходзіць з дому з паўгадзінным запасам. Як сам тлумачыць: «Каб абмеркаваць з сябрамі жыццёвыя праблемы».

І гэты раз ён раней выбраўся: яшчэ не было сямі гадзін, а ўжо яго кірзавікі падміналі траву на лугавіне, што адразу за агародамі. Крочыў няспешна... Кінуў чэпкі позірк пад ногі: «Здаецца, расы няма... Ці не дождж будзе?» Але ў дождж не верылася, бо сухмень ужо які тыдзень панавала паўсюль.

Поплаў канчаўся. Сцяжынка хавалася ў засені крынічлівага кустоўя з гаманкім ручвом пасярэдзіне. Праз яго перакінутыя хісткія дошчачкі. Больш гразкія мясціны ўсланыя голлем. Гэта прыклаў свае гаспадарлівыя рукі Іван Антонавіч. Ён любіць прыпыняцца тут у спёку. Адразу ж агортвае падбадзёрлівая прахалода, а грудзі ўдыхаюць востра-гаючы настой балотнага шматквецця.

Як толькі выйдзеш з кустоўя — сцяжыну перасякае меліярацыйная канава. Даволі глыбокая. Яе берагі злучаюць дзве шырокія шпалы, якія аднойчы і завёз сюды Іван Антонавіч. Балазе, на чыгунцы гэтага «дабра» дастаткова.

Іван Антонавіч на хвілінку прыпыніўся на кладцы, прыкінуў: «Трэба яшчэ адну шпалу пакласці. І поручні не зашкодзілі б...» Ён міжволі прыгадаў, як дзён колькі таму гэтая кладка была кімсьці разбураная: шпалы валяліся на дне канавы. Няйнакш нехта з мясцовых гаспадарнікаў пастараўся. Бо сцяжына, што пралягала па самаму ўскрайку тарфянога поля ўсцяж канавы, а месцамі нават і па самой броўцы, была заарана. Вядома ж — наўмысна. Маўляў, ёсць

дарога, і няма чаго таптаць палетак. Што ж, гаспадарнікі на колах: ім і ўкругаля можна...

А ўвогуле ж — нешта нядобрае адбылося: зруйнавалі ўсе ранейшыя ўзбочныя дарогі, а новых не праклалі. Вось і блытаюцца людзі — тыя, хто не прывык гойсаць па наезджанай каляіне.

А што ж узаранае тарфяное поле, якое праглынула сцяжынку? Спёка зрабіла яго часова амаль бясплодным. Здавалася, ператварыла глебу ў распалены попел, у якім загінула значная частка кінутага зерня. Поле трымцела, быццам у гарачцы. Ад яго патыхала жарам і даўкім нежыццёвым тлом. Усё жывое цягнулася да канавы, да вады.

З цяжкасцю Іван Антонавіч узваліў на плячо шпалу і паволі рушыў уверх па адхону. Няўзнак прыпаў вухам да шурпатай абачыны добра прагудроненай шпалы — і яму падалося, што чуе грукат колаў цягніка, быццам у ракавіне — шум мора.

— Ну во — і ты жывая, га?.. — прашаптаў Капытка. — Столькі цягнікоў прагрукацела па табе... — казаў ён да шпалы, бы да жывой істоты. — Тут адпачнеш... І паслужыш яшчэ.

Па тарфяным ворыве, спатыкаючыся на няроўнасцях узбочыны канавы, Іван Антонавіч дабраўся да другой кладкі, што побач з гасцінцам і возерам. З гэтай асабліва шмат клопатаў: то паводка знясе, то нехта паломіць... Даводзілася ўзводзіць «пераправу» зноў і зноў. Гэты раз змайстраваў надзейна: тры шпалы злучыў металічнай ліштвай, замацаваўшы яе кастылямі.

Іван Антонавіч нарэшце выбраўся на асфальт. Гучна затупацеў, каб збіць з ботаў паналіпаны торф, і падаўся ў бок чыгуначнай станцыі. Пачынаўся яго чарговы працоўны дзень.

Тры вёскі зліліся як бы ў адно цэлае. Нам жа, людзям, неабходна толькі перакінуць кладкі дабрыні

паміж душамі, каб выстаяць перад цяжкасцямі жыцця і застацца самімі сабой.

## ЦІХОНЯ

Дзед Даніла размяняў восьмы дзесятак, а выглядаў амаль на шэсцьдзесят. Высокі, дужы, злёгку сутулаваты, ён быў падобны на стары дуб з нахіленай верхавінай. У яго доўгія, моцныя рукі з тоўстымі вузлаватымі пальцамі, якія нагадвалі карані. Даніла хадзіў летам пераважна без шапкі. Свавольнік-вецер расчэсваў белыя густыя валасы. З-пад навіслых густых броваў глядзелі маленькія пранізлівыя вочы.

Я завітаў да яго ў чатыры гадзіны раніцы. Мы яшчэ ў мінулую суботу дамовіліся ісці сёння на паляванне. Дарэмна думаў, што стары забыў пра сваё абяцанне. Ён ужо чакаў мяне са стрэльбай і паляўнічай сумкай за спінай. Нельга сказаць, каб дзед быў заўзяты паляўнічы. Проста вельмі любіў прыроду, любіў, як часта сам гаварыў, падыхаць чыстым ранішнім паветрам.

Сустрэў мяне Даніла з усмешкай:

— Познішся... Яшчэ б троху пачакаў — і ні бусенькі, пайшоў бы адзін.

Любіў ён гэты выраз «ні бусенькі», устаўляў яго ў размове вельмі часта, хоць патрэбы часам і не было.

Пачынала світаць. Зямля паціху награвалася. Над рэчкай уздымаўся туман. Ён слаўся над самай вадой і, здавалася, рака дыміцца. Воблакі туману віселі над нізінамі. Месцамі яны амаль поўнасцю закрывалі прырэчны лес; былі відаць толькі яго вяршаліны. Птушкі пачыналі прачынацца.

Мы ішлі па ціхай, яшчэ соннай вясковай вуліцы. Сямтам скрыпелі дзверы ў хлявах, гаспадыні пакрыквалі на кароў. Звонка струменіла малако ў дно даёнак.

З чарговага завулка, насустрач нам, выйшаў высокі малады мужчына. Ён ішоў шырокім крокам, крыху апусціўшы галаву, выставіўшы наперад і без таго шырокія

грудзі, што вырысоўваліся пад чыста вымытай матроскай. Прыветна глядзеў на нас вялікімі шэрымі вачыма. Прывітаўся, і Даніла кінуў яму ўслед:

— Сягоння «палкоўнікам», Юзік?

— Ага, дзядуля.

— Там маю кароўку выпусці з хлява, а то ўнукі яшчэ спяць.

— Добра, — адказаў паспешліва Юзік.

Праз нейкі момант над вёскай пачулася раскацістае «выганя-я-яй!» і загуляла гучным рэхам на панадворках.

— Бачыў гэтага хлопца? — загадкава пасміхнуўся Даніла.

— А што?... Хлопец як хлопец.

— Гэта праўда — чалавек ён, як і ўсе... А вось я раскажу табе, які́м ён быў гады два таму. Цяпер нават цяжка ўявіць таго Юзіка.

І я пачуў такую гісторыю. Юзік, па прозвішчу Салодкі, быў чалавек ціхі, непрыкметны. Але для аднавяскоўцаў не існавала ні Юзіка, ні тым больш — Салодкі: апрача як Ціхоня, яго больш ніяк і не называлі. Хадзіў Ціхоня павольна, апусціўшы ў дол вочы. Ён з цяжкасцю перасоўваў ногі, быццам іх магнітам прыцягвала да зямлі. Здавалася, што яму не толькі цяжка рухацца, але і жыць. На твары блукала жаласлівая ўсмешка, якая быццам гаварыла: не кпіце з мяне, бо я — таксама чалавек. А з яго такі часценька пацвельвалі. На рабоце ён бадай заўсёды хадзіў, як сонны. «Не шанцавала» яму і ва ўласным жыцці. Жонка нарадзіла двойню, а праз тры гады — другую. Іншы радаваўся б, а яму — гора.

Рэдка калі быў ён шматслоўны. Такое здаралася, калі добра вып’е. Спяваў ён тады матроскія песні, бо служыў — гэта было ўсім вядома — у марфлоце. Расказваюць, Юзік раней вучыўся на трактарыста. Ды аднойчы, падчас практыкі, запусціў рухавік, а спыніць не

змог. На гэтым і закончылася яго вучоба. Пра такіх звычайна гавораць у народзе: «Ні ў салдаты, ні ў матросы, ні падмазваць калёсы».

Не раз Юзік спатыкаўся ў жыцці, падаў і нідзе не знаходзіў падтрымкі, таму ўсё больш і больш губляў упэўненасць у свае сілы. Магчыма, ён і застаўся б такім на ўсё жыцце, калі б не адзін выпадак, які перакрэсліў яго мінулае, дапамог знайсці самога сябе...

Была касавіца. Адзін за адным касцы пазаймалі пракосы. Апошнім, як заўсёды, завіхаўся Юзік. Пракос ён гнаў вузкі, касіў нячыста. Нават падлетак Пеця ішоў наперадзе ў яго і касіў лепш. Той-сёй з мужчын пасмейваўся:

— Стань, Пеця, за Ціхоняй, наступі яму на пяты.

— Паддай газку, Ціхоня, не марудзь!..

У адказ на жарты Юзік толькі разгублена ўсміхаўся.

Сонца падымалася ўсё вышэй і пякло няшчадна. Касцам давялося збавіць тэмп. Вастрасловы неўпрыкмет прымоўклі. Усе паглядвалі на дзеда Данілу, чакаючы, калі ён дасць каманду заканчваць работу.

Наступны дзень выдаўся яшчэ больш спякотны. Абед. Касцы адзін за адным сыходзяць з пракосаў, садзяцца пад кусты й пачынаюць абедаць. Калі Юзік закончыў свой пракос, некаторыя падсілкаваліся ўжо.

Побач была сажалка. Палова касцоў паспяшаліся да яе, каб ахаладзіцца. Сажалка глыбокая, вада ў ёй цёмна-карычневая, берагі нізкія. Толькі ў адным месцы была палоска цвёрдага грунту. Амаль усе кінуліся ў ваду, якая тут жа стала чорнай. На беразе застаўся цыбаты Міша Панцялейчык. Ён не ўмеў добра плаваць і ў нерашучасці хадзіў па беразе. Калі ж купальшчыкі павыходзілі на бераг, Міша раздзеўся і з разбегу раптам кінуўся ў ваду і паплыў. Яму захацелася азірнуцца назад, каб паглядзець, ці далёка адплыў. Убачыўшы, што бераг далёка, разгубіўся і пачаў тануць. Гэта заўважылі ўсе, але ніхто не асмельваўся кінуцца на дапамогу. Баяліся. Хло-

пец ён быў высокі, дужы, а месца глыбокае, топкае. Міша ўжо двойчы схаваўся пад вадой. Нехта моцна закрычаў:

— Памажыце, Мішка тоне!..

У гэты момант Юзік канчаў абедаць. Пачуўшы крык, ён з незвычайнай для яго рухавасцю кінуўся да сажалкі , — як быў, у адзенні, бултыхнуўся ў ваду. Усе атарапелі ад нечаканасці. Ніхто не чакаў такога ад Ціхоні. І вось — дзве галавы паказаліся над вадой. Усе з палёгкай уздыхнулі. Потым Юзік стаяў за кустом і моўчкі, сарамліва паглядаючы на вяскоўцаў, выкручваў адзенне.

— А малайчына, Юзік... Хто б мог падумаць!

— Не дарэмна ж служыў у марфлоце...

— Герой!..

Пасля абеду зноў пачалі касіць, і Юзік, як заўсёды, прыстроіўся апошнім. І тут дзед Даніла не вытрымаў — падышоў да Юзіка, рашуча пацягнуў за руку і сказаў:

— Чуў?.. Ты — герой, Юзік! Тваё месца наперадзе. — І павёў хлопца на першы пракос.

Мужчыны ў знак згоды заківалі галовамі.

Юзік спачатку нясмела азірнуўся, затым, набраўшы поўныя грудзі паветра, шырока размахнуўся касой. Дзе ўзяліся сіла і спрыт у чалавека!

Ён касіў хутка, чыста і не азіраўся назад. Яму было радасна, бо адчуваў сябе героем дня, чалавекам! Мужчыны ледзь паспявалі за ім.

З таго часу яго ўсё часцей сталі бачыць на людзях. Ён нават пачаў хадзіць на сходы. У ім цяжка было пазнаць ранейшага Юзіка. І ўжо ніхто з аднавяскоўцаў не называў Ціхоняй, нават рэдка — Юзікам.

Ён стаў Язэпам Іванавічам.

## АДЗІНОТА

Рабочы дзень у эколагаў раёна пачынаецца ў восем. Толькі кіраўнік інспекцыі Уладзімір Іванавіч Холад мае звычку з'яўляцца раней. Рухавы, энергічны,

заўсёды нацэлены на справу. І гэты панядзелак быў звычайны.

Не паспеў засяродзіцца на чарговым клопаце, як ранішнюю цішу ўспалашыў тэлефонны званок. Гучна-рэзкі, кароткі, бы загад.

— Добрай раніцы... Шнітоўскі — старшыня калгаса «Ленінскі шлях».

— Вітаю. Што ў вас там?..

— Ды лебедзя ратаваць трэба... Падобна, прыхапіла лёдам.

— Дзе гэта?

— На нашым возеры... Вялікім.

Лебедзь сядзеў за паўсотню крокаў ад берага. Бы драмаў. Усе намаганні спудзіць птаха былі марнымі. Ні пагрозлівыя ўзмахі рукамі, ні гучныя вокрыкі — нішто не бралася птахам да ўвагі.

— Мабыць, скачанеў... — непакоіла Шнітоўскага. — Як жа гэта ён, га?.. Ну прыляцеў бы да каго на падворак — пусцілі б абагрэцца... Людзі ў нас чулліўыя.

— Трэба падысці да лебедзя, — прапанаваў Холад. — Але не надзейны лёд... На лыжах, можа?

Вясной дыхнула надзвычай рана. Нават лёд на возеры знік. Ды раптам ціскануў мароз, скаваў возера. Сям-там можна было запрыкмеціць адчайных рыбаловаў. Праўда, тыя трымаліся бліжэй да берага... Зноў адпусціла. І лебедзь прыляцеў на возера, калі не сышоў яшчэ цалкам лёд. Адзін прыляцеў. Без сяброўкі. Мо, з ёй здарылася што? Толькі ён спадзяваўся на сустрэчу. На звыклым месцы, паблізу ад свайго гняздоўя. І чакаў у самотнай адзіноце.

— Смелыя ёсць? — звярнуўся да цікаўных Уладзімір Іванавіч.

— Усё ж рызыка, дый сагрэцца не шкодзіла б, — як пажартаваў адзін з хлопцаў.

— Ёсць чым сагрэцца...

— Тады я ўмомант... Няма праблем.

Аматар «сагрэцца» схадзіў дадому і вярнуўся з варотцамі ад хлеўчука. Кінуў іх на падатліва-крохкі лёд і сам асцярожна ўзлёгся споверх. Лёд злёгку крахтануў. Хлопец прыўстаў, пасунуў варотцы наперад... Зноў прылёг... І так пакрысе пачаў набліжацца да лебедзя, па-ранейшаму нерухомага, задумна-стоенага.

Хлапца да сябе ён блізка не падпусціў — недзе метраў за дзесяць паволі ўстаў і, горды, незалежны (маўляў, дарма турбаваліся: я ж проста адпачываў), падаўся ў бок зіхотнай ад сонечных промняў палонкі.

На тварах клапатуноў з’явілася лёгкае расчараванне. Але тут жа яго змяніла задаволенасць: з птахам нічога не здарылася...

Між тым зноў бралася на мароз. Праз колькі дзён лёд на возеры значна патаўсцеў, і рыбаловаў паболела. Лебедзь па-ранейшаму заставаўся на сваім месцы. Рыбаловы былі блізка, і лебедзь тупаў побач з імі, важна, акурат вартаўнік вадаёма. Відаць, яму нешта перападала з ежы. А як жа — ён браў плату за дазвол парыбаліць паблізу ад яго гняздоўя.

Я не выцерпеў — ступіў на лёд. Слізготна-празрысты, колеру неба. Дно праглядвалася. Водарасці былі нерухомыя, і недзе ў іх зялёна-цёмнай гусцежы хаваліся заўсёды прагныя шчупакі.

Лебедзь падпусціў блізка, але дакрануцца да сябе не дазволіў — лёгкім трухам (ногі — левая была акальцаваная, з правай сачылася кроў — расстаўляў шырока, нібы матрос на палубе) адступіў убок, запыніўся і пагрозліва выдаўжыў шыю. Роўна-пляскатая дзюба рэзка пераходзіла ў надлобны бугор, на якім у абрамленні чорных плям, страхотліва пазырквалі вочкі. Пер’е было бруднаватае.

— Аб лёдавы бур пашкодзіў... — патлумачыў рыбалоў. — Ступіў на бур, чыркнуў перапонкай па васт-

рыі... Гляджу — кроў. Бач, босы ходзіць. І не прастуджваецца.

Магчыма, лебедзь сур'ёзна паранены, не можа ляцець? Але, на шчасце, маё апасенне не пацвердзілася. Неўзабаве аднекуль нахапіўся сабака, і лебедзь спрытна ўзняўся ў паветра.

## НЕ СКАРЫЎСЯ

Трактар буркатаў амаль на адной ноце, павольна рухаючыся ўезджаным прасёлкам. У кабіне наганяла млявасць духата, прыпраўленая пахам саляркі.

Нечакана мы ажывіліся: умомант абагнаў на такім жа «кіраўцы» рыжагаловы хлапец. Ён зыркнуў у наш бок, нібы папракнуў: цягнецеся, маўляў, як на валах.

— Вось такія зухі дзень носяцца, а пасля месяц на рамонце стаяць, — прабурчаў мой падвозчык. — Ды яшчэ звяроў рэжуць... — махнуў рукой у бок павароткі, якая крута брала на поле, ашчаціненае кукурузным іржышчам. Вунь, бачыш?.. На самым лабяку кукуруза так і засталася няўбранай. Дзік перашкодзіў — на нож жняяркі кінуўся... Можна сказаць, самагубства.

— Чуў... Якраз тут і выйду. Дзякуй.

Дык што ж учора адбылося?... Хмарны вечаровы прыцемак прыспешваў. Жняярка, бы казачна-ненаедная істота, няспынна кружыла вакол астраўка кукурузы. Таропка падмінала гонкія сцёблы, рэзала і, здробненыя да сіласнай масы, борздка выкідвала праз хобат у кузаў аўтамашыны. Работы заставалася недзе на паўгадзіны. У нізовіне пачынаў там-сям курыцца туман.

Жняярка, а следам за ёй і машына з надвышаным кузавам, усё вышэй і вышэй, як па спіралі, накручваліся на ўзгорак, як раптам нешта цёмнае, буйное мітнулася, ламаючы быллё, у процілеглы бок кукурузнага пятачка. На чысты лабяк не выбегла — застыла-сцішала-

ся акурат на ўскрайку, у прорадзі. «Дзік... Сякач!» Кіроўца жняяркі паддаў газу, прасігналіў... Ён, малады хлапец, быў не тое што здзіўлены, а да сполаху ўражаны тым, што дзік не паспяшаўся выхапіцца з абцужна-смяротнага круга, а ўсчаў шалёна кідацца туд-сюд у пошуках паратунку менавіта ў абсягах гэтай зялёнай аблогі. А ўрэшце — не было яму куды ўцякаць: з аднаго боку — вёска, з другога — поле, ажыўленая дарога... Спачатку дзік і паімкнуўся быў кінуцца ў лес! Але, падобна, дзве легкавушкі, грузавік і людзі, што стаялі перад ім, наперадзе, стрымалі яго.

А пятля зацягвалася ўсё болей: жалезныя сківіцы жняяркі спрытна хапалі апошнія сцябліны... Нечакана дзік рэзка затармазіў, рашуча развярнуўся — і з падскоку, лётма, гупнуўся на лоўжык струшчанай кукурузы, што імкліва сунулася ў ненажэрна-сталёвую пашчу... Жняярка ўздрыгнула, заскрыгатала і замоўкла.

У целе дзіка знайшлі дранкулю і ці не з паўдзесятка карцечын. Даўнія. Гэты сякач некалі й сапраўды пабываў-такі ў ачэпе цывілізаваных паляўнічых — стралялі па ім, відаць, з машыны. І няйнакш — з легкавіка. Таму і бярогся — не хацелася зноў трапіць у пераплёт пацэльнага агню.

## СВЕТЛЫ СУМ БЯРОЗАВЫ

Па-святочнаму ўзнёсла ў бярозавым гаі ранняй вясной. Белы снег, пакраплены шматлікімі цёмна-пярэстымі праталінамі, нагадвае раскіданыя кімсьці ашматкі бяросты, стракатыя і доўгія, скурчаныя ад холаду. Малюнак уражвае — зямля зліваецца з беластволымі прыгажунямі, і ў наваколлі, здаецца, адно і пануе светлы бярозавы сум, што мкне ў небасінь разам з ажурна-кучомістым вершаллем. Бярозы, быц-

цам магічныя сасуды, напоўненыя сокам, які нават вецер баіцца праліць, застылі ў чаканні шалу вясновай стыхіі. Сок распірае грудзі бяроз: незнарок парушыш кару — і пальецца долкі, жыватворна-гаючы, халодны.

Іду і любуюся гаем. Нечакана — пакалечаная бяроза... Ссечаная ўзімку, яшчэ калі ляжаў тоўсты пласт снегу, бо пень — у рост чалавека. Чырвоны дыск утрапёнага сонца кідаў ярка-тугі згустак промняў на ўзмакрэла-абезгалоўлены камель, што ганебнай патырчакай застыў на барвовым фоне гаснучага дня — папрок чалавечай безгаспадарчасці, а больш — бессардэчнасці. Побач бездапаможна раскінула сухое голле ўсё яшчэ прыгожая, хоць і мёртвая крона бярозы. А пень нібыта працягваў жыць — сачыўся барвянахмельнай сукровіцай, і дападныя мурашы, упіўшыся, бражна кружылі па яго бліскуча-вільготнай, пляскатай аплешыне.

У сполахах зыркай сонечнай мройвы пацурабак загубленага дрэва нагадваў дагараючую парафінавую свечку.

Змрок згушчаўся. Ясна вырысоўваліся толькі блізкія бярозы, астатнія — нябачна зліваліся ў суцэльную ружова-зіхоткую сцяну. Нечым падобную на тыя цагляныя мураванкі, якімі нашыя продкі абносілі памежныя крэпасці ды пасяленні, каб не было як прабіцца прышлым ворагам у абшары слыннай Бацькаўшчыны.

## ПАСТАЯННАЯ ПРАПІСКА

— Ну ж і хітрая парачка... — захапляўся мой знаёмы. — Якая вытрымка!.. Паблізу на гусенічным трактары праляскочыш, і не падумаюць узлятаць. Затое калі пехам ідзеш і ледзь прыпынішся ля гняздоўя — адразу на крылы... Эйш, побач з чалавечым жыллём

пасяліліся. У нас тут іх не чапаюць. А там, дзе глядзяць на іх як на зладзеяў, быццам крадуць з хат вяскоўцаў залатыя рэчы, там не дазваляюць так блізка сяліцца — адпужваюць, а бывае, што проста адстрэльваюць... А яны ўсё роўна да чалавека хінуцца.

— Што ні кажы — загадкавыя птушкі, гэтыя сарокі.
— Уставіў і я свае тры грошы ў лятункавы подум сябра.
— Можна, скажам, навукова абгрунтаваць неабходную для прыроды колькасць сарок. Але ўсё ж ці не лепш знайсці й ліквідаваць тыя прычыны, што парушылі раўнавагу ў ёй?! Безумоўна, гэта зрабіць намнога цяжэй, чым знішчыць «лішніх».

Ранак быў марозлівы. Настылыя да звоні прыдарожныя дрэвы, здавалася, прамерзлі да каранёў. Зусім не цешыла вока казачнае хараство ўзорыстых накідак з шэрані.

Сарочы прытулак на алешыне я запрыкмеціў таксама. Ён і блізка не быў падобны на гняздоўі варон ды гракоў, густа ўмайстраваныя ў макаўе дрэў усцяж гасцінца, пакінутыя і занядбаныя. А гэтая, сарочая дамоўка, нават зімой выглядала дагледжанай, жылой.

Мы як ні спяшаліся, але міжволі мусілі прыпыніцца. У світальнай палымнечы новага дня карункавая вогкасць заінелага голля кантраставала незвычайна. Я ўгледзеў споверх рахмана ўсталяванага лоўжыка натапыраны белы камячок. Вось ён матлянуўся ў бок ад гнязда і, раз-другі торгнуўшы завабна доўгім хвастком, скочыў на галіну, што была троху вышэй. Гэтага аказалася дастаткова, каб другая сарока адчула небяспеку і тут жа выхапілася вонкі.

Вось дык навіна — сарокі прапісаліся на пастаянна ў нейкім кіламетры ад чалавечага жытла, бадай ля самай дарогі!

Калі верыць сябру, дык у больш цёплыя дні да гэтай адасобленай парачкі прылятаюць пагасцяваць сарокі з лесу, што паблізу ад вёскі. Пагасцёўцаў бывае ажно за дзесяць недзе — ладная чародка...

Воддаль віднелася балоцьвіна, зарослая драбналессем. Колісь лазняк і вольхі падступалі да самай дарогі, але прайшлі меліяратары, і ўтварылася поле. Прыдарожны алешнік застаўся як прысады, яго знарок пакінулі. Захавалася і гняздоўе гэтых дзвюх сарок, якія, пэўна, дзеля былой звычкі, каб не дужа мяняць жыццёвых стасункаў, і не зрушылі з месца.

## ВЯРТАННЕ

Цяжка ўзлягаючы крыламі на імжыста-звонкае паветра, нізка праплыла прыгожая птушка-лебедзь! Так блізка бачыў упершыню даволі рэдкую госцю ў нашых мясцінах. Прызнацца, не без апасення сачыў я за натужнымі ўзмахамі шырозных крылаў — гэта ж столькі ў іх і хараства, і сілы. Менавіта сілы й хараства, што ў першую чаргу якраз і даюцца вачам.

Вясна наводзіла парадкі: зліквідавала белыя пухавікі з палёў і ўзялася за возера, ледзяны панцыр якога раставаў даволі марудна. Над праталінкамі сярод чароту, што цягнуўся да цэнтра возера, дзе ўжо значыўся даволі ладны адлюстровак вады, мітусіліся тлумныя чайкі. Здавалася, лебедзь якраз там і прывадніцца. Не, белая птушка зрабіла адно разведвальны круг над возерам і паляцела на нейкі іншы вадаём.

І ўжо недзе праз тыдзень, калі возера спрэс аздобілася бялёса-ўзвейнымі хвалямі, з марыва непагодлівага надвячорка мой зрок на імгненне выхапіў постаць велічна-грацыёзнай птушкі — мройна-белым прывідам яна адзінока гойдалася ў азёрнай бурапені.

Адзінокі лебедзь заінтрыгаваў мяне, і я падаўся да возера. Багністы бераг не дазволіў падысці да вады, а птушка і без таго знаходзілася на ладнай адлеглласці. Гэта некалькі расчаравала. Але мусіў задаволіцца тым, што з цікавасцю сачыў, як лебедзь перыя-

дычна ныраў — пэўна ж, падсілкоўваўся, здабываючы нейкі там азёрны корм.

— Любуецеся? — учуў я амаль за спінаю, блізка, нечы троху ахрыплы голас.

Азірнуўся. Перада мною стаяў мужчына гадоў пяцідзесяці з шорстка-цьмянымі, пранікаціненымі вусамі. Незнаёмец быў у дажджавіку і гумавых ботах.

З правага пляча звісала доўгая пуга. Пастух. Ну так, зводдаль пасецца статак кароў.

— Назіраю... — ціха выбуркнуў я: прызнацца, стаўлюся насцярожана да такіх вось мясцовых «прыліпалаў».

— Бачу, панесла некага... От я, значыць, і пакраўся следам... — Падалося, пастух нечага наўздзіў пільна «абмацваў» мяне вачыма. — Тою вясной іх тут два плавала, ля самага берага красаваліся...

— Красаваліся, кажаце?

— Унё там, — паказаў на астравок паклычанага чароту. — Гняздо распачалі...

— І што ж?

— Знайшоўся тут адзін... Далікатэсу захацеў, калом яму ў горла. Звёў лябёдку... Раздзеўся — і пайшоў махаць наўпагон, а яе ветрык адносіць усё далей, далей. Акачанеў гарыдавец, не вярнуўся на бераг... Пакінуў на траве мялкашку з торбаю ды адзенне — шмоткі новыя, не галадаў чалавек... Лябёдка тая з яйкам была. Яе дасталі ў той жа дзень... Тапельца ж багром пдчапілі ажно на шосты — ляжаў у твані, не падняло на паверхню...

— Што ён за чалавек быў, калі на лебедзя руку падняў?

— А сёння — што на лебедзя, што на чалавека... Свет курвіцца, чалавек паслабеў душой. — Пастух павярнуўся тварам да возера, прыжмурыў вочы. — Чуў розныя легенды пра гэтых птушак... Мабыць жа, праўду кажуць, што яны такі — адналюбы... І гэты, бач, вярнуўся. І ўжо да берагу — ані блізка, ва ўкор нам, людзям.

## САЛАВЕЙ У ГОРАДЗЕ

Нованароджаны летні дзень уладна заяўляў аб сабе прарэзлівымі гудкамі паяздоў і ўсё нарастаючым шумам матораў. Стрункія капіляры сонечных промняў яшчэ не паспелі ўсмактаць вільгаць з густых вершалінаў прыасфальтавых дрэў.

У прахалодна-кудлатай засені высокай таполі я нечакана пачуў спеў салаўя. І гэта амаль у цэнтры разбуджанага горада! Пошчак спачатку быў няўпэўнены, быццам знакаміты пяюн не асмельваўся заявіць пра сябе на поўны голас, з таго і не спяшаўся ўзяць патрэбную ноту. Але з нарастаннем гарадскога шуму мацнеў і салаўіны голас. Гэта мне нагадвала як бы своеасаблівае саперніцтва птушкі з машынамі. Здавалася, салавей з усіх сіл імкнуўся звярнуць на сябе ўвагу чалавека. Аднак прахожыя, такія няўдзячныя, нібы ўсе яны нямыя ды глухія, пры пераходзе вуліцы на дрэва, з вершаліны якога віртуозна падалі на асфальт раскацістыя салаўіныя рулады, ніхто нават і не глянуў, бо ўсю сваю ўвагу аддавалі праязджаючым машынам. Людзі былі занятыя непасрэдна сваімі клопатамі, якія прынёс з сабой новы працоўны дзень. Бы зразумеўшы гэта, ганарлівы спявак хутка заціх.

Я назіраў за дрэвам. Спадзяваўся, што салавей зноў заспявае. Ды не — ён маўчаў. Відаць, зразумеў, што вытыркнуўся тут са сваімі песнямі, як той Піліп з канапель, не ў час і не да месца. Праз нейкі момант маленькая шэрая птушка пакінула таполю.

Я стаяў і думаў: адкуль ён тут, гэты галасісты птах? Непадалёку, за горадам, дзе пачынаюцца ўгоддзі суседняга саўгаса, люстраніць невялікі вадаём, побач — балотца і густы хмызняк. Салавейкаў там — і старых пяюноў, і маладых — поўным-поўна. Недзе сярод іх, мусіць, і гэты шустрак жыве, а сюды прыляцеў ці не рэкламаваць свае здольнасці. Патрэба такая ёсць — забываем салаўя, нямее душа нашая ў штодзённа-тлумным гудзе смярдзючага горада.

## ПАВУЦІНКІ-ЛІХТАРЫКІ

Азёрная роўнядзь і прахалода вабяць і малога, і дарослага: з вудай, лодкай і проста — адпачыць, асвяжыць цела і наталіць душу, зняць фізічную і нервовую стому. Між тым ужо ўсплыў барвовы дыск сонца. Гіганцкі горан сусвету яшчэ павінен давесці яго да белага напалу.

— Тата, мы да крынічкі йдзем? — спытаў мой шасцігадовы сын.

— Ты хочаш крынічку пабачыць?... Недзе ёсць яна тут, крынічка... Непрыкметная. Непадалёк ад возера. Ледзь пульсуе ў балаціне, зарослай кустоўем і асакой.

— Тата, паглядзі! — падсунічаны тварык сына заззяў усмешкай. — Ліхтарыкі на галлі!.. Хто іх павесіў?

— Павучкі.

— Каб ноччу відаць было?

— Ну пэўна ж. Бачыш, нават уключальнікі ёсць.

Наўкол густыя шматлікія сеткі павуціння, шчодра ўсыпаныя кропелькамі расы, зырка ззялі на сонцы. І сапраўды, з кожнага «ліхтарыка», бы тасёмка з таршэра, звісала павуцінка. І сын з ходу хапіўся за адну і пацягнуў — павуцінка абарвалася, аднак ліхтарык не патух, зіхацеў па-ранейшаму.

— Навошта так зрабіў? Цяпер павучок не выключыць і не ўключыць святло.

— А чаму павучкі так позна спяць?.. Ліхтарыкі выключыць трэба! — Сын памкнуўся да чарговай павуцінкі.

— Не трэба ўмешвацца ў жыццё павучкоў.

— А я хачу дапамагчы... — сын працягваў бедаваць, і я заспакоіў яго: — Сонейка зараз само патушыць ліхтарыкі... Хадзем да крынічкі.

Мы спусціліся ў лагчынку. І натрапілі на крынічку зусім нечакана, хоць я неаднойчы бываў тут. Часам кружыш вокала, мінаеш гэтае вечна жывое дзіва, вяртаешся зноў, пакуль вось так нечакана і дасца ў вочы. Яна сапраўды як усё роўна па-за увагай чалавека... Між тым вада ў ёй глы-

бінна-першародная. Ніколі не замярзае. У любую сцюжу. Навакольныя птушкі й звяры тут не госці, а старажылы. З таго — мноства слядоў і слядкоў вакол. І, як ні дзіўна, не менш павуцінак, спрэс наструненых на кустоўі й траве...

Падчас свайго дзяцінства чалавецтва несвядома, па-спажывецку ставілася да навакольнага асяроддзя: імкнулася адно выжыць. І вось — выжыла і размножылася. Заможна-сыты чалавек страляе ў лебедзя. Гэта законна абурае нас!.. Аднак жа мы, не задумваючыся, нішчым павуцінкі. Дзіва што, павуцінка — не лебедзь. Павук, каб не памерці з голаду, новую выструніць і заснуе зноў сваё нябачнае «сеціва» для камароў ды мух. Як відаць, нават нейкія там павучыскі нешта ўсё ж значаць для прыроды. І хто ведае, у якой ступені?!. Запавуціненая лясная сцежка, скажам, звера суцяшае — чалавек тут, значыць, не быў, ніякай снуды не пакінуў...

Безумоўна, нельга рваць і тыя самыя павуцінкі ў душы, якімі знітаваныя з прыродай і мы самі, людзі, бо кожны з нас таксама частачка сусвету, можа, і не самая лепшая, але ж без гэтай, здавалася б, кволай прывязі-падтрымкі даўно б ужо чалавецтва канула ў бездань небыцця.

## НЕДЗЕ ПАБЛІЗУ...

Над лугавой нізовінай — доўгім і вузкім прыканаўем — браўся лёгкім туманцом няспешны летні надвячорак.

За канавай нехта касіў. Мне чамусьці здавалася — бывае ж такое! — нібыта гэты нехта, просты дзядзька ў стракатай кашулі, зусім і не касіў, а ўзбіваў, успалошваў прыснулы на траве туман.

Аднекуль прыляцела пара буслоў. Зводдаль мышкаваў сабака. А недзе паблізу ў кустах салавей рупна абсвістваў нейкага там мясцовага «салапёка».

Падобна, у прыродзе ўсталяваліся гармонія і лад.

Ды нечакана дзесьці паблізу з транзістара грымнула песня папулярнай расейскай спявачкі. І што ж?..

Ну так, аніякай інтэграцыі не адбылося...

Сабака перастаў раскопваць мышыную норку і кінуўся на буслоў — тыя з неахвотай узняліся ў паветра.

Касец нечага раптам перастаў касіць дый паківаўся дадому.

Не стала чуваць і апантанага салоўкі.

## ШПАКІ

Зіма выдалася запознена-бесхарактарнай — вось-вось, здаецца, пачне хваліць Дзеда Мароза за празмерна-пякучую халадэчу, як тут жа няўзнак расплачацца, відаць, прыгадаўшы нялёгкі лёс звяроў ды птушак падчас сцюжных ветравеяў, махне шырокім белым рукавом і спыніць завіруху. Пасля задумаецца аб нечым, ды так і задрэмле ў поўнай нерашучасці.

Птушкі, як відаць, разгубіліся — не могуць вырашыць пытанне: ляцець ім у вырай ці не? Асабліва вагаліся шпакі. І сапраўды, навошта адпраўляцца ў далёкі й небяспечны шлях, калі й тут нядрэнна — ні снегу табе, ні марозу. Такога ж настрою і качкі, бо вадаёмы й блізка не бяруцца лёдам. Зняверыліся ў зіме і людзі.

Быў пачатак лютага, але снежная вопратка зямлі моцна прадзіравілася — вясёлыя капяжы са стрэх настройвалі на веснавы лад.

Тым не менш убачыць шпакоў у гэты час было даволі проста — тыя, як ні ў чым не бывала, бадай кожную раніцу падоўгу сядзелі на вішні й чысцілі ўзлахмачанае ветрам пер’е. Праўда, рухі ў птушак былі злёгку замаруджаныя, не адчувалася ў іх той веснавой жвавасці й весялосці. Шпакі маўчалі, быццам скаваныя прадчуваннем нечага нядобрага. Напэўна, даверыўшыся бясснежнаму надвор’ю, што загасцявала ў позняй восені, а пасля і ў зімы, яны замарудзілі з адлётам у вырай, а затым і наогул спазніліся.

Людзі спачувальна глядзелі на птушак. Нікога не радавала іх спазненне, а, наадварот, засмучала — наперадзе ў шпакоў яшчэ столькі выпрабаванняў.

А вось вераб'і — гэтыя аказаліся неспагадлівымі. Яны мітусіліся ля шпакоўняў — не хацелася верабейкам пакідаць цёплыя кватэры, і яны сваім гарлапаністым крыкам, здавалася, выказвалі пратэст: «Узімку мы тут гаспадары!.. Ляціце ў свой цёплы край!»

Дзіўна, шпакі нават і не збіраліся аспрэчваць свае правы на жыллё. Яны яшчэ колькі дзён пагойдаліся на мокрых галінках, як бы любуючыся сваімі ўтульнымі шпакоўнямі, потым сабраліся ў гурт, скампанаваліся і паляцелі ў толькі ім вядомым кірунку. Недзе ж і на гэты выпадак у іх ёсць свой надзейны прытулак.

Вось і думай: холад і бяскорміца гоніць птушак у цёплы край. На пэўны час. Пасля яны вяртаюцца. Каб спяваць, пладзіцца... Жыць!

Часам і чалавек пакідае сваё гняздоўе. Бывае, што і з-за бяскорміцы. Ён недзе вылузваецца са скуры на чужыне, рве жылы — марна траціць здароўе ў празмернай працы, і ў выніку бясслаўна губляецца ў віракруце дзён. І адно родны кут яшчэ доўга помніць яго, чакае.

## СПІЛАВАЛІ ДРЭВА...

На гонка-стройную, з кучаравай вершалінай арэшыну начапілі пятлю. Канец вяроўкі перакінулі цераз плот агародчыка, на вуліцу. За вяроўку ўхапілася рукамі кабета і хлапчанё-падлетак. Вяроўка выструнілася, і двое мужчын пачалі пілаваць на ўзроўні грудзей надзіва тоўстую арэшыну. Такім чынам, усё было прадугледжана, каб дрэва, падаючы, не паламала даволі збуцьвелы плот. Піла-двуручка звінела порстка-з'едліва і нядоўга. Вершаліна раптам уздрыгнула. Яе моцна тузанулі вяроўкай і сталі хіліць у бок вуліцы... Нарэшце, не зачапіўшы плота, арэшына пераляцела з агарода на вуліцу і перакрыжавала дарогу.

— Эйш, так упала, што і не чыркнула аб плот, — сказаў адзін з пільшчыкаў. — Мая парада! — І прысеў на кукішкі. — А зараз пачнем з камля пілаваць...

— Мама... Мне шкада арэшыны, — насупіўся падлетак: здавалася, во-во заплача. — Яна была прыгожая...

— А ўжо на ёй, сынок, арэхаў не было.... Дый грады зацяняла.

— Дык навошта ж садзілі?!.

— А ты ў бацькі пра гэта спытай... Аднойчы прынёс з лесу дубчык і пасадзіў. Тады ён багата жыў, пра грады не клапаціўся. А сёння на свой гарод калі не паспадзяешся, дык можна і зубкі на паліцу пакласці...

Арэшыну спілавалі й пасеклі на дровы. А хлапчук усё ніяк не мог звыкнуцца з надзіва бязглуздай, нечакана адкрытай для сябе чарговай жыццяіснасцю: часам і прыгожае перашкаджае людзям.

## ЖЫЦЦЯ ВЫТОКІ

Прыпар ледзьве кранае лясное мроіва з тонкім водарам маладой грыбніцы й моху, сівога, кусціста-раскошнага, што ўкрывае прагалкі ў сосніку, сярод якога часам пракідаюцца купкі густалістых бяроз, злёгку пазначаных ужо яркаю барвай восені.

Змірыўшыся з думкай, што мае грыбы яшчэ не выраслі, я прысеў адпачыць. Нада мной жвава кружылі й папісквалі дзве надзвычай маленькія птушачкі — лясныя сініцы. Вось адна села на тонкі збуцьвелы пянёк і быццам растварылася ў ім. Нечакана «чарадзейка» выпырхнула з пня так нечакана і порстка, бы са струка вылузалася і адляцела ўбок пераспелая гарошына. Тое, што ўбачыў, мяне вельмі ўсцешыла: у верхняй частцы пня якраз пад доўгім сучком цямнела маленькая адтулінка, у якую, здавалася, толькі чмель і мог пралезці. Зазірнуў у гэтае мікра-дупельца і —

дзіва! — выявіў даволі шыкоўна-ўтульнае гняздзечка, а ў ім — раскрытыя роцікі птушанятак, маленькія галоўкі якіх на тонка-кволых шыях пачаргова дацяг-валіся як не да вырунку. Птушаняты прасілі есці... Дакрануўся да пня рукой — зусім струхнелы, як толькі й трымаецца. І мне падумалася: «Якім трэба быць асцярожным і ўважлівым у лесе, каб не парушыць жыццёвыя вытокі яго насельнікаў!»

## ІМГНЕННЕ

Нязвыклыя для вуха гукі, накшталт птушыных, знянацку захапілі маю ўвагу. Шустры камячок полымя, гарэзлівы й бязважкі, адспружыніў ад зямлі й пакацiўся ўверх па шурпатым ствале елкі.

Вавёрка!.. Яна ўмомант аказалася на вяршаліне дрэва. І тут жа, бы акрабатка, скочыла на суседнюю елку. У міг вока апынулася на кучомістай макаўцы сасны... Імкнучыся не заблытацца ў сухаломе, я ледзьве паспяваў за вавёркай, не спускаючы з яе вачэй. Вось так, непрыкметна для сябе, міжволі ўцягнуўся ў гульню з гэтайляснай свавольніцай. Калі ж яна раптам знікла ў голлі, я ажно засмуціўся быў, што ўсё так хутка скончылася. І, прызнацца, шчыра ўзрадаваўся, калі зноў заўважыў лёгкае воблачка з шалупіння кары, а пасля — і яе, вавёрку, па-ранейшаму імкліва-ўзвейную, недасяжную.

Нарэшце густая сцяна бору скончылася. Вавёрка ў нерашучасці замерла на краю адной з разлапістых елак, агледзелася. Недзе метры за тры перад ёй высілася разгаліста-каржакаватая сасна-семенніца. Вавёрка памкнулася была скокнуць, але нешта стрымала яе. Можа, страх?.. Ды не. Здаецца, страху не выявіла, бо раптам імкліва мітнулася з галіны на сукасты стрыжань і паімчала ўгару. Ужо там, на вяршаліне, выбрала спадзіста-доўгую галіну і, набраўшы раз-

гон, спрытна гайсанула з яе ў кучоміста-голкавую каламуць старое сасны...

Момант палёту — помірг вока, кароткае імгненне. Лёгкае цельца вавёркі распласталася ў промнях сонца. Распушаны хвост прасвечваўся наскрозь. Вавёрка шчасліва дасягнула суседняй вершаліны й хутка знікла ў сваім гняздзе, падобным на сарочае, але больш уцепленае, таму значна шырэйшае і вышэйшае.

У кожнага з нас ёсць момант узлёту на сваю вяршыню, і важна своечасова адчуць і ўбачыць траекторыю свайго лёту ў абраны пункт прызямлення. Прамаруджваюць і памыляюцца адно бяскрылыя.

## ДУБ-ЗАСТУПНІК

Кожны дзень я з жахам назіраў, як усё расце-большае зеўра пясчанага кар'ера. Набліжаецца да лесу, увачавідкі пашыраючыся. Жоўта-авальны, стромы бераг паволі, таўшчэзнымі глыбамі сплывае акурат пад стралу экскаватара, на якой гойсае знізу ўверх нестамлёна-пражэрлівы коўш-чарпак. Упобачкі з экскаватарам шчыруе і празмерна рухавы трактарок-пагрузчык. Разам з глыбамі жаўцяку міжволі абрынаюцца, нібы ў магілу, і малады соснік, і стромыя прыгажуні-бярозы, і вечна трапяткія асіны, і заўсёды маладое кустоўе вербалозу...

І вось — у шчэрбах пустой глыбіні кар'ера выразна-яўна азначылася густое плеціва каранёў дуба-волата. Ён, гэты цар прыроды, быў нашмат старэйшы за ўсе суседнія дрэвы. Невядома ў якім стагоддзі абаснаваўся тут. Дападныя «кар'ершчыкі» ўзяліся нішчыць дуб. Яго ўжо як след падкапалі, бадай палова каранёў вісела ў паветры, аголеная і добра падсушаная сонцам. Нядаўна нехта з руплівых знішчальнікаў прыроды абліў таўшчэразны камель саляркай і падпаліў. Дуб ахапіла полымя, але ненадоўга: выгарала саляр-

ка і агонь патух. Нарэшце экскаватаршчык не вытрымаў:

— Ды няхай ён спрахне... Канчаем, хлопцы, бо ўсё роўна не адолеем. Бач, у наш бок нахілены. Яшчэ, чаго добрага, накрые... Будзем новы кар’ер асвойваць.

І паехалі.

І стала ціха наўкол. Дуб-волат адпудзіў сваёй веліччу палахліўцаў. Гнеўны шолах ягонай лістоты зноў змяніўся на лёгка-дрымотны пошум вечнасці.

## НЕ АБАРАНІЛІ

Шпакі збіраліся ў чароды. Выпрабоўвалі моц крылаў і згуртаванасць перад адлётам у вырай. Жывымі гірляндамі павісалі на дратах ліній электраперадач і падоўгу сумавалі ўголас, напаўняючы наваколле развітальнымі песнямі.

Але ніводзін з іх, бадай, не адчуваў сябе такім гаротным, як шпачок з параненым крылом. Птах-інвалід нават не асмельваўся пакінуць сваю кватэру: сядзеў на парожку і маўкліваназіраў за сваімі пабрацімамі. Яму так не хацелася заставацца аднаму.

Усё часцей я пачаў заўважаць, як над хаткай шпачка-бедалагі кружыць каршун. Восеньскі вецер паабчэсваў з яблыняў амаль усё лісце, і шпакоўня была відаць, бы на далоні.

Неяк надвячоркам у садзе нема залемантавалі сарокі. Яны, быццам маленькія верталёцікі, то павісалі над шпакоўняй, то камянямі падалі на яе. Хутка ўсё высветлілася: з саду порстка ўзляцеў каршун. У яго ўчэпістых кіпцюрах трапятаўся той самы шпачок-інвалід.

Сарокі яшчэ доўга не маглі супакоіцца, але з хаты выйшла гаспадыня і разагнала надакучлівых гарлапанак. Ёй і няўцям, што белабокія клікалі менавіта яе — каб ратавала шпачка. Яна не выбегла, таму і ўсчалі асуджаць нерупліўку, дружна лаялі.

## АДМОВІЛІСЯ

Гэтая шпакоўня, як кажуць, дажывала свой век. Усё ж нечым прыйшлася даспадобы птушкам, і тыя ахвотна сяліліся ў ёй, дарма што дзіравая ўся і струхнелая.

Але знайшоўся добры чалавек і паспагадаў шпакам. Ранняй вясной зняў з дрэва стары птушыны домік і замяніў яго новым. Толькі ці то ў спешцы, ці вырашыў, што сыдзе і так, прабіў адтуліну не пасярэдзіне пярэдняй сценкі, як звычайна, а збоку, з самага краю. Вельмі проста і хутка — зрабіў два надрэзы нажоўкай на краі дошкі, падкалупнуў долатам — і лаз гатовы.

Хутка завіталі шпакі. Яны доўга аглядалі новае жытло. Пэўна ж, ім вельмі хацелася пасяліцца ў ім, але асаблівай радасці не выказвалі: неахвотна залазілі ў шпакоўню і гэтак жа неахвотна выпырхвалі з яе.

Яны так і не ўпадабалі новай кватэры. Затое атайбаваліся ў ёй вераб'і.

## ЧОРНЫЯ РАБІНЫ

Прырода, нібы пераборлівая модніца: за год некалькі разоў мяняе вопратку, палітра адценняў якой вельмі багатая. Але ў кожным сезоне ёсць свае дамінуючыя колеры. У барве і жаўцізне патануў восеньскі лес. Прыкметна пазалаціліся сады.

Асабліва ў гэты час прывабныя рабіны. Дзве з іх акруглымі кронамі, бы вогненнымі шарамі, павіслі над узмежкам, надаючы ўтульнасць апусцеламу агароду. Важкія гронкі пругка-чырвоных пладоў цешылі вока.

Прызнацца, я нейкі час не звяртаў увагі на тое, што рабілася наўкола. Учуўшы лёгкі пошум, я міжволі глянуў у бок рабін. Ад незвычайнага здзіву ажно атарапеў: з чырвоных — рабіны сталі выключна чорнымі... Што за метамарфозы?

І толькі шпачыны галас, што даносіўся з рабін, вярнуў мяне ў сапраўднасць. Той жа момант над дрэвамі

ўтварыліся дзве жывыя хмаркі, якія ў міг вока зліліся ў адну. А рабіны зноў сталі чырвонымі.

## ЗАСТУПІЛІСЯ

Невысокую маладую яблыню з даволі сіметрычнай кронай і вострай вершалінай увенчвала на рэдкасць вялікая шпакоўня. Пара шпакоў-навасёлаў сядзела паблізу сваёй хаткі й мірна аб нечым шчабятала. Раптам нямаведама адкуль на іх рэзка спікіравала галка. Яна адагнала птушак, якія, пэўна ж, паверылі ўжо ў сваё шчасце, і нырнула праз шырокую адтуліну ў іх домік. Відаць, галка аблюбавала гэтае жытло раней за шпакоў. Балазе, сваім прасторным лазам шпакоўня і спадабалася ёй.

Шпакі здалёк назіралі за галкай. Як толькі тая паляцела кудысьці — няйнакш на перакус, шпакі тут жа вярнуліся да шпакоўні. Ды галка не была б галкай — зноў накінулася на шпакоў. І яны, бадай што, страцілі б свой прытулак, калі б зводдаль, на суседнім дрэве, не сядзела варона... Так, варона спакойна і надта цярпліва назірала за недарэчным глумам. І калі шпакі, можна сказаць, апусцілі ў адчаі крылы, змагліся ў няроўнай барацьбе, яна сарвалася з седала і рашуча накінулася на галку — умомант адагнала гарыдаўку ад шпакоўні. Маўляў, не крыўдзі меншых за сябе.

## КІСЛІЦЫ

Цяжкія шурпатыя лапкі старых ялін нагадвалі апушчаныя крылы гіганцкіх птушак, што ярусамі ўселіся вакол ствалоў, утварыўшы цёмна-зялёныя капюшоны з колкага пер’я-ігліц. Адшліфаваныя ветрам і дажджамі, ніжнія часткі ствалоў пакрыліся праз гады лёгкім зялёным налётам. Здаецца, хтосьці спецыяльна пафарбаваў іх з пульверызатара. Маладыя яліны ашчацініліся знізу

ўчэпістымі сухімі галінкамі, балюча драпаючы неасцярожных наведнікаў.

З нізовіны, што аблюбаваў ельнік, цягнула сырасцю. Шматлікія зялёныя астраўкі кісліц — іх яшчэ называюць зайцавым шчаўем — аздаблялі малапрываблівы для вока лясны дол. Бадай кожнаму вядомы гэтыя нічым не адметныя расліны. Увесну кісліЧныя плантацыі нагадваюць светла-фіялетавыя жывыя дыванчыкі...

А чаму менавіта гэтыя краскі густа ўсыпаныя дробным кветам? Прыгледзьцеся ўважліва і зразумееце. Звычайна на травяністых раслінах кветкі й лісце знаходзяцца на адным сцябле. Лісце і кветкі ў кісліцы маюць асобныя сцёблы. Ці не таму расліны так бесперашкодна размнажаюцца?

## ПОБАЧ З ДОБРЫМ ЧАЛАВЕКАМ

Дзьмуў пранізлівы вецер. Нават «коцікі» на кустах вербалозу нахохліліся ад холаду. Час ад часу сыпаў дробны калючы град. Яшчэ за добрую тысячу крокаў да вёскі я заўважыў у прасвеце паміж хатамі й дрэвамі буслінае гняздо. Яно ўвенчвала тэлеграфны слуп, што стаяў па левы бок вуліцы за прысадамі.

Падыходжу бліжэй. Абодва буслы на гняздзе. Адзін — скрай гнязда, мужна падставіў грудзі парывам ашалелага ветру. Пэўна, гэта быў Ён. Троху пахістваўся, але ўсё ж засланяў-такі сваю сяброўку ад працінаючага холаду. Раней на адной разгалістай ліпе нярэдка сялілася да пяці бусліных сем’яў. Іх гнёзды ўтваралі нешта накшталт шматпавярховых гракoвых інтэрнатаў. А дзве буслянкі на дрэве нават не здзіўлялі. Цяпер жа і адну не часта ўбачыш. І вось — радасць: буслянка на слупе... Цывілізаваная сямейка!

Чаму птушкі аблюбавалі слуп? Так, месцейка зручнае — побач рэчка, балаціна. Але ж па другі бок рэчкі — высокая ліпа з буслянкай. Праўда, колькі гадоў таму

на старой ліпе, амаль над самай вуліцай, было гняздо, ды яго скінулі долу. Знарок. Узамен жа ўсцягнулі крыжавіну на другую ліпу, крыху далей ад хат, амаль на беразе рэчкі. Буслы не сталі забудоўвацца на пазначаным месцы, а пасяліліся на слупе, ля хаты добрага і ціхага чалавека Сцяпана, які працуе механізатарам, а яго жонка Марыля — паштаркай. У іх сям'і лад і згода.

Расказваюць, у халодныя вёсны буслы ў пошуках паратунку ад сцюжы разам з хатняй жывёлай заходзілі ў хлявы. Пад Сцяпанавым дахам ім таксама знойдзецца прытулак.

## РАЗВІТАННЕ

Чарада шпакоў рэзка знізілася і доўгім чорным шнурочкам расцягнулася над самай вадой. Я толькі дзіву даваўся: як на такой хуткасці ды ў такой скучанасці ніводная птушка не чыркнула па вадзе крылом!

Вось ужо ўтварыўся жывы шарык і «пракаціўся» над лугам. Чарада то станавілася цямнейшай на разваротах, калі ўсёй плошчай распластаных крылаў трапляла ў поле майго зроку, то святлела, калі аддалялася ці набліжалася.

Імклівыя віражы птушак у стынучай восеньскай прасторы настройвалі на сумны лад. Сваімі частымі пікіраваннямі і ўзлётамі шпакі, здавалася, адбівалі паклоны родным мясцінам, развітваліся з імі перад адлётам у вырай.

## ПОМСЦЯЦЬ

Налёты шпакоў усё болей засмучаюць і нервуюць вяскоўцаў. Птушкі тлумнымі, шумнымі чародамі сядлаюць вішні. Ды яшчэ і верашчаць незадаволена, бы сварлівыя бабулькі. І падаюць на зямлю недаспелыя вішні, а з паспелых застаюцца толькі костачкі.

Як ужо не адпуджвалі нахабаў: грукалі ў бляшанкі, вешалі пудзілы, крычалі пагрозліва і нема, інтэнсіўна размахваючы рукамі, шпурлялі каменнем... А шпакі толькі адляцяць крыху і павіснуць гірляндамі на электрычных дратах. Цікуюць. Адвярнуўся куды гаспадар — і зноў нахабная хеўра акупуе вішнёвыя прысады.

Некаторыя шпакі да таго асмялелі, што ўжо і не ўцякалі — усядуцца адзін-два не вельмі высака, у галлі, схіляць гарэзліва галоўкі й пачынаюць назаляцца: у адказ абсвістваюць пужакаў. Ды яшчэ і падскокваюць у такт абуральным прытупванням гаспадара ці гаспадыні. Ну так — насміхаюцца: маўляў, не дастанеш, не дацягнешся — хоць трэсні ад злосці.

Гэта нагадвала помсту. За што?

— Яны з Германіі да нас прыляцелі... Там дзікіх шпакоў процьма, — патлумачыў мне адзін вясковец.

Можа, каторыя і сапраўды прыляцелі з Германіі. Але ж хіба там вішняў няма? Выходзіць, птушкі галодныя, таму і агрэсіўныя... Але ж калі разважыць, дык, можа, Германія тут не пры чым. Раней шпакоўню ладзіў кожны гаспадар. І не адну. Шпачыныя хаткі можна было паўсюдна бачыць у зеляніне садоў.

Шпакі раўнамерна рассяляліся. Харчаваліся насякомымі, частаваліся вішнямі. Так, вішнямі. Але гэта было неўпрыкметку. Бо для пражыцця сямейкі-другой шмат корму не патрабавалася. Калі ж чалавек стаў абыходзіць птушак увагай, дык жытла ў іх станавілася ўсё меней і меней. І сёння ў шматлікіх садах вяскоўцаў, прызнацца, засталіся лічаныя шпакоўні...

І знайшлі шпакі прытулак у лясах ды іншых прыдатных месцах. Вядома ж, сваіх былых звычак яны не страцілі. Дый смак вішань па-ранейшаму прываблівае. Таму і наведваюцца ў свае колішнія сады. Чародамі. Такі ў іх цяпер лад жыцця. Бадай што калгасны.

Вось і расплочваецца чалавек за сваю няўвагу да птушак.

## УЛАДКАВАЛІСЯ

Галкі здаўна прызвычаіліся ладзіць гнёзды ў комінах. І не ў тых, што з адным дымаходам... Коміны са шматлікімі выцяжкамі асабліва прываблiваюць. Там птушкам і зручна, і бяспечна, і цёпла. Але такіх прытулкаў становіцца ўсё меней. Чалавек прынараваўся бараніцца ад галак металічнай сеткай.

Ды ў апошні час пачалі з'яўляцца новыя магчымасці для гнездавання птушак. І спарадзіў іх чалавек. Абыякавасць, хуліганства.

Слупы электраперадач на вясковых вуліцах месцамі аздобілі велічэзныя ліхтары. З пукатымі шклянымі плафонамі. Відаць, у капейчыну абышліся. Толькі што карысці. Ці лямпачку перагарэлую няма каму замяніць, ці яшчэ горш — плафон растоўчаны... Карацей — на вуліцы ўсталёўваецца цемра. І вісець бы гэтым асвятляльным цацкам без патрэбы, калі б не гаспадарлівыя галкі. Прыстасавалі яны забытыя людзьмі ліхтары пад гнёзды. Такога-сякога смецця наносяць — і цалкам задаволены жыткай...

Стаіць у маркоце такі абліхтараны слуп, бы асляплены Адысеем цыклоп. Імкнецца ён нешта разгледзець на зямлі, а не можа. Спыніцца незнарок пад слупам вясковец, задзярэ галаву і прабурчыць ціха, радуючыся за галку:

— Бач, птушка, а не дурней за чалавека... Хоць якая, ды карысць.

## У ПАЛОНЕ

У гэтым месцы рэчышча нагадвала глыбокі кацёл. Кучарава-густое кустоўе месцамі зялёным кіпнем «вылівалася» праз край...

Справа і злева на берагах ад кустоўя адгарадзіліся шматпавярховымі каменнымі гмахамі ўперамеж-

ку з дымнымі трубамі заводаў. Спрадзе, па ходу плыні, над ракой шлагбаўмам павіслі сталёвыя трубы цеплатрасы, ззаду — бялеў аграмадны, адзеты й абуты ў бетон, мост.

«Кіпела» зеляніна ў палоне цывілізацыі, ірвалася на прастор.

## ГУСІ НАД ВОЗЕРАМ

Гэты раз вясна згадзілася з календаром — у першы ж дзень сакавіка рашуча заявіла аб сабе яркім сонцам і дружнымі капяжамі. Але пасля нібы ўсумнілася ў занадта ўзвейным спрыце, засумнявалася ў сваіх сілах, і нетаропка, а часам і нехаця, пачала няспешна выконваць свае спрадвечныя абавязкі.

У прыроды-мастака яшчэ не хапала веснавых фарбаў, каб правесці пэндзлікам па астраўках-слядах снегу на паўночных схілах пагоркаў. Зялёны колер ледзь прабіваўся з-пад пакручанай снегам і талай вадой шэра-жухлай леташняй травы. Уздыбураную жорсткую шчэць незаараных на зіму жытнёвых палёў стараўся прыгладзіць вецер.

Пад ледзяным дахам нервавалася возера. Дзе-нідзе лёд крыху падтаяў. Над сухім чаротам, крычучы, мітусіліся чайкі, быццам імкнуліся разбудзіць возера. Некаторыя з іх уселіся ўздоўж палонак, часта заглядвалі ў ваду, але не рашаліся пагойдацца на жаданых хвалях. І, мусіць, толькі таму, што замала ім было дзеля гэтага месца. Возера дыхала холадам, і клопаты птушак, прынесеныя вясной, здавалася, зусім не турбавалі яго.

Нечакана ў небе пачуліся крыкі гусей. Яны ляцелі трыма клінамі. Я з дзіцячых гадоў не перастаю здзіўляцца іх высокай арганізаванасці ў палёце. Кожны ведае сваё месца ў жывым ланцужку, вытрымлівае пэўную дыстанцыю. Асабліва зайздрошчу важаку, яго здольнасці згрупаваць птахаў у адзіны клін, зручны ў палёце і бяспечны. Над возерам клін парушыўся. Зменшылася хут-

касць палёту — крылы птушак выгіналіся дробнымі чорнымі хвалькамі. Манатоннае пакрыкванне змянілася неразборлівым гагатаннем. Было відаць, як гусі паапускалі галовы й пільна ўзіраліся ў лядовую роўнядзь возера.

Ім, напэўна, хацелася як найхутчэй утапіць сваю стому ў чароўна-гойным блакіце азёрнай роўнядзі.

## ХМАРЫ-ПЛЯМЫ...

Быў час, калі зіма беззваротна страціла свае пазіцыі, а вясна яшчэ не ўсталёўвалася. Пахмурныя, шэрыя, нічым непрывабныя далягляды недарэчы стракацелі на панурых спінах пагоркаў. Пасярэдзіне лабяка пясчанай выспы насупленым брывом ускінулася вузкая палоска маладога хвойніку.

Прасёлкавая дарога, змучаная коламі машын, здавалася, скардзілася свету на свае пакуты, узняўшы пісягі-каляіны аж да самага небасхілу.

Зводдаль, па правы бок, цягнуўся неглыбокі закінуты роў. Я збочыў і пайшоў усцяж хісткага берага. Чародка парыжэлых леташніх чарацін з акунутымі ў халодную ваду надламанымі вяршалінамі-мяцёлкамі нагадвала пэндзлікі. І было такое ўражанне, што вялікі мастак-прырода вось-вось возьмецца за іх і распачне сваю спрадвечную справу абнаўлення зямлі.

Вада здавалася мёртвай. Але гэта толькі на першы погляд. У ледзяной празрыстасці цяплілася жыццё. Па дне прагульвалася сямейка трытонаў, якія час ад часу ўсплывалі на паверхню і, захапіўшы паветра, пагружаліся на дно. Цяжка пераварочваючыся з боку на бок, з іх браў прыклад і нехлямяжы жукплывунец. Па роўнай паверхні, бы на водных лыжах, хутка слізгала на доўгіх камарыных лапках вадамерка. Ішоў ёй на абгон маленькі чорны жучок — нёс яго, здавалася, нейкі бязгучна-імклівы рэактыўны рухавік...

Мне захацелася бліжэй пазнаёміцца з насельнікамі вады: зрабіў яшчэ адзін крок, але знячэўку штурхнуў нагою бутэльку, што ляжала ў траве. Сам ледзь утрымаўся на нагах. Бутэлька цяжка плюхнулася ў ваду, і праз нейкі момант на паверхні ўтварылася тлустая пляма і пачала разрастацца, нібыта навальнічная хмара. Гэта з бутэлькі выцек мазут...

Вадамерка на поўнай хуткасці ўрэзалася ў «хмарку» і рэзка збавіла ход. Крыху паблукаўшы ў нязвыклай каламуці, пачаў выбірацца з яе і чорны жучок. Не даспадобы прыйшоўся мазут трытонам і жуку-плывунцу. Неўзабаве ў мазутнай пляме і пад ёй не аказалася ніводнай жывой істоты.

Расчараваны, я адвёў позірк ад вады й паглядзеў у бок горада. Над дахамі дамоў плыла хмара дыму, крыніцай якой была заводская труба.

## «ЦЯПЛІЦА» ДЛЯ РЫБ

Палеткі ўжо скінулі з сябе цяжкія зімовыя кажухі, пагублялі белыя паясы, што вузкімі палоскамі снегу запалі ў меліярацыйныя канавы на тарфяніках.

Ручаі неслі халодную чыстую ваду ў неглыбокае возера. Снег над імі ў многіх месцах падтаяў, утварыліся стрэшкі, з якіх ныраў у ваду вясёлы капеж. Ён не палохаў дробных і шматлікіх рыбак-верхаводак. Але як толькі над вузкай палоскай вады з'яўлялася постаць чалавека, рыбкі спалохана мітусіліся, пабліскваючы срэбнымі брушкамі, і некаторыя з іх жывымі тарпедкамі ўрэзваліся у мяккія берагі, уздымаючы тарфяныя воблачкі.

Верхаводкам ненадоўга хапала сіл дужацца з плынню, таму яны часта давяраліся хвалям. Звычайна трымаліся чародкамі. Відаць, ім, нядужым, так было лягчэй адшукваць корм і хутчэй заўважаць небяспеку.

Маю ўвагу затрымаў цэлафанавы мяшочак, што расчыненым бокам ляжаў насуперак плыні, а верх кры-

ху ўзвышаўся над вадой. Прыгледзеўся — пад цэлафанавай «стрэшкай», своеасаблівай цяпліцай, нерухома стаялі тры верхаводкі. Можа, выпадкова патрапілі?

Выліваю ваду разам з рыбкамі ў ручай і апускаю мяшочак на ранейшае месца. Праз некаторы час тыя самыя тры рыбкі — большая, сярэдняя і маленькая — зноў паспяшаліся пад плёнку. І назаўтра мае знаёмыя не пакінулі абжытай кватэры. Што ж прывабіла іх у гэты схоў? Пэўна, вада ў цэлафане цяплейшая, чым у канаве. І не дзіўна — яна ў мяшочку не рухаецца, а «страху» мініяцюрнай «цяпліцы» награвае сонца. Не турбуе тут рыбак і мелкаводная плынь. Вось яны й грэюцца, набіраюцца сіл.

## УРАЧЫСТЫ ГАЙ

Зямля выслабанялася ад зімовых чар. Дрыжэла раніцамі ад холаду парыжэлым леташнім сіўцом, а ўдзень, імкнучыся сагрэцца, падстаўляла спіну пад сонечныя промні. І, каб хутчэй ачуняць, піла раставую ваду. Нараджалася вясна, а з ёй — абуджалася жыццё...

Лес здаваўся перасычаным вільгаццю: цяжка пагойдваў набраклымі вершалінамі, стрэсваючы долу буйныя халодныя кроплі. Яшчэ толькі бралася на вечар, а ўжо ў густым, пераважна сасновым лесе панаваў насцярожаны паўзмрок. Зялёны дуб-волат цяжка ўздыхаў, абдаючы сырасцю, цвіллю і тонкім духмяным пахам клейкавіны маладой лістоты. Вузкая сцяжынка ледзь праціскалася паміж дрэў, якія быццам імкнуліся засланіць ад яе неба.

Мой позірк затрымаўся на асіне, што двойчы абвіла сасну, вядома, не па сваёй ахвоце. У двух месцах ствол асіны ў розны час быў моцна пашкоджаны, надламаны. Відаць, у тыя нялёгкія моманты й падтрыма-

ла яе хвоя, што стаяла побач, не дала ўпасці. Вершаліна асіны ўсё ж такі змагла прарвацца да сонца скрозь густыя хваёвыя шаты. Зайздросная прага жыцця!

Змрок яшчэ больш гусціўся — за колькі крокаў ужо нельга было выдзеліць асобныя дрэвы. Я звярнуў рэзка ўправа і, здавалася, апынуўся ў святліцы. Грабавы гай нібы перанёс мяне ў світанак — такая яснасць і ўрачыстасць панавалі наўкола! Знізу светлай зялянінай і блакітам высвечваў дыван з зайцавага шчаўя і пралесак, зверху — акрываў шацёр з празрыста-зялёнай маладой лістоты граба.

Грабавы гай — даволі вялікая рэдкасць! Гладкія, цвёрдыя, пад колер сталі ствалы. Глыбока гафрыраванае зубчатае лісце, здавалася, толькі што пабыло пад нейкім казачна-чарадзейным прэсам. Дрэвы вылучалі святло, якое атрымалі ў спадчыну ад сваіх далёкіх продкаў, і гэтую празрыста-гойную святлістасць яны захоўваюць.

## НЯМА АПРАЎДАННЯ...

Ляснік абяцаўся быць апоўдні. Але прызначаны тэрмін мінуў: можа, забыў, ці затрымаў клопат больш важны, чым мой. На ланцугах захлыналіся брэхам два сабакі. Вартаўнікі... Я пасняшаўся знікнуць з поля іх зроку — завярнуў за рог хаты. Сабакі тут жа супакоіліся.

Нядаўна абшаляваны бок хаты выходзіў проста на вуліцу, на мурожыну. Да сцяны цяжка прывалілася масіўнай спінкай негабляваная лаўка...

Цень, прахалода. Вырашыў пачакаць. Прысеў.

Гарачы ліпеньскі дзень санліва перавярнуўся на другі бок. Побач па дарозе праімчалася машына. Паветра змяшалася з едкім, цёплым пылам. Стала ця-

жэй дыхаць. Але падзьмуў лёгкі вятрыска, і воблака пылу міжволі сплыло ў бок яловага лесу. Ён, густы, быў у двух дзесятках крокаў ад хаты.

Тут жа, на вуліцы, у зарасніку палыну і крапівы, ляжалі дровы, розныя будаўнічыя матэрыялы. Усё гэта было складзена наспех і абы-як. Задраўшы ўгару заржавелыя палазы, зарыліся ў зямлю капыламі яшчэ даволі новыя сані. З-за прысядзібных прысадаў выглядвалі стажкі мінулагодняга і сёлетняга сена.

На пагорку паводдаль павіскваў цыркулярнай гатар. Вось на цялежках выкацілі распілаванае бервяно. Нечакана пярэдняя цялежка саскочыла з рэек — канец бервяна вызлізнуў з ціскоў, і асляпляльна белыя дошкі, бы промні, веерам рассыпаліся наўскос рэек...

Я прыгадаў, што ў лесніка непадалёку, на ўзлеску, пасаджана бульба. Магчыма, акучвае ці скародзіць. Выйшаў за аколіцу. Так і ёсць. Збоч участка, з трох бакоў акаймаванага хвойнікам, стаялі калёсы. А за бурым канём, запрэжаным у барану, хадзіла жанчына, леснікова жонка. Я прыспешыў крок. Раптам аднекуль збоку вынырнула ласяня: нязграбнае, на высокіх тонкіх нагах, і па канюшынішчы запраставала да каня. Калі наблізілася бліжэй, спужана спынілася, нерашуча павярнула назад і трухам падалося ў лес. Напэўна, малое згубіла сваю маці. Якраз пад'ехаў на матацыкле ляснік. Імя яго рэдкае — Яўхім. Каржакаваты, недзе ўжо блізка да пенсійнага ўзросту, з палыселай галавой. Вочы, нават у ценю, увесь час прыжмураны.

Я пацікавіўся пра нядаўні пажар на тарфяніку, і ён з горыччу зазначыў:

— Трэба ж тарфянік так усмаліць... Адпачываючыя... Ды цешся сабе прыродай на здароўе, толькі зрабі ласку — не пакінь пасля сябе непатушанага вогнішча.

— Далі рады агню?

— Небяспечна, браток, і не пытайся... Утаймавалі, здаецца. На трэція суткі ледзь саўладалі. І во, здаецца, і не гарыць, а з-пад зямлі гарэнь чуваць — нешта ж курыцца там... Пажарышчам страшна ісці: то дрэва нечакана рухне, то, чаго добрага, сам правалішся...

Яўхім закончыў абганяць бульбу, завёз дадому акучнік і барану.

— Зараз на кані паедзем, — звярнуўся ён да мяне.— Тут непадалёку ёсць добры сухастой: на дровы, пад брыкет, у самы раз... У мяне там, побач, сена высушанае.

Некаторы час ехалі моўчкі. Калёсы нетаропка пераваліваліся па каляіністай лясной дарозе, глуха бухаючы коламі па карэннях.

— Што і казаць, не навучыліся яшчэ людзі як след паважаць прыроду, — ажыўлена праказаў Яўхім. — Вось тут непадалёк шашу цягнулі. Роўную, бы напятая струна. Так эканомней, значыць. Падмінала дарога старыя дрэвы... Думаў, што бярозавы гай абмінуць, пашкадуюць... Дзе там! Бульдозерамі з зямлёй змяшалі й нават на дровы не выкарысталі. План гарэў, вось як...

І вось мы спыніліся. Ляснік паказаў некалькі сухіх хвой, пасля задуменна прысеў ля свежага пня.

— Бач ты, быццам пласцінка! — захапіўся Яўхім. — Такі роўны зрэз... І гэтыя кольцы. От каб прайграць, га? Шмат чаго б паведаў гэты пень... Лядашчая баравуха была. І нехта ж, во, уходаў. І як я ні шукаў — канцы ў ваду.

У засені асадзіста-разгатага дуба Яўхім прысеў адпачыць. Закурыў. Правёў рукой па шурпатай кары й ціха-ўрачыста сказаў:

— Вось такому, як гэты, асілку, я, можна сказаць, жыццём абавязаны... Быў пачатак вайны. Адступалі

мы. Зброю і то не ўсе мелі. Як сёння помню — поле... Фашысцкія танкі. З'явіліся нечакана, мы нават акапацца не паспелі. Многія з нашых пад гусеніцы трапілі... І за мной адзін увязаўся, хоча жыўцом падмяць. Ляскоча ззаду, раве... Страшна. Адчуваю, сілы мае на зыходзе. Ногі падкошваюцца, вось-вось наваліцца ззаду... Як чую: «Сюды!.. Хутчэй!» Азірнуўся на голас — аж дуб таўшчэзны збоч ад мяне, а пад ім — старшына... Рукой махае — кліча... Я і мітнуўся за гэты дуб. І тут — кулямётная чарга... Паласнула акурат па камлі. Мне падалося, што дрэва застагнала. Во як! А тыя ж кулі прызначаліся мне...

Яўхім прытушыў недапалак, расцёр нагою. Пайшлі да балацявіны. Пацягнула сырасцю, цвіллю.

— Тут маё сена... Лічы, табе пашанцавала — бабровае селішча пакажу.

Неўзабаве сярод густога лазняку залюстраніла нешырокая рачулка. Я ступіў колькі крокаў і ледзь не праваліўся ў глыбокі, амаль вертыкальны лёх, на дне якога блішчэла вада.

— Вось гэта і ёсць бабровы ход, — пасміхнуўся Яўхім. — Тут тарфянікі, узровень вады высокі, і амаль ніколі не падае. Ну і выспаў стае, сухіх мясцінак, дзе бабры й жывуць у норах... Таму хатак не робяць. Аднойчы ў вельмі засушлівае лета, калі вады паменела, бабры перагарадзілі рэчышча плацінай... Гэтая рачулка якраз ля нашага лесагадавальніка працякае. Памятаецца, вырошчвалі мы надта каштоўныя саджанцы. Паліваць іх трэба было рэгулярна. Неяк раніцай прыходзім — абмялела рэчка: ледзь па дне вада сочыцца. Пайшоў, гэта, я ўгару... Ага. Бачу — гаць. Давялося разабраць яе крыху збоку і пусціць ваду. Тройчы бабры рамантавалі гаць, але ўрэшце мусілі ўступіць людзям — паглыбілі свае норы.

Нагрузілі воз, як павезці, балотнай асакі. Вярталіся дадому прыцемкам. І ўжо на выездзе з лесу не-

падалёку ад леснiковай сядзiбы, на нейкi момант на дарогу выбегла ласяня. Зiрнула ў наш бок i тут жа знiкла ў гушчары й цемене.

— Нядаўна нехта ласiху застрэлiў... — сумна паведамiў ляснiк. — Кабылу на ноч я звычайна выпускаю на лужок. Вось ласяня i падыходзiць да яе. Сумуе па мацi. Так i будзе бадзяцца, пакуль на браканьера цi ваўка не патрапiць...

Мяне вельмi ўразiла, што чалавек (браканьер) i воўк былi пастаўлены побач. Калi ваўка можна апраўдаць — ён змагаецца за месца пад сонцам, то чалавека...

Уласна, а за што яна змагаецца, гэтая вечна ненаедная, карыслiва-пажадная iстота?

## ВАВЁРЧЫНА СТАЛОЎКА

Нiзовiну запаланiў падлесак. Пераважалi лiсцёвыя дрэўцы й кусты арэшнiку. Толькi сям-там спаважна пагойдвалi голлем адзiнокiя ялiны. Высокая саломiстая трава, месцамi амаль упоравень з кустамi, пад подыхам ветру, расхiнаючыся, адкрывала часам яркiя агеньчыкi ягад калiны.

Восень ужо як мае быць кранула сваiмi фарбамi лiстоту.

Калiсьцi тут шумеў лес, аб чым сведчыла шматлiкае шырокае пнёўе: выбеленае, адшлiфаванае дажджом i ветрам. На пнях, да якiх блiзка падступалi арэхавыя кусты, я заўважыў шкарлупiнне арэхаў... Падобна, натрапiў на вавёрчыну сталоўку! На адным пнi было колькi цэлых арэхаў. Узяў два спараныя цалкавiкi ў спадзеўцы, што зараз паласуюся. Раскусiў — пустыя! І сярод астатнiх, пакiнутых цэлымi на пнях, не знайшоў анiводнага прыдатнага да яды. І нямала здзiвiўся здольнасцi вавёрак, не раскусваючы, распазнаваць пустыя арэхi.

## АДСТАЛА

Хвалі клінам збіліся ў дробны зыб. Гусі замітусіліся, узнялі галас, хоць і без таго іх нават спакойнае гагатанне кантрастуе з рытмічна-меладычным жураўліным покрыкам. Але гэты раз гусіны розгалас быў настолькі рэзкі й бязладны, што прахожыя пачалі міжволі ўглядацца ў захмуранае восеньскае неба. Складвалася ўражанне, што гусі нечым занепакоеныя, і гэта перашкаджае ім нармальна працягваць палёт. Нарэшце клін крыху аформіўся. Я ўважліва прыгледзеўся. Ну і ну — качка-крыжанка атакоўвала левы ланцуг гусінай чарады!

Крыжанкі адрозніваюцца ад звычайных дзікіх качак буйнымі памерамі. Але сярод гусей яны выглядаюць прыкметна меншымі й больш рухомымі.

Вось у адным месцы гусіны строй парушыўся — утварыўся невялікі прамежак. Качка імкліва накіравалася туды (хуткасць палёту ў яе большая, чым у гусей) і заняла яго. Але тут жа ланцужок ушчыльніўся, бы віткі сціснутай спружыны, і выштурхнуў няпрошаную спадарожніцу. Так паўтаралася ці не тройчы...

Відаць, крыжанка адстала ад сваёй чарады й цяпер хацела далучыцца да гусей, каб разам працягваць нялёгкі шлях, але тыя настойліва адпрэчвалі яе.

Тым часам гусі аддаляліся. Кожны новы парыў ветру, насычаны імжой, быццам сціраў з небасхілу ланцужкі гусей, што віднеліся ўсё смутней і смутней. Нарэшце і зусім зніклі.

А мне хацелася верыць, што гусі ўсё ж прымуць качку ў сваю чараду. Дый сама крыжанка, пэўна ж, не сумнявалася ў гэтым. Галоўнае — праявіць настойлівасць, паказаць свой спрыт і апантанасць.

## СУСЕДЗІ

Яны аблюбавалі кустоўе акацый, шыпшыны й лазняку, што велічэзнымі вожыкамі заляглі на спачын паміж шашой і чыгункай. Нізовіну аж да самых агародаў палавініла канава. Яна зарасла чаротам і асакой, на берагах і прагалінах паміж кустамі непадзельна гаспадарылі крапіва і ваўчкі. Нават у самае спякотнае лета адсюль цягнула сырасцю, прэлым лісцем і крынічнай прахалодай.

Гнёзды іх амаль побач — па-суседску. Вароны ўладкавалі сваё на разгалістай акацыі, а сарокі — троху ніжэй, на верхавіне лазовага куста.

Такое суседства здзіўляла. Як вядома, вароны й сарокі бессаромна забіраюцца ў чужое жытло і не супраць паласавацца не толькі яйкамі, але і птушанятамі.

Першымі тут пасяліліся сарокі. Праз нейкі час у будаўнічых клопатах замітусіліся вароны. Суседзі часта «сварыліся». Вароны натужна, да забыцця каркалі, што нават пер’е на галовах тапырылася. Сарокі ж, гарлапанячы, здавалася, больш націскалі на гук «ча», выкрыкваючы яго на розныя лады.

Першымі недавер да міралюбства суседзяў выказалі сарокі. Калі пачалася кладка яек. Яны не пакідалі без нагляду свайго гнязда ні на хвіліну. Такую ж тактыку ўзялі на ўзбраенне і вароны. Але з цягам часу ля гнёздаў пацішэла, паступова паміж птушкамі наладжваліся сапраўды суседскія адносіны. Я нават стаў заўважаць, што вароны й сарокі, калі адлучаюцца ад гнёздаў, даручаюць іх ахову суседу ці суседцы.

Аднойчы ў пачатку лета мяне спыніў утрапёны лямант сарок, якія то імкліва пікіравалі з дрэў уніз, то нізка павісалі над кустамі у нейкім неверагодным паветраным танцы.

Пад гнёздамі пазвоньвала ланцугом карова. Відаць, так дапяклі сляпні й мухі, што рагуля сарва-

лася з прывязі й кінулася шукаць паратунку ў прахалодзе кустоў. Калі я падышоў бліжэй, тут жа ўсё і зразумеў: слабыя на крыло птушаняты варон рызыкоўна пахістваліся на галінках лазовага куста... Адзін варанёнак упаў на зямлю, ляжаў пузам угору і ўсё ніяк не мог стаць на ногі. Канешне ж, карова пазбродавала — успалашыла і варанятак, і сарок...

Вароны-бацькі, напэўна, паляцелі здабываць корм, а сарокі, як відаць, непакоіліся за суседскіх нашчадкаў.

## МЕСЦА ПАД СОНЦАМ

З надыходам вясны чалавек вельмі востра адчувае сваю роднасць з прыродай. Ён радуецца і першаму дажджу, і кволым парасткам травы, і асабліва — прылёту птушак.

Неяк вясной я наведаў бацькоўскі дом, каб на колькі дзён забыцца на рэдакцыйны клопат і троху папісаць. Мяне сустрэў апусцелы сад. Напаўсухая дуплістая груша з надламанай вершалінай і старая разгалістая яблыня сіратліва прытуліліся да страхі суседскага хлеўчука.

Кожную раніцу я пачаў заўважаць, што на іх завітваюць дзве пары шпакоў. Яны сядзелі нерухома, падоўгу і маўкліва. І я прыгадаў, што і на грушы, і на яблыні некалі былі шпакоўні. Мне захацелася зноў ашчаслівіць птушак. Дошак дома не знайшоў, а вось дзве фанерныя скрынкі з-пад пасылак якраз прыйшліся дарэчы. Мне падалося, што адтуліна ў адной шпакоўні атрымалася вельмі шырокая, таму ў другой зрабіў вузейшую. Гэтую, з вузейшым лазам, прыладзіў на яблыні, а з шырокім — на грушы.

Праз колькі дзён пацікавіўся, як адчуваюць сябе навасёлы. На грушы сядзелі шпакі й весела пасвісталі. Яны па чарзе ныралі у шпакоўню і, калі вы-

лазілі навырунак, задаволена церабілі дзюбкамі пер’е, атрэхваліся, і віталі ўзыход сонца шчаслівым шчабятаннем.

Зусім інакш паводзілі сябе іх суседзі. Тыя вельмі рэдка заглядалі ў шпакоўню, а калі здаралася такое, дык не радаваліся — моўчкі пазіралі ў мой бок, быццам нечага чакалі ад мяне.

Відаць, я ўсё ж не дагадзіў гэтай парачцы. Але што не так зрабіў?.. Усё высветлілася праз тыдзень. На яблыні было вельмі шумна: ваяўніча нахохленыя вераб’і атакавалі шпакоўню. Адзін шпак сядзеў побач са шпакоўняй, як вартавы, другі быў унутры. Вераб’і наскоквалі, нібы маладыя пеўні. Але шпакі вялі сябе паважна, на правах гаспадароў. І толькі зрэдку, але даволі рашуча, ішлі ў наступ на вераб’ёў, і тыя тут жа рассыпаліся па суседніх дрэвах. Ды вераб’ёў прыкметна большала, і шпакам стала цяжэй адбівацца. Здавалася, перамога «шэрых» забяспечана. Яны абляпілі шпакоўню, нават сцішылі свой гвалт. Шпак-вартавы не кінуўся ў бойку — некуды паляцеў. А са шпакоўні час ад часу пагрозліва вытыркалася рухомая галоўка шпачыхі... І раптам — чорнаю хмарай навалілася на яблыню чарада шпакоў. Абляпілі дрэва густа — так, што вераб’і, быццам пераспелыя яблыкі, умомант пападалі долу. Шпачыха з цяжкасцю праціснулася праз вузкую адтуліну.

Цяпер я ўсё зразумеў. У той час, як шпакі неахвотна «абжывалі» сваё новае селішча, вераб’і не марудзілі, бо разумелі, што навасёлам яно не прыдатнае, і крадма насілі пер’е, салому і розны друз, выкарыстоўваючы для гэтай работы кожную хвілінку, калі шпакі адлучаліся. Вераб’і дзейнічалі нахабна: пакуль што-якое, дык яны й гняздо зробяць, а за свой кут і пазмагацца можна.

Спрэчку неабходна было вырашаць на карысць шпакоў, для якіх і прызначаўся домік. Я ўзяў нож,

паставіў драбіны й палез на яблыню. Расшырыў лаз, злез, схаваўся за рог хлява і пачаў назіраць. Прыляцелі шпакі. Дзіва — па чарзе сталі ныраць у домік і, відаць, засталіся задаволеныя, бо пасля агледзін успомнілі раптам і пра свае песні.

Здавалася, для навасёлаў пачалося шчаслівае жыццё. Але дзе там! Вераб'і зноў пайшлі ў наступленне. І вось, калі шэрыя задзіры знаёма абляпілі шпакоўню і ўсчалі галас, шпачыха разышлася не на жарт — пачала рашуча выкідваць астаткі вераб'інага гнязда. Уражаныя, вераб'і знялі блакаду і больш ужо не даймалі шпакоў...

І што ж? Вераб'ёў асабліва не пакрыўдзіш — за маю паслугу шпакам гэтыя шэрыя хітруны мне такую кару ўчынілі: заснавалі сваё гняздоўе за шалёўкай акна. І якраз таго, пры якім стаіць мой пісьмовы стол. Чарты крылатыя знарок — ну пэўна ж! — моцна шумелі кожную раніцу. А калі дачакаліся птушанят, і зусім няўрымсныя сталі: балонкі акна аж звінелі ад іх пісклява-дакучлівага ціліўкання. Але давялося змірыцца, бо кожнаму павінна быць месца пад сонцам.

## ГАЛУБІНАЯ ПРАФІЛАКТЫКА

У гэтую пару восень звычайна называюць позняй. Яна вельмі хоча быць падобнай да зімы, таму ў апошнія дні свайго існавання занадта лютуе. Маўляў, глядзіце, людзі, я не горш спраўлюся, дык навошта зіма вам?!.

Парывісты вецер, насычаны халодна-дробнымі крупінкамі пылу, балюча хвастаў па твары. А галубам хоць бы што — яны купаліся ў збочдарожнай лужыне. Вось адзін з іх энергічна залапатаў крыламі па вадзе, распушыў хвост, пасля страпянуўся, раскідваючы па баках дробныя пырскі, і пачаў чысціць дзюбай пер'е.

Так рабілі й астатнія.

Тыя, што скончылі купанне, уселіся на даху бліжэйшага дома і працягвалі прыхарошвацца...

Я заўважыў, што ў лужыне, якую аблюбавалі галубы, вада была ўперамешку з нафтапрадуктамі — густая, шыза-чорная масляная плёнка зіхцела на сонцы. Мне стала дзіўна — побач лужына з чыстай вадой, а галубы абралі менавіта гэтую, забруджаную. Відаць, з прафілактычнай мэтай.

## КАНТРАСТЫ

Цёплым чарадзейным дажджом пралілося вясновае неба, і над вёскай закалыхаўся зялёны пажар. Грудзі нямелі ад захаплення, удыхаючы гаючы бальзам чысцюткага, як святло, паветра.

Я бадзёра ішоў па выгане, ужо мінаў апошнюю хату, як нечакана амаль побач падаў голас салавей. Ён быццам заклікаў звярнуць на яго ўвагу. З'яўленне птушкі мяне не здзівіла — побач невялікае возера, правы бераг якога паўмесяцам акаймляў даволі высокі густы хмызняк. Пачаў пільна ўзірацца — намерыўся на свае вочы ўбачыць маленькага артыста. Ды вось жа ён — на крывым прутку дроту, што вытыркаўся з грудка ламачча. Зрабіў неасцярожны крок — і салавей знік у суседнім садзе.

Я падышоў да «падмосткаў», дзе толькі што выступаў птушыны маэстра. У маёй душы бунтавалі дзве процілегласці: салавей і куча ўсялякага смецця, высыпанага на выкарчаваную з карэннямі яблыню — пачварнае праяўленне чалавечай дзейнасці. Вы скажаце: усплёск такой неахайнасці — з'ява не выпадковая. Так, але ж і чалавек у сваім канкрэтным праяўленні таксама не выпадковая з'ява. Сэнс яго жыцця і заключаецца ў тым, каб даказаць, што яго, Іванава ці Сцяпанава, з'яўленне на свет не зігзаг лёсу. І менавіта з клопату аб

прыродзе, з гэтага свяшчэннага абавязку і пачынаецца доказ неабходнасці на зямлі кожнага з нас.

Чалавек мае схільнасць апраўдваць свае ўчынкі: сад запушчаны, калгасны... А гэта — бадай што нічыйны, без прыгляду. Можна, безумоўна, спрачацца аб мэтазгоднасці такога апраўдання, але бясспрэчна адно — прыроду трэба шанаваць, бо толькі разам з ёй чалавек пачувае сябе Чалавекам.

## НЕСПАДЗЕЎНАЯ СУСТРЭЧА

Лес, што асядлаў аддаленую выспу, палавініў барвовы дыск сонца.

Я падышоў да толькі што засеянага поля. Сям-там на раллі значылася насенне аўса і гароху. І тут я ад неспадзеўкі знерухомеў і прытаіў дых — недзе за паўсотню крокаў па полі важна расхаджваў даволі рэдкі ў апошні час лясны прыгажун — глушэц. Буравата-чорнае покрыва птушкі ажно ільснілася на ледзь прымерклых ужо сонечных промнях...

Я ўпотай любаваўся жывым цудам прыроды. Але маё замілаванне гэтай дзівоснай птушкай зацьміла нечаканае пытанне: «Чаму глушэц, жыхар глухіх хваёвых лясоў, апынуўся на полі?!. Ён хіба галодны?..»

І тут я, нібы адбіваючыся ад рою пчол, энергічна замахаў рукамі й пусціўся з усіх ног у бок птушкі, крычучы:

— Акыш з поля!.. Ляці адсюль, ляці... Тут — яд, хімікаты... Памрэш!..

Глушэц павярнуўся ў бок лесу і, прабегшы колькі метраў, спрытна адарваўся ад зямлі — паляцеў. А я супакоена падумаў: «Вось і добра — ляці на свой корм, лясны...»

Птушка пакрыляла ў бок балотца, што цудам захавалася на ускрайку зрэджанага і надта «ачалавечанага» бору.

Мне стала сумна. Месцамі прыстання глушца адвеку былі спелыя і пераспелыя бары: ці то сухадольныя, ці то балоцістыя, але мала кранутыя чалавекам. Тут птушка адшуквала прытулак і патрэбны спажытак, а ў тым баку, куды паляцеў глушэц, такой мажлівасці для яго не ўяўлялася. Таму ён і падсілкоўваўся на полі. Стрэцца на палетку з глушцом мне надаралася неаднойчы.

# НАРЫСЫ

# УСПАМІНЫ

## ПАЦІЧОЎСКІ МЕРЫДЫЯН

У саўгас імя Купрыянава выпала трапіць бадай што апоўдні. І ўсё ж вадзіцеля малакавоза Яўгена Віктаравіча Фядотава неспадзявана заспеў у канторы.

Невысокі, хударлявы. Хада рэзкая, імклівая. Засмужаны твар. У глыбока пасаджаных вачах улоўліваліся вясёлыя іскрынкі. Загаварылі пра яго бацьку, і ён нягучна, але даволі ўзнёсла, як аб нечым важным, значным для сябе, сказаў:

— А як жа, бацьку добра помню... Цяга да тэхнікі ў мяне — ад яго.

Я дастаў два фотаздымкі далёкіх дваццатых гадоў. Сур'ёзныя, засяроджаныя твары маладых камунараў. Многім з гэтых юнакоў і дзяўчат не было тады й дваццаці.

Яўген Віктаравіч уважліва разглядваў калектыўны здымак, які, трэба сказаць, захаваўся надзіва нядрэнна.

— Не, тут майго бацькі няма, — заключыў ён.

— А на гэтым?.. — падаў я другі здымак, не такі выразны, як першы. На ім шэсць камунараў. Адзін з іх сядзіць, астатнія — стаяць супроць былога панскага свірна.

— Ёсць... Вось ён, стаіць... Другі злева, — голас Яўгена Віктаравіча пацішэў, рука, што трымала здымак, прыкметна ўздрыгвала. Праз шчэць няголенага твару, бы чарніла праз прамакатку, густа праступіла чырвань. Яго бацька — чубаты хлапчына з яшчэ зусім юным, але выразна мужным тварам.

— Скажыце, адкуль у вас гэтыя фотаздымкі? Нават у мяне такіх няма.

— У 1974 годзе я сустракаўся з вашым бацькам... Ён і даў мне іх.

— За год да яго смерці.

— Я магу вярнуць... Але ці не лепей перадаць гэтыя рэліквіі ў мясцовую школу? Там, здаецца, музей ствараюць.

— Калі так... Я не супраць.

Ён замоўк і нечага адно перамінаўся з нагі на нагу. Я таксама маўчаў. Паўза яўна зацягвалася. І я сказаў:

— Мне мала вядома пра вашага бацьку з таго часу, як паслалі яго вучыцца на механізатара.

— Вывучыўся, вярнуўся і працаваў трактарыстам у калгасе, — ажывіўся мой суразмоўца. — Накіравалі ў партшколу, якую не паспеў закончыць — пачалася вайна... Ваяваў. Быў цяжка паранены. Доўга лячыўся. Пасля працаваў старшынёй калгаса ў Пятровічах, у Забалоцці. Нейкі час узначальваў трактарную брыгаду ў Верхменскай МТС...

І нахлынулі на Яўгена Віктаравіча ўспаміны. Здавалася, ён расказвае не дзеля мяне, а лучае ўзбуйніць і высвеціць у сваёй памяці вобраз дарагога яму чалавека.

— Бацькава брыгада была лепшая ў МТС. Трактароў не хапала, і з гэтае прычыны даводзілася працаваць і ноччу. Рабілі ў дзве змены. Зламаецца трактар — рамантавалі яго проста ў полі. Зімой бацька цэлымі тыднямі прападаў у МТС, дахаты вяртаўся позна. Дабірацца ж было няблізка, ажно з Пацічова. Вельмі ганарыўся ён сваёй прафесіяй. Часта любіў паўтараць: «На трактары, сынок, наша ўлада трымаецца». Успрымаў я тады гэтыя словы больш сэрцам, душой, вымяраючы іх сэнс бяспрыкладнай самааддаласцю бацькі.

Успаміны пра бацьку не пакідалі Яўгена Віктаравіча ажно да самага дому. Вось ужо і яго Пацічова. Паставіў машыну. Зрабіў неабходнае па гаспадарцы, узлокціўся на плот і стаў глядзець паўзверх агародаў — на кароўнікі й кузню, дзе некалі й абаснавалася

камуна. Ён застаў яшчэ рэшткі былых панскіх пабудоў, якія з'яўляліся сведкамі тых незабыўных падзей. Ім авалодала непераадольнае жаданне пайсці туды...

Прыпыніўся ля кузні. Сутоньвала. Летні надвячорак наплываў няспешна, загадкава. За канавай нехта касіў. Аднекуль прыляцела двое буслоў. А зусім паблізу ў прырэчных кустах настройваўся на песенны лад салавей. У наваколлі бадай што пачала ўсталёўвацца надвячэрняя ціша, якраз тая самая, што пераходзіць пасля ў цьмяную вусціш гармоніі ночы.

Адно ўспаміны не адпускалі, па-ранейшаму даймалі Яўгена Віктаравіча. Ён таропка праставаў далей і, бы ў сне, яму трызніўся бацька... Віктар Аляксандравіч Фядотаў быў карэнным жыхаром вёскі Пацічова. З ранняга дзяцінства батрачыў на пана — пасвіў каровы, давялося таксама гнуць спіну і на палетках мясцовых сялян-замажэнцаў, якіх пасля сталі называць кулакамі. Спазнаў ярмо розных павіннасцей, накшталт гужпадаткаў ды ўсялякіх іншых дзяржаўных пабораў...

Рос ён жывым, працавітым хлопцам. Павевы новага жыцця з цяжкасцю пранікалі ў глухія мясціны. Часам, праўда, пакалечаныя салдаты, што вярталіся з фронту, даносілі да аднавяскоўцаў тое-сёе з падзеяў віхурнага часу. З адным з такіх салдат, які быў родам са Смаленшчыны, і сышоўся Віктар. Доўгімі зімовымі вечарамі той расказваў аб рэвалюцыі, пра Леніна. Аднойчы прынёс ён і такую вестку, што ў некаторых вёсках ужо створаны камуны, у якіх людзі жывуць вялікай дружнай сям'ёй. Усё заробленае дзеляць пароўну. Паміж імі — лад, павага, таварыскасць...

Словы такія, бы зерні, кінутыя ва ўрадлівую глебу, буйна прарасталі ў свядомасці юнака. Ён усё часцей стаў задумвацца над тым, як выйсці з кулацкай кабалы, як змяніць існуючае жыццё. І выпадак дапамог яму ў гэтым.

Халоднай снежаньскай раніцай 1926 года клопаты па гаспадарцы паднялі Віктара на досвітку. Якраз калі

ён увіхаўся ля студні, браў ваду, паблізу прыпыніліся сялянскія сані. На іх сядзелі трое незнаёмых хлопцаў. Апранутыя былі пераважна ў вайсковае адзенне, з мноствам лапікаў, скрэмзаных грубымі няроўнымі швамі. На маладых, не па гадах сур'ёзных тварах застыў адбітак нейкага важнага клопату, што і рабіла невясёлых паязджанаў амаль дарослымі.

— Вось і першага пацічоўца сустрэлі... — азваўся возчык. — З поўнымі вёдрамі — добрая прыкмета... Здарова!

— Дзень добры...

— Скажы-тка ты нам, браток, дзе тут у вас харомы панскія?!.

Віктар няпэўна махнуў рукой у бок лесу:

— Там...

— Адсюль не відаць, — заўважыў другі.

Хлопцы як не паўвядра выжлукцілі, пахвалілі ваду — маўляў, смачная! — і возчык запрапанаваў Віктару:

— Сядай... Пакажаш.

Віктар аднёс вёдры на падворак, вярнуўся і сеў у сані. Адразу сталі знаёміцца.

— Скуратоўскія мы, — сказаў той самы, што за возчыка. Быў ён крутаплечы, нос падобны на бульбіну, шырокі, вочы пранізліва-насмешлівыя. — Ёсць такая вёска — Скураты... Чуў?.. За Смалявічамі, у бок Мінску. Ну? Дык назаві сябе, першы пацічовец.

— Фядотаў... Віктар.

— Пётра Чыкун, — ахвотна ішоў на размову возчык. — А вось ён, — паказаў на суседа, даўгавязага з бледным летуценным тварам, — Яўхім Воўк.

— Міхась Ляховіч, — адгукнуўся і трэці, чарнявы.

— Пра камуну чуў што-небудзь? — Чыкун лёгка сцёбнуў пугаю каню па крыжавіне.

— Чуў...

— Вось мы й прыехалі, каб арганізаваць у вас камуну.

Віктар не верыў сваім вушам — ад радасці так рэзка павярнуўся, што ледзь не выкуліўся з саней.

— А вы не маніце?.. Пабажыцеся.

— Бач ты яго — у Бога верыць!.. — бледны твар Яўхіма хапіўся чырванню. — Мы ўсе тут бязбожнікі... І табе раім забыць на царкву, калі не апрыкла на кулакоў ішачыць. Кулак з папом заадно — гэта ж самыя прагныя міраеды-эксплуататары, варожы клас. А Бог — ён такі: беднага шкадуе, а багатаму грахі даруе. Карацей, таўчэ багач бедняка і ў хвост, і ў грыву, а Божанька вочы заплюшчыў і пасопвае сабе пад нос, віфліемскіх красуняў у сне бачыць...

— Мне ўсё апастылела тут — жыцця новага хочацца, справядлівага! — Віктар глядзеў Яўхіму ў вочы. — Я, калі вы не супраць, буду памагаць вам.

— Вось, вось... Значыць, з намі заадно?

— А з кім жа яшчэ?!

— Трымай! — Яўхім пацісснуў Віктару руку. — Лічы сябе, таварыш Фядотаў, першым камунарам.

— Ну і Яўхім! — галасна выгукнуў Чыкун-возчык і засмяяўся амаль як дзіця — непасрэдна, шчыра.— Гэта ж трэба — з ходу сагітаваў хлопца! — І — да Віктара: — Віншую. Ты сапраўды першы камунар. Ва ўсе спіскі ўнясем тваё прозвішча.

Няспешна, азіраючыся па баках, хлопцы падняліся на ганак памешчыцкага дома. З цяжкасцю адчынілі дзверы. Увайшлі. Дыхнула гулкай астыласцю вялікіх пакояў. Праз разбітыя вокны са свістам урываўся сцюдзёны вецер. Ён шкуматаў на сценах абрыўкі шпалераў, барабаніў ацалелымі рамкамі ад партрэтаў. На месцы некалі пагляднага каміна грувасцілася ладнаватая крушня бітае цэглы. Пустэча пакояў, іх няўтульнасць і насцярожаная вусцішнасць міжволі выклікалі дрыжыкі, станавілася зябка і тужліва на сэрцы.

— Здаецца, месца нядрэннае, — перарваў маўчанне спакойны голас Пётры Чыкуна. — Галоўнае, ёсць дах над галавой і зямля панская...

— З чаго пачынаць будзем? — Яўхім Воўк гатовы быў адразу ж брацца за справу.

— А за якія шышы ўсё гэта рамантаваць? — у голасе Міхася Ляховіча чуліся адчай і трывога.

— Ну, што вы такія панылыя?!. Возьмем у дзяржавы грошай у крэдыт, — Чыкун трымаўся па-ранейшаму спакойна — гэтым бадай і выдаваў старэйшым за астатніх.

— Шырэй адтапырвай кішэню! — абыякава выгукнуў Ляховіч. — Хто мы такія?

— Пазыку нам дадуць! — даволі ўпэўнена сказаў Чыкун. — Гэта ж не якая там прыватная, а дзяржаўная гаспадарка... Камуна! — Вочы яго палымнелі. — Арганізаваўшы камуну, мы тым самым пакажам тутэйшым людзям прыклад, як трэба рушыць стары свет і ствараць справядлівы лад жыцця, заснаваны на роўнасці й братэрстве. Мы стаім ля вытокаў новага грамадства, савецкага. І не нам, сынам батракоў, баяцца цяжкасцей! — Чыкун наблізіўся да Віктара. — Галоўнае — не адступіць, не спасаваць перад нягодамі. — Нейкі час стаяў моўчкі. З хлопцаў таксама ніхто не азываўся. — Дык вось, — зноў прарвала яго, — возьмем крэдыт не менш за тысячу... Заўтра ж еду ў райвыканкам. Не дадуць — у Цэнтральны Камітэт камсамола звярнуся! Адступаць нам ужо няма як — свайго абавязкова даб'емся!

Хлопцы выйшлі на вуліцу. Вёска, ахутаная ранішняй смугой, маўчала загадкава, здавалася апусцелай і наскрозь прамерзлай, роўна памешчыцкі дом. Але будучых камунараў саграва́ла думка, што ў гэтай звычайнай вёсцы жывуць і тыя, хто таксама скіруе на дарогу новага жыцця, пойдзе з імі поруч. Адзін з іх ужо зрабіў першы крок.

Недзе праз гадзіну хлопцы ўзялі кірунак на Смалявічы. Ім не цярпелася хутчэй распачаць задуманую справу.

Старшыня Смалявіцкага райвыканкама таварыш Жук уважліва выслухаў Чыкуна і сказаў:

— Не спяшайцеся... Камуну вы абавязкова створыце, але, шчыра кажучы, я паверу ў гэта толькі тады, калі ў вас будзе надзейны паручыцель.

— Дзе ж нам яго, такога, знайсці — надзейнага? — захваляваўся Чыкун.

— Паспрабуйце звярнуцца ў Мінск, у ЦК камсамола... Магчыма, там вам і дапамогуць.

...У кабінет загадчыка аддзела Цэнтральнага Камітэта ЛКСМ Беларусі Платона Галавача зайшлі трое: Пётра Чыкун, Яўхім Воўк і Міхась Ляховіч. Рослыя, статныя юнакі. Загадчык — таксама яшчэ даволі малады, сухарлявы, сярэдняга росту. У галіфэ, белых бурках і ваенным кіцелі. Нетаропка і доўга задаваў Чыкуну пытанні. Той адказваў. Часам хтосьці з яго каманды таксама ўмешваўся ў размову. Загадчык слухаў, ківаў галавою. Потым зноў звяртаўся да Чыкуна — распытваў, удакладняў, даваў парады.

— Так і быць, хлопцы, — Платон Галавач падняўся і выйшаў з-за стала. — Пераканалі — паручаюся за вас. Але — не падвядзіце. Справа нават не ў грашах, якія вы атрымаеце, а ў чалавечым гонары, сумленні. З сённяшняга дня — вы не проста камунары, вы — змагары за новую вёску. І каб вас там не абрабавалі — атрымаеце зброю... Вам яе дадуць у міліцыі. Значыць, кажаце, паспелі пазнаёміцца з былым памешчыцкім домам? Няблага. І райкам камсамола, думаю, правільна параіў вам узяць участак на колішняй памешчыцкай сядзібе. Гэтую зямлю Савецкая ўлада аддала ў часовую арэнду заможным сялянам. Вядома, арандатары будуць супраць... Але зямельцы нашай трэба надзейны гаспадар. Здаецца, бліжэйшы ваш сусед — саўгас «Шыпяны»? Дык вось, рабочыя вам на першым часе дапамогуць: насенне атрымаеце, сеялку, плуг, каня... А далей — усё ад вас залежыць, разжывайцеся самі. І запомні-

це: асноўная апора — мясцовая моладзь... Смялей вырывайце батракоў з кулацкіх лап. І вось яшчэ што — гэта важна: на зброю не спадзявайцеся... Хіба толькі ў крайніх выпадках. Слова — мацней за наган.

Пётра Чыкун і яго кампаньёны ўважліва слухалі Платона Раманавіча, ва ўсім пагаджаліся з яго довадамі й прапановамі. І пачуваліся шчаслівымі, бо нарэшце-такі можна будзе па-сапраўднаму ўзяцца за арганізацыю камуны. Ім, першапраходцам, паверылі. А гэта — бадай галоўнае ў іх пачыне. Давер яны апраўдаюць.

Калі бацька даведаўся аб намерах Віктара, заўпарціўся і стаў адгаворваць:

— Сынок, ну навошта табе гэтая камуна? — у голасе роспач і крыўда. — У нас, дзякуй Богу, ёсць шматок зямлі. Вось і будзем трымацца яго... Мне засталося жыць нямнога. Табе давядзецца карміць сям'ю. Вядзі сабе паціху гаспадарку. Пакуль яшчэ магу, і я падсоблю...

— Не хачу я так жыць, — рашуча заявіў сын. — Досыць, пачну ладзіць новае жыццё — свабоднае, незалежнае ад кулакоў. Лепш, тата, адпусці мяне без крыку, па-добраму, бо ўсё роўна не ўтрымаеш!

— Ну... Ідзі сабе... Ідзі! Бачыш, не крычу... Але нічога ў пасаг не дам: у чым стаіш, у тым і адпраўляйся... Апамятаешся, ды будзе позна.

Рэзка рыпнулі дзверы — Віктар выбег на вуліцу. Удыхнуў свежае паветра раз, другі. Супакоіўся. Так, іншага ён ад бацькі й не чакаў. І добра, што размова адбылася. Ажно лягчэй стала — скаціўся камень з душы. Не, крыўды ў яго не было на бацьку. Стары, бач, паміраць сабраўся, бо ўжо не ў сілах перажыць новыя выпрабаванні. Не дзіва — столькі праліў поту, сцярпеў здзекаў, каб умацаваць, хоць і невялікую, але сваю гаспадарку. А тут яму кажуць: «Гэта ўжо не тваё, а — наша, калектыўнае!» Такое супярэчлівае яго ўяўленню паняцце аб укладзе жыцця. Іншая рэч, калі ўсялякія там пе-

рамены не закранаюць цябе непасрэдна. Дык не ж — уласны сын на ражно лезе, дамагаецца вольнай жыткі! Што і казаць, і сам ён, бацька, ніколі не быў супраць справядлівага ладу. Ды не ўяўляў яго такім. Саветы перакроілі не толькі межы — праламілі душу селяніна... Дзіра ў душы, вялікая. І там цёмна. І хочуць гэтыя лахцубары, камуністы, запаліць лямпачку Ільіча, і не толькі ў горадзе ўсе куточкі высвеціць, а таксама і ў сяле... Ну так, бяруцца камуністы ўсё калюча-мулкае сцерці з душы селяніна. Выграбці й выкінуць на сметнік гісторыі. Ды хто ведае, што лішняе там, у сялянскай душы, а што патрэбнае?.. Спалохаўся стары, пераляканўся. Вельмі ж адрозны ад звычнага, стагоддзямі ўсталяванага парадку, гэты новы лад, савецкі. Дужа ж ён нейкі жорсткі й непрадказальны.

Віктара ж непакоіла пакуль бадай што адно: а калі яго ўсё ж падманулі, і ніхто не збіраецца засноўваць у панскім памесці камуну? Ці ж нешта там у іх атрымаецца — маладыя занадта арганізатары, гарачуны.

Але тыя ж самыя хлопцы са Скуратоў — і тыдня не прайшло — зноў аб'явіліся ў Пацічове. У першы ж дзень завіталі да Фядотавых. А праз нейкі час Віктар ужо і не ўяўляў сябе без сваіх таварышаў-аднадумцаў. Што праўда, то праўда — чатырох юнакоў аб'яднала сяброўства.

Праз колькі часу малодшы Фядотаў перабраўся жыць да камунараў. Бацька, як і абяцаў, нічога не даў яму. Адно захапіў з сабою хлопец драўлянае вядро, якое нядаўна змайстраваў сам. Пётра Чыкун раз'язджаў увесь час на сваім кані, потым і карову прывёў. З канём прыбыў і Яўхім Воўк. Саўгас «Шыпяны» шмат чым дапамог камунарам, нават пазычыў на час пасяўной плуг, конную сеялку. На выдзеленыя грошы маладыя гаспадары набылі яшчэ аднаго каня і карову.

«Так, дзесьці вось тут», — Яўген Віктаравіч для пэўнасці зрабіў колькі крокаў налева і знерухомеў у задуменнасці. Бацька любіў паказваць мясціну, дзе пралег-

ла некалі першая баразна, дзе з першымі ўсходамі бралася ў гонкі рост таксама і новае жыццё камунараў.

...Ішла вясна 1927 года. На кулацкіх хутарах распачалі сяўбу. Не бавілі час і камунары. Асабліва памятнай была пасадка бульбы. Чыкун, як старэйшы, паважна шыбаваў за плугам, а Фядотаў, Ляховіч і Воўк садзілі ўслед клубні. Не зрабілі яны й двух заходаў, як з-за купкі разгалістага ліпняку паказаліся арандатары. І чым бліжэй тыя былі да камунараў, тым іх крокі рабіліся нервова-шпарчэйшыя ды шырэйшыя. Пагрозліва размахваючы рукамі, хеўра барадатых мужыкоў хмарай насоўвалася на хлопцаў.

— Не дам араць!.. Хто дазволіў?!. — асіпла выгукнуў Аляксандр Мурашка, наблізіўся да коней і стаў парывацца спыніць іх.

Пётра Чыкун працягваў плугаваць моўчкі, не падаючы выгляду, што ўсур’ёз успрыняў візіт арандатараў. І толькі тады, калі ўчэпістыя, заскарузлыя пальцы двух барадачоў учапіліся ў адну аброць і другую, і коні спыніліся, ён, як бы нехаця, спаволі дастаў з кішэні наган і сурова загадаў:

— Гэй там — асадзі назад!.. Ну?! Паўтараць я не ўмею.

Мужыкі насцярожана адступіліся.

— Не маеце права тут сеяць!.. — прабасіў узнерваваны Сцяпан Мініч. — Гэта мая зямля... Ад Савецкай улады атрымаў у арэнду.

— Правільна. Савецкая ўлада дала вам зямлю ў часовае карыстанне, — зазначыў Пётра Чыкун. — А цяпер Савецкая ўлада перадала гэтую зямлю нам, камунарам. Цяпер мы тут гаспадары... Камунары!

— Гэта самаўпраўства! — усхадзіўся Мініч і зноў рашуча падаўся да коней; яго напарнік Мурашка не скрануўся з месца.

— Не падыходзь... Аслухаешся — прыкончу! — Пётра Чыкун пагражальна пстрыкнуў курком.

— Дзядзька Сцяпан, забірайце сваіх тарбахватаў і

шыбуйце дадому, — Віктар звярнуўся да свайго аднавяскоўца з намерам папярэдзіць, каб трымаўся ад бяды як мага далей, не лез першы ў пельку галавой, бо разумеў, што дастаткова хоць аднаму з арандатараў узгарэцца і распачаць бойку, камунары яўна не здрэйфяць: прыменяць зброю.

Тым часам Чыкун — акурат прачытаў яго думкі — сышоў з баразны й адступіўся ўбок. Зручна стаў — коні не засцілі нахрапістага Сцяпана Мініча. Ды яшчэ знарок, каб усе бачылі, прыўзняў наган і навёў на ініцыятара канфлікту, голасна загадаў:

— Папрашу зараз жа пакінуць поле!.. І каб ніколі тут вашай нагі не было.

Скрадам, як злодзей, падпырхнуў да Мініча пераляканы Іван Ганчарык, хапіў за крысо суконнага армяка:

— Пайшлі адсюль... Шальмец гэты, бачыш, гатовы ўсіх нас перастраляць. І другі, паглянь-ка, з карабінам... Эйш, узброеныя. Ім, малакасосам, пальца ў рот не кладзі: куляй каторы прашые шлунне — і бегай тады, даказвай, што не ты вінаваты. Там, дзе зброя, там і ўлада. Анягож!

Сцяпан Мініч ажно зблажэў з твару — так яго трэсла ад злосці. Але мусіў скарыцца, апусціў голаў і пасунуўся ў бок змешанага падлеску. За ім пакапыцілі й астатнія. Праўда, узлаваная хеўра не адразу змылася з вачэй — арандатары стаялі на краі поля, раіліся аб нечым, кідаючы ў бок камунараў з'едліва-зласлівыя позіркі. Нарэшце паволі пабрылі ў вёску.

Яўхім Воўк закінуў за спіну карабін і зноўку ўзяў у рукі кош з бульбай. Пётра Чыкун ачысціў плуг ад жухлай травы-леташкі й панукнуў коней... Больш ім у гэты дзень ніхто не замінаў.

Камунары бадай што абжылі памешчыцкі дом. Руская печ добра захавалася. Спалі на шырокай цёплай чарэні.

Неяк за вячэрай Віктар Фядотаў прапанаваў назваць камуну «Нашай воляй». Яму тут жа запярэчыў Пётра Чыкун:

— Добра прыдумаў... Але ж мы — камсамольцы. Дык ці не лепш — «Камсамольская воля»?

— Вось гэта правільна! — голасна ўсклікнуў Яўхім.

Праз момант твар у Пётры стаў заклапочаны, сур'ёзны.

— Малавата ў нас сілы, — разважліва пачаў ён. — З сяўбой ледзьве ўправіліся... Трэба больш актыўна агітаваць моладзь, а мы сядзім тут, як совы ў дупле, нікуды не вылазім. — Нечакана цепнуў плячыма і ўважліва паглядзеў на Фядотава. — Заўтра, Віця, пойдзеш на хутар да кулака Зубовіча. З батраком яго паспрабуй звязацца. Ты ж мясцовы, даверу табе будзе болей. Пагавары з ім. Толькі пастарайся без лішніх сведкаў агітаваць... Не ў прысутнасці гаспадара. Інакш не даведаешся, чым дыхае, — не раскрыецца. Зубовіч трымае хлопца ў яжовых рукавіцах, кажуць. Заганяў беднага.

— Вечарам ісці? — насупіўся Віктар.

— А што — баішся?..

— Ён вечарам сабак спускае з ланцуга... У яго два іх. Вялікія дурынды — ваўкарэзы, жах!

— Дык што, хочаш, каб наган даў?.. Не дам. Стрэліў раз — і хопіць. Зброя — не пýгала. Зброя — на крайні выпадак. — Ажывіўся. — Пачнем наладжваць вечарынкі, гуртаваць моладзь вакол сябе... А во — паставім спектакль. Яўхім Мефістофеля так сыграе, што прыедуць з Мінска, стануць прасіць, каб у рэспубліканскі драмтэатр пераходзіў. — Пасміхнуўся. — Трэба разварушыць моладзь, зацікавіць... Ну няўжо хто-небудзь з нас не выступіць і не раскажа аб пачатай справе?..

— У былой эканомкі патэфон захаваўся... Пласцінкаў многа, — сказаў Фядотаў. — Шаляпін спявае...

— Якраз тое, што трэба!.. — зарадаваўся Чыкун. — Ёй, старой калошы, навошта патэфон панскі?.. Рэквізуем!

— А нам — правільна! — спатрэбіцца, — усхапіўся з услонца Яўхім Воўк. — Браткі, я ўжо і пеpажаўнуў бы — кішкі марш іграюць!

— Віцёк!.. — ускінуў густыя бровы Чыкун. — Сёння ты за кашавара — бярыся бульбу абіраць... Ды ўжо, хлопча, дагадзі гэты раз мне — цалкаваначку згатуй. Якраз і селядзец ёсць. Люблю з селядцом! А наверх — гарбаткі, каб смага не даймала.

Кухар нечага раптам сумеўся, ніякавата перасмыкнуў плячыма:

— Я хлеб з вугельчыкамі спёк... Думаў, хутчэй будзе — дзяжу ў печ, на цёплы под. Цеста і выбегла... Так што — выбачайце, мякіш з начыннем.

— А ну, пакажы, — падышоў да стала Пётра. Вугельчыкі зашаргацелі пад нажом. Ад бохана адвалілася нашпігаваная «аздобай» луста. — Чым не панскі пірог, га? Бач, з разынкамі!

Хлопцы дружна засмяяліся.

Пасля вячэры, калі сталі ўкладвацца на спачын, Чыкун жартам папікнуў Яўхіма за яго дзіравыя боты:

— Ты што гэта, Яўхіме, так апусціўся, га? У зношаных ботах да дзяўчат і не патыкайся — засмяюць... Ды нас, калі мы закаржэем тут, стануць не камунарамі называць, а камінарамі, абарванцамі. Так што — і боты купім табе. А Віцю — фуфайку. Хлопец зусім абнасіўся.

— А ўжо мы з табой у храмачах ходзім... — прабурчаў Ляховіч. — Глянь-ка, твае боты не лепшыя — не сёння-заўтра падэшва адхлупне. І мае шкрэбалы таксама во-во ашчэрацца. Што ж выходзіць?.. Адзенне наша — гэта ж, прабачце, лахманы... — І заявіў: — Дык вось, для таго і камуна, каб мы жылі лепш за астатніх. Інакш колам нікога ў наш хаўрус не загоніш. Хіба не так, га?.. Уласна, навошта нам запасіць грошы? Для чаго, калі ад іх няма карысці?!.

— Замаўчы! — абарваў яго Чыкун. — Сперш расшырым і ўмацуем нашу гаспадарку, станем заможныя. І

ў недалёкім будучым абавязкова сабой зоймемся. Хаця — вось што я табе, Міхась, скажу: не думай, што твой шыкоўны выгляд некага пераканае ў перавагах новага ладу жыцця. Ты хочаш пашыкаваць, пафанабэрыцца дзеля рэкламы: маўляў, хутчэй збягайцеся да нас, бачыце, якія мы прыгожыя, жывем-радуемся... Першымі прыбягуць зайздроснікі, такія ж самыя фарсуны. А пасля што? Сорам!.. Жывучы сёння, ніколі не трэба забываць на заўтрашні дзень!

Ляхові́ч узбурыўся:

— А вось я, уласна, хачу добра жыць цяпер, сёння... Магчыма, мяне заўтра прыстукнуць. Для чаго ж я павінен гнуць спіну, як чорны вол, недаядаць, хадзіць, як жабрак? Для будучага? А калі я, дапусцім, не зусім веру ў тое, што гэтая наша казка стане калі-небудзь явай?.. Ці ж нам асіліць гэта цуда-юда? Хоць і напінаемся, укалваем па-чорнаму... Мала гэтага — мы яшчэ павінны цёмных мужыкоў перавыхоўваць у высокасвядомых людзей. Затонкая кішка ў нас! — лыпнуў вачыма Ляховіч і ўнурыўся ў дол.

— Памаўчаў бы, кажу! — ажно затрэсла Чыкуна. — Не верыш у нашу казку?.. А я — веру. І я такі не адзін. А ты прыбіўся да нас, каб хутчэй разбагацець... Што, на пуп праз сілу ўзяў?!. Дык вось — абыдземся без ныцікаў!.. Ты — матылёк-аднадзёнак, якому б толькі й скакаць па мядовых красках. Не здольны ахвяраваць сабой дзеля іншых. І такі нам ты не патрэбны. Камсамольца Міхася Ляховіча болей не існуе.

— От і цудоўна, — агрызнуўся Ляховіч. — Вельмі ўжо шмат мне даў гэты камсамол... Сабраліся выскачкі ды самаўпраўцы. Ну няхай бы й дралі свае горлы, дык не ж — стараюцца заткнуць рот кожнаму, хто супраць іх. Ніякай дэмакратыі!

Яны доўга яшчэ спрачаліся, да позняй ночы. І нарэшце з болем адчулі, што Ляховіч духоўна стаў ім чужы, што іх дарогі разышліся назаўсёды.

Раніцай, яшчэ цямком, Ляховіч знік.

«Гэтак лепш, — падумаў Чыкун.— Здарылася б такое пазней, калі камуна папоўніцца, Ляховіч стаў бы дэзарганізатарам. А на Яўхіма і Віктара спадзявацца можна — свае хлопцы, надзейныя».

На хутар кулака Зубовіча Фядотаў прыйшоў раніцай. За высокім частаколам ажно захлыналіся сабакі. На ганак выйшаў сам гаспадар — з гарбузаватым і залішне ільсняным ад празмернай атлустасці тварам. Аздобіўшы маленькі рот ліслівай усмешкай, пацікавіўся:.

— Чым абавязаны? — не спытаў, а нібы стрэліў ва ўпор насцярожаны Зубовіч.

— Ды вось... Да вашага парабка завітаў. Як ён тут жыве-маецца?.. — І не без хітрасці дадаў: — Я, прызнацца, наламаў дроў — пагарачыўся, бацьку пакрыўдзіў... Сышоў, бы ў тыя прочкі, з дому. На душы ў мяне камень ляжыць, скінуць бы яго. Ды не магу — задужа цяжкі... Думаю, Іван мне дапаможа.

— Праходзь... Госцю мы заўсёды рады, — Зубовіч звузіў тхарыныя вочкі, варухнуў густа-калматымі брывамі. — Іванка ў нас, як родны. Жыве і радуецца — і цёпла яму, і ўежна... Эх, давайце-ка, сынкі-браточкі, сядзема, во, радком ды пагаворым ладком. А то — жывем-працуем, адзін аднога не заўсёды чуем, а калі й чуем, дык анічому не верым... — Бегаў паўз стол гаспадар, змахваючы рукавом з чорнай сталешніцы хлебныя пакрышні.

Нарэшце загадаў жонцы забяспечыць мужыкоў «патраўкай». Тая сперш паставіла на стол гранёны штоф з самагонкай і тут жа прынесла сподак з ладным кавалам прыпечанага сала, кружло каўбасы, міску салёных гуркоў... Ад такога смакавітага разнастраўя ў Віктара перахапіла дых. Самагонка яму не ў радасць, і ўжо хацеў адмовіцца ад чаркі, але стрымаўся, бо няёмка будзе

есці (падумаюць — галодны). Для прыліку прыгубіў крыху, пачаў закусваць. Не спяшаўся. Каўбаса спадабалася, затое гуркі пахлі асінавай бочкай, і ён сказаў пра гэта Зубовічу. У адказ пачуў прыбеднена-посмешны бзык:

— На дубовыя бочкі трэба велькія грошы... Твайму бацьку ўдалося сцібрыць два дубовыя кадухі з панскай эканоміі, вось вашыя гуркі й смачныя. Не падумай, што я асуджаю... Прызнацца, мне тады, калі раскрадалі панскае дабро, пад рукі трапіліся дабрэнны, яшчэ зусім новы хамут і сырамятныя, таксама новыя, лейцы...

Іван нечага зацята маўчаў. І еў, і піў — як мокрае гарыць. Ды ўсё час ад часу спадылба пазіраў на гаспадара, напружана ловячы як не кожны ягоны жэст. На твары парабка выразна чыталася: «Маўчу... Слухаю і маўчу. А вы — гаварыце... Мая хата з краю...»

— Бачу, Ваня, табе тут няблага жывецца, — Віктар гаварыў так, нібы зайздросціў парабку. — Я бадай што прагадаў... Ніхто да нас не спяшае, круцімся мы, як трэскі на вадзе... Мой голас анічога не значыць. А табе тут — вольніца: з дзядзькам і пагаворыш, і адпачнеш. — І — як бы між іншым, нібы жартам: — Цябе ж тут ніхто не крыўдзіць, так?

— Не крыўдзяць... — ціха выбуркнуўся парабак.

— Ён у нас, як сыр у масле качаецца, — Зубовіч ажно ўзапрэў ад празмернай рупнасці. — Я не шкадую нічога для таго, хто мне спрыяе... — Здавалася, ён усёй сваёй фанабэрыяй адно і сцвярджаў: «Глядзі, вашывец саплівы, як я харчуюся. І так — кожны дзень». — Вы там, у сваёй камуніі, нябось, з капусты на квас перабіваецеся, — яхідна хіхікнуў і гэтак жа яхідна дадаў: — Пазыку яшчэ не праелі?.. — Самазадаволена выцер рукой тоўстыя губы.

Віктар як і не чуў гэтых яго слоў. Ён усчаў распавядаць аб жыцці ў камуне. І ўжо не падладжваўся пад настрой Зубовіча — гаварыў так, каб парабак ягоны

зразумеў усё правільна: у камуне толькі й месца бедняку, там ён — вольны птах.

— Па вечарах мы чытаем... У нас цяпер многа кніг, ёсць нават з аўтографамі пісьменнікаў. — І стаў расказваць, як яны разам працуюць, дзеляць па-сяброўску заробак... — Добра гэта ці не, але камунарам іначай і нельга — мы ўсе роўныя.

Зубовіч колькі разоў імкнуўся перапыніць — скіроўваў размову ў іншы бок:

— Абарванцу на людзях толькі й жыць — калі сам чаго не ўхопіць, дык яму іншыя паднясуць...

І Віктар нарэшце задаволіў яго памкненні, сказаў:

— Дзядзька, вы праўду кажаце: у камуне каму і добра, дык гэта абарванцам. — Устаў і папрасіў, каб Іван правёў яго да варот, спаслаўшыся на тое, што баіцца сабак.

Зубовіч нехаця згадзіўся, але папярэдзіў Івана:

— Ты не доўга там... Не забывай — заўтра досвіткам па дровы едзем.

Калі выйшлі за вароты, Віктар сказаў:

— Я ўсё ведаю... Табе ў гэтага вірлавокага сыча жывецца не соладка... Трымаешся ў яго з-за страху страціць кавалак хлеба. Кідай скваліыгу і шыбуй да нас. Абяцаеш?

Іван у знак згоды адно галавой кіўнуў. Яны й пяці хвілін не пастаялі, як выйшаў на ганак Зубовіч і паклікаў парабка ў хату.

І ўсё ж візіт да Зубовіча не быў дарэмным. Праз некаторы час Іван таксама стаў камунарам.

Вечарыны наладжвалі звычайна па суботах. У прасторнай зале памешчыцкага дома зрабілі сцэну. Арганізатарам самадзейнасці й пастаянным акцёрам, які забаўна выконваў камедыйныя ролі, быў, як ні дзіўна, менавіта Віктар Фядотаў. Ставілі спектаклі па камедыях «Рэвізор», «Збянтэжаны Саўка». Апрача маладых пацічоўцаў завітвалі на агеньчык і пажылыя, асабліва

зачасцілі жанчыны. Танцавалі як пад гармонік, так і пад мелодыі патэфона, тым больш што пласцінак става-ла ўсялякіх.

Звычайна, калі прысутныя добра павесяляцца, на сцэне з'яўляўся Чыкун і пачынаў, як ён любіў казаць, пралетарскую агітацыю:

— Рана ці позна, а маладым вяскоўцам давядзецца ўступіць у камуны, калгасы, саўгасы... Савецкая ўлада ўзяла цвёрды курс на стварэнне ў вёсцы калектыўных арцеляў. Іншага выбару няма. Сельская гаспадарка будзе пастаўлена на сацыялістычныя рэйкі. Дарэмна мясцовыя багацеі спадзяюцца на хуткую гібель новай улады. Ужо ўвесь свет пераканаўся ў яе несакрушаль-насці. Толькі калектыўная гаспадарка выведзе нас з галечы жабрацтва...

Цяжка было зразумець, якое ўражанне рабілі такія выступленні на вяскоўцаў. Але хто-ніхто з іх пачынаў вагацца. З болем адрываючыся ад старога, звыклага, хутчэй інстынктыўна, чым свядома, цягнуліся да новага жыцця не толькі юнакі, але і дзяўчаты. Пабойваючыся сваіх бацькоў, яны пакуль што адкрыта не выяўлялі свай-го стаўлення да камунараў. Прыняць удзел у вечарыне — адно, а вось стаць паўнапраўным камунарам — іншае.

Бадай што год камунары жылі ўтраіх, часам жарту-ючы адзін з аднаго, што настаў час камусьці з іх ажаніц-ца. Вечарынкі праходзілі за вечарынкамі, а камунараў не большала.

«Чаму?» — задавалі хлопцы сабе пытанне. Адказ прыходзіў сам сабой: яшчэ даволі кволай была маладая камуна. Эканамічна слабай. Таму і вырашылі ў бліжэй-шы час расшырыць гаспадарку, значна палепшыць умо-вы жыцця. Прыгадалі Міхася Ляховіча: маўляў, дарма з ім так абышліся — у нечым ён меў рацыю: трэба і пра сябе думаць, а не толькі пра сусветны пралетарыят.

Камунараў, канешне, здорава выручыў вялікі па-мешчыцкі сад. Рэалізавалі дзяржаве багаты ўраджай садавіны, атрымалі добрыя грошы. Прадалі частку

ачышчанага за зіму зерня, бульбу. Купілі яшчэ двух коней, тры каровы, свінаматку, конную малатарню, іншы сельгасінвентар, абсталявалі памяшканні. Фядотаў прывёз з горада чатырохлямпавы радыёпрыёмнік. Хлопцы, вядома ж, падумалі й пра сябе — купілі абновы, прыадзеліся. Жыць сталі троху лепей, чым вясковыя бednякі.

Зрэшты, як ніхто іншыя, менавіта беднякі сачылі за жыццём камунараў і радаваліся іх поспехам. Яны адразу звярнулі ўвагу на перамены, што адбыліся ў камуне. Нарэшце «прыляцела» і першая ластаўка: у камуну папрасіўся бядняк Міхаіл Дыбун. Прынялі з радасцю. За ім — прыйшоў Васіль Трапашка са сваёй сям'ёй. Прывёў карову. Пасля ў камуну ўліліся сем'і Ліпневічаў, Кулінковічаў, Свірыдовічаў і іншыя. Знайшоўся і свой рахункавод-бухгалтар — Пятро Асташонак. Загадваць складам савет камуны даручыў Таццяне Кляніцкай, гатаваць страву — Таццяне Чарняк. Настаўнік Крайко праводзіў культурна-масавую работу. Прыйшла ў камуну і сястра Фядотава — Ганна, а пазней — і ўся сям'я. Праз некаторы час камунараў ужо налічвалася каля 20 чалавек. Гэта ў асноўным была моладзь. Юнакі й дзяўчаты з гарачымі сэрцамі, гатовыя будаваць новае жыццё.

...Яўген Віктаравіч прыпыніўся ля сянажнай траншэі. Каторы тыдзень закладваюць. Усе тэрміны прайшлі. Здаецца, і тэхнікі дастаткова — ажно 43 трактары. Гэты раз меліяратары падвялі: усе сенакосы й пашу ўзаралі — задумалі ўсё «адным махам» асушыць. А чаму не паступова, па частках? І вось — няма з чаго сілас нарыхтоўваць. Няма дзе кароў пасвіць. Ні саўгасных, ні чыіх іншых. Неразумна гэта. Тым больш, што асобныя ўчасткі не было неабходнасці чапаць. Відаць, у меліяратараў з планам нелады. І куды ж глядзела кіраўніцтва саўгаса? Ці не ў чарку тым часам?

Або ўзяць калектыўны падрад — добрая рэч! Асабліва сямейны. Ён мала чым адрозніваецца ад арганізацыі працы камунараў. Укараняецца ж слаба.

...Вясну 1929 года камунары сустракалі падужэлымі. Свае ўмельцы-кавалі змайстравалі патрэбную колькасць плугоў, конную сеялку. Адчулі сілу камунараў і так званыя хутаране-замажэнцы. Сталі не без злоснага намеру прыглядвацца, а то і пагражаць за тое, што пераманьваюць батракоў, самыя ўвішныя з іх Лойка і Герасімовіч. Іх неўзабаве арыштавалі й выслалі некуды ажно за Котлас — нібыта як ворагаў сялянства, як эксплуататараў.

Вечары адпачынку ў камуне сталі праходзіць больш змястоўна. З Чэрвеня як не штотыдзень прывозілі кіно. Фядотаў ухітрыўся выпускаць светавую газету. Крайко рэдагаваў насценную. Як правіла, у гэтых «агітках-досціпах» адлюстроўваліся працоўныя будні камунараў, высмейвалася адмоўнае. Жыццё станавілася асэнсаваным і ярка прывабным, цікавым.

Першы сакратар ЦК ЛКСМБ Платон Галавач з'явіўся ў камуне нечакана. Гэта ўжо быў не толькі знаны пісьменнік, але і не менш знаны грамадскі дзеяч. Яго цікавіла літаральна ўсё. Агледзеў дом, абышоў гаспадарчыя пабудовы. Пабыў на полі, дзе працавалі камунары. Амаль з кожным пагаварыў. Пасля звярнуўся да Чыкуна:

— Поспехі значныя... Віншую!.. Але трэба разварочвацца шырэй.

— Не хапае рабочых рук, цягла, інвентару... — Пётра Чыкун глядзеў на камсамольскага важака як на чалавека, які ўмее не столькі хваліць, як дапамагаць, і быў упэўнены, што на яго просьбу наконт трактара не забыў.

— Кажаш, рабочых рук не хапае? — Платон Галавач пасміхнуўся, узяў Чыкуна пад руку і прайшоўся з ім так, подручкі, да чарговай купкі рабочых. — Лічы,

тут наша агульная недапрацоўка... Няўмела агітуем. І перш за ўсё слабасць нашая ў тым, што няма нам пакуль чым хваліцца. Трэба механізаваць працу людзей. І гэта ўскалыхне вёску... Моладзь пасадзім на трактары, машыны. Дадзім і вам трактар. Заслужылі.

— Платон Раманавіч, я не ачуўся? — Пётра Чыкун быў хутчэй уражана-здзіўлены, чым узрадаваны — няйнакш ад хвалявання ён і ляпнуў гэтае «не ачуўся», нібы не паверыў, усумніўся.

— Узнагародзім трактарам, як актыўных будаўнікоў новага жыцця ў вёсцы, — запэўніў Платон Галавач. — Механізацыя, — працягваў ён, — і толькі механізацыя. Аб'яднаем аднаасобныя бядняцкія гаспадаркі ў калектыўныя. Так? А чым апрацоўваць зямлю? Без трактароў аніяк не абысціся, бо на бядняцкіх коней ды прымітыўны сельгасінвентар спадзявацца не выпадае. На серадняка пакуль таксама асаблівых надзей не ўскладзеш. А кулакі нам не па дарозе... Некаторыя з іх пачалі шкодзіць. Так што — атрымаеце трактар, то без аховы яго не пакідайце... Дваіх камсамольцаў тэрмінова накіруйце на курсы трактарыстаў. Толькі выбірайце самых дастойных. Ну, а цяпер раскажыце мне, таварыш Чыкун, падрабязней аб справах у камуне...

І Чыкун пачаў расказваць, дэталізуючы асобныя моманты з жыцця камунараў.

— Значыць, Ляховіч збег, не вытрымаў... Так, не ўсім пад сілу такая ноша. Чалавек па-сапраўднаму пазнаецца ў самыя цяжкія, я сказаў бы, у прынцыпова важныя моманты.

— Рыба шукае, дзе глыбей...

Платон Галавач перапыніў Чыкуна даволі дзіўным і, як здалося камунару, наіўным пытаннем:

— А вось прызнайся: ты цвёрда ўпэўнены, што ваша камуна зможа існаваць далей?

— Не зусім упэўнены... Бо людзі да нас прыходзяць з розным узроўнем свядомасці. Дый матэрыяльная база

пакуль не надта задавальняе нас... З трактарам, безумоўна, хутчэй акрэпнем.

— Ну не ў хвасце ж вам плесціся — акрэпнеце, — пагадзіўся Платон Галавач. — Ды літаральна праз год станеце перад неабходнасцю рэарганізацыі камуны ў калгас. І гэта заканамерна. І менавіта вашыя людзі псіхалагічна найлепш падрыхтаваныя да супольнага гаспадарання.

У час абеду, калі ўсе камунары сабраліся ў сталоўцы, Платон Галавач выступіў з кароткай прамовай. Ён ад імя Цэнтральнага Камітэта камсамола рэспублікі падзякаваў камунарам за добрую працу. Расказаў аб становішчы ў краіне, спыніўся на міжнародных адносінах, згадаў апошнія рашэнні й пастановы кампартыі, засяродзіў увагу камунараў на памкненні ўрада перабсталяваць і ўзбуйніць шмат якія заводы й фабрыкі, што якраз і прывядзе да ўмацавання абароннай магутнасці Краіны Саветаў.

Пасля сталічны госць абедаў разам з камунарамі. Нарэшце ў іх суправаджэнні адправіўся да легкавой машыны...

Хлопцы й дзяўчаты, узбуджаныя і ўсхваляваныя сустрэчай, увечары правялі камсамольскі сход. На ім было прынята адзінадушнае рашэнне: накіраваць на курсы трактарыстаў Віктара Фядотава. Другога вылучэнца не падабралі пакуль. Камунары адкрыта зайздросцілі свайму паплечніку — кожнаму хацелася быць на яго месцы.

Усё цяжэй рабілася Пётру Чыкуну і Яўхіму Воўку трымацца вызначанага курса камуны. У першыя гады яны бадай кожнага навічка «прасвечвалі» наскрозь. Пры масавым жа ўступленні ў камуну людзей рознага ўзросту стала відавочным, што гэтая форма арганізацыі жыццёвага ўкладу не адпавядае рэчаіснасці. Траплялі людзі з рэзка адрознымі поглядамі й перакананнямі. Сталі частымі выпадкі ўхілення ад працы, той-сёй несумленна выконваў ўскладзеныя на яго абавязкі. Ча-

сам нават даходзіла да крадзяжу прадуктаў харчавання і маёмасці. І без таго слабая эканамічная база ўвачавідкі падрывалася негатыўнымі ўчынкамі несумленных камунараў.

Пасля як не штодзённых спрэчак-дэбатаў кіраўнікі нарэшце вырашылі правесці сход, дзе як не адзінагалосна пастанавілі перайменаваць камуну ў калгас «Камсамольская воля». Першым старшынёй абралі Пётру Чыкуна. Былыя камунары сталі калгаснікамі — атрымалі надзелы зямлі, займелі свае гаспадаркі. Шмат хто стаў будавацца на сваіх сотках, асобна есці, асобна трымаць сямейны прыпас. Таму былыя камунары не вельмі жалкавалі — калгас па тым часе бачыўся ім прагрэсіўнай гаспадаркай.

Ужо добра сцямнела, калі Яўген Віктаравіч накіраваўся дахаты. Мінулае так авалодала ім, што яму амаль наяве чуліся словы бацькі: «Якое гэта шчасце, сынок, зазірнуць у будучае. І не меншае — наблізіць яго, прылучыць да сённяшніх клопатаў».

Можна ўсяляк ставіцца да камуністычнай ідэі. Маўляў, і тое ў ёй не так, і гэтае. Сапраўды, няма ў сусвеце казачнага абрусу, на якім звычайна бывае ўсё — ад бутляў з заморскімі вінамі й да самых нязвычных страў, печыва ды фруктаў. Пацічоўскім камунарам такі самабраны абрус займець не ўдалося. Затое ўсе яны, маладыя-гарачыя нецярпліўцы, зразумелі адно: нічога само, без напружанай паўсядзённай працы ў рукі не даецца. Аднак імкненне людзей да лепшага жыцця — ёсць вечнае. Акурат як і казка пра самабраны абрус. Як Прыгожае Светлае Заўтра.

Чалавецтва пакуль не ведае такога грамадства, якое было б пазбаўлена заганаў няроўнасці. І надалей формы гэтага імкнення будуць розніцца, але сутнасць іх застанецца нязменнай — справядлівасць! І найперш — у размеркаванні матэрыяльных даброт аў.

Кастрычніцкая рэвалюцыя семнаццатага года з'явілася тым мерыдыянам, які строга размежаваў колішні супольна-адзіны свет на дзве часткі — багатых і абяздоленых. І там, бадай, на асобным уліку былі камунары. Ім не цярпелася як мага хутчэй пашырыць гэты свет і бескампрамісна, справядліва і шчасна ўладкаваць пераважную большасць людзей. Ды лёс распарадзіўся інакш. Жыццё трымаецца сваіх няўмольна-эвалюцыйных законаў, пакідаючы нам адно няўрымслівую надзею на лепшую долю.

## ІДЗІЦЕ ЗА МНОЙ!..

Пякельнае афганскае варыва... У смяротным кіпені змагаўся, знемагаў. Два гады й тры месяцы. На рахунку дзвесце восемдзесят пяць баявых выхадаў. Быў параненый... Наўкола адно панылыя абрысы гор-чужаніц, накшталт шчэрбін абгарэлых берагоў гіганцкага катла. У ім кіпела амаль без пярэдыху. І не толькі днём — у агні душманаў, у неміласэрнай спякоце, але і ноччу — каля трохсот рэактыўных снарадаў разрывалася наўкруг.

Яго дваццаць сёмая вясна асвяцілася двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, медалём «За адвагу»...

О, Божухна, як суаднесці ўсё гэта з тваім пастулатам: не забі?!. А ўсё ж — калі яйка сімвал жыцця, то адно тоненькая шкарлупінка ратуе яго, жыццё, ад смерці. Ці не такая ж роля і арміі — браніраванага шчыта?.. Бо менавіта ён, гэты шчыт, і адводзіць смерць ад мірных людзей, ратуе іх. Каб яны, Божухна, жылі згодна тваім запаведзям. Дык жа даруй тым, хто дзеля гэтай высакароднай мэты ўзяў у рукі зброю.

Такая цяжкая місія выпала на долю Анатоля Аляксандравіча Аляхновіча. Можа, толькі палітыкі-кан'юнктуршчыкі могуць сцвярджаць адваротнае.

Успамінае Анатоль Аляксандравіч:

— Па даных армейскай разведкі мы пасля даведаліся, што калі б спазніліся на дзве гадзіны, то ў Афганістан увайшлі б амерыканцы... Так што — мы абаранялі паўднёвыя рубяжы Савецкага Саюза. Нашай агульнай Айчыны. Нашы сем'і. — Крыху падумаў і ўзрушана дадаў: — Дзейнічалі рашуча... Уявіце — за нейкія пятнаццаць хвілін узялі Палац Аміна!

Якая аператыўнасць!

Сёння Анатолю Аляхновічу і сарка няма. Мацак — паўнаватая, ладна складзеная постаць. Шырокі, акруглы твар. З помным выразам дабрыні, шчырасці, спакою. Наогул жа — тыповы выгляд былога вайскоўца. Надзвычай лёгкая паходка, рухавасць, статнасць. На сцяне ў пакоі — аўтамат, баявы, з адкідным прыкладам. Побач — прымацаваныя, веерам, зачахлёныя нажы...

— Так, гэта ў нас асобны пакой для захоўвання зброі, — заўважыўшы мой здзіўлена-запытальны позірк, патлумачыў Анатоль Аляксандравіч. — Самі ахоўваем офіс. Усё, як кажуць, у рамках закона.

Што ж тычыцца офіса ў Жодзіне, дзе размешчана таварыства з абмежаванай адказнасцю «Памяць», якое ўзначальвае Аляхновіч, то гэта ўзор для пераймання. Чысціня, бы ў бальнічнай палаце. Падлога выкладзена светлай пліткай. Нават боязна ступіць... Дываны паўсюль. У пакоях — мяккая зручная мэбля. На вокнах — жалюзі. Ахоўнік кантралюе тэрыторыю вакол офіса пры дапамозе тэлекамер. І ўвесь гэты камфорт стварылі чатырнаццаць чалавек. Такі штат таварыства. Ці не малайцы?!

Афганская тэма не надта ахвоціла майго субяседніка. Стрыманасць, лаканічнасць. Толькі й гэтага было дастаткова, каб спасцігнуць сутнасць.

— Відаць, страляць у падобных да сябе няпроста, хоць гэта і ворагі? — Я з ходу памкнуўся заглыбіцца ў філасофію вайны.

— Так. На першым часе... Але асобы абагульняюцца — у смерць. І тады — альбо ты яе, альбо — яна цябе.

— І ўсё ж, пасля бою, калі бачыш забітых, шкада і чужых?

— Толькі да таго моманту, пакуль не ўбачыш і сваіх... Тады хваля помсты змывае жаль. Бясследна. Увогуле ж — гэта работа прафесіяналаў... Так, ёсць такая прафесія — абараняць Радзіму.

Нарадзіўся Анатоль у Гродне. Пасля бацькі яго пераехалі ў Жодзіна і аселі там назаўсёды. Вучыўся ў Жодзінскай сярэдняй школе № 4 і марыў здзейсніць подзвіг. Вучыўся добра. Вызначаўся самастойнасцю, сур'ёзнасцю. Стараўся не даць у крыўду слабых. Толькі з цягам часу зразумеў, што аднаго жадання здзівіць свет геройскім учынкам недастаткова. Да подзвігу трэба рыхтавацца. Усебакова. Найперш — мацаваць сябе ведамі, духоўна і фізічна. Бо, маючы нават незвычайную сілу, можна ўтварыць такое глупства, што сораму, ганьбы не абярэшся.

Страхотна-знішчальнае полымя вайны...

У дні памінання яно плача слязьмі смутку, славы, гонару, памяці...

Васковыя слязіны сцякаюць са свечак. Пяці. Столькі жодзінскіх воінаў не вярнулася з Афганістана.

Як мог, аберагаў ад душманскіх куляў сваіх паплечнікаў па зброі Анатоль Аляхновіч. Рызыкуючы ўласным жыццём. Ды бязлітасная смерць расстаўляла звыродныя пасткі ў самых непрадказальных месцах. І гінулі, гінулі хлопцы, якія ішлі побач.

Толькі жывыя будуць помніць іх. Заўсёды. Таму ўвекавечванне подзвігу сваіх баявых таварышаў Анатоль Аляксандравіч лічыць сваім найсвяцейшым абавязкам. Узначальваемае ім таварыства «Памяць» аб'явіла кон-

курс на стварэнне праекта дастойнага помніка. А пакуль — закладзены камень з надпісам на мармуровай пліце: “Тут будзе ўзведзены помнік «афганцам» і воінам іншых лакальных войнаў”. Помнік! Увасабленне подзвігу тых, хто аддаў свае жыцці за Радзіму. Напамінак і перасцярога неабачлівым палітыкам. Даніна невымернаму смутку маці, жонкам, родным і блізкім загінуўшых...

Такія рысы, як спагада, адказнасць, імкненне ва ўсім найперш пакладацца на сябе, — рана сталі вызначальнымі. Акрэслілі свядомасць Анатоля. Скончыў восем класаў і наважыўся ў вучылішча. Жодзінскае. Семдзесят пятае. Яно рыхтуе кадры для Беларускага аўтамабільнага завода. Падаўся, каб набыць прафесію і адначасова — атэстат аб сярэдняй адукацыі. Вучыўся паспяхова. Толькі адна чацвёрка перашкодзіла стаць выдатнікам. Набыў прафесію наладчыка чацвертага разраду.

Працаваць пасля вучобы не давялося. Прызвалі. Трапіў у войскі спецыяльнага прызначэння. Брыгада знаходзілася ў Мар’інай Горцы. Затым служыў у пасёлку Ціксі. У вусці Лены. Застаўся на звыштэрміновую.

— Бо лічыў, што няма пачэсней абавязку, чым служыць Радзіме. Непасрэдна. Я і цяпер трымаюся такой жа думкі, — разважае Анатоль Аляксандравіч Аляхновіч.

У Севастопалі ён скончыў школу прапаршчыкаў і зноў вярнуўся на Ціксі. На цэлых пяць гадоў, дзе кожны прыроўніваўся двум. Так, нялёгкая выпала ношка. Далёка не кожнаму яна па плячы. То ж войскі спецыяльнага прызначэння. Пропуск у іх — інтэлект, выдатная фізічная падрыхтоўка. Якраз для такіх, як Анатоль Аляхновіч. Здатны да вучобы, майстар спорту па самба, адменна страляе, кідае нож, можа пры неабходнасці кіраваць самалётам, падводнай лодкай. Мае на сваім рахунку звыш чатырыста скачкоў з парашу-

там. Таму і маршы-кідкі на дваццаць пяць кіламетраў з поўнай выкладкай, і трохтыднёвыя выжыванні на сухарах ды вадзе ў бязлюднай мясцовасці толькі ўмацоўвалі веру ва ўласныя магчымасці.

— Вас, Анатоль Аляксандравіч, рыхтавалі з нейкай спецыяльнай мэтай выкарыстання?

— Кожная група адпрацоўвала на макетах захоп ваенных аб'ектаў у той ці іншай краіне. Зразумела, варожай нам. Рыхтаваліся надзвычай дэталёва. Каб дзейнічаць пасля без адзінай задзірынкі.

Каля года Анатоль Аляхновіч нёс службу ў Забайкальскай ваеннай акрузе. У Даурыі. І падаў рапарт з просьбай накіраваць у Афганістан.

— Нас рыхтавалі на выпадак ваенных дзеянняў. І такая магчымасць выпрабаваць сябе якраз надарылася. Я пайшоў дабравольна, бо разумеў, што пагроза паўднёвым межам Савецкага Саюза сапраўды існавала.

Сон усё не прыходзіў. Яго ходу замаруджвалі навярэджаныя перажываннямі думкі, пачуцці. Заміналі, бы распалены глыбокі пясок стомленаму вандроўніку пустыні. Нарэшце мозг знямогся і нібы патануў у сыпкім разгарачаным мроіве з рэшткаў хваляванняў. І тут жа ўсплыў прывід: горы, каменне, бедная жухлая расліннасць. І невялікая група спецпрызначэнцаў. Наперадзе, як заўсёды, ён, Аляхновіч. Паўпрыцемак. Вузкая горная сцяжынка. Нечакана адзін з яго байцоў, зусім яшчэ маладзенькі, збочыў. Туды, дзе таіліся душманскія міны. «Назад!» — прыглушана прахрыпеў Аляхновіч. Але было позна — прагрымеў выбух... Усчаўся бой.

...Памяць, бы судна ў віры часу. Непатапляльнае. Гады наносяць прабоіны. Не — не забыцця. Хутчэй — пакорлівасці лёсу. Маўляў, не вернеш. І боль стратаў пакрысе прытупляецца, утаймоўваецца. І вось, здаецца,

плынь часу ўжо вышэй за ватэрлінію... Яшчэ крыху — і як нечаканая сустрэча з тымі, хто быў поруч пад варожым агнём, і шторм успамінаў уздымае судна памяці на грэбень вышэзнай хвалі. Жудасна, балюча...

Кабул. Спёка на мяжы нясцерпнасці. Смерць — адразу ж за трапам самалёта. У зваротны шлях, на Радзіму, адпраўляюцца цынкавыя дамавіны. Груз-200. Так сустрэла Анатоля Аляхновіча афганская зямля. Страх? Толькі на першым часе. А пасля — помста папяліла той страх. Такая ж бязлітасная, як і азіяцкае сонца. Верылася ў немінучую адплату за палеглых хлопцаў: «Хутка дабярэмся да вас, душманы... Духі!»

А дух смерці кружыў і кружыў наўкола... Анатоль прыбыў у воінскую часць, прыняў групу. Не больш за пятнаццаць чалавек. У спецназначэнцаў няма ні аддзяленняў, ні ўзводаў. Група — адзіны арганізм, адпрацаваны да сінхроннасці, да безумоўнага ўзаемаразумення. І гэта пры адменнай баявой вывучцы, пры ўменні рэагаваць на змяненні ў сітуацыі. Толькі так можна невялікай агнявой сілай нанесці адчувальны ўрон праціўніку. У тым месцы, дзе той меней за ўсё чакае небяспеку.

І ў першае баявое заданне, і падчас яшчэ некалькіх «выхадаў» у тыл праціўніка, ён, прызнацца, як след не адчуў подыху вайны. Было загадана «сустрэць» караван. Заглыбіліся ў горы. Выбралі зручную пазіцыю. Стаіліся. І пяць дзён праляжалі ў засадзе. Толькі злавеснае сонца прасавала прамянямі спіны. Бы імкнулася ўплавіць у раскаленае каменне і прысыпаць гарачым пяском. Але караван так і не з'явіўся — змяніў маршрут...

Гэты ж караван заўважылі з паветра. Верталёт тэрмінова высадзіў групу Аляхновіча на сопкі. Прыкрыў агнём. І з ходу — у бой. Перастрэлка была кароткай. Знішчылі дванаццаць «духаў», узялі шмат зброі, боепрыпасаў.

Служыў тады Анатоль на мяжы з Пакістанам. Мясцовасць там вельмі складаная. У гарах безліч сцежак. І ўсе трэба кантраляваць, каб надзейна прыкрыць пазіцыі.

Апошнія ж абстрэльваліся праціўнікам нават ноччу. Аднойчы іх групу высадзілі з «бэтээраў» за дзесяць кіламетраў ад месца прызначэння. Уначы. І якраз там, дзе ім загадана было акапацца, аказаліся «духі». Завязаўся бой. Страцілі двух чалавек. Цяжка параніла камандзіра. Пад прыкрыццём аўтаматчыкаў Аляхновіч падпоўз да яго і адцягнуў за скалу, у бяспечнае месца. За што быў удастоены ордэна Чырвонай Зоркі. Гэта была яго першая баявая ўзнагарода.

Я слухаў скупыя, без жадання дэталізаваць, баявыя аповеды былога спецназаўца і ўпотай захапляўся яго сціпласцю. Мець столькі баявых выхадаў, кожны з якіх прэтэндаваў на сустрэчу са смерцю, і адмаўляць сабе нават адзін раз нейкім чынам намякнуць на геройства... Не, і тут не што іншае — як выхаванасць, пачуццё ўласнай годнасці, стрыманасць. Чалавек з невычэрпным запасам прыстойнасці. Як відаць, такіх мужнасць і сёння не пакідае.

На шмат якія заданні Аляхновіча адпраўляў камандзір батальёна Карчагін. І ніколі не забываў параіцца:

— Які накірунак лічыш больш небяспечным? — Аляхновіч паказваў на карце пазначаны маршрут і тут жа супакойваў камандзіра: — За мяне не хвалюйцеся, таварыш палкоўнік... Заданне выканаем.

Падчас паходу Аляхновіч, можа, і зачаста спыняўся і загадваў прыглушана, але выразна: «Ідзіце за мной... Крок у крок». І гэты яго загад выконваўся, як правіла, дакладна. Бо адзіны неасцярожны рух мог каштаваць жыцця. На шмат якіх горных сцяжынах чакалі сваіх ахвяр душманскія міны ды лавушкі. Анатоль быў надта асцярожны. А зрэшты, ён бадай што нейкім невядомым яму чуццём, адчуваў-угадваў, дзе замаскіраваная смерць. Неаднойчы й сам здзіўляўся гэтаму дару. Яму верылі. За ім смела ішлі. Так, ён чуў смерць на адлегласці. Ён мусіў яе чуць. Менавіта звышадказнасць за тых, хто ішоў по-

бач, патрабавала ад Аляхновіча звышнапружання. Ён прадумваў шмат варыянтаў. І выбіраў нарэшце той, якому душманы не прыдалі ўвагі. Беражонага, кажуць, і Бог беражэ.

Іх «закінулі» ў горы, што ў правінцыі Лагар. Паблізу кішлака Хушы. Патрабавалася зайсці з поўначы і прачасаць тэрыторыю.

— Але натрапілі на засаду, — успамінае Анатоль Аляксандравіч. — Мяне кантузіла... І параніла. Радыст выклікаў дапамогу. Нас выбаўлялі адтуль гадзін восем... Усё сведчыла аб тым, што засада была спланаваная. У выніку — шасцёра нашых загінула, пяцярых параніла... І толькі дваіх абмінулі душманскія кулі.

За гэты бой Анатоль Аляксандравіч Аляхновіч атрымаў другі ордэн Чырвонай Зоркі. А 13 снежня 1987 года быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза за аперацыю «Магістраль» на Хосце. Групу ўзначальваў зямляк з Барысава, намеснік камандзіра батальёна Віктар Галаўко. Заданне выканалі й вярталіся назад. Заставалася замініраваць падходы з гор, як раптам трапілі ў кальцо душманаў. У самым пачатку боя параніла камандзіра. Аляхновічу ўдалося выратаваць яго. Прыняў камандаванне на сябе.

— Падмога не магла прабіцца да нас двое сутак, — апавядае Анатоль Аляксандравіч. — Некалькі соцень «духаў» не падпускалі яе. І я вырашыў раздзяліць групу на дзве часткі й прабірацца да сопкі, на якой мы акопваліся раней... Той раз нашы страты былі значныя.

— Вайна звычайна робіць людзей жорсткімі, а вось вы, відаць, ці не шчаслівае выключэнне? — задаю чарговае пытанне, выкліканае адбіткам незвычайнай добрасці на твары майго суразмоўцы.

— Проста я навучыўся цаніць жыццё. І сваё, і чужое... Што ж тычыцца жорсткасці, спароджанай вай-

ной, то я пакінуў яе там — у гарах Афганістана. Хіба ж ёсць месца ёй у мірным жыцці?! Тут павінна цараваць дабрыня. І толькі.

— Роля сяброўства, бадай, найболей значная?

— Так. На вайне вартасць моцы сяброўства вымяраецца цаною жыцця. Не кожны брат брату так пасабляе, як мы — адзін аднаму. Там... А яшчэ нас падтрымліваў гонар за тое, што мы ў адказе за Радзіму. Магутную. Для мяне, прызнацца, найбольшай заганай была няздольнасць служыць у войску. Прыстойнасць, самавітасць, узаемавыручка — вось што вызначала нас. Калі армія будзе займацца выключна сваёй справай — усур'ёз рыхтавацца да абароны Айчыны, — то адно лепшыя рысы будуць уласцівыя людзям у вайсковай форме.

— А калі б зноў, Анатоль Аляксандравіч, спатрэбілася ўзяць у рукі зброю?

— За Радзіму — хоць сёння!

— І ўсё ж — Афганістан працягвае паліць нашыя душы... Наламалі там савецкія партгенералы дроў.

— Так, наламалі... Колькі нашых палегла! А хто вярнуўся, паранены, кантужаны, з парушанай псіхікай... Той і сёння не менш пакутуе, чым тады, будучы ў палоне, у шпіталі... Дык вось, сёння беларускіх воінаў, наколькі мне вядома, нідзе за межамі сваёй краіны няма. І гэта правільна. З цягам часу, думаю, забудземся мы й на той самы інтэрнацыянальны абавязак, які ўсім нам даўся ў знакі. Як можна дапамагаць таму, хто ставіць пад сумненне неабходнасць тваёй прысутнасці?.. І што самае прыкрае, дык гэта тое, што пасля тыя, хто паслаў цябе ў пекла, сарамліва адварочваюцца і адмяжоўваюцца. Яны, бач, чыстыя, а твае, воін, рукі ў крыві... Такое цяжка ўсведамляць.

...Пасля Афганістана Анатоль Аляхновіч нядоўга затрымаўся ў войску. Балазе, стажу для выхаду на пенсію хапала. То ж служыў з паскарэннем — год ішоў за некалькі.

Каб сысці з армейскай сцяжыны, падстаў ставала. Найперш — непакоіла здароўе маці, Ніны Іванаўны. Служба сына ў Афганістане пралягла праз яе сэрца. Глыбокім следам.

— Сынок, пашкадуй мяне, — упрошвала яна са слязьмі. — Я стамілася трывожыцца за цябе.

А яшчэ — яго дачушка. Марынка. Ёй толькі годзік. Між іншым, яе шмат хто з вяскоўцаў называюць — афганкай. Не Марынкай. Ласкава, пяшчотна... Патрэба прыхінуцца да маці, сям'і, сагрэць іх сваёй увагай, клопатам стала неадкладнай. Абавязковай.

Так здарылася, што, бачыце, палітыкі не прызналі сваіх памылак, і на «афганцаў» неўзабаве забыліся. А ў «афганскія жорны», між тым, трапілі болей як паўмільёна чалавек. У тым ліку — каля сарака тысяч беларусаў. Па сутнасці "афганцы" апынуліся пасля вайны, лічы, сам-насам са сваімі праблемамі...

І ці не таму Анатоль Аляксандравіч Аляхновіч зноў адчуў сябе на перадавой. І як тады, на небяспечных горных сцежках Афганістана, загадаў, але моўчкі: «Ідзіце за мной!..»

Проста аб'яднаць «афганцаў» — паўсправы. Хоць і надзвычай важнай. Сумесна лягчэй процістаяць нягодам. А яшчэ — неабходна матэрыяльная падтрымка. Стабільная. Трывалая.

І ён стварае таварыства «Памяць».

Памяць, — каб помнілі тых, каго няма.

Памяць, — каб дапамагчы тым, хто жыве ёй.

Заснавальнікі — пяцёра «афганцаў». Аб'яднаалі свае сціплыя грашовыя прыпасы. Узялі крэдыт у банку.

Былыя ўдзельнікі афганскіх падзей аказваюць высокі давер Анатолю Аляксандравічу Аляхновічу — выбіраюць старшынёй Беларускага Саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. А гэта — трыццаць дзве тысячы чалавек. Анатоль Аляксандравіч вырашае стварыць рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр. У Віцебску.

Сустрэчы з кіраўнікамі, чыноўнікамі. Шматлікія. Рознага ўзроўню. У тым ліку і высокага. Два разы запісваўся на прыём да тадышняга старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Вячаслава Францавіча Кебіча. Вопытны, спрактыкаваны палітык зацікаўлена, з разуменнем выслухаў Анатоля Аляксандравіча і рашуча падтрымаў:

— Няма пытанняў. Давайце прапановы. Афганскую рану трэба загойваць. Досыць ёй смылець. У хлопцаў пакалечаныя не толькі целы, але і душы. Неабходна лячыць. І як след...

Беларускі Савет ветэранаў вайны ў Афганістане... Анатоль Аляксандравіч адолеў нямала, будучы яго старшынёй. Галоўны ж набытак — рэабілітацыйны цэнтр. На той час восем тысяч «афганцаў» мелі патрэбу ў лячэнні. Узвялі лячэбны корпус. Кабінеты аснасцілі сучасным абсталяваннем. Былі запрошаны лепшыя медыкі... Цяпер штомесяц каля ста былых воінаў паляпшаюць сваё здароўе.

Перажытае, успаміны раз-пораз «разбінтоўвалі» пакалечаныя душы маладых людзей, якія, можа, толькі-толькі дасягнулі першай прыступкі сталасці. І, здавалася, іх раны ніколі не загояцца. Час няўладны над болем душы, якая параненай птушкай то падае ў цясніны, то няроўна кружыць-крыляе над стромымі сопкамі. Падстрэленая, знясіленая, яна ніяк не можа ўзняцца на вышыню чалавечага жыцця... І таму крычыць у адчаі, кліча на дапамогу.

Менавіта ўвага да лёсу «афганцаў» — ці не лепшы лекар! Матэрыяльны дабрабыт Анатоль Аляксандравіч Аляхновіч успрымае як падмацунак духоўнасці. Яе вяршыні — патрыятызму, які ў канчатковым выніку і ўвасабляецца ў служэнні Айчыне. Толькі яна, Айчына, здольная ўскалыхнуць увесь патэнцыял любасці й сілы людской. Да рэшты. Нават да ахвяравання самім жыццём.

Дзеля Радзімы! Невычэрпнай крыніцы духоўнасці. Яе мы поўнім і да яе ж прыпадаем у спёку жыццёвых нягод. Калі ж мець асалоду выключна ў сытасці, то за болей тлусты кавалак спажывы нядоўга і здрадзіць. Радзіме.

Таварыства «Памяць» Анатоль Аляхновіч арганізаваў найперш дзеля таго, каб мець пэўную самастойнасць, незалежнасць. Гэта — яго човен у вірлівай, няпэўнай плыні жыцця. Сам наладзіў ветразь. Сам за рулявога. Таварыства «Памяць» — цяпельца, якое грэе тых, хто ўжо, бадай, не можа самастойна распаліць яго. Цеплыня дабрачыннасці ахінае і ўдзельнікаў вайны, і інвалідаў, і пенсіянераў, і воінаў-інтэрнацыяналістаў, і сем'і загінуўшых, і дзяцей. Таварыства — вытворчага ўхілу. Майструюць мэблю, рамантуюць тэхніку, абслугоўваюць яе. І штогод мільярды рублёў выдаткоўваюць на падтрыманне дзевяці школ, шасці садкоў, «Дома дзіцяці», клуба «Зубраня», калгаса «Дружба» і нават мясцовай міліцыі, пажарнай. І гэты цуд твораць усяго чатырнаццаць працаўнікоў таварыства. Па ўласным жаданні. Ніхто іх не абавязвае. Апроч — сумлення і высокага патрыятычнага абавязку. Сотні людзей адчуваюць іх дабрадзейную прысутнасць. Рэдка, рэдка якое прадпрыемства, нават буйнога маштабу, можа прэтэндаваць на такую добрасць. І на такія магчымасці.

Людзі, няўжо вы ўсё яшчэ не разуверыліся ў гаварунах, абяцанкіных?! Яны ж нават пры пасадзе высокай надзвычай бездапаможныя. Ці не час вылучаць у лідэры такіх, як Анатоль Аляксандравіч Аляхновіч. Людзей, якія здольныя і кіраваць, і ашчаджаць тых, кім кіруюць. То бок — сваіх падначаленых.

Не, зусім не выпадкова Анатоль Аляксандравіч Аляхновіч узначальвае адначасова і таварыства «Памяць», і Жодзінскую арганізацыю Беларускага Саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Дзе прыкметная дзейнасць першай супольнасці падпарадкавана мэтам другой. Не менш

прыкметнай. Менавіта — духоўнаму ўзлёту «афганцаў». Усведамленню імі сваёй высокай годнасці, набыццю пачуцця гонару за свой подзвіг. Гэтыя выпакутаваныя, вышэйшай пробы якасці яны нясуць моладзі. І праз афганскую песню свайго ансамбля «Саланг», і праз шматлікія сустрэчы. У тым ліку і ў сваім дыскабары. Гэта — цэнтр духоўнасці патрыятычнага выхавання моладзі, дзе сумесна з ветэранамі Вялікай Айчыннай шчодра дораць падрастаючаму пакаленню каштоўнейшы скарб — любоў да Айчыны!

З кожным крокам наперад усё гучней і выразней чуецца покліч: «Ідзіце за мной! Ідзіце за мной...» Аб упэўненасці поступу Анатоля Аляхновіча пераканаўча сведчыць праграма, дасланая Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку. З адзіным намерам — палепшыць дабрабыт людзей, зрабіць больш важкімі іх духоўныя набыткі.

Вось радкі з праграмы Анатоля Аляксандравіча: «Я ведаю, як аснасціць вытворчасць новымі тэхналогіямі і даць рабочым стабільную высокую заработную плату; ведаю, як узняць сельскую гаспадарку, за кошт якіх сродкаў закупіць для нашых калгасаў новыя трактары й камбайны, а таксама стварыць сумесныя прадпрыемствы па выпуску сельскагаспадарчай тэхнікі, што ў сваю чаргу прывядзе да павелічэння ўраджайнасці й падняцця дабрабыту сельскіх працаўнікоў».

У магчымасцях, здольнасцях гэтага выдатнага, легендарнага чалавека сумнявацца не даводзіцца. Хаця б таму, што ўжо адзінаццаты год яго таварыства «Памяць» паспяхова працуе на рынках Рэспублікі Беларусь, краін СНД і краін дальняга замежжа. І сіл у Анатоля Аляксандравіча Аляхновіча дастаткова, бо яшчэ няма і сарака. І было б надзвычай несправядліва, калі б жыццё не дазволіла яму здзейсніць намечанае, прадуманае, узважанае. Спаўна. Не, так не павінна быць. Бо мы спадзяемся на лепшае.

## ВЫБАР ГАННЫ ІВАНАЎНЫ

### 1

Мне шчасціць на людзей добрых, прыстойных. І няйнакш таму, што сам імкнуся да іх. Бы ў спёку — да крынічкі. Так, хінуся да незвычайных людзей. Як да цяпельца ў сцюжу. І чым непагодлівей на душы, чым больш неўладкаванасці ды няўтульнасці наўкол, тым большая патрэба пабачыцца і пагаварыць. Такія сустрэчы — паратунак ад пакутлівых дум-сумненняў. Падужэлы душой, ты наўздзіў смела ўзлягаеш на крылы мараў.

Я спяшаўся да Ганны Іванаўны Чачоткінай. Не спазняўся, не. Быў звычайны суботні ранак. У буднія дні ў кабінет дырэктара гандлёва-вытворчага прадпрыемства «Беллясгастэхніка» не прабіцца. На працягу ўсяго тыдня. Тры змены даюцца ў знакі. У суботу ж — паслабленне. Праўда, калі якая няўпраўка, то і ў выхадныя дні прыходзіцца быць на працы. Часцей вымушае попыт на прадукцыю. А гэта прыемна, хоць і клопатна.

Дамовіліся сутрэцца ў дзевяць.

Вецер шалеў. Яму б пад сілу ўскалыхаць завіруху, але дзе ўзяць снегу?.. Людзі ўжо звыкліся з беднасцю зімовых прыпасаў. Ды толькі не ён, вецер! Ён — уладар. І пажадаў нагадаць пра сябе менавіта цяпер. Імчаў стрымгалоў, спатыкаўся, каціўся... Хапаў жвір і кідаў жменямі ў твары прахожым.

Вуліца Гандлёвая... На беразе рачулкі — двухпавярховы цагляны будынак. На першым паверсе — магазін, на другім — канторка «Беллясгастэхнікі». І магазін, і прадпрыемства падпарадкаваныя Міністэрству лясной гаспадаркі. Першапачаткова прызначаліся для закупу і продажу абсталявання лясгасам. Але паступова калектыў прадпрыемства пачаў усё болей пакладацца на ўласную ініцыятыву. Сёння займаецца зборкай

пажарных машын на базе «Урала». Тут рамантуюць бензапілы, заточваюць дрэваапрацоўчыя інструменты... Вырабляюць дошкі для падлогі, вагонку, разнастайныя піламатэрыялы...

Чакаць Ганна Іванаўна не прымусіла. У вызначаны час спяшалася аднекуль з глыбіні тэрыторыі. Увогуле ж — гэта задворкі лясгаса. Вельмі нязручныя.

— Атайбаваліся мы бадай што на балоце, — яна паказала рукой у бок рачулкі. — Ад вады бетоннымі плітамі адгарадзіліся... Але ўсё роўна вільгаці хапае.

Спачатку Ганна Чачоткіна працавала на ГВП «Лес». Юрыстам. У калектыве гэтага гандлёва-вытворчага прадпрыемства было дванаццаць чалавек. На чале з Пятром Георгіевічам Буціным. У канторы лясгаса займалі ўсяго адзін пакойчык. Калі Пятра Буціна прызначылі старшынёй райвыканкама, Ганне Іванаўне прапанавалі ўзначаліць прадпрыемства.

Я спытаў:

— Сёння Пётр Георгіевіч — намеснік міністра сельскай гаспадаркі... Ці сюды прыязджае калі?

— Адносіны захаваліся самыя добрыя.

— І дапамагае, відаць?.. — Але тут жа і пашкадаваў, што задаў гэтае пытанне, бо запрыкмеціў незадаволенасць на твары Ганны Іванаўны.

— За дапамогай не звярталася ні разу... І не збіраюся. Мы тут — гордыя ўсе!.. Дый непрыстойна гэта. Самі павінны спраўляцца.

Прыняла Ганна Іванаўна калектыў ужо ў трыццаць чалавек. На сёння ён пабольшаў да ста шасці. Усяго праз пяць гадоў.

Не без задавальнення Ганна Іванаўна знаёміла з «заўтрашнім днём» прадпрыемства... У нізовіне, зводдаль канторы, узвышаліся дзве каробкі пабудоў. Таўстасценныя. З чырвонай цэглы. Перыядычна «кланяўся» аўтакран. Пазвоньвалі, пашоргвалі кельмы. Будаўнікі завіхаліся на сваіх рабочых месцах — кожны

паасобна, але ў той жа час як бы ў адзінай стваральнай стыхіі, у адзіным працоўным рытме.

— Спяшаемся, — тлумачыла Ганна Іванаўна. — Людзі ўсе свае... Прыспешваць не прыходзіцца, стараюцца.

— А гэтыя дзве каробкі чаму закруглены так?

— Тут сушыльныя камеры будуць... Побач узводзім цэх-майстэрню па вырабу мэблевых шчытоў, якія — ёсць дамоўленасць — мяркуем пастаўляць у Германію... А гэта — трыццаць чатыры дадатковыя рабочыя месцы. Каля двух тысяч кубоў прадукцыі разлічваем штогод адгружаць. Скажу так: вытворчасць наша рэнтабельная і цяпер. Але не ў той ступені, у якой хацелася б. Магчыма, не ўсе задаволеныя гэтай будоўляй. Дадатковыя клопаты. Турботы. Ды як яшчэ можна забяспечыць людзям дастойнае жыццё?..

— Ці не лепш было б, Ганна Іванаўна, каб ваш калектыў прыватызаваў прадпрыемства? Бо калі ўласнае, то, кажуць, і аддача большая?

— Магчыма... Але прыватызаванае можа аднойчы перавандраваць у нечыю прыватную ўласнасць... Баюся, што і следу ад яго не застанецца. Таму — толькі дзяржаўнае!

## 2

Ёсць людзі-жаваранкі: прачынаюцца рана. Сядзіба Чачоткіных абуджаецца бадай адной з першых. На вуліцы Дружнай, што на ўскрайку Смалявіч. Руплівасць Ганны Іванаўны зразумелая — у сем трэба быць на рабоце. Не заспіць і Аляксандр Рыгоравіч. Муж ейны. Хоць, здавалася б, і спяшацца асабліва няма куды. Які ўжо год на пенсіі. Маёр. Зрэшты, прызвычаіўся да армейскага распарадку, відаць, на ўсё жыццё. Следам непрыкметна распачынае свае турботы й Надзея Фядосаўна. Свякроў Ганны Іванаўны. Ёй ужо за восемдзесят. Але рухавая не па ўзросту.

Падворак мог бы абысціся і без падмогі Ганны Іванаўны. Муж і свякроў даволі рупна гаспадараць. Ёсць і кароўка, і парсючкі, і куры... Але ж і ёй самой даспадобы ўвіхацца ля жыўнасці. І радоўку з мужам адбудзе. Ён звычайна ёй спагадае — скіроўвае ў той бок, куды статак меней за ўсё панадлівы.

Адным словам — цану ўласнага падвор'я Ганна Іванаўна няблага ведае. Ці не таму і зямлю для людзей прадпрыемства заўсёды імкнецца прыдбаць — не вялікая радасць з голай зарплаты жыць, калі ёсць магчымасць і ў зямлі папоркацца, нешта самому вырасціць. Раней соткі выдзяляў калгас «1-га Мая». А ў апошні час на палетках калгаса «Ленінскі шлях» адмералі. Гэта значна бліжэй.

Ноч прайшла надзвычай хутка.

Ганна Іванаўна ўстала. Падалася на кухню. Уключыла святло. З вокнаў спуджана зыркнулі густыя снапы святла і мякка ўперліся ў перадсвітальны змрок.

Позірк спыніўся на даёнцы. І рукі міжволі пацягнуліся да яе. Даіць кароўку было ранавата, але гэтая акалічнасць ніяк не паўплывала на жаданне Ганны Іванаўны. Яно вынікла падсвядома. Згодна стану, прычына якога пакуль не была вызначана... Пах сена зімой. Гэта подых лета! Бы дзверы прачыняеш не ў пуню, а ў скарбонку чароўнага, гаючага настою са шматтраўя.

У вялікіх блакітных вачах каровы, падалося, віраваў неспакой. Яна нават на імгненне забылася пра жвачку. Маўляў, не чакала ў такую рань.

— Ты што, Рабінка, не пазнала? — у голасе гаспадыні лагода і клопат.

Пачала даіць карову. Два струнка-белыя, акурат жывыя промні-струменьчыкі хвацка задзогалі па гулкім донцы вядра. Хвіліна — і яны ўжо іначай цур-

галі, без рэха, і ўсяго толькі з надзіва смачна-мяккім прыхлёбам, і ўсё сцішней рабілася ў даёнцы, супакойлівей. Нарэшце там адно шаптала нешта, ціха і невыразна, патанаючы ў пахкім шумаванні.

На душы ў гаспадыні было светла і лёгка. Згадалася, калі намерыліся перавезці Надзею Фядосаўну з вёскі Клянкі, што ў Талочынскім раёне, да сябе, у Смалявічы, тая рашуча паставіла ўмову:

— Згодная, але каб і маю Рабінку ўзяць... Без яе — не крануся.

Ажно так: Рабінка — частка яе самой. Ні больш і не менш. А яно ж і праўда — з кароўкай і не так маркотна. І хлеў, дзе месціцца рагуля, з'яўляецца для свекрыві куточкам роднай сялібы.

Неяк гасцявала ў Ганны Іванаўны сяброўка. Раечка Каралевіч. І так развярэдзіла душу. Ажно з Краснаярска прыехала. Лепшая яе сяброўка. Здавалася, успаміны ніколі не скончацца. Бо вярталі ў родны кут. Мясціны дарагія, жаданыя. Там вёска яе бабулі Агаф'і Францаўны. З пятага па дзявяты класы яна туліла Ганулю. Спачатку бацькі прывозілі на канікулы, пасля і назаўсёды пакінулі. Хаця ратоў хапала. Тут яна і адолела сялянскую навуку. І жыўнасць, і агарод без яе клопату не абыходзіліся.

Сяброўкі скончылі дзевяць класаў і неяк прыкінулі: куды падацца? Сталенне кранула сваім крылом рана. Рамантыка не давала спакою.

— Давай — у Краснаярск?! — прапанавала Рая. — Там у мяне — цётка.

— А як жа школа?

— Будзем завочна вучыцца... На фабрыку ўладкуемся.

Довадаў супраць не было. І праз колькі дзён дзяўчаты прыехалі ў горад. Улегцы. Бадай, у чым стаялі. Затое з поўнай ношай надзей. Самых светлых мар і спадзяванняў.

3

— Давай, дачушка, я працаджу малачко, — Надзея Фядосаўна звыкла склала ў колькі столак марлю. — Табе ж ісці ўжо... Не пазніся.

— Мама, ты шчаслівая? — спытала Ганна Іванаўна. Нечакана. Нават для сябе самой.

— А няўжо ж... Шчаслівая.

— А па роднай вёсцы сумуеш?

— Вось ты аб чым... — Сказала свякроў засяроджана. — Дык з'ездзіла б на радзіму, дачушка... Думаецца — не муштруй сябе, сабралася — і там.

«Хм, не муштруй... Хіба ж магчыма вярнуцца ў юнацтва, маладосць?» Але была ўдзячная Надзеі Фядосаўне за спагаду. Уменне спрыяць людзям — талент. Дадзены Богам. Але ж чалавек аддае сябе грамадскай справе, здаецца, ці не болей, чым уласнай сям'і.

Вочы Ганны Іванаўны зачапіліся. Да іскрынак... У Краснаярску для Ганны першым прытулкам стала трыкатажная фабрыка. Працоўная ж кніжка распачата запісам — «швачка» Ён, гэты запіс, адметны перш-наперш тым, што сведчыць аб спробе заявіць пра сябе, што ты ёсць такая, што нешта ведаеш і можаш. Першы самастойны крок. Прыступкі ж сталення — гарбарна-абутковы камбінат... Пайшла ў рост дзяўчына. Абралі сакратаром камсамольскай арганізацыі камбіната. То ж не жартачкі — чатырыста камсамольцаў! Прымаюць у партыю. Паступае ў Томскі дзяржаўны інстытут на юрыдычны факультэт. Вучыцца завочна.

Энергіі — праз край. Да Ганны Іванаўны хінецца моладзь. Верыць ёй.

Здавалася, будучыня Ганны Іванаўны ярка высвечвалася. І даволі выразна. Бо якія промні неўзабаве асвяцілі яе лёс: узначальвае аргааддзел Цэнтральнага райкама камсамола горада Краснаярска, затым — пер-

шы сакратар райкама камсамола, пасля нейкі час працуе загадчыкам сектара прафесійна-тэхнічнай адукацыі крайкама камсамола! Але тут Ганна Іванаўна даведваецца, што яе вось-вось накіруюць на партыйную работу. Для кагосьці, магчыма, — і жадаць лепшага не трэба. Усё складвалася адмыслова — жыццё каціла акурат па наезджанай каляіне. Менавіта, — да вышынь кар'еры.

Ды незалежны, ініцыятыўны характар Ганны Чачоткінай заўпарціўся, запратэставаў. Рашуча. Ёй крыху за дваццаць пяць. І што рыхтуюць?! Замест жывой, кантактнай работы з моладдзю завочна-загадны, ушчувальна-панылы стыль дзейнасці? Паўстаць раптам Гулівeрам перад мурашамі? Заўчасна састарэць душой? Так імкліва «перабудавацца» Ганна Іванаўна не магла. Гэта і палохала, і пярэчыла яе дзейнай сутнасці, унутранаму настрою. А калі так, то ніякіх кампрамісаў з сумленнем. І пакуль не «прапанавалі» зверху, трэба зрабіць ход самой...

Ганна Іванаўна ўладкоўваецца ў тэхналагічны тэхнікум швейнай прамысловасці. Зразумела, — без дазволу, крадма. І без працоўнай кніжкі. Яе добра ведалі там і цанілі. Па яе папярэдняй пасадзе. Тым болей — з яе, Ганны Іванаўны, надзвычай адказным стаўленнем да справы. Выкладала палітэканомію... Узмоцненыя, знясільваючыя падрыхтоўкі да лекцый. Спала па тры гадзіны ў суткі. Аўдыторыя ж немалая — чатырыста восемдзесят чалавек! Пасля — зноў яе стыхія — праца з моладдзю! Цяжкасці не ў залік. Праз які час Ганну Іванаўну прызначаюць завучам.

### 4

Вельмі ж тады Ганне Чачоткінай хацелася верыць, што пра яе забыліся. А яшчэ лепш — зразумелі. Далі магчымасць зрабіць выбар самой. Аднак жа той, хто трапляў у поле зроку партыі, яе клопату і ўвагі пазбавіц-

ца ўжо не мог. У лепшым сэнсе. Патрэба ж у Ганне Іванаўне была відавочная. Таму яе неўзабаве прызначылі дырэктарам гарадскога прафтэхвучылішча. Закрытага. Яно павінна было рыхтаваць повараў для закрытых гарадоў. Павінна... Бо вучылішча трэба было яшчэ пабудаваць. Праўда, тады, у пачатку сямідзесятых, запланаваныя аб'екты ўзводзіліся параўнаўча хутка. Не быў выключэннем і гэты. На васемсот навучэнцаў. Дзяўчат. Днявала і начавала разам з імі Ганна Іванаўна. Займець такую сямейку ў дваццаць дзевяць гадоў не кожнаму пашчасціць. А яна была шчаслівая. Незвычайна. Бо ўсе намаганні адбіваліся, бы ў люстэрку, на дабрабыце яе выхаванак. Дыхалася і працавалася так прывольна! Плённа. Чатыры гады запар вучылішча, сярод падобных, не мела роўных. Ва ўсёй Расійскай Федэрацыі! І ордэн «Знак Пашаны» Ганна Іванаўна атрымала заслужана.

Толькі ж яе парткіраўнікі думалі інакш: маўляў, загартоўку вытворчасцю прайшла. Удала... Час мацаваць апарат. Дзейныя аўтарытэтныя людзі былі заўсёды на ўліку. І яе паклікалі. Сам першы сакратар крайкама. Яна не паехала. Зноў была запрошана на размову... Мусіла параіцца з Аляксандрам Пятровічам Навумкіным, прадстаўніком закрытага горада.

— Не там маё месца... — горача даводзіла яна. — Не прытруся я там... — Пасміхнулася. — Стандарты не па мне. Дый нязручны я чалавек.

— І ўсё ж давядзецца ехаць, Ганна Іванаўна...

— Зразумейце, аддаленасць ад вытворчасці абмяжуе мае магчымасці... Мне трэба бачыць вынікі сваіх намаганняў.

— Магчыма, цяпер нам якраз такія людзі й патрэбныя... Партыя пачынае перабудоўвацца.

— Не паеду!.. Няўжо я дрэнна працую?

— Ды не, ордэнамі не раскідваюцца... Але не дапаможа і ён. Ведайце: з агнём гуляеце. Рызыкуеце сур'ёзна пашкодзіць сваёй кар'еры. Пасля няпроста будзе рэалізаваць сябе.

Размова скончылася тым, што Навумкін выклікаў свайго шафёра і загадаў:

— Даставіш у крайкам... — Клацнуў дзверцамі машыны й дадаў: — Без адзінага прыпынку!

Прызначылі сакратаром райкама. Па ідэалогіі. Сваю нязгоду Ганна Іванаўна «апратэставала» нязвыклай актыўнасцю. Добрасумленнасці ёй было не займаць. Сакратар у самай гушчыні падзей, поплеч з людзьмі. Стала вельмі прыкметнай асобай. Паўсюль задавала тон. Райкамаўцам давялося прызвычаіцца і да вольнасцей Ганны Іванаўны. Яна магла выказацца насуперак рашэнню бюро. Адна.

**5**

На пасадзе намесніка старшыні гарвыканкама Ганна Чачоткіна адчувала сябе патрэбнай. Адказнасць — за адукацыю, культуру, спорт. Яе непасрэднае дачыненне да калектыву, асобы.

Непаразуменняў ставала... Зімовая спартакіяда народаў СССР. Турбота па падрыхтоўцы ўскладвалася і на Ганну Іванаўну. Абавязвала пасада. Акурат перад самым адкрыццём — тэлефонны званок.

— Неабходны дадатковыя месцы, — голас высокапасаднай дамы.

— Няма ніводнага, усе білеты распрададзены, — суха адказала Ганна Іванаўна.

— Знайсці!

— Немагчыма...

— Вы разумееце, з кім...

У адказ Ганна Іванаўна паклала трубку. У Краснаярску тады налічвалася каля мільёна жыхароў. Стадыён не мог прыняць усіх жадаючых. А перагружаць яго было небяспечна. Для саміх жа балельшчыкаў. Але жэст дабрадзейнасці ўсё ж быў зроблены. Лімітам умяшчальнасці пагрэбавалі. У выніку — непапраўнае...

Балельшчыкі прарвалі ачапленне міліцыі й рушылі на лёд... Гвалт, ёнк — ахвяры! Ці знайшлі вінаватага? Так. Ім аказаўся дырэктар стадыёна.

Або — па жаданні «зверху» здымалі старшыню гаркама. Маўляў, не адпавядае. Усе дружна пацвердзілі прапанаваную неадпаведнасць. І толькі яна, Ганна Іванаўна, выказала нязгоду. Больш таго — адзначыла станоўчае ў рабоце кіраўніка.

Далейшыя падзеі ў краіне вымусілі Ганну Іванаўну больш выразна акрэсліць сваю пазіцыю. Адмаўленне партыі, распад Саюза... Складвалася ўражанне, што галава калоны раптоўна павярнула назад. На сто восемдзесят градусаў. Быццам спалохалася выпрабаванняў. Людзі ж, якія ішлі следам, нерашуча стоўпіліся ўсцяж абочыны... Не адразу ачомаліся. Намеры перабудоўшчыкаў праясніліся канчаткова, калі быў узняты белы сцяг — абвясцілі прыватызацыю. Стала відавочна, што выбітныя партакраты даўно ўжо не верылі ў камуністычную ідэю. Яе першакрыніца паступова зацягнулася бросняй забыцця. І толькі зрэдку аказвалася бурбалкамі цытат.

Расплочвацца давялося сярэдняму звяну партыйцаў. У тым ліку і ёй, Ганне Чачоткінай. Часам было і нялёгка, але яна смела глядзела людзям у вочы. Бо саромецца сваіх учынкаў не было падстаў...

Пайшла на вытворчасць. Каб разам з людзьмі змяніць нешта ў лепшы бок. Актыўна ўдзельнічала ў дэманстрацыях, мітынгах... У час аднаго шэсця да яе дробненькімі крокамі наблізіўся адзін з прыкметных знаёмых чыноў. Ласкава зазіраючы ў вочы, вымавіў:

— Я ганаруся вамі, Ганна Іванаўна.

— А я вось вамі... не магу. Надыдзе час, калі пры сустрэчы са мной вы будзеце вышукваць вачыма трэшчынкі, выбоінкі на асфальце, каб схаваць там свой вінаваты, сарамалівы позірк.

Выступала Ганна Іванаўна і супраць прэзідэнцтва Ельцына. Калі ж сітуацыя склался на карысць пера-

будоўшчыкаў, то становішча значна ўскладнілася. Якаянебудзь вартая перспектыва ёй ужо не бачылася.

### 6

З кожный прыступкай дашчана-рыпучай лесвіцы ўсё бліжэй падступалі надзённыя клопаты, выцясняючы ўспаміны. Там, на другім паверсе, канторка Ганны Іванаўны.

— Офіс пачакае. Спачатку — новы цэх. Людзям рабочыя месцы трэба, добры заробак.

А такі даспадобы гэтая лесвіца. Звыклася з ёй. Быццам не рыпіць, а распытвае аб нечым. Ці дакладвае... Карацей — першай падае голас у ранішняй цішы.

Прызнацца, Ганна Іванаўна ўсё болей на моладзь пакладаецца. Падбірае людзей. Самавітых, прыстойных. З такімі надзейней. Дый працаваць цікавей. Звальняць жа, калі што, не спяшаецца. Тройчы дае шанц застацца на вытворчасці. Наровіць ладзіць адносіны на ўзаемадаверы, бачыць у чалавеку асобу. Апошняю спробай захаваць працаўніка ў звыклым яму калектыве паўстае перад тым, як правіла, пытанне: «А ў якой якасці вы самі хацелі б рэалізаваць сябе?» На жаль, не заўсёды атрымліваецца па-добраму. І ўсё ж людзі не крыўдзяцца. Нават звольненыя.

Кіраўнік без калектыву, на яе думку, — нуль. Добры калектыў — гэта калі ў ім сабраліся не толькі аднадумцы. Жыццё там, дзе існуюць процілегласці: добрае і не зусім. Дадатнае і адмоўнае. Зноў жа — значнасць кіраўніку надае калектыў. Сіла калектыву — у дабрабыце людзей, у іх паўсядзённым настроі...

Ганна з недаверам ставіцца да тых, хто хутка «перабудоўваецца». Мяняе свае погляды ў залежнасці ад абставін. Без прамаруджвання. Бо хіба можна замяніць на нешта раўназначнае такія святыя паняцці, як сумленне, вера, адданасць радзіме, страціць свае прынцыповасць, мараль, перакананасць?!. Заставацца заўсёды

самім сабой — гэта таксама пазіцыя. Няўхільна-прынцыповая і ўпэўненая. Вядома ж, чалавек з цягам часу мяняецца. Нехта — у бок духоўнага пасталення. І нехта — у бок дэградацыі, разбурэння асобы.

Гандпёва-вытворчае прадпрыемства «Беллясгастэхніка» рэспубліканскага падпарадкавання. Але па меры магчымасці працоўны калектыў гэтага прадпрыемства дапамагае і дзецям-інвалідам, і ўдзельнікам вайны, і таварыству сляпых, і школе... Прымае ўдзел у будаўніцтве манастыра ў Дамашанах, царквы ў Сокале.

Колькі разрозненых слядоў-ланцужкоў можна ўбачыць пасля завейнай ночы, калі наўспрамкі прастуеш раніцай праз поплаў убок знакамітага прадпрыемства. У прыцемку не адразу ўзаб'ешся на нечы след. І ўжо калі троху развіднее, і чым бліжэй да прадпрыемства, ты раптам патрапляеш на ўжо добра азначаную сцяжыну...

Так нярэдка і ў жыцці бывае. Праўда, калі правільна абраны пэўны накірунак і стае рашучасці адолець непадступныя стромы на абраным шляху. Арыенціры Ганны Іванаўны Чачоткінай самыя надзейныя, і заблукаць ёй у жыццёвым лабірынце, трэба думаць, і надалей не давядзецца.

## І ЖЫВЕ ЯГО КАРПІЛАЎКА

Яго Карпілаўка... Жыццёвы выток, суцяшэнне, гаючая крынічка. І так здарылася, што не ён жыве ў вёсцы, а яна туліцца ў ім. У яго памяці. Вузкая ж вуліца з двума дзесяткамі хат даражэй і паглядней самага павабнага праспекта. А вунь, вунь тая сцяжынка — сяброўка басаногай пары. І ён імкнецца за ёй, бы за ніткай цудадзейнага казачнага клубка. А клубок успамінаў няспешна раскручваецца і вядзе да паратунку, ачышчэння і ўсведамлення існасці жыцця.

О, колькі моцы ў вас, родныя мясціны! Здаецца, зусім здарожыўся, знямогся, а прычасціўся душой — і падужэў. Скрухі й стомы як не было. Ты вяртаеш, любы куток, у дзяцінства — да светлых мар, да надзеі. Вяртаеш да родных і блізкіх, дарагіх магіл.

Вёска Карпілаўка... Яна не хаваецца ў засені прысад, яна наогул не прапісаная на тэрыторыі Прылепскага сельсавета. А была колісь суседкай Дубровы, Батурынкі... Пакуль не знеслі. Болей як сорак гадоў таму. Не пакінулі на тутэйшых могілках і нябожчыкаў. Мясцовасць жа апынулася пад хвалямі вадаёма.

Знікла з поля зроку вёска. Ды толькі не з памяці й сэрца гэтага чалавека. Яўген Вайцехавіч Кульваноўскі нарадзіўся ў Карпілаўцы. Тут, пад бацькоўскім дахам, адвеснавала яго дзяцінства. І калі жыццё ўжо надта дапякала, спяшаўся звычайна сюды. Сцішыцца на беразе і доўга ўзіраецца ў азёрную роўнядзь. Быццам імкнецца ўвесь напал нягод астудзіць у прахалодзе вадаёма.

Гэты ж раз наведаць родныя мясціны Яўгена Вайцехавіча закарцела і мне.

— Вельмі дарэчы, — жвава падхапіў ён. — І сам я даўнавата не быў. Усё не выпадала. Не, не настальгія па мінулым цягне мяне сюды. А, відаць, нейкая звышсіла, мая зорка вядзе. Тут я знаходжу суцяшэнне, супакой...

Яшчэ не бралася на паўдня, а спёка ўжо даймала. Непрыкметна цвілі й нярэзка духмянілі травы. Кожны крок значыўся пылком. А ўсцяж вадаёма жывымі хмаркамі тоўпілася драбнюткая машкара.

— Вось там мая Карпілаўка, — махнуў рукой у бок возера Яўген Вайцехавіч.

Яна была акурат у лагчыне, ягоная вёска, сярод даволі высокіх пагоркаў. З іх кіпнем выпірала зеляніна. І цяпер адна выспа звесіла пругкія грудзі кустоўя над самай вадой, бы прылягла напіцца.

Узгоркі, узгоркі... Рэдка дзе вока можа выхапіць роўны лапік. Нездарма ж Прылепскія абшары называюць маленькай Швейцарыяй.

— А вунь там, лявей, адкуль качка ўзляцела, — працягвае мой субяседнік, — працякала рачулка... Стаяў вадзяны млын.

Качка чыркала па воднай роўнядзі кончыкамі крылаў, быццам запалка аб карабок, і пырскі бісерам зырчэлі на сонцы.

Каржакаваты, сутулы... Так, Яўген Вайцехавіч сутулы. А што ж — сапраўдны селянін штодня адбівае нізкія паклоны зямліцы. Моцныя, учэпістыя рукі ў гэтага чалавека. Твар асветлены мудрасцю, што выходзіць з пранікнёнага, спагадлівага позірку разумных вачэй. Вусны цвёрдыя, валявыя. Міжволі прыгадваюцца словы аднаго калгасніка: «Строгі, але справядлівы». Старэйшына роду гаспадарнікаў раёна. Прылепская зямля дала трох выдатных кіраўнікоў: Анатоля Баніфатавіча Купрэйчыка, Вікенція Антонавіча Казлоўскага і яго — Яўгена Вайцехавіча Кульваноўскага. Яны амаль аднагодкі... Дваіх ужо няма.

За плячыма Яўгена Вайцехавіча пяць гадоў брыгадзірства, дзесяць — прааграноміў у калгасе імя Леніна і адзінаццаць — узначальваў калгас імя Гагарына. Такой ношкі пакуль не адужаў ніводзін сённяшні гаспадарнік раёна.

— А за ляском, на пагорку, — працягвае знаёміць мяне з роднымі мясцінамі Яўген Вайцехавіч, — узвышаўся фальварак пана Сіткевіча. Чырванацэглы прыгажун. Цяпер ад яго засталіся адно парэшткі падмурка. — Павярнуўся спінай да возера і з нейкай асаблівай цеплынёй і павагай зазначыў: — А той во лясок і лагчыну — па сённяшні дзень называюць Кульваноўскімі. Па прозвішчы майго дзеда Паўла. Там сядзіба яго была. Сёння аб ёй толькі сякія-такія слядкі сведчаць... Бэзу і язміну багата. Не вырадзілася прыгажосць.

Спыніўся ў колькі кроках ад возера і задумаўся. Скіраваў сумны позірк на ваду... І мне падалося, што свае ўспаміны ён чэрпае не з глыбіняў памяці, а з нетраў азёрных.

— Я нарадзіўся ў трыццаць дзевятым... І вайна не абышла маю дзіцячую памяць. Пракацілася па ёй. Жыццё вісела на валаску...

Немцы ўварваліся ў вёску. Усіх жыхароў сагналі да могілак. Людзі ў жаху застылі перад дуламі аўтаматаў. Фашысты збіраліся спаліць вёску. Яшчэ нейкі момант... Але двое афіцэраў аб нечым заспрачаліся над разгорнутай картай, тыцкаючы ў яе пальцамі... І нечага раптам змянілі свой намер. Як пасля высветлілася, яны пераблыталі вёскі. Карпілаўка была яшчэ і пад Чэрвенем. Менавіта тую вёску яны й меліся сцерці з твару зямлі.

Маці расказвала Яўгену, што вайна застала яе з ім у бальніцы, у Мінску. І як толькі пасыпаліся на горад бомбы, яна ў адным халаціку выбегла з сынам на вуліцу. Рызыкуючы жыццём, дабралася да роднай вёскі... Вайна не аднойчы расстаўляла смяротныя пасткі на жыццёвай сцяжынцы Яўгена, але іх пашчасціла абмінуць.

Бацькоўская хата. Самае дарагое і помнае звязана з ёй. Маці... Фёкла Аляксандраўна. Яе рукі не ведалі спачыну. А як яны песцілі лянок, што карміў і апранаў. Трасту ж сушылі ў лазенцы й на печы. Затым, пасохлую і храбусткую, мялі на ручной церніцы. І сыпалася, іскрылася на сонцы кастрыца. Пасля даводзілі да ладу трапашкай, грэбенем... І вось, ахайна звязаныя і складзеныя, мяккія і цёплыя, бы матчыны далоні, ручайкі валакна ільсняцца ладнай копкай на ўслоне.

— Чаму ручайкі? — І Яўген Вайцехавіч удакладняе: — Відаць, ад слова рука... Бралі добрую жменю валакна і звязвалі.

Гэта з бацькоўскай хаты ён вынес пашану да лёну — адвечна беларускай культуры... У раёне ўжо забыліся пра лён, а ён да нядаўняга часу вырошчваў яго ў сваёй гаспадарцы.

— З лёнам вымушаны былі развітацца, — не без жалю гаворыць Яўген Вайцехавіч. — Льнотэхніка адпрацавала сваё... Дый цана на льнопрадукцыю нявартая ўвагі... А лянок жа быў нашай, лічы, валютай!

З боку вадаёма падзьмуў ветрык. Злёгку пацягнула прахалодай. Яўген Вайцехавіч не пераставаў узірацца ў азёрную брынь. Яму прыгадвалася маці... Неяк расказала яна сыну мясцовую пабаску. Сутнасць такая. Прывёз гаспадар воз снапоў з поля. Убачыла квахтуха, кінула сваіх куранят і — скок на воз. Голасна кудахча, нагамі грэбае... Радуецца, што з хлебам усе будуць. Гаспадар жа — хлысь пугаўём! І забіў курыцу. Ноччу яна прыснілася яму, кажа чалавечым голасам: «Ты пасіраціў маіх дзетак, а я пасірачу тваіх». Зразумела, мужык не прыдаў гэтаму ніякага значэння. Нават забыўся пра сон. Але, калі назаўтра вёз снапы, кола трапіла ў каляіну — воз перакуліўся і падмяў яго... А яшчэ і такое помніцца Яўгену Вайцехавічу — на ўласныя вочы бачыў. Быў ён тады хлопцам нежанатым. Ехаў на веласіпедзе, і застала ў дарозе навальніца. Як раптам маланка ўдарыла ў пуню, дзе былі складзены снапы. Пуня загарэлася, і хлеб загінуў. Пажылыя вяскоўцы сцвярджалі, што, маўляў, Бог пакараў. Бо нельга было складваць у пуню снапы да Прачыстай.

— І гэта не нейкія прымхі ці выдумкі, — заўважыў мой субяседнік. — Мудрасць, вопыт пакаленняў... Няйнакш нейкай звышсілай уладкаваны сусвет і наша зямля. Разумна ўладкавана. І мы павінны берагчы гэты неацэнны дарунак. Усё трэба рабіць з павагай, любасцю не толькі да самога чалавека, але і жывёлы, дрэўца ды нават кусціка, травінкі, мураша і павучка... Гэтаму

найперш і вучыла мяне маці. За што я вельмі ўдзячны ёй.

Якая ж пашанота сёння старшыням калгасаў? Іх, як не кожнага, можна бэсціць, зневажаць... І гэта дазволена ўсім і на ўсіх узроўнях улады. Вось нядаўна на ўсю рэспубліку распякалі аднаго кіраўніка за тое, што ў сенакос дазволіў вяскоўцам гуляць вяселле. Маўляў, такая гарачая, адказная пара, а ім — гулі ў галаве... Дык што, старшыня павінен клапаціцца яшчэ аб графіках шлюбаў?!.

Ці вось яшчэ. Гэта не хто іншыя, а менавіта старшыні вінаватыя ў тым, што ў час сенакосу адпачываючым на берагах рэк і азёр гараджанам не ўзучылі ў рукі замест вудаў косы ды граблі!

— Заязджаю на днях на мехдвор, — працягвае Кульваноўскі. — Стаіць зламаная касілка. Ля яе корпаюцца механізатары. Падкасваю рукавы й кажу: «Давайце ключы... Паказвайце, дзе што круціць!» Хлопцы сумеліся: «Жартуе ці ўсур'ез?» А я тлумачу: «Мне кажуць, што старшыня не хоча рамантаваць тэхніку, таму і касьба не ладзіцца». Хлопцы смяюцца... Але ж і праўда: адказнасць на кіраўніка сёння ўскладзена неймаверная, а вось абароненасці й павагі ніякай. Не дагадзіў чалавеку — скарга! Зноў цябе калашмацяць. Таму, калі б выпала ўсё пачаць спачатку, то не згадзіўся б на такую пасаду... Здаецца, сёння адмовіўся б. Але пакінуць людзей у нялёгкую часіну не выпадае. Сумленне — толькі яно і ўтрымлівае. Паверце, я нават газету ў кабінеце чытаць не магу, калі гарачая пара і ўсе ў полі...

Людзі старэйшага пакалення не надта вітаюць прыватызацыю. А вось Яўген Вайцехавіч — яе прыхільнік. Бо з прыватнікам давядзецца размаўляць без знявагі й пагроз, а лагодненька і на мове эканомікі. А не так, як цяпер са старшынямі: «Незаменных няма!..» Вядома ж, папярэдне трэба выпрацаваць умовы прыватызацыі, закон, па якім яна павінна здзяйсняцца і які б ахоўваў

яе. Пасля спатрэбіцца гадкоў пяць, каб перабудаваць свядомасць людзей для ўспрыняцця прыватнага ладу гаспадарання.

— Зірніце вунь туды, — Кульваноўскі паказвае на процілеглы бераг возера, дзе процьма легкавушак, чырвоных, ружовых — няйначай, як лічынкі каларадскіх жукоў на бульбе. — Адпачываюць людзі. Сёння ж субота. А ці магу я, Кульваноўскі, прыпадобніцца да іх?.. Зноў жа ўсклікнуць: «У такі гарачы, напружаны час старшыня сваё пуза грэе!..»

Мне прыгадаўся адзін эпізод у кабінеце Кульваноўскага. Зайшоў загадчык фермы:

— Яўген Вайцехавіч, надзвычайнае здарэнне — тры рухавікі ў халадзільніку згарэлі.

— Будзем прымаць меры.

Загадчык выйшаў, а старшыня выклікаў па рацыі спецыялістаў. Тыя канстатавалі той жа факт.

— Вы тлумачыце на ўзроўні загадчыка фермы. Спецыялісты абавязаны асэнсаваць паломку дэталёва. Па якой прычыне? Хто вінаваты? З каго спытаць? Мне трэба ставіць пытанне на праўленні аб выдзяленні грошай на набыццё рухавікоў. А іх ажно тры. Гэта больш за дзесяць мільёнаў. — Пасля, калі спецыялісты пайшлі займацца справай, дадаў: — Урэшце, грошы з касы давядзецца браць мне. Пад асабістую адказнасць. Без усялякіх апраўдальных дакументаў... Рухавікоў у запасе няма. А малако кісне! Гэта страты! Марудзіць не даводзіцца. Якое выйсце? Ісці да прыватніка. А яму давай толькі наяўныя грошыкі. Вось і вымушаны браць на сябе адказнасць. Ходзіш на грані ордэра і ордэна. Гледзячы з якога боку да справы падысці.

Яго калгас — адна з нямногіх гаспадарак у раёне, дзе начыста адсутнічаюць падсобныя промыслы. Дый навошта самім перапрацоўваць малако, калі побач, у Смалявічах, малаказавод. Эканамічна нявыгадна, дарагоўля... Старшыня не спяшаўся з падсобкай яшчэ і

таму, што гэта не сялянская справа. Галоўнае — даваць малако, мяса, зерне... Тут і вопыт значны, і спецыялізацыя.

Тым не меней, яго гаспадарка адна з лепшых у раёне. Прыбытковая. І зарплату людзям без асаблівых затрымак выдаюць.

Ёсць поспех і стабільнасць, бо адчуваецца клопат пра людзей і павага да іх. Пабудаваныя сто чатырнаццаць кватэр. Рэканструяваныя фермы, заасфальтаваныя дарогі. Узяліся за будаўніцтва дзіцячага сада, фельчарска-акушэрскага пункта, газіфікуюць кватэры...

— Асобныя кіраўнікі казырацца, сцвярджаючы, што ў іх досыць кадраў, — закранае новую, не менш балючую праблему Яўген Вайцехавіч. — Не, гэта не так. Адчуваецца іх недахоп. Моладзі не густа. Дый тая не адмысловая. Сяк-так заканчваюць вучылішча і... Калі ў нас раней толькі пяць працэнтаў працуючых пакланяліся бахусу, то сёння — усе пяцьдзесят. П'юць... Не могуць размеркаваць свой сціплы бюджэт. Падзенне нораваў... Бо не паважаецца, абясцэнена праца селяніна. Чаго яна вартая, калі літр нейкай кока-колы ў шэсць разоў даражэй за літр малака? А як нялёгка яно даецца! Сёння механізатар працуе на касілцы з чатырох гадзін раніцы да дзесяці вечара. Васемнаццаць гадзін у суткі! Колькі ён здольны вытрымаць такую нагрузку? Дзень, два?..

Калі вярталіся назад, то я толькі й чуў ад Яўгена Вайцехавіча: «Вось у гэты лес я хадзіў па ягады, а вось на гэтым полі яшчэ падлеткам акучваў бульбу, а вось...»

Успаміны, успаміны...

## ЖЫЦЬ СЁННЯ

Ёсць незвычайныя горы... Без вяршыняў... Гэта — лёсы людскія... Чалавечыя жыцці... Але ж — калі дасягнуў пэўнай вышыні, а яна падалася табе вяршыняй, і цешыўся гэтым набыткам да скону, то ці жыў ты?

Задаволіўся дабрабытам? А душа? Яна ж, бы восеньскае дрэва, з сумам скідвае лісце няспраўджаных надзей. Аднак жа і рост дрэва абмежаваны. Так. Але да апошняга імгнення яно кожнай галінкай прагне, цягнецца да сонца. Да свайго творцы!

Жыццё чалавечае мае сэнс толькі пакуль поўніцца духоўная крыніца. І чым вышэй узыходзіш па сходах духоўнасці, тым усё болей аддаляецца вяршыня. Бы небасхіл. І гэта надае сілы, спараджае мужнасць... Няма межаў удасканалення духу!

Толькі здараецца і такое, калі чалавек міжволі спыняецца на ўзыходжанні: усведамляе, што не той абраў шлях. А распачаць новы не стае духу — стаміўся... Лёс здраджвае, як і ненадзейны спадарожнік у гарах. Але такою самай здрадай можа быць паралізавана і цэлае грамадства. Як ускалыхнуць людзей, скіраваць да вяршыняў сапраўднай духоўнасці?!

— Да завоблачных разваг не прывучаны, — неяк пры сустрэчы выказаўся старшыня калгаса-аграфірмы «Рассвет» Фёдар Рыгоравіч Бацяноўскі. — А зрэшты, кожнае меркаванне можна перакруціць на любы манер. У жыцці ж усё значна прасцей. Хто толькі не клікаў нас у светлае заўтра? І што ў выніку маем? Вялікую дулю... Дык вось, справа гонару кіраўніка — зрабіць усё магчымае і нават звыш таго, каб людзі жылі дастойна менавіта сёння. Пражытае нельга перайграць, кампенсаваць... Тут і раскрыйся, кіраўнік, свае начальніцкія здольнасці пакажы. Людзі ацэняць... І я не вельмі засмучаюся тым, што метады майго гаспадарання не недта традыцыйныя. Галоўнае — яны апраўдваюцца дабрабытам людзей...

— Вядома, калі людзі бліжэй і болей будуць ведаць вас, то гэта толькі паспрыяе справе... — Я стараюся не надта ўстраваць у размову — трымаюся свайго прынцыпу: больш слухаю, чым гавару. — Пра вас не тое што нарыс — раман можна пісаць!

— Не, пісаць пра мяне не трэба... Залішне ўсё гэта. Да славы я даволі абыякавы. — Ён хітравата-загадкава зірнуў на мяне — відаць, прыкінуў, што мне так проста не саўладаць з ім, і дадаў: — А калі й праўда надумаў ушанаваць маю асобу, тады найперш трэба наведаць маю Бацькаўшчыну. А як жа інакш... Дарэчы, бацька болей мяне заслугоўвае ўвагі. Франтавік. Да пенсіі настаўнічаў. І да ўсяго яшчэ — музыкант... Карані Бацяноўскіх глыбока заляглі ў тутэйшай зямліцы. Нават ёсць урочышча Бацяноўскае.

Раней Фёдар Рыгоравіч меў адметную звычку: адтапырыць сагнутыя кручком указальныя пальцы й на хаду рэзка паторгвае рукамі. Быццам вылузвае нешта з зямлі. Мабыць, так лепш думалася. Грунтоўней засяроджвалася ўвага на галоўным. Цяпер гэтая прывычка меней прыкметная. Рухі спаволіліся, але даволі жвавыя. Галоўныя рысы Федара Рыгоравіча — сялянскасць і людскасць. Позірк учэпісты, удумлівы... У спагадлівым выразе твару ўлоўліваюцца дзейнасць, воля і рашучасць.

Бацькоўскае котлішча Фёдара Бацяноўскага знаходзіцца на ўскрайку вёскі Куркава. На тым, што ў бок Каменкі. Агародам — на калгасны палетак. Усцяж — нізовіна, аздобленая астраўкамі кустоўя. Азярцо ці рачулка паблізу не люстраняць. У паўдзённым прыпары сцішылася ў засені прысад непрыкметная вулачка. Але неўзабаве ажывілася — вярталіся з папасу вясковыя кароўкі.

Сухарлявы, вышэй сярэдняга росту, рухавы мужчына ўпраўляўся з рагулямі. Адна ўпарцілася, выяўляла нораў. І ўтаймавалася толькі тады, калі вяроўчына абвіла рогі. Другая ж — цягнулася ззаду, хвостка сцёбаючы доўгім хвастом па поўных баках. Мужчына быў у тым узросце, калі старасць яшчэ не асмельвалася ўладна аказацца, а маладосць грашыла мітуслівасцю. Менавіта на такой жыццёвай вярсце я і заспеў Рыгора Фаміча Бацяноўскага.

Сядзіба не вабіла вока. Старэнькая, добра ашаляваная хаціна, здаецца, прысела, бо дворык заасфальтаваны на ўзроўні падмурка. Гаспадарчыя пабудовы рознай ступені ахайнасці й састарэласці. Паўдагледжаны даўні сад...

— Як у сорак шостым пабудаваліся, так і пасадзілі... — Рыгор Фаміч з саду распачаў размову. — Яго, як і нас, на новае месца не перацягнеш. Састарэлі... Хаціну ў сілах быў новую паставіць. Сродкі меліся... Толькі як гэта па тым часе настаўнік мог наважыцца «харомы» ўзводзіць?.. Буржуазныя замашкі... Таму лепш было не выдзяляцца. Затым — дзеці... А іх у нас чацвёра. Выгадавалі... У людзі вывелі... І ўсе разляцеліся з бацькоўскага гняздоўя.

Семдзесят сем гадкоў за плячыма ў Рыгора Фаміча. І, бадай, самае помнае ў іх — вайна!.. Не абмінуў партызанскую лясную сцяжыну. Толькі яна незабыўная яшчэ і тым, што сустрэў на ёй сваю адзіную — Вольгу Іванаўну, жонку... Вызваляў Смалявічы... Дайшоў да Берліна... Быў паранены.

Менавіта барысаўскае педагагічнае вучылішча вызначыла не толькі прафесійны накірунак у жыцці Рыгора Фаміча Бацяноўскага, але і духоўны. Чаму толькі тады не навучалі будучага педагога малодшых класаў. Ён быў, як кажуць, і жнец, і на дудзе ігрэц. Так, вучылі й музыцы. Рыгор Фаміч захапляўся скрыпкай, мандалінай, балалайкай... Праўда, нотныя прамудрасці глыбока не спасціг. Усё болей на слых арыентаваўся. Але найперш усвядоміў, што музыка — гэта мова душы... Мова — самая вартая яго ўвагі.

Нялёгкі жыццёвы шлях прайшоў Рыгор Фаміч. Маючы чатырох дзяцей, завочна скончыў геаграфічнае аддзяленне Белдзяржуніверсітэта. Вёў у мясцовай Куркаўскай школе геаграфію, працу, фізкультуру, спевы... Вольныя часіны аддаваў самадзейнасці, вёў заняткі ў музычным гуртку, кіраваў вучнёўскім ансамблем народ-

ных інструментаў. А яшчэ любіў вандроўкі па родным краі. Разам з вучнямі змерыў яго ўсцяж і ўпоперак. Гэта быў своеасаблівы працяг музычнай тэмы. Бо няма дзівосней музыкі палёў, лугоў, лясоў, рэк...

— Федзя вось да балалайкі прыахвоціўся, — з нейкім патаемна-светлым замілаваннем доўжыў размову Рыгор Фаміч. — Нават схільнасць да пісьменніцтва меў. У якім класе, ужо не памятаю, але рэдагаваў насценную газету...

У невялікай хаце начыння ўжо загуста. Ложкі, канапы, шафа — як самаробныя, з даўніны, так і сучасныя, з глянцам. І не дзіўна: а калі ўся сямейка завітае, дзе ўладкаваць?

— Само сабой, часцей за ўсіх Федзя прыязджае, — дадае Рыгор Фаміч. — Зразумела, нас праведвае... Часам сядзем: ён — з балалайкай, я — з мандалінай... Як урэжам! Ды нешта даўнавата не быў. Што і казаць, клопатаў у яго на сямярых хопіць. Толькі ці яму ад цяжкасцей збочваць. Працай жа выхаваны. Памятаю, у класе дзесятым ужо вучыўся... Неяк звяртаецца да мяне: «Хачу, бацька, касцюм чорны, кашулю белую, чаравікі модныя...» А я кажу: «Дык вунь, сынок, усё там... — І паказваю ў бок калгаснай фермы, дзе падмурак пад новы кароўнік закладвалі. — Ідзі, дапамажы...» І пайшоў... Вядома, мы пасля таксама да яго заробку даклалі. Так, грошы ў нас былі. Але ж галоўнае, каб сваім мазалём здабыў, каб цану ўсяму зведаў...

— І хату, і ўсю гаспадарку на дзяцей пакідала, — да мужавых слоў Вольга Іванаўна далучыла свае. — На цэлы дзень. Бо ведала, што і кароўку падояць, і свіней накормяць... Я ж медсястрой працавала... Спачатку на Ўсяжы, а затым і ў Смалявічах.

Рукі ў Вольгі Іванаўны нязграбныя, рухі запаволеныя... Занядужыла жанчына. Лічы, за дваіх даводзіцца Рыгору Фамічу ўвіхацца. Дый адкуль таму здароўю быць. Ці завіруха, ці дождж, а ў бальніцу спяшайся.

Там жа зноў не адагрэешся. І ўсё з халоднай вадой справу мела. Вось і прыдбала хваробу.

За акном мякка прытармазіла легкавушка.

— Федзя прыехаў! — узрадавана схамянуўся Рыгор Фаміч.

Фёдар Рыгоравіч таропка пераступіў парог бацькоўскай хаты:

— Я на хвілінку... — Падышоў да мяне — павітаўся. — Эйш, апярэдзіў-такі... А мне сказалі, што паехаў на маю вотчыну карэспандэнт... Хм... Усё непагадзь, а тут дзянёк добрага надвор'я. Кармы спяшаемся выхапіць... — Зірнуў на сумеўшыхся бацькоў і прысеў на старэнькае крэсла.

— А можа, сынок?.. — неяк загадкава кіўнуў у бок процілеглага кута Рыгор Фаміч.— Няхай карэспандэнт ацэніць... Можа, пахваліць, га?

— Давай, бацька!

Рыгор Фаміч жвава ўсхапіўся з месца. Неўзабаве вярнуўся з мандалінай і балалайкай. Шурпатыя, загрубелыя, зусім не ўласцівыя музыкам пальцы ўладна абхапілі тонкія грыфы. Адзін і другі рэзка ўдарылі па струнах...

— Вазьмі вышэй, — заўважыў бацька. — Бач, адчуваецца... Даўно не браў у рукі.

Фёдар Рыгоравіч натужыў струны. Схіліў набок галаву... І разлілася раздольна-нястрымнай, шчымлівай хваляй «Каробачка». Вольная, свабодная, незалежная ад клопатаў і паўсядзённай жыццёвай мітусні мелодыя запоўніла не толькі пакой, але і нашыя душы...

Адна мелодыя змяняла другую. Я зачаравана слухаў, і мне здавалася, што заблукаў у гушчыні высокіх сцёблаў жыта і жаўрук кранае трапяткімі крыламі сонечныя струны-промні — яны звіняць, граюць...

І вось — заціхлі мандаліна і балалайка... На імгненне ўсталявалася цішыня. Твары музыкаў асвятляла ўрачыстасць. Быццам пасля ачышчальнай малітвы. Зда-

валася, бацька з сынам далучыліся да нечага высокага, недасягальнага для іншых.

Фёдар Рыгоравіч заспяшаўся. Маці падрыхтавала трохлітровы слоік малака. Загарнула нешта ў паперу. То ж — сваё, хатняе. І смак у яго іншы, і пах... Хай паласуецца сынок і яго сямейка. Для маці дзеці ўвесь час застаюцца дзецьмі. І ўвагай, клопатам іх заўсёды хочацца сагрэць.

Бацькоўскі дом, музыка ўзрушылі Фёдара Бацяноўскага. Хацелася думаць аб нечым важным, вызначальным. І міжволі прыгадаўся такі выпадак... Карацей, няўдалы палёт... Ён узначальваў калгас «Звязда». Неяк руліў няспешна па прасёлку. Аглядаў пасевы, прыкідваў... Палі пераважна пагоркавыя. Роўнядзь толькі дзе-нідзе... І тут на макаўцы самай стромай выспы запрыкмеціў людзей. Тыя снoўдалі, мітусіліся... Няўжо болей няма чаго рабіць, як рунь таптаць? Пад'ехаў. А-а... Спартсмены. Дэльтапланерысты. Забраўся і ён на вяршыню. Кажа хлопцам: «Вось дык занятак сабе знайшлі... Такія дзецюкі, а займаюцца абы-чым... Ды гэта ж працей простага — палярцець з гары...» — «А вы паспрабуйце!..» — прапанаваў адзін. «Давай!» — Рашуча падышоў да дэльтаплана, ухапіўся за папярочку, разбегся...

Але як толькі ногі адарваліся ад зямлі, адвага пачала знікаць. Дэльтаплан стаў набіраць вышыню... Фёдар Рыгоравіч тузануўся ўлева, управа — не слухаецца, не паварочвае назад... Заставалася адно — тэрмінова пікіраваць... І ўрэзаўся ў зямлю... Сораму было не абрацца. Сур'ёзна падвёў вынікі: «Кожны павінен займацца сваёй справай— залатое правіла!»

І ён цвёрда трымаецца гэтага правіла. Але мець талент кіраўніка яшчэ недастаткова. Яго трэба няспынна і нястомна шліфаваць, удасканальваць. Цесна спалучаць і духоўны, і прафесійны рост. Каб утрымаць свой «дэльтаплан» у любых абставінах і не спасаваць перад вышынёй, Фёдар Рыгоравіч Бацяноўскі знайшоў сваё месца ў

жыцці. Аб іншым і не марыць. Адно імкнецца апраўдаць яго. І гэта яму ўдаецца. Дык якое ж шчасце яшчэ патрэбна?

Не, ён не лічыў сябе шчаслівым, калі са старшыньства ў «Звяздзе» апынуўся ў крэсле начальніка абласной ветлабараторыі. І ўсё таму, што недарэчны выпадак амаль на два месяцы кінуў на бальнічны ложак. Пасля лячэння трэба было набрацца сіл...

— Месца сабе не знаходзіў, начамі не спаў... — прыгадвае Аляфціна Віктараўна, жонка Бацяноўскага. — Пакуль не надарылася магчымасць вярнуцца ў раён, на пасаду кіраўніка калгаса-аграфірмы «Рассвет».

Згадаўся дакор бацькі. Маўляў, няправільна, не гуманна замест малака «атруту» выпускаць. Сутнасць справы ў тым, што калгас прыстасаваў старое памяшканне пад вінаробчы цэх. Але, калі б не Бацяноўскі, то нехта іншы запоўніў бы гэтую нішу. Вельмі выгадную. Ды яму, мясцоваму, хіба да твару выпускаць няякасную прадукцыю?

Мне давялося быць сведкам тэлефоннай размовы Фёдара Рыгоравіча з адным з яго падначаленых.

— Па акцызах разлічыцца тэрмінова, — патрабаваў старшыня.— Спыніць вытворчасць, ніводнай бутэлькі віна, пакуль не ліквідуеце запазычанасць!..

Цяпер думаюць пашырыць перапрацоўку сельгаспрадукцыі. Купілі недабудаваныя цэхі малочнага завода, які былі надумаліся падпарадкаваць барысаўскаму. Раён страціў бы такую капеечку! І вельмі крыўдна было, калі на пасяджэнне, на якім вырашалася такое надзённае пытанне, многія акцыянеры не з'явіліся. Няйнакш таму гэты «працэс» і замарудзілі, што Бацяноўскі рашуча выказаўся супраць аб'яднання.

— Вы не апасаецеся, што вашы пераапрацоўчыя цэхі могуць спыніць? — пацікавіўся я аднойчы ў Федара Рыгоравіча. — Такія прамысловыя гіганты сельгаспрадукцыі прастойваюць...

— Не спыняць, — адказаў ён спакойна. — А калі што — закансервуем, перапрафілюем... Урэшце яны сябе даўно апраўдалі. Якія ж мы гаспадары, калі будзем прадаваць сыравіну сабе на шкоду. Таму перапрацоўваем амаль усё: малако, мяса, гародніну, зерне... На чарзе — бульба. Досыць карміць людзей абяцанкамі. Жыццё даецца аднойчы. Кожны яго дзень аднолькава каштоўны. І сённяшні, і заўтрашні... А мы імкнемся жыць заможна ўжо сёння. Хіба гэта кепска?

Так, жывуць заможна... І ў пазыкі надта не залазяць. І жыллё будуюць, нават — катэджы... У гаспадарцы ўсе з павагай ставяцца да працаўніка, што якраз і спрыяе росквіту і памнажэнню яго духоўных набыткаў.

Калі жыццё напаўняецца сэнсам, то з'яўляецца патрэба імкнуцца да яго вяршыняў. Да высокай чалавечай вартасці.

## АДРАДЖЭННЕ

Радзіма... Якое велічнае, неабсяжнае паняцце! І дзівоснае. Накшталт усемагутнага джына, што цудоўна месціцца і пад неабдымным небасхілам айчыны, і пад дахам бацькоўскае хаты.

І нават, калі злы лёс руйнуе, нішчыць родную сялібу, радзіма не гіне. А назаўсёды перавандроўвае ў тваю душу і сэрца, дзе трапяткія ўспаміны пакрысе адраджаюць радзінны кут. Ён уваскрасае. Бо спарадзіў цябе дзеля таго, каб мацаваў Радзіму, часцінкай якой з'яўляешся і сам. Любоў жа да бацькоўскае зямлі вечная, як і ўсё тое, што выяўляе яе сутнасць.

...Разгубленасць апаноўвала ўсё болей і болей. Здавалася, яшчэ імгненне — і роспач узарвецца нясцерпным болем. «Дзе ж ты, мая родненькая?» — прашаптаў ледзь чутна. Перад вачыма толькі суцэльны саван снегу. Ды цішыня... Незямная... Сняжынкі надзвычай лёгкія, да бязважкасці. І ўяўлялася, што не падалі, а нерухома

віселі. Нібы спыніўся час, і ты ў іншым вымярэнні... Нястрымна падступала жаданне выгукнуць сваю скруху. На ўсе грудзі! Каб адчуць рэальнасць, каб пачуць... Каго?

Мікалай да болю ў вачах узіраўся ў далячынь. Позірк мітусіўся, хапатліва абмацваў наваколле: «Дзе ж яна, дзе?.. Хоць бы якая прыкмета!.. Памыліцца не мог... Павінна быць тут...»

І вось яго засяроджаны позірк проста ўрэзаўся ў дуб, які велічна застыў у нямым белым бязмежжы. На момант ашаламіў. Але тут жа выгукнуў: «Гэта ж наш, наш!.. — І таропка падаўся напрасткі, не зважаючы ўвагі на няроўнасці даволі заснежанай раллі. Дуб шырока раскінуў голле. Быццам намерваўся абняць нечаканага госця. — Ну, здароў... Лічы, пяць гадкоў не бачыліся. — Мікалай асцярожна дакрануўся далонню да шурпатай застарэлай кары. Яна падалася цёплай. — Прызнаў...»

Дуб рос на ўзмежку іх некалішняга агарода. Троху далей — бацькоўская хата... Толькі абярніся. Але Мікалай марудзіў.

Вёсачка Воранаў — яго басаногі жыццёвы разбег — была зліквідавана як пацярпелая. Родная вёсачка з птушынай назвай. Яе крылы спапяліў чарнобыльскі атамзабойца. Ці не досыць для чалавека адзінай натуральнай Боскай смерці?! Навошта ж столькі згуб панасылалі на сябе самі людзі? Утаймавалі атам. Дзеля жыцця... Толькі поруч з жыццём і смерць прысуседзілася. Атамзабойца подла, нябачна, па-здрадніцку нанёс удар...

Вось і яго, Мікалая Ўладзіміравіча Неўмяржыцкага, вёсачку Воранаў, што ў Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці, насцігла кара за людскую безадказнасць. Хоць гэтай бяды самі вяскоўцы ніякім чынам не наклікалі. Звычайна пакутуюць бязвінныя...

Мікалай Уладзіміравіч ведаў, што яго вёскі ўжо няма. Але не хацеў у тое верыць. Бо ці можна так, завочна, зміріцца з тым, што тваёй Бацькаўшчыны не існуе?.. Значыць — трэба захаваць у памяці ўсё, што засталося.

Да драбніцы. Каб у сваім сэрцы зноў узрадзіць другое жыццё радзімых мясцін. Бо гасцяваць тут наўрадці калі давядзецца.

Але такая магчымасць надарылася. Якраз спатрэбілася ехаць у Гомель па мінеральныя ўгнаенні. Працаваў тады Мікалай Неўмяржыцкі галоўным аграномам на эксперыментальнай базе «Жодзіна».

Ішоў ён спасцярожліва, быццам мог некага патурбаваць. А можа, не хацеў дачасна «будзіць» успаміны. Але ж такі працяўся ўрачыстасцю і святасцю моманту — ступіў на бацькоўскі падворак. Былы... Ён значыўся рэшткамі агароджы ды паглыбленнямі на месцах колішніх падмуркаў пад хаціну і гаспадарчыя пабудовы.

Воддаль сіратліва гібеў невялічкі сад. І было жудасна ўсведамляць, што ў яго дрыготкіх галінах, ва ўсім наваколлі затаіўся невідзімкай атам-згубіцель, злавесны й небяспечны. Ён прывёў у непрыгоднасць жыццёвую прастору, выгнаў з паселішчаў людзей... І на многія гады пазбавіў іх шчаслівай магчымасці вярнуцца назад.

Мікалай упершыню запрыкмеціў па абрысах прысад і ўсвядоміў, якой жа яна была маленькай, яго вёсачка, і такой неабароненай, бездапаможнай. А тады, у дзяцінстве, яна замяняла яму ўвесь свет. Здавалася неабсяжнай, вечнай...

Засталася і студня з замшэлым драўляным зрубам ды пахіленым жураўлём. Вадзіца пакрыўджана стаілася недзе пад тоўшчай снегу. А некалі яна, не атручаная, давала жыццё, праганяла смагу ў спёку...

Мікалай прыгадаў, як хлапчуком любіў зазірнуць у таемную глыбіню студні. Ён падаваў голас. І яму хтось гулка адгукваўся. Як з рупара, што вісеў на слупу ля калгаснай канторы...

Успаміны нахлынулі гарачай казытлівай хваляй... І ён быццам раптоўна асірацеў, быццам укралі нешта самае дарагое. Слёзы затуманілі вочы...

Звычайна расстанне бывае не такое самотнае і балючае, калі ёсць куды вярнуцца, да чаго прыстаць. Ну жыў тут, рос... Паехаў... Прыехаў... Затое калі цябе страчае чарнобыльская пустка з рэшткамі былога жытла, што беззваротна канула ў Лету, то ўжо аніякае вяртанне не можа суцешыць. Хіба толькі сарве бінт часу з ран памяці... І ўздыбіць вал скрухлівай даўніны.

Мікалай Неўмяржыцкі не развітваўся з любым сэрцу куточкам, які колісь значыўся яго вёсачкай Воранаў. Моўчкі, са шчымліва-пякучым пачуццём незваротнасці зрушыў з месца і пабрыў на шлях, да машыны. Як на відэастужку, кожную рыску, абрыс... ліхаманкава, прагна занатоўвала памяць, каб праз усё далейшае жыццё пранесці светлы сум па радзіме. Светлы сум... Так, сум.

Сядзіба Неўмяржыцкіх была адной з паглядных у вёсцы. Хаціна са стрыжнёвага, бы звон, сасновага бярвення. Зграбная. Высокі дах аздоблены ладным вільчаком. Хлявы, прысценкі, павеці, застаронкі вызначаліся моцай і гаспадарскім прыглядам. Падворак цешыў вока. Абяцаў яшчэ доўгія гады спраўна служыць Уладзіміру Іосіфавічу. Менавіта яго майстравыя, мазольныя рукі надалі сялібе такое вабнае і адметнае аблічча. Кожны кругляк, кожная дошка, маснічына, цвік... увабралі іх цяпло, рупнасць. І калі здрадзіў лёс — паслаў чорнага чарнобыльскага злыдня, які атруціў, збэсціў, знясіліў і адабраў здабытае, Уладзімір Іосіфавіч доўга не мог усвядоміць сэнс слова «ліквідаваць». Усё спадзяваўся, што гэта непаразуменне, памылка. Бо не толькі вёску меліся нішчыць, яго сялібу, але і яго жыццё — пажывому... Калі ж вёска ўжо зусім абязлюдзела, ён неахвотна падаўся у Мазыр, да Наталлі, дачкі. Але да апошняга цешыў сябе надзеяй, што нехта з маладых, застанецца, а заадно — і ён. Толькі дарэмна. І яшчэ не раз наведваўся ў Воранаў — пільнаваў хаціну. Каб не паздзекаваўся хто... Хацеў уратаваць вораноўскія ка-

рані, што насілкам, бязлітасна выкарчоўваліся з сэрца, з душы.

Чарнобыльскі крыж узлёг і на яго плечы. Хай супольна з бацькоўскай ношкай. Але і яго — нялёгкая. Такія помныя воранаўскія дзянькі, гадкі...

Жыўнасці Неўмяржыцкія мелі ніштавата. Дзве кароўкі. Зразумела, і цяляткі ў свой час з'яўляліся. А свіней, на прыкід Мікалая, было нават залішне. Ён, тады ўжо ў некалькіх кроках ад юнацкага парога, меў патрэбу ў дадатковай свабодзе. Балазе, сястра Наталля ды брат Анатоль поруч... Маці, Кацярына Мікалаеўна, яшчэ на досвітку збольшага хатнія клопаты «прычэша» — і на саўгасную ферму, да цялят. Шчырая, няўрымслівая жанчына. Што ж да бацькі, Уладзіміра Іосіфавіча, то, як дыхне спелым прыпарам зямліца, — з цямна да цямна прападае на саўгасным палетку. Механізатар! Толькі позна ўвечары, ды самайранічкай і бывае дома. Затое, як сцішваўся саўгасны абшар, з падворку — ні кроку. Наганяў упушчанае: корпаецца ў хляве, даводзіць да ладу платы, пабудовы, нешта майструе... Надта шанаваў тэхніку. То ж без яе якія зрухі!? Таму, калі набываў саўгас новы трактар, не ўзнікала пытання: «Каму?» Уладзімір Іосіфавіч нязменна «цугляў» і «аб'езджваў» сталёвага рысака. На сваім апошнім Т-25 без капітальнага рамонту ажно восем гадкоў «праскакаў». Разам з ім і на пенсію падаўся. Выкупіў.

Бацькава гаспадарлівасць, прыхільнасць да зямлі сталі вызначальнымі ў лёсе Мікалая. Пэўна ж, менавіта гэтыя якасці служаць, уласна, крытэрыем пашаноўлі хлебароба.

Палеткі браліся раллёй... Мітусня, гвалт варон, гракоў, воранаў — безліч тлумных птахаў апавяшчала аб абуджэнні зямлі. Яны засумотніліся па ёй і голасна радаваліся стрэчы, да забыцця. Яна ж, расчуленая, частавала іх сваёй першай спожыццю.

Пара ачуняння зямлі ўражвала Мікалая. У гэты час ён імкнуўся быць поруч з бацькам. Каб самому спасцігнуць яе тайніцу... Хоць бы й тое ж зярнятка. Прарасце, да сонца цягнецца. Нарэшце коласам зашапаціць... Колькі сабе падобных зярнятак народзіць! І дасць спажытак людзям. Галоўнейшы!

Мікалай нярэдка дакучаў бацьку сваёй хлапчукоўскай дапытлівасцю. Яму, падлетку, уяўлялася, што дастаткова адкрыць нейкі цудадзейсны сакрэт ураджайнасці — і турбатня вакол хлеба скончыцца. Ва ўсялякім разе, не будзе такой высільваючай.

— Тата, ты ў цуд верыш? — неяк сын агарошыў бацьку нечаканым пытаннем.

— У які гэта? — утаропіўся ў надакучніка Уладзімір Іосіфавіч.

— Ну, што зярняты жыта могуць быць з фасоліны?..

Бацька ўсміхнуўся і выцягнуў перад сабой напрацаваныя вузлаватыя рукі:

— Я вось у іх, сынок, веру... У свой вопыт... Ды ў каня жалезнага, — кіўнуў у бок трактара. — Ты толькі што падсабляў мне за рулём... І не адчуў, што гэта не машына, а сапраўдны цуд. Ну, хто мы без гэтага чараўніка-памочніка?

— Ды я не пра тое...

— Разумею... Твае дзівосы разгадае хіба толькі навука.

«Навука?..» Упершыню Мікалай адчуў сябе незвычайна ўпэўненым і дужым. Нейкая звышсіла ўлілася ў яго істоту. А ўсё тлумачылася проста — запрыкмеціў сваю сцяжыну ў жыцці. Усвядоміў сэнс свайго існавання. Хай не канчаткова, не надта ясна і поўна, але пачалі непакоіць, казытаць — прарастаць крылы!

Вучыўся Мікалай Неўмяржыцкі добра. Пачатковую і сярэднюю прыступкі адукацыі пераадолеў паспяхова. Хлопца вызначала летуценная задуменнасць,

рамантычная сцішанасць. Але і весялосці, і нават гарэзлівасці ставала.

З паступленнем у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію пачала здзяйсняцца мара авалодання сакрэтамі ўраджайнасці. Схільнасць да агранаміі неўзабаве выявіла і здатнасць у гэтам накірунку. І чым грунтоўней спасцігаў навуку, тым усё больш аддалялася надзея напаткаць дзіва, цуд... Якраз і спатрэбіліся Мікалаю якасці, якімі шчодра абдарылі яго бацькі: працалюбства, цярплівасць, незайздрослівасць, дабрыня. А хіба іншыя рысы могуць быць уласцівыя тым, хто мае непасрэднае дачыненне да хлеба?!

Ужо на другім курсе Мікалай узяўся за дыпломную работу. Яна тычылася яравога ячменю. Патрабавалася даказаць, пацвердзіць уплыў рознастайных фактараў на фарміраванне ўраджаю. Прычым у рознаварыянтным выкананні. Карпатлівы, працаёмкі занятак. Але толькі ён дазваляў уявіць будучаму спецыялісту, як дапамагчы зямлі, прыродзе даць патрэбнае чалавеку. Удумайцеся толькі — дапамагчы прыродзе!.. І якія трэба мець веды, узровень адказнасці, каб быць дастойным такога гонару.

Чацвёрты курс. Час апрабоўвання тэарэтычных набыткаў...

— У вас, Мікалай Уладзіміравіч, задаткі вучонага, таму практыку вы павінны праходзіць у інстытуце аховы раслін, — настойліва раіў кіраўнік дыпломнай работы, прафесар, доктар сельскагаспадарчых навук Эсхат Мінібаевіч Мухаметаў. — Ваша згода — і я ўсё ўладкую.

— Дзякуй за клопат, Эсхат Мінібаевіч. Мяне цягне на палеткі саўгаса Мічурына. Хачу паспрабаваць свае сілы там. Калі ўжо на саўгасным полі нешта змагу, то і на доследным участку атрымаецца. Я ж — будучы спецыяліст. Таму сумленне абавязвае. І маладыя яшчэ... Паспею.

— Малады, паспею... Навука, даражэнькі, патрабуе ўсяго жыцця, да рэшты. Мне гэта добра вядома. Можаце паверыць. Работа вучонага знешне мала прыкметная, і вынікі не часта радуюць... А маладосць звычайна імкнецца хутчэй праявіць сябе, паказаць. Дык вось, малады чалавек, не спазніцеся... Так. так. Навука адтэрміноўкі не церпіць.

Мікалай у глыбіні душы пагаджаўся з прафесарам. Але родныя гоні, бы покліч, уладна клікалі да сябе. І ніякія довады не маглі стрымаць.

Дома прынялі, як свайго. З даверам, надзеяй і прыхільнасцю. Прызначылі на пасаду агранома-насенневода. І не як практыканта, а як спецыяліста. На поўную штатную зарплату. Гэта надавала ўпэўненасці. Самастойнасць жа спрыяла разгортванню ініцыятывы. А яе Неўмяржыцкаму было не займаць. І ў першую чаргу яна праявілася ў настойлівай рэалізацыі навуковых метадаў вядзення справы. Менавіта ў захаванні тэхналогіі ад «а» да «я». Гэты падыход, як высветлілася, аказаўся найболей эфектыўны. І поспех нязменна спадарожнічаў пачынаючаму спецыялісту. А калі твае задумкі й веды рэалізуюцца, то праца захоплівае, натхняе. Ператвараецца ў творчы працэс. Дасягнуў адной мэты – і тут жа не церпіцца ўзяцца за новую справу. Яшчэ болей важную, нават у пэўным сэнсе рызыкоўную. Пачаў здзяйсняцца «цуд», які мроіўся ў дзяцінстве. Але досыць акрэслены, рэальны.

І пасля заканчэння акадэміі, яшчэ амаль тры гады Мікалай Неўмяржыцкі не пакідаў свой саўгас. Не мог прагнаць смагу дзейнасці. Але працаваў ужо ў якасці галоўнага агранома. І так удала, што вымусіў быць заўважаным. Нават старажылы знялі шапкі перад «чарадзействам» агранома. Гэта ж каб так раздобрылася іх збяднелая зямелька! Пясок ды выпрацаваныя тарфянікі. Урадлівасць ворыва значылася ў 22 балы. І на табе даруначак — 35 цэнтнераў збожжавых з гектара!

Прызнанне, павага, аўтарытэт. Для іншых — верх магчымага. Але не для Неўмяржыцкага. Усё часцей адольвала перасцярога прафесара Мухаметава: «Навука адтэрміноўкі не церпіць». Толькі даводзілася зноў і зноў адкладваць... І не таму, што поспех казытаў самалюбства, а ўсё новыя і новыя справы зацягвалі ў свой кругаварот. Здаваліся неадкладнымі.

Ну так, дарогу ў горад Жодзіна галоўны аграном саўгаса імя Мічурына Лельчыцкага раёна ведаў добра. Бо там яго мара — Беларускі навукова-даследчы інстытут земляробства. Наведваўся па справах: набыць насення новых гатункаў збожжавых, пазнаеёміцца з перспектыўнымі тэхналогіямі вырошчвання сельгаскультур... Але галоўнае — удыхнуць такое жаданае паветра навуковай установы. Прылучыцца, хоць і ўяўна, да яе клопатаў. З невымернай павагай і хваляваннем пераступаў ён парог інстытута. Сэрца білася ўзрушана, а ў такт яму поклічна пульсавала думка: «Я павінен вучыцца тут... Нельга адкладваць... Тут маё месца!»

І лёс паспрыяў яго жаданню. Праўда, своеасабліва...

Паклікалі ў райкам партыі. Наконт Неўмяржыцкага там былі свае прыкіды. Дырэктар саўгаса імя Мічурына не задавальняў раённае кіраўніцтва. Гаспадарка стала недамагаць, хібіць... Патрабавалася, як кажуць, уліванне свежай ініцыятывы. І бачылася кандыдатура ў старшыні якраз у Неўмяржыцкім. Даволі выразна. Прыйшоўся да двара. Мясцовы. Сур'ёзна заявіў аб сваіх прафесіянальных магчымасцях. Сціплы, самавіты. З творчым запасам... Факт тутэйшага паходжання надзвычай важны ў сэнсе адказнасці. А тут яшчэ на зыходзе кандыдацкі стаж. Партыйнасць жа толькі ўзмоцніць пачуццё абавязку.

Словам, у райкаме разлічвалі на Мікалая. І першы сакратар Уладзімір Анісімавіч Мірановіч не бачыў сур'ёзных прычын для нязгоды.

— Ну, як працуецца? — сустрэў ён Неўмяржыцкага звыклым да банальнасці пытаннем.

— Нармальна, — адказаў Мікалай.

— А як людзі?

— А што людзі... Як ты да іх, так і яны да цябе.

— А ў сэнсе дысцыпліны?

— У дысцыпліны, на мой погляд, матэрыяльная аснова... Парадак ёсць тады, калі людзі зацікаўленыя ў выніках працы. Калі нешта маюць. У гэтым выпадку парушэнні працоўнай ці тэхналагічнай дысцыпліны толькі сабе на шкоду.

— Вось, вось... У раслінаводстве ў вас поспехі прыкметныя. А ў астатнім? І ў цэлым па гаспадарцы?

— Канчатковы здабытак не задавальняе...

— Адсюль вынікае і агульны настрой. Карацей, і вы, і рабочыя саўгаса не маюць магчымасці спаўна рэалізаваць сябе. І якая гэтаму перашкода? — у позірку першага сакратара праскочыла хітрынка.

Тут Мікалай зразумеў, куды хіліць Міранові́ч. Унутрана сабраўся і сказаў:

— Дарма стараецеся, Мікалай Уладзіміравіч... Іду ў навуковую сферу.

— А мы вырашылі, — нетаропка працягваў сакратар, — што лепш будзе для ўсіх, калі вы, Мікалай Уладзіміравіч, узначаліце гаспадарку.

Неўмяржыцкі на імгненне сумеўся. Не кожны ў няпоўныя дваццаць пяць удастойваецца такой прапановы. Але недзе там, у глыбіні душы, у прасторах свядомасці заварушыўся пратэст. Пакуль нерашучы... Пачаў асцярожна аднеквацца:

— Не... Гэтая ноша не мая. Не саспеў я... Нядаўна скончыў акадэмію... У агранаміі нечага дамогся, а тут... Не! Дроў такіх наламаю... У эканоміцы, у планаванні, у бухгалтарскім уліку недасведчаны... Зеленаваты.

— Маладосць не загана, — стаяў на сваім сакратар. — Што ж тычыцца прагалу ў адукацыі, то пашлем

на паўгадовыя курсы маладых кіраўнікоў. У сталіцу. Згода?

Для катэгарычнай нязгоды падстаў не было. Адмову ж маглі растлумачыць па-рознаму. Хутчэй за ўсё практыцызм узяў верх. Бо сельскагаспадарчая навука ў нас не ў вялікай пашане — для рэалізацыі яе дасягненняў у гаспадарак усё меней і меней магчымасцей. І Мікалай не запярэчыў. Да таго ж — знайшоўся і суцяшальны фактар: «А ўсё ж да Жодзіна бліжэй, чым да Мінска».

Займаючыся на курсах, падрыхтаваўся і паступіў у аспірантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства. Час вучобы на курсах праляцеў непрыкметна.

Вяртанне непакоіла Мікалая. Меней за ўсё яго цешыла сустрэча з Уладзімірам Анісімавічам Міранinformal вічам — паступіў у аспірантуру без яго ведама. Цішком. А цяпер вось давядзецца адказваць. Але апасенні Неўмяржыцкага былі марныя.

— Правільна зрабіў, — шчыра сказаў Уладзімір Анісімавіч. — Талент не кожнаму даецца. Рэалізуй... А гаспадарку ўсё роўна ўзначаліш... Будзеш завочна вучыцца.

— Не, Уладзімір Анісімавіч...

— Разумею... Не хочаш ісці ў свой саўгас. Накіруем у іншы.

— Хачу на стацыянары вучыцца... Паверце, гэта мая запаветная мара. А пакіраваць яшчэ паспею. Толькі ж дваццаць пяць. А вось навука чакаць не будзе.

— Што ж, Мікалай Уладзіміравіч, дай табе Божа... А пасля назад вернешся?

— Не ведаю... Як жыццё складзецца... І апошняе, Уладзімір Анісімавіч, — голас Мікалая пагучнеў.

— Выкладвай, — панура схіліў галаву Мірановіч.

— Мой кандыдацкі стаж яшчэ не скончыўся. А на новым месцы, відаць, давядзецца пачынаць усё спа-

чатку. Таму, прашу, прыміце мяне ў партыю тут, дома.

— Думаю, уладзім... На бліжэйшым бюро.

Сёння можна па-рознаму ставіцца да партыі камуністаў. Але не да тых партыйцаў, якія шчыра верылі ў непазбежнасць усталявання справядлівасці. І не ашчаджалі сябе дзеля здзяйснення светлай мары. Імі рухала высокая мараль. Яна ўздымала іх над астатнімі. Перш за ўсё — добраахвотнай адказнасцю за лёс краіны.

Беларускі навукова-даследчы інстытут земляробства стаў для Мікалая Неўмяржыцкага не толькі марай, але і месцам працы. Праўда, незвычайным месцам. Накшталт стартавай пляцоўкі ў нязведанае. Палёт жа павінен быў падрыхтаваць і здзейсніць ён сам. З якой мэтай? Адкрыцця? Так. Але на першым часе — хаця б прыадчыніць браму патаемнасці, за якой... Што прыхавана там для яго? Урачыстае, светлае пачуццё агортвала пры гэтай думцы. Паднядзельвала ж настрой здзяйсненне доўгачаканай магчымасці сустрэцца з навукай. Адзін на адзін. Без прысутнасці вытворчых спраў. Яны ж неяк разам адхінуліся. І ледзь значыліся ў яшчэ ўчарашняй, але ўжо далечыні. Навука, навука... І ў святочную бязважкасць уражання неўзабаве ўладна ўварвалася свежае паветра няўтольнай прагі дзейнасці.

Тэма кандыдацкай была вызначана так: «Ураджай і якасць зерня ячменю новых гатункаў у залежнасці ад азотнага харчавання і сродкаў аховы». І гэты накірунак даследавання не выпадковы. Ён яўна перагукваўся з летуценнем дзяцінства аб цудзе. А якраз азот — адно з самых чарадзейных мінеральных угнаенняў. Гэта ён, азот, утварае зялёную масу. Лісце — далоні раслін, што цягнуцца да сонца. Насычаюцца ім. Па-навуковаму — фотасінтэз: бялкі, ураджай. Але калі перакарміць расліны азотам — бяда! Колькі ж трэба азоту, каб атрымаць найбольшы ўраджай? На

гэтае, галоўным чынам, пытанне і меўся адказаць сваімі даследаваннямі Мікалай Неўмяржыцкі.

Вёў доследы ў многіх паўторнасцях і варыянтах. Каб высветліць, якія суадносіны ўгнаенняў, якія глебы, умовы найлепш спрыяюць праяўленню цудадзейснай сілы азоту.

Усё складвалася добра. Малады навуковец пачынаў адчуваць упэўненасць у сваіх памкненнях. Аднак бязлітасная зменлівасць лёсу чорнай кошкай перабегла запаветны шлях. Толькі пяць месяцаў пашчасліла пабыць у жаданай стыхіі. У красавіку-маі 1987 засеяў доследныя ўчасткі. А ў жніўні, калі яны парадавалі адменным ураджаем, завітаў да яго дырэктар эксперыментальнай базы «Жодзіна» Мікалай Сцяпанавіч Халянкоў, які з уласцівай яму рэзкасцю і прамалінейнасцю акрэсліў новы паварот у жыцці Мікалая.

— Відаць, плоцяць тут не надта? — кінуў з лёгкай усмешкай Халянкоў.

— Ды так... Хапае.

— І кватэры не абяцаюць?

— Пакуль не...

— На прыватнай перабіваешся?

— Даводзіцца...

— Словам, перспектыва ў сямейным плане невыразная. Дваіх дзетак маючы... — Фразы кароткія, колкія. Бы шылы. І ўсе, быццам наўмысна, мецяць у адну балючую кропку — б'юць па самалюбству. — Карацей, ідзі да мяне галоўным аграномам. Кватэру атрымаеш... Дарэчы, сам дырэктар цябе рэкамендаваў. Так-так, Уладзімір Паўлавіч Самсонаў. А навуку завочна адолееш. Падумай... Узваж... Адказ чакаю заўтра. І ніякай адтэрміноўкі.

Ашаломлены такім бесцырымонным неспадзеўным наскокам, Мікалай нейкі час не мог ачомацца. Жаль, смутак, бездапаможнасць... Няўжо — асадзі назад! Ён, зрэшты, і сам разумеў сітуацыю, але не так выразна і

прыземлена. Сапраўды, што ён можа даць сям'і ў сённяшнім становішчы? А абавязаны. Галава. Няўжо няма ніякай надзеі, зачэпкі? На гэтае пытанне мог адказаць толькі дырэктар інстытута. І Мікалай неадкладна накіраваўся да яго.

— Чаму, Уладзімір Паўлавіч, ваш выбар спыніўся на мне?

— Як вы ведаеце, Мікалай Уладзіміравіч, эксперыментальная база «Жодзіна» у адной звязцы з інстытутам. Яе галоўная задача — укараняць у вытворчасць нашы распрацоўкі, тэхналогіі, размнажаць выведзеныя намі гатункі збожжа, рэалізоўваць іх гаспадаркам... А ў апошні час мы не адчуваем належнага кантакту з кіраўніцтвам базы, дзейснай дапамогі. І справа тармозіцца. Вы ж — у адной асобе спалучаеце і практыка, і вучонага. Дык хто лепш за вас зможа дапамагчы інстытуту, навуцы?

— На чым грунтуецца ваша дасведчанасць пра мае практычныя здольнасці?

— На той самай характарыстыцы на вас, што даслаў мне першы сакратар Лельчыцкага райкама партыі Міранові́ч.

— Скажыце, а кватэра, калі застануся ў інстытуце, мне свеціць?

— Надзвычай праблематычна. Мы нічога не будуем. І з-за беднасці наўрад ці будзем... Вы здольны, энергічны чалавек, — падбадзёрваў Уладзімір Паўлавіч. — І вучоным абавязкова станеце. Інстытут — побач... Урэшце — вас ніхто не вымушае.

Але Неўмяржыцкі ўжо не ўспрымаў сутнасць доваадаў. Яму рупіла хутчэй застацца сам-насам. Супакоіцца. Усё дасканальна ўлічыць. Прыняць рашэнне. Намер дырэктара інстытута быў зразумелы. Уладзімір Паўлавіч перш-наперш — кіраўнік навуковай установы. І гэтая акалічнасць абавязвае дзейнічаць адпаведна займаемай пасадзе. Дбаць пра поспех у цэлым. А

значыць і яго, Неўмяржыцкага, намаганні павінны быць падпарадкаваныя агульным інтарэсам.

На дадзены ж момант Неўмяржыцкі-аграном карысней для інстытута, чым Неўмяржыцкі-вучоны. Калі ад вучонага прычакаеш належнай аддачы... А тут — адразу. І з выгадай для ўсіх. Навуковых распрацовак на сёння нямала. І бадай усе яны бездапаможныя, быццам немаўляты, не маюць руху ў вытворчасць. І менавіта ён, Неўмяржыцкі, і ніхто іншы, будзе спрыяць укараненню іх у вытворчасць. Хіба гэта не ганарова?! І калі ўсё толькі ад яго залежыць, то ён проста абавязаны...

Многія лічаць сябе докамі ў сельскай гаспадарцы. Маўляў, паболей гною, дожджык у патрэбны час — і ўраджай з поля не звезці! А таго не разумеюць, ці свядома не хочуць уцяміць, што нават нязначныя адхіленні ад тэхналогіі вырошчвання культур прыводзяць да значнага недабору прадукцыі. Ад той самай тэхналогіі, якую рэкамендуюць вучоныя. Калі ж пашанцуе, то поспехі прыпісваюцца кіраўнікам, уладу маючым. А ў выпадку няўдачы — ківаюць на вучоных: «Гэта яны падкінулі нікчэмную збажыну...» Які гаспадарнік прызнаецца, што проста не змог як след забяспечыць рост ураджаю!

Мікалаю Неўмяржыцкаму, у ролі галоўнага агранома эксперыментальнай базы «Жодзіна», якраз і давядзецца ў рэальных умовах даказаць перавагу той ці іншай распрацоўкі або тэхналогіі. А затым укараніць у вытворчасць. З размахам. Гэтым ён і абароніць навуку, уздыме на належную вышыню, якой яна па праву заслугоўвае.

А колькі маладых таленавітых навукоўцаў так і не змогуць раскрыць свае патэнцыяльныя магчымасці?! Гэта ж такі ўрон для навукі. Магчыма, сёння ён не так адчувальны. А заўтра, у недалёкім будучым?! А ўсё з-за таго, што яны, як і ён, Неўмяржыцкі, пазбаўленыя, нават па самых сціплых мерках, спрыяльных умоў для жыцця. Звычайнага — чалавечага. Але для яго гэта не перашкода.

Мікалай унутрана зміры́ўся з новым выкрутасам лёсу.

Дакладней, пераканаў сябе ў мэтазгоднасці такога кроку. Гэта — неабходнасць, патрэба.

Дома вельмі ўважліва паглядзеў на жонку. Яна адчула нейкія нелады, але змоўчала. Звычайна ён сам расказвае. А тут звёў за спінай рукі й пачаў нетаропка мерацць крокамі пакойчык.

— Ты што, вязень?

— Гэтак, гэтак, Таня... У зняволенні абставін. Толькі ў астрозе нават большая камера, чым наш пакойчык.

— Нічога, пацерпім.

— Цярпець можна толькі тады, калі ёсць нейкая надзея...

— А ад інстытута?..

— Ніякай.

— Нешта прыдумаем.

— Гэта ж парадокс: аграному кватэру — калі ласка! А вучонаму — вiламі па вадзе пісана.

— Ты пра што?

— Скажы, колькі мы вытрымаем у такіх умовах?

Недзе ў бакоўцы кашлянула бабуля-гаспадыня. Дзеці ж бесклапотна гулялі на падлозе. Ім бацькоўскія турботы яшчэ былі няўцям.

— Галоўнае — аспірантура. Я ведаю, што для цябе гэта значыць.

— Разам з тым я не магу дазволіць, каб мая сям'я пакутавала, калі ёсць шанц.

— Пайсці аграномам?

— Так. На эксперыментальную базу... Кватэру паабяцалі.

— А не падвядуць?

— Не думаю.

— А як жа вучоба?

— Я хлопец — сялянскі, жылісты. Здужаю. І працаваць буду, і вучыцца. Сумяшчэнне, магчыма, не лепшае выйсце, але іншага не бачу. Гэта лагічны крок, без якога нічога добрага не прадбачыцца.

— Асілім. Я ж заўсёды побач. На маю дапамогу можаш разлічваць...

Назаўтра даў згоду. Толькі яшчэ раз удакладніў у дырэктара базы Халянкова:

— Кватэру гарантуеце?

— Ды гарантую.

Але, як кажуць, абяцанага тры гады чакаюць. А тут і гэты тэрмін зыходзіў, а з кватэрай усё марудзілі. Кандыдацкую ж дысертацыю абараніў. Праз сем гадоў.

Лёс рыхтаваў новыя выпрабаванні. Жыццё працягвалася.

Тры гады пасрэдніцкай дзейнасці для Мікалая Уладзіміравіча Неўмяржыцкага напоўненыя супярэчлівым зместам. Неўмяржыцкі, галоўны аграном эксперыментальнай базы «Жодзіна», апынуўся на скрыжаванні інтарэсаў навукі й вытворчасці.

Ураджай на дзялянках вучоны атрымліваў усё пад поўную патрэбу. І ўсё рабілася як след. А на полі базы ён не мог узяць належны разгон. Высільваўся. Бо задавольваўся тым, што мелася пад рукамі, а потым — як атрымлівалася. У выніку — аўтарытэт навукі пакутаваў, а яе залежнасць ад практыкі ўзмацнялася. Між тым, навукова-вытворчае аб'яднанне «Колас» стваралася з дакладна вызначаным намерам. Навукова-даследчы інстытут земляробства і кармоў — галоўны! А эксперыментальныя базы, у тым ліку і «Жодзіна», — дапаможныя, падпарадкаваныя яму. Бы крылы, якія павінны былі вынесці распрацоўкі вучоных інстытута на палеткі краіны. І нават за яе межы. Але ў гэтых крылаў пачалі вырастаць свае галовы. І не на пустым месцы. Кіраўніцтва баз не толькі павінна было забяспечваць патрэбы навукі, але несла адказнасць за выкананне планаў продажу дзяржаве малака, мяса... Гэтая акалічнасць дазваляла не надта лічыцца з інтарэсамі інстытута. Балазе, ёсць зручнае

прыкрыццё: маўляў, спраў і так безліч. Важных... За гэтыя справы й спагоняць у першую чаргу, і па галоўцы хутчэй пагладзяць. Навука ж нікуды не дзенецца.

Са свайго боку Мікалай Неўмяржыцкі рабіў усё магчымае, каб хуткая паўсядзённая выгада не «падмяла» шматгадовыя напрацоўкі вучоных. Але ці толькі ад яго аднаго ўсё залежала?!

Тым часам мову кіраўніка базы ўсё меней разумелі ў інстытуце. Яго адметная «інтэлігентнасць» прыйшлася не даспадобы як спецыялістам, так і працаўнікам гаспадаркі. Словам, падшуквалася новая кандыдатура. Пайшла чутка, што прэтэндэнты ёсць нават у Смалявіцкім раённым упраўленні сельскай гаспадаркі. Няпэўнасць становішча вымусіла спецыялістаў базы сабрацца ў дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства і кармоў Уладзіміра Паўлавіча Самсонава. Каб высветліць, хто ж самы дастойны?!

Дырэктар моўчкі адчыніў сейф. Дастаў пакоўную папку і пляснуў аб паліраваны стол.

— Вунь колькі іх, жадаючых кіраваць! — не без іроніі выгукнуў Уладзімір Паўлавіч. — Нават акадэмікі ёсць. Толькі я прапаную Мікалая Ўладзіміравіча Неўмяржыцкага. Навуковец. Практык. Самавіты памяркоўны чалавек. Пераварыце, паважаныя, маё меркаванне. А пакуль — нарада скончана.

Усе ад нечаканасці сумеліся. Найболей жа — сам Неўмяржыцкі. І толькі ў канторы ачомаліся.

— Думаю, у Мікалая атрымаецца, — першым выказаўся галоўны інжынер базы Іван Кірэевіч Дралаў.

— Я катэгарычна супраць! — запярэчыў Мікалай.

— Ведаем. Толькі асабліва і ўпрошваць не збіраемся. Прадстаўніком ад працоўнага калектыву пойдзеш.

На сходзе выбіралі з шасці кандыдатаў. Неўмяржыцкаму вельмі запомнілася менавіта гэтае пытанне:

— Як выбярэм вас, дзе жыць будзеце?

— Калі дазволіце пабудавацца тут, то назаўсёды разам...

Дырэктарам абраны ў сакавіку 1990 года. Тады толькі споўнілася дваццаць восем.

— У раёне няма роўні вашай гаспадарцы... Чым тлумачыцца такі ўпэўнены поступ? — пацікавіўся я ў Мікалая Ўладзіміравіча.

— Толькі адным — без навукі ні кроку! І спецыялізацыя... Распыляцца нельга. Насенневодства, жывёлагадоўля... Гаспадарка прыгарадная. Таму пераапрацоўваем малако, мяса. І самі ж рэалізуем.

Яго твар свеціцца спагадай і добрасцю. Бровы прыўзняты, бы ад лёгкага здзіўлення. Позірк задуменны, нават крышку сумны. Адметнасць жа — вусы. Сцякаюць раўчукамі ажно за шчокі.

— А з навуковай дзейнасцю як?

— Вось... — Ён адчыніў шуфляду стала, дастаў кнігу і падпісаў. — Мая... На памяць.

Я з удзячнасцю прыняў. Назва кнігі: «Азот у земляробстве Беларусі». Даведаўся таксама, што ў Мікалая Неўмяржыцкага ўжо каля трыццаці навуковых работ.

— Можа, і доктарская не за гарамі?

— Прыкіды ёсць. Насенневодства трэба ўпарадкаваць. На навуковую аснову паставіць. Навошта ўсім гаспадаркам гэтым займацца. Наша можа справіцца. Здавай фураж — і атрымлівай узамен адмысловае насенне...

Чалавек імкнецца рэалізаваць дадзенае яму Богам. Каб пакінуць пасля сканчэння шляху зямнога пра сябе добрую памяць. Людзі абавязкова спытаюць: «Адкуль жа ён родам?» Што тычыцца Мікалая Ўладзіміравіча Неўмяржыцкага, то пра яго так і скажуць: «Ён з вёскі Воранаў...».

З цягам часу, можа, яна ўсё ж адродзіцца, гэтая вёска. Бо працягвае жыць у памяці яе жыхароў.

# І ЎВАСКРЭСНУЦЬ У СПРАВАХ СВАІХ

Спешнага намеру збочыць не меў. Але старэнькія «жыгулі» міжволі туліліся да прыдарожнага кустоўя. Бы машынай кіраваў не ён, а яго клопат. Даўні й тлумны. Прыпыніўся акурат на мяжы — калгаса і горада. Ля знаку падзела — двух бетонных каласоў, аздобленых ледзь прыкметным відарысам сярпа і молата. Калісь каласы прыхарошваў бляшаны барэльеф Леніна. Быў таксама і надпіс: «Калгас «Ленінскі шлях». Ды здзерлі надпіс... Перабудаваліся. І сабе побач помнік узвялі — кучу смецця з бытавых адкідаў. Лічы, на самым беразе вадаёма, побач з шашой.

Прыдарожную мурожыну асцярожна кранула ранішняя золкасць. Пад нагамі ледзь чутна пахрабуствала намаразь. Праз дзесятак нетаропкіх крокаў Міхаіл Мікалаевіч Надзеін прыпыніўся на ўзвышаным тарфяным беразе. Былое ўрочышча «Вялікае» больш як на сто гектараў люстраніла талеркай вадаёму. З аднаго боку — пасёлак Арджанікідзе, з другога — вёска Мікалаевічы й прыбярэжнае кустоўе суседняй балоціны. І было вельмі дзіўна... Бярозавыя выспы, пабудовы, хай таксама на пагорках, але даволі аддаленыя, так выразна і агромніста адбіваліся ў вадзе! Нібыта знаходзіліся побач. Здавалася, што іх адбітак зыходзіў з неба. Можа, нябёсы гэтак сама занатоўваюць і нашыя жыцці? Тады ў нябыце душу кожнага чакае кінастужка гэткае вось явы. Калі застыгне апошні кадр зямнога існавання... Здаецца, недзе адтуль, з вяршыні, асветленай сонцам, сарваўся камяк-аблачынка... Каціўся рос, віхурыў... І — стоп!

Міхаіл Мікалаевіч адчуў слабасць, млявасць... Ціск... Намацаў у кішэні валідол... «А чаго ты чакаў? — зазначыў насмешліва-сумна. — Столькі гадкоў бязлітасна знясільваў, паліў сэрца... Вось і асеў гар клопатаў, трывог на трубах-сасудах. Павузелі... Не да курортаў было. Цяпер жа кроўка-моцухна вясновай паваддзю не мкне. Ды нічога...»

Паўнацелы, невялікага росту. Позірк добры, з жартавінкай. Вось-вось, здаецца, зачэпіць некага і тут жа, няўзнак, смяшынкай адорыць.

Бралася на зіму. Дрэвы паслухмяна скідвалі вопратку: рыхтаваліся да спачыну. Сям-там непрыкаяна гойдалася запозненая лістота. Вока безуважна слізгала па фіялетава-чырвонай сцішнасці ў шыза-ружовай празрыстасці ракітніку і вербалозу. Пярэсцілі й падвясельвалі самотны малюнак хіба толькі стволікі маладых бярозак у лёгкіх накідках ды заўсёдная зяляніна хвой і елак. Апошнія надзвычай выразна, але нешматліка ўпісваліся ў ажурнасць лісцёвых карункаў.

Лісіным хвастом залёг паўз бераг жухлы чарот. У адным месцы ён далёка распушыўся на халоднай роўнядзі вадаёма. Быццам барадаўкі на чыста, да сінькі паголеным твары, з вады выступалі астраўкі травы. «Пакуль не зашкліла... трэба паспець таўсталобіка запусціць», — занепакоіўся Міхаіл Мікалаевіч. Рыбку такую — выключна на траву ласую. А то зарастае, мяльчэе возера. Але ж мелі шанц, і не так даўно, ачысціць, нават грунтоўна ўпарадкаваць. І без дадатковых турбот.

Не раз дакараў сябе Міхаіл Мікалаевіч Надзеін за нерашучасць. Менавіта, як толькі звыкаўся з пенсійным ладам жыцця. Запрашалі ўзначаліць таварыства выратавання на водах. Акурат мог адолець. Без высільвання. Адмовіўся наадрэз. Маўляў, стаміўся, хворасць. Крыху адсапуся, а потым бачна будзе. І вось — саступіў. Перад Анатолем Баніфатавічам Купрэйчыкам. Былым старшынёй калгаса «Ленінскі шлях».

— Ты, Міхаіл Мікалаевіч, усё роўна дома не ўседзіш, — хітравата жмурыўся ён. — Для цябе справа, бы вада для рыбы. А тут — побач... Работа не пыльная — узначаліш штаб грамадзянскай абароны...

Надзеін разумеў: пасада — толькі кось-кось... Воз жа чакае другі. І даволі пакоўны. Гэта для яго звыкла.

Не ў такой запрэжцы даводзілася напружвацца... Купрэйчыку патрэбны яго вопыт, сувязі, аўтарытэт, разваротлівасць... Ён не быў сябрам Анатоля Баніфатавіча. Іх зблізкала нешта большае. Найперш — самаахвярнасць, бязлітаснасць да сябе дзеля справы. І не дапамагчы яму цяпер — значыць абысціся з ім несумленна. Бы пакінуць на полі бою...

Усяго два месяцы Міхаіл Мікалаевіч песціўся на пенсійнай канапе. Хоць меў права не пакідаць яе наогул. Працоўны стаж пад пяцьдзесят. З іх дваццаць адшчыраваў намеснікам старшыні райвыканкама. Згодна чыну адказваў за культуру, адукацыю, быт, медыцыну... Але неўпрыкметку запіхнулі ў яго ношу і будоўлю. Бы пагадзіўся добраахвотна. На грамадскіх пачатках. І — дарма. Бо карысць намаганняў дзеля людзей вымяраў не таўшчынёй кашалька і ўладкаванасцю асабістага стойла. Не, вакансій кіраўнікоў-будаўнікоў не было. Толькі калі Надзеін падставіў плячук раз, другі, то хай сабе і натужвае жылы. А мы паназіраем. Паціху, памалу назіральнікі затаіліся. Бо, шчыра кажучы, былі не́мачныя. Балазе, на зарплату бяздзейнасць не ўплывала, а поспехі не праміналі запісаць і на свой рахунак.

Я бяруся сцвярджаць, што нуль больш адзінкі. Праўда, калі поруч з ёй, скажам, лічба 10... Як можна адлюстраваць яе, пакінуўшы нязменнай адзінку? Ды надзвычай проста — 1+9. Вось вам і нуль! Значнасць чалавечага жыцця можна матэматычна ўявіць бясконцай колькасцю лічбаў. Скажам — 9999... Але смерць здольна проціпаставіць гэткую ж бясконцасць лічбаў. Толькі з процілеглым адмоўным знакам. І ў выніку — нуль. Так, фізічнае існаванне чалавека скончана.

А што ж засталося пасля смерці за гэтым нулём? Мо, адна дзесятая — 0,1?.. Тут разумеецца і яшчэ адзін нуль, калі мець на ўвазе дроб — 1/10. У лічніку — адзінка (асоба, «личность»). Ну, а ў назоўніку нуль

зноў перабольшвае адзінку-чалавека (1+9). Бо справы перажываюць зямное існаванне. І нават даюць права на бяссмерце.

На значныя святы Міхаіл Мікалаевіч апранае пінжак, абцяжараны шматлікімі ўзнагародамі. Між тым, ёсць сярод іх і ордэн «Знак Пашаны», медалі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй», бронзавы медаль Галоўнага камітэта ВДНГ СССР... А ўсяго — пятнаццаць. Мае ганаровыя граматы як саюзныя, так і рэспубліканскія. І ўсе ўзнагароды, нават значок «Выдатны дружыннік», вельмі дарагія яму і помныя. Бо гэта — вехі, зоркі на яго жыццёвым шляху...

Але найперш Міхаіл Мікалаевіч Надзеін — будаўнік. Вядома, не з кельмай упраўляўся. А рабіў усё магчымае і нават — звыш, каб кельма не сумавала. І тая не ведала пярэдыху. Толькі Смалявічы ўзбагаціліся кацельняй, сярэдняй школай, двума 60-кватэрнымі дамамі, аўтавакзалам, рэканструяванай цэнтральнай плошчай... І гэта далёка не поўны пералік.

«Калі ж пачаўся Надзеін-будаўнік? — прыкідваў Міхаіл Мікалаевіч, спавольна накіроўваючыся да машыны. — Так, з той незабыўнай сустрэчы... А пасля і ўпэўненасць адчуў, і свае магчымасці ўзважыў...» І крэсівы-паўшар'і пачалі высякаць іскры ўспамінаў, імкнучыся запаліць і сагрэць душу.

Яго нязменна накіроўвалі на нарады ў сталіцу. Асабліва, калі там меліся за нешта паўшчуваць. Бо пакладаліся на яго ўменне імгненна сарыентавацца ў той ці іншай сітуацыі, адметна і глыбока мысліць, да месца і дасціпна пажартаваць. А яшчэ — не было той праблемы ў раёне, якая б не хвалявала Надзеіна. І ў самых цяжкіх абставінах яму бачылася выйсце. Адрознае — надзеінскае! Не саромеўся выказацца аб набалелым пры самым высокім начальстве. Таму і запрыкмецілі яго.

Неяк у перапынку адной з нарад нечакана запатрабаваў тагачасны старшыня Савета Міністраў рэспублікі Ціхан Якаўлевіч Кісялёў:

— Дзе гэты нізенькі намеснік старшыні райвыканкама са Смалявіч? — Надзеін знаходзіўся побач, і Ціхан Якаўлевіч амаль без паўзы насеў на яго: — Што гэта за балоціна перад уездам у Смалявічы з боку Мінска?! Проста сорам... Тэрмінова ліквідаваць!

— У мяне іншыя абавязкі, — памкнуўся быў адмовіцца Міхаіл Мікалаевіч.

— А я даручаю гэта вам.

— Грошы патрэбны...

— Будуць. Зараз звяду са сваім памочнікам, і вырашайце разам...

Праз які час на месцы балоціны весела залюстранiла прыгожае вадасховішча «Смалявіцкае». Непадалёку пабудавалі кафэ «Зарэчнае».

Далася ў знакі рэканструкцыя Цэнтральнай плошчы ў Смалявічах. Ледзь паспеў спыніць бульдозеры, якія зрэзвалі й ссоўвалі грунт. Ці бачыце, пагорак перашкаджаў сузіраць прывабнасці новага гандлёвага цэнтра. А тое няўцям, што тут пралягаюць камунікацыі...

Сямнаццацігадовым юнаком Міхаіл Надзеін у сорак чацвертым быў прызваны ў войска. Неўзабаве яго цяжка параніла. Застаўся інвалідам другой групы. На ўсё жыццё. Але ніхто пра яго інвалідства не ведаў. Бо не цярпеў спагады, друграраднасці, ільготаў... Заўсёды налягаў на ўвесь хамут. Выкладваўся спаўна. Так бачыўся яму сэнс дзейнасці, жыцця.

Свой працоўны стаж на Смалявіччыне Міхаіл Мікалаевіч распачаў на Верхменьскай МТС. Інструктарам. Выдзелілі дваццаць пяць кубоў лесу — будуйся... Маўляў, будзем лічыць, што жыллём забяспечаны. І пабудаваўся. Спешна. Бо набліжалася зіма. У гэтай хаціне жыве і сёння. У Смалявічах. Па вуліцы Школьнай. Мае невялікі агарод. На тарфяніку. У канцы — нізовіна. Яе

раней запаўняла вадой, і ўтваралася нешта накшталт невялікага вадаёма. Суседская малеча нават карасёў запусціла. А пасля вудзіла. Міхаіл Мікалаевіч жартаваў: «Уласную сажалку маю. Чым не пан?» Але правялі меліярацыю прылягаючых зямель, і сажалка перасохла. А з ёй знікла і адзіная прывілея Надзеіна.

Як і меркаваў Міхаіл Мікалаевіч, старшыня калгаса Анатоль Купрэйчык паступова пашырыў кола яго абавязкаў. Што ж тычылася асноўнага, то кабінет па грамадзянскай абароне абсталяваў узорна. Нават семінары ў ім праводзіў. А ў дадатак гандлёвы цэнтр у вёсцы Забалоцце парупіўся дабудаваць, сталоўку давесці да ладу, прыдбаў для яе абсталяванне... І ў вёсцы Старына магазін сваёй увагай не абмінуў.

Аднойчы Анатоль Баніфатавіч паскардзіўся Надзеіну:

— Душа баліць. Столькі зямлі калгаснай марна прападае. Я маю на ўвазе ўрочышча «Вялікае». Затоплена вадой... Ні балота, ні вадаём... А якое месца для адпачынку можа атрымацца... Вазьміся, Міхаіл Мікалаевіч, а то ў мяне рукі не даходзяць. Людзі дзякуй скажуць.

— Паспрабую...

З гэтым ўрочышчам Надзеін ужо меў справу. Тады ліквідавалі торфапрадпрыемства імя Арджанікідзе, а торфамасіў перадалі аднатыпнаму прадпрыемству «Чырвоны Сцяг». Торф ва ўрочышчы выбралі й дэманціравалі станцыю перапампоўвання вады. Каля 250 гектараў плошчы пачалі затапляцца. Апынуліся пад вадой і два фекальныя кар'еры. Смурод распаўсюдзіўся па ўсім ўрочышчы, а брудная вада рушыла па канавах у рэкі Пліса і Бярэзіна.

— Трэба нешта рабіць! — рассякаў паветра рукамі ва ўласцівай толькі яму манеры тагачасны старшыня райвыканкама Міхаіл Кірылавіч Смольскі.

— Я ж прасіў не падпісваць дакументы на перадачу, пакуль выпрацаваныя плошчы не будуць рэкульта-

ваныя і вернутая калгасу «Ленінскі шлях»! — горача даводзіў Міхаіл Мікалаевіч.

— Ну, паспяшаліся, паспяшаліся... Выручай, братка...

І Надзеін спешна арганізаваў дастаўку бульдозераў ва ўрочышча — фекальныя кар’еры абгарнуліваламі зямлі. Але значная колькасць адходаў ужо асела на дно.

У 1984 годзе быў распрацаваны рабочы праект рэкультывацыі затопленых зямель. Праўда, ён тройчы пераглядаўся, а справа так і не скранулася з месца. Нарэшце ў канцы 1991 года праект зацвердзілі. З дзяржбюджэта выдзелілі сродкі. Але толькі спусцілі ваду і распачалі ачыстку дна, як з’явіўся чыноўнік з Міністэрства фінансаў і заявіў:

— Работы спыніць!

— Чаму?

— Не ваша справа!

І ўрочышча зноў затапіла вадой. Расходаваныя грошы былі выкінуты на вецер. А колькі разам з вадой выпампоўвалі рознай жыўнасці! Праз трубу помпы, бы праз мясарубку, выплюхвалі рыбу, іншых насельнікаў вадаёма. Гінулі ракі, чарапашкі, водарасці...

Міхаіл Мікалаевіч разумеў, каму гэта на руку. Так помсціў канцэрн «Амкадор». Бо калгаснікі сарвалі драпежны намер маладой прамысловай акулы. Нягоды, якія прынесла перабудова, вымусілі калгас аб’яднацца з канцэрнам. Але апошні не быў зацікаўлены ў росквіце гаспадаркі. «Амкадор» вабілі толькі каштоўныя землі калгаса: паблізу Мінска, чыгункі, аэрапорта, аўтамагістраляў... За іх можна мець такія грошы, калі прадаць ці аддаць у арэнду! Усвядоміўшы гэта, калгаснікі парушылі суполку з «Амкадорам». Пачаўся судовы працэс па раздзелу «Амкадора-агра». Міхаіл Мікалаевіч Надзеін прыкладаў нямала намаганняў, каб калгасу адсудзілі кругленькую суму. Так, яна па праву належала гаспадарцы. Але сквапны «Амкадор» не жадаў мірыцца з гэтым. Маючы па тым часе значны ўплыў, канцэрн увёў у зман Міністэрства фінансаў. Маўляў, урочышча «Вялікае» не належыць кал-

гасу, і той не мае права вывозіць з яго на сваe палі сапрапель.

Заставалася толькі адно — падняць архіў. І Надзеін узяўся за гэту работу. Ён дакументальна даказаў, што торфамасіў «Вялікае» спрадвечна — калгасная тэрыторыя. Тлумачыў гэта так:

— Хто пасля распаду СССР стаў пераемнікам? Расія!?. Дык вось, у той час, калі калгас насіў імя Варашылава, урочышча «Вялікае», якое знаходзілася на яго тэрыторыі, у 1930 годзе перадалі торфапрадпрыемству імя Гея. Апошняе праз чатыры гады перайменавалі ў торфапрадпрыемства імя Арджанікідзе. Пастановай Савета Міністраў БССР было прадугледжана, што пасля выпрацоўкі яно будзе рэкультавана і вернута землеўладальніку — калгасу імя Варашылава, які з 1958 года стаў называцца «Ленінскім шляхам».

Урочышча адстаялі. Але ж справу трэба было давесці да канца. І гэта не давала спакою. Дзялкі ўжо сталі патрабаваць, каб частку берага вадаёма аддалі ім. На што Надзеін стрымана адказаў:

— Вось давяду да ладу, а пасля хай калгас распараджаецца. Не бянтэжыў яго і гнеў новых беларусаў: «Хто цябе ўпаўнаважыў?!» Толькі супакойваў сябе: «Сумленне, людзі й абяцанне Купрэйчыку».

Дапамог выпадак. Падчас урачыстасцей на Цэнтральнай плошчы Смалявіч да Надзеіна падышоў старшыня райвыканкама Пётр Георгіевіч Буцін. Ён толькі што быў прызначаны на гэтую пасаду. І Міхаіла Мікалаевіча прыемна ўразіла, што сам падышоў.

— Мне вядома, Міхаіл Мікалаевіч, што вы займаецеся вадаёмам «Вялікае». Справа нашага гонару давесці гэтую справу да лагічнага завяршэння. Так, сродкаў малавата... Але і за гэту сціплую суму можна зрабіць максімальна карыснае...

— У мяне ёсць задумка, Пётр Георгіевіч, — ажывіўся Надзеін. — Давайце заўтра ж сустрэнемся і ўсё абмяркуем.

— Згода...

Ранкам наступнага дня яны мералі крокамі ўзбярэжжа вадаёма. Падышлі да кустоўя, сярод якога бруілася колькі крынічак. І Надзеін паспяшаўся выказаць сваё меркаванне:

— Вось ад іх і пракапаем усцяж берага абводную канаву. Яна якраз пойдзе пад ухіл. І свежая крынічная вада трапіць у возера, а лішкі будуць скідвацца ў Плісу... Трэба месцамі выкарчаваць кусты, пракласці трубы...

— Пераканалі, згодзен, — заключыў Пётр Георгіевіч. — Толькі як быць з праектам? Мы з-за беднасці ўрэжам яго. Уладкуйце з аўтарам.

Аўтар даў згоду. Выкраілі грошы на ачыстку вадаёма. І ў хуткім часе задуманае было рэалізавана.

Неабходна было прыдбаць рыбку, дужа ахвочую да травяных страў, — таўсталобіка. Міхаіл Мікалаевіч падключыў да гэтай справы раённых эколагаў, паляўнічых... Выкарыстаў свае сувязі... Нарэшце высветлілі, што ў Брэсцкай вобласці ёсць рыбгас, дзе разводзяць таўсталобіка. Паехалі туды — дарагавата! Закупілі малькоў у эксперыментальным гадавальніку Вілейскага рыбгаса. Па памяркоўнай цане. Прывезлі ў малакавозе. Прыцемкам. Бралася на мароз. Зарыбілі не толькі вадасховішча «Вялікае», але і «Смалявіцкае», і тое, што ў Чарніцы.

— Паспелі, — задаволена зазначыў Міхаіл Мікалаевіч. — Не сёння-заўтра зашкліць вадаём... Цяпер можна і адпачыць.

## ВЕСНАВЫ СНЕГ

Сакавіцкі снег сыпаў і сыпаў. Бы неба зблытала сусекі пораў года. Ці, спахапіўшыся, што спазнілася, шчыравала спаўна. А яны, сняжынкі, нязвыкла бязважкія, быццам спароджаныя паветрам, здавалася, не клаліся, а завісалі над зямлёй. Бялюткім пухавіком. Іх за-

позненасць, сляпучасць і першародная вясновая чысціня ўрачысцілі наваколле. Нібы на яго ўскінулі святочны абрус. І вось-вось распачнецца вясёлая бяседа.

Толькі на душы ў старшыні калгаса імя Арджанікідзе Ўладзіміра Пятровіча Лысага было не надта ўцешна. Дый адкуль той радасці ўзяцца. Жыццёвыя і боскія нягоды, што хмарыліся над палеткамі, ледзь праяснялія кволай надзеяй на лепшае. Менавіта сваёй часовасцю, як гэты веснавы снег. І ўсё ж не верылася ў яго пагрозлівасць. Бо прырода вяснуе, прыспела яе абуджэнне.

Можа, і веснавы стан сялянскай існасці, усталяваны яшчэ да перабудоўчага пертрусу, не ўспрымае ўсур'ёз сённяшняга ліхалецця. Таму цярпліва чакае вясковец хуткай павадзі, з якой сыдзе каламуць няпэўнасці й нявызначанасці. Толькі крыгаход чамусьці позніцца. А веснавога ж снегу ўсё падкідае.

Раніцой на нарад Уладзімір Пятровіч нярэдка дабіраўся пешаком.

Штыкі на Кургане Славы ледзь залаціў золак. Вёска Слабада, што ля падножжа манумента, дасапвала апошнія сны. Прыемны момант... Калі людзі пакладаліся на твой клопат, а ты па-бацькоўску дбаеш пра іх. І ў гэтай сцішанай прахалодзе досвітку неяк лёгка і аб'ёмна думаецца. Пра справы надзённыя і лёс асобнага працаўніка. І горасці, і радасці людскія валодаюць намерамі старшыні, вызначаюць рытм сэрца, вал душэўнага хвалявання.

Дасяг павароткі. Направа — прагаліна. А там, далей — гатар, збожжаток і мехдвор, дзе чакаюць спецыялісты. Каб параіцца наконт сённяшніх турбот. Толькі хацелася прыгадаць аб нечым узнёслым, вызначальным. Рупіла ўзняцца над гэтай мітуслівай рэчаіснасцю і як след асэнсаваць насмылелае. Вызначыць іх накірунак, разгледзець тую светлую прагаліну, дзе гняздзяцца цудныя птахі. Вось-вось расхінуць яны магутныя крылы

спадзяванняў і возьмуць напрамак да лепшай долі. Толькі б паспець за імі ўслед...

На момант Уладзіміру Пятровічу ўявілася гэтае поле-прагалак. Залітае цёмна-зялёнай фарбай руні. Сакоўнай, кусцістай... Гэта ж яго самы жаданы й любы сэрцу краявід. Няма дзівосней і шчасней часіны нараджэння новага жыцця. Пачуццё бацькоўства лагодзіць і ўзвышае. Бы стаіш не на ўскрайку поля, а ля калыскі парасткаў-немаўлятак. Птушыны ж спеў падаецца іх галасамі. Зярняткі праклюнуліся на свет і прагнуць жыцця: радуюцца сонцу, дажджу, ветру... І хлебаробскаму клопату.

А вось яшчэ адзін прагал паспелай збажыны. Прырода і чалавек аб’ядналіся, каб спарадзіць з зярнятка колас і напоўніць яго хлебадарнай сілай. Усведамленне таго, што маеш непасрэднае дачыненне да гэтай таямніцы, узрушвала старшыню, высвечвала нейкі таемны сэнс жыцця. Дапасаваны да вечнасці, сваёй значнасці ў ёй.

А з чым зроўніцца адчуванне таго, як пульсуе з камбайна зерне. У падстаўленыя далоні. Цёплае, нібы з пазухі спякотнага жнівеньскага дня. Здаецца, мільёны маленькіх сэрцаў б’юцца ва ўнісон.

У любых жыццёвых абставінах трэба сеяць і ўбіраць. І ніякія разумнікі не абыдуцца без гэтых двух светлых момантаў сялянскай працы. Нават у самую непраглядную непагадзь гэтыя два маячкі выведуць, выратуюць. Толькі вось тым, хто іх запальвае, нешта не шчасціць. Сяляне, бы салдаты ў бамбёжку, моцна прыціснутыя да зямелькі. І ні пра што іншае, як пра выжыванне, не просяць у Бога. А яны ж — цуда-птушкі! Толькі вось крылы... На іх наліп веснавы снег... Чакаюць, пакуль растане... Страпянуцца б! Але цяжар спадзявання не дае. А на каго пакласціся?! Дый ці толькі гэты цяжар?

Разважанні Ўладзіміра Пятровіча наткнуліся на нядаўні выпадак. Лепшая даярка — адзіная ў гаспадарцы, якая надаіла ад рагулі па чатыры тысячы кілагра-

маў малака, прыхапіла крыху сабе. Злавілі... Гэты факт надзвычай уразіў старшыню. Было крыўдна. Да болю. «Няма малака? Дык выпішу. Каму і калі я адмаўляў? Няма дзе трымаць кароўку, з кармамі праблема? Дык пад дахам калгаснай фермы ўладкуем. Вунь колькі ўжо такіх прытулілі. Даглядай, як уласную, і разлічвайся паціху за падмогу малачком».

Хваляваўся Уладзімір Пятровіч яшчэ і таму, што ніяк не знаходзіў дакладнага вызначэння паходжанню гэтай праявы. Філосаф, выхавальнік па сваёй сутнасці, ён упарта адшукваў, выслухоўваў тыя довады, матывы, якія б арганічна вынікалі з пэўнай сітуацыі. І ў размове з даяркай найперш дамагаўся гэтага:

— Няўжо ў вас няма гонару за здабыткі сваіх рук? Напрацаваных, навярэджаных... Адкуль такая абыякавасць?

Жанчына маўчала.

— Надаіць ад каровы болей як па чатыры тоны малака ў нашых умовах! Гэта ж, калі хочаце, подзвіг! Каб дасягнуць такіх вынікаў, то не проста працаваць трэба, а шчыраваць. Да сёмага поту, не пакладаючы рук. Вашым дасягненнем ганарымся ўсе мы. Бо вы — часцінка нашага калектыву. Лепшая! А з іншага боку — геройства здзейсніў хто? Злодзей! Скажыце, у якія маральныя рамкі ўкласці ваш учынак? Які ўзор для іншых? Мне, напрыклад, сорамна за вас і вельмі крыўдна... І аддзячылі вам спаўна — каляровы тэлевізар прыпаднеслі...

— Забярыце назад, — ціха вымавіла даярка.

— Не, даражэнькая. Вы спаўна заслужылі гэтую ўзнагароду... І спагнанне таксама атрымаеце!

Старшыні на момант стала шкада жанчыны. Бо ці толькі яе віна? Працу селяніна абясцэнілі, збэсцілі... Ніякай ёй пашаны. З таго і сам ён стаў сябе меней паважаць. Сваёй годнасці цурацца. І трэба нямала прыкласці намаганняў, каб яна, годнасць, выслабанілася з ціны зняважлівасці. Як вось і ў даным выпадку — з даяркай.

Сёння ствараецца бачнасць, што людзі надта хінуцца да Бога. Але ж ці так гэта на самай справе? Адна з вызначальных запаведзей Хрыста: «Не ўкрадзі!». І што? Цягнуць, як хто можа. Тым болей — калгаснае. Яно ж — нічыйнае... Дый з чаго гэтыя душэўныя пакуты павінны вынікаць, калі нават у Канстытуцыі рэспублікі калектыўнай (калгаснай) формы ўласнасці не значыцца. Ёсць толькі — дзяржаўная і прыватная.

Скончыўся нічым не адметны нарад, і Уладзімір Пятровіч паехаў па брыгадах. Хоць спешнай патрэбы ў гэтым і не было. Зімовыя работы ў большасці сваёй завершаныя, а распачынаць вясновыя пакуль не дазваляла надвор'е. Толькі сіла звычкі па некалькі разоў на дзень наведваць вытворчыя падраздзяленні ўзяла верх. Ён прызвычаіўся кантраляваць сітуацыю, быць у курсе спраў. Гэта спрыяла лепшаму ўзаемаразуменню, кантролю, дысцыпліне...

«Ніву» часам сцягвала з маланаезджанай дарогі ў глыбокі пульхны снег. Але чатыры вядучыя колы без асаблівага высільвання хуценька выхаплівалі яе на прасёлак.

Лёс калгаснай вытворчасці як мае быць турбаваў старшыню. Яна кінута на самавыжыванне. А разам з ёй — і селянін, які перабіваецца з хлеба на квас. Як кажуць, жыве кот, жыве і сабака. У аднаго і таго ж гаспадара. Той аднолькава шкадуе іх. Але так ужо склалася, што адзін пануе ў хаце, а другі скавыча на двары. Праўда, пародным сабакам болей пашчасціла. Яны — пакаёвыя, ім нават мышэй лавіць не трэба... Такое параўнанне крыху падвесяліла.

Прыхільнік калектыўнага гаспадарання, ён хацеў у той жа самы час бачыць у калгасніку і аднаасобніка. Асобу, якая б спалучала свой інтарэс з калектыўным і была зацікаўленая ў гэтым. Менавіта ў плане сумеснага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы й індывідуальнага, самастойнага вядзення ўласнай гаспадаркі. Селянін павінен паверыць у свае сілы й магчымасці.

Цяпер жа ён у асноўным пакладаецца на кіраўніка. Той «выб'е», арганізуе... І нярэдка ловіць на слове. Маўляў, паабяцаў, дык кроў з носу, а выканай. І тут памыліцца нельга. Лавіруеш, бы на вузкай кладачцы праз роў. Крыху саступіў... І страціў давер. Меў такую неасцярожнасць і Уладзімір Пятровіч. Справы пайшлі добра, і замахнуўся на стодоларавы месячны заробак. Кожнаму, хто выпрацуе мінімум. А тут — шалёная інфляцыя. Хіба можна было прадбачыць такое? І тлумачыў людзям, і прасіў прабачэння... З таго часу на абяцанні дужа паскупеў.

Вясна настала. Хоць і запозненая. Зіма лежабокам пакачалася на жухлай бруднай траве ўсцяж дарог. Месцамі — да пролежняў. Толькі яе сястрыца-пераемніца мяняць пасцель не паспяшалася. Халадэча, суш не бадзёрылі, не рупілі.

Веснавы снег стаў вадой. Даў жыццё раслiннасці. Гэтага чакалі. Хоць і доўга. Але былі ўпэўненыя ў непазбежнасці павадзі. Таму і не надта маркоціліся.

А вось «снег» неўладкаванасці сялянскай. Калі ён ператворыцца ў жыватворны, гаючы настой? Бо колькі ран, сінякоў... лячыць трэба. Гаспадар жа і гаспадарка ў знямозе.

Лісце на дрэвах дробнае, бы недаразвітае. Трава неахвотна, марудна працiскваецца з перасохлай зямліцы. Быццам цікуе. На дварэ май, а прырода ўсё яшчэ прыгнечаная. Акурат птушка са звязанымі крыламі. Ні табе зялёнага полымя лістоты, ні белай замяці садоў, на поўную моц і ўвесь прасцяг, ні бэзавай духмені на ўсе грудзі...

Хіба могуць акрыяць самі па сабе лістота, трава? Без сонца, дажджу... Без спрыяльных умоў. Гэтак жа і селянін не ў сілах самастойна ўзняцца. А ўсё выжывае, выжывае. І які ўжо час.

Старшыня сцішыўся ў сваім прасторным кабінеце. Задуменны, напружаны позірк. У блакітных вачах — і мудрасць, і нейкая затоенасць. На твары й добрасць, і

строгасць, і ўпэўненасць. Улоўліваюцца няўхільнасць, нават упартасць і ўладнасць. Прычым — высокага манеру.

У пяты раз калгаснікі даверылі Уладзіміру Пятровічу Лысаму гаспадарку. І свой лёс. Бо ўдала вёў яе і вядзе. Інжынеру па адукацыі, Уладзіміру Пятровічу калгас бачыўся адзіным зладжаным механізмам, у якім няма другараднага ані ў чым.

Але ўсё болей Уладзімір Пятровіч прыходзіць да высновы, што надвор'е над калгасным ладам усталёўваецца неспрыяльнае. І на перспектыву разлічваць не даводзіцца. На сённяшні дзень у раёне толькі чатырыпяць гаспадарак, дзе прадпрымальныя, вопытныя кіраўнікі яшчэ неяк зводзяць канцы з канцамі. У іх ліку і яго калгас. Бо могуць «выбіць». Добра інфармаваныя, маюць адпаведную падтрымку. Астатнія ж такой магчымасці пазбаўлены. Дый сродкаў «збоку» усім не хопіць. Каб забяспечыць будучыню сельскагаспадарчай вытворчасці, трэба выпрацоўваць новы, сістэмны падыход да яе вядзення. На дзяржаўным узроўні. Старшыньскіх жа магчымасцей хопіць адно дзеля таго, каб толькі выжыць.

І Ўладзімір Пятровіч усё рабіў для гэтага. Бадай, першым у раёне акцыяніраваў калгас. Дакладна ўлічылі долевы ўдзел кожнага працаўніка ў стварэнні каштоўнасцей гаспадаркі. Асабліва — пенсіянераў. У першы ж год атрымалі добрыя дывідэнды. Але пачуўся ўладны вокрык «зверху»: «Няма такога закону, а самадзейнасці не дапусцім». Ледзь выкараскаўся. Сякія-такія паперы й абставіны дапамаглі.

Мы аднойчы разгаварыліся за кубкам гарбаты. Размова вялася аб будучыні вёскі.

— Селяніна сёння, па вялікім рахунку, не існуе, — пачаў даводзіць я. — Бо ён страціў пачуццё асабістай адказнасці за зямлю. У свой час яе адабралі разам з Боскай верай, ды так і не вярнулі прыхільнасць да карміцелькі. Хлебароб стаў накшталт падзёншчыка.

— Так, зямля не яго асабістая, а нейкая абстрактная ўласнасць. Гаспадара неабходна выхоўваць. І гэта павінен быць найпершы клопат дзяржавы. У даным плане, лічу, мы зрабілі памылку. У час прыватызацыі жылля. Аддалі за бясцэнак. А цяпер жыллё патрабуе рамонту. І калгас — ці бачыце? — павінен займацца гэтай справай.

— Вы неаднойчы былі за мяжой, цікавіліся, як там гаспадарaць. Дык, можа, не трэба вынаходзіць веласіпед, а ўзяць пэўную замежную мадэль за ўзор?

— Пабываў за мяжой ці не разоў з трыццаць. У складзе розных дэлегацый. Пераняць нешта цалкам немагчыма. Бо ў нас свой, адрозны падыход. Там жа ўсё адшліфавана, як след удасканалена. Напрыклад, адзін фермер можа абслугоўваць да двухсот кароў. Або лічаць, што лепш мець да кожнага прычапнога агрэгата трактар, чым па некалькі разоў адчэпліваць і прычэпліваць плуг ці сеялку. Маўляў, эканоміцца час. Зразумела, не з нашымі магчымасцямі дый не з нашымі людзьмі такое падсілу.

— І ўсё ж нейкі паратунак павінен быць?

— Інвестыцыі. Як айчынныя, так і замежныя. Без іх сельскую гаспадарку на належны ўзровень не ўзняць.

— Мне здаецца, Уладзімір Пятровіч, што ў вас ёсць асабісты погляд на пераўладкаванне існуючых форм гаспадарання?

— Ёсць, безумоўна. Нешта накшталт ізраільскай мадэлі. Там у вёсачцы свой камбікормавы заводзік. На кожнай сядзібе — фермачка. Добра прыстасаваныя пабудовы, належная механізацыя. Вось вам і спалучэнне калектыўных і асабістых інтарэсаў. Прычым — усёй сямейкай шчыруюць. І пераемнасць, і беспрацоўных няма. Хацеў, вельмі хацеў нешта падобнае зрабіць і тут. Ды не паспеў. Перабудова ўсе планы перакрэсліла.

Калі рыхтаваліся матэрыялы для нарыса, ні мой субяседнік, ні, тым болей, я нават не здагадваліся, які

сюрпрыз прыпаднясе лёс. Справа ў тым, што ў хуткім часе дэпутаты абралі Уладзіміра Пятровіча Лысага старшынёй раённага Савета дэпутатаў. Адзінагалосна. Адмовіць не змог. А з іншага боку — з'явяцца новыя магчымасці паспрыяць селяніну расчысціць сумёты на шляху да заможнага жыцця.

## ПАТАЕМНЫ КАМЕНЬ

Лейтэнант міліцыі Валерый Іванавіч Курылёнак звыкаўся з месцам прызначэння, пасадай і яе багатым слоўным увасабленнем: оперупаўнаважаны Смалявіцкага раённага аддзела ўнутраных спраў па барацьбе з раскраданнем сацыялістычнай уласнасці. На той момант лейтэнант мінуў дваццаць шостую вярсту жыцця, скончыў Горкаўскую вышэйшую школу МУС СССР. І, вядома, гарэў жаданнем хутчэй праявіць сябе ў сапраўднай справе. Упэўненасці надавалі добрыя веды, а яшчэ болей — практыканцкі стаж: вызначыўся ў дзвюх аперацыях у Днепрапятроўску. Але, як кажуць, начальству лепш відаць.

Адрас, па якім накіраваўся Валерый Іванавіч, быў незвычайны — Курган Славы. Патрэбна было праверыць фінансавую дзейнасць фатографаў. Падставай для праверкі паслужылі скаргі кліентаў на несвоечасовую выдачу фотаздымкаў. І, бадай, самае галоўнае — фатографы, работнікі РКБА, працавалі на аддаленні. У іх — лабараторыя, а пры ёй усё неабходнае начынне.

Хоць заданне і не спакушала складанасцю, прыцягвала незвычайнасць аб'екта. Яму, лагайчаніну, тады яшчэ не выпала пабываць на Кургане Славы. А калі давялося, стала няёмка. Хіба лагічна і прыстойна падазраваць у несумленнасці людзей, якія працуюць на гэтым свяшчэнным месцы?!. Ды яны абавязаны ўвасабляць чысціню самой душы чалавечай. Славу нашу і памяць ім даверылі. Але супакоіў сябе: гэта толькі звычайная

праверка. Тут усё павінна быць у адпаведнасці з сумленнем.

І не памыліўся, чаму шчыра парадаваўся. Фатографы аказаліся ўвогуле прыязнымі хлопцамі. Не без таго: наклалі адбітак выдаткі маладосці: бесшабашнасць і ў пэўнай ступені няўзважаны як след груз адказнасці.

А для сябе зрабіў невялікае адкрыццё. Аказваецца, Курган Славы з'яўляецца філіялам Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тут нават ёсць малодшы навуковы супрацоўнік. Такая грунтоўнасць пастаноўкі справы падкрэслівала яе важнасць і веліч. Адчуваўся подых гісторыі. Хваляванне і глыбокая пашана перапаўнялі душу, якая, бы напятая струна, гучала ўрачыстасцю.

Валерый Іванавіч падаўся да шашы, каб на спадарожнай машыне дабрацца да Смалявіч. Імжэла нізкае восеньскае неба. Хмары цяжкім прасам насоўваліся на Курган Славы — здавалася, вось-вось зачэпяць штыкі абяліска. Нечакана адна з хмар адхінулася, і прамень сонца, быццам магутны пражэктар, высвеціў Курган. Манумент падаўся казачным, з незвычайна празрыстага каменю. На момант уявілася, што ён не з нейкіх матэрыяльных часцінак, а з мноства подзвігаў: ад падмурка да самай вяршыні. І яны гучаць сцішана, пранікнёна, урачыста-трагічна... Але прамень гэтак жа раптоўна знік, як і з'явіўся. Пахмурнасць ахутала таямнічасцю помнік.

Лейтэнант унутрана схамянуўся ад нечаканай асацыяцыі думак, здзівіўся, кінуў нецярплівы позірк на шашу. Машын нягуста. Пасля даволі працяглай паўзы прашмыгнуў грузавік з пасажырам... Вецер і дождж узмацніліся. Нечакана востра пацягнуў свяжак: стала зябка. Кінуўся ў вочы вагончык, што быў размешчаны ля падножжа насыпу. Па-хатняму ўтульна дыміўся закураны бляшаны комін. І лейтэнант не ўтрымаўся ад спакусы забегчы на хвілінку, каб прыхінуцца да цяпла.

У вагончыку было накурана і душна. Патыхала неабжытасцю. Відаць, тут калектыўна збіраліся нячаста.

Чалавек з дзесяць у рабочым адзенні прымасцілася ўсцяж сцен. Пераважна мужчыны пажылога ўзросту. Пры з'яўленні госця сцішылі гамонку, дружна накіравалі ў яго бок насцярожана-ўважлівыя позіркі. Што ні кажы, а паяўленне чалавека ў міліцэйскай форме стэрэатыпна наводзіць на думку, што ён тут невыпадкова. І кожны міжволі прыкідваў: «З якой нагоды?»

— Добры дзень. Пагрэцца вось забег, — неяк сумеўся лейтэнант, ненатуральна таропка выцягнуў перад сабой рукі й зрабіў крок да буржуйкі.

Лёгкая разгубленасць замест начальніцкага выгляду прадстаўніка ўлады, хутка зняла насцярогу прысутных: «Завітаў выпадкова». А праз момант лейтэнант ужо не быў аб'ектам увагі. Са свайго боку Валерый Іванавіч не чакаў заспець столькі людзей — наводшыбе! Калі б наведвальнікі, а то... І псіхалагічная непадрыхтаванасць стала вынікам невялікага замяшання. За адаптацыяй жа ўсё цяжэй было адмахнуцца ад назойлівага пытання: «Дзеля чаго яны тут?» Не без задавальнення адзначыў, што спрацоўвае чыста прафесіянальная цікаўнасць. Проста чалавечая наўрад ці варухнулася б.

Бліжэй за ўсіх сядзеў мужчына ў пацёртым дажджавіку. З плечукоў дажджавіка і капюшона пачала прабівацца пара. Усмешліва-добры твар мужчыны выклікаў асаблівую прыхільнасць да гэтага чалавека. Лейтэнант прысеў побач:

— Скажыце, чаму тут столькі людзей?

— Як?! Дык мы ж працуем... — няпэўна адказаў мужчына ў дажджавіку.

— Якая ж тут асаблівая работа?.. — падліў масла ў агонь сваёй непасвячонасцю Валерый Іванавіч.

— О-о, яшчэ не ўсе штатныя сабраліся... А прыкінь сезонных. Работа, кажаш? Чаму? Ёсць... І сантэхнік, і вадзіцель аўтацялежкі, здаецца, пры справе, і некаму ж трэба дзёран рэзаць, а пасля — укладваць, і траву абкошваць, снег, лёд з прыступак счышчаць... Што і казаць, работы стае, то і людзі... трэба.

Мужчына задумаўся. Апошнія словы, як падалося Валерыю Іванавічу, вымавіў не без сумнення.

— Я тут сёння з самай раніцы, а каб хто працаваў, штосьці не заўважыў... — цікаўнасць авалодвала лейтэнантам.

— Работы цяпер мала... А што людзі сабраліся, дык сёння зарплата.

— Касіра чакаеце?

— Ды не, у нас сам Іван Мікалаевіч грошы атрымлівае і выдае... Дырэктар.

— І яго нехта суправаджае?

— Каго? Івана Мікалаевіча? Ды ён яшчэ хоць куды! Любога ў барановы рог сагне. Хоць і адстаўнік, а порах не ўвесь спаліў.

Гэтай ноччу лейтэнанту не спалася. Усё ніяк не мог адкараскацца ад пачутай размовы ў вангончыку. Яму проста пашанцавала. Дый хіба мала ў жыцці прыкладаў, калі звычайны выпадак дапамагаў разблытаць клубок складанай справы. У тым ліку і крымінальнай. Вельмі не хацелася кідаць цень падазрэння на тых, каму даверана берагчы свяшчэнны агонь людской памяці. І прайсці міма нельга...

Падстава ж для сумнення была. Хай невялікая, але і яе неабходна зняць, каб не засталося ніводнай плямкі недаверу. Інакш нельга, бо няма цвёрдай упэўненасці, што не парушана мяжа сумлення, на варце якой стаіць і ён — лейтэнант міліцыі Курылёнак. Гэта яго ўчастак, і ўсялякія там выпадковасці выключаюцца.

Логіка падказвала варыянты. Калі ўявіць, што загадчык Кургана Славы Іван Мікалаевіч Самохін нядобрасумленны чалавек, то ён меў усе ўмовы, якія могуць садзейнічаць злоўжыванню. І не дзіўна: сам атрымлівае грошы з банка і сам жа іх выдае падначаленым. Штатныя рабочыя адпадаюць — ад іх акладаў нават крыху якую адхапіць цяжка, а вось сезоннікі... А з другога боку: калі Самохін сапраўды прыстойны ча-

лавек і яму апраўдана давяраюць?.. Тады як разумець раптоўнае замяшанне мужчыны ў дажджавіку?

Каб зняць усе «калі», неабходна было ў першую чаргу ўстанавіць асобу Самохіна.

Дабро і зло ў жыцці спалучаюцца ў самых неверагодных абставінах. Гэта нагадвае цягнік, які цягне за сабой платформы. На іх побач і танк, і бульбасаджалка, і гармата, і зернеўборачны камбайн... Калі «зло» супраць ліха — гэта апраўдана.

Звярнуцца адразу ў Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, філіялам якога (Курганам Славы) загадваў Самохін, уяўлялася заўчасным і неразважлівым ходам. Зразумела, сёе-тое там можна было высветліць. Толькі доказы супраць загадчыка адсутнічалі. Загадзя ж насцярожыць кіраўніцтва і самога Самохіна азначала, калі не праваліць, дык значна ўскладніць справу. Дый ці была тут справа? Але ўсё ж Валерый Іванавіч пазваніў у цэнтралізаваную бухгалтэрыю Міністэрства культуры й даведаўся, што касір ёсць. І выдаваць зарплату абслугоўваючаму персаналу Кургана Славы таксама ўваходзіць у яго абавязкі. Якія ж матывы «спагады» касіру з боку Самохіна? Джэнтльменская бескарыслівасць?

На той момант Самохін загадаваў філіялам пяты год. І за гэты час жыхары навакольных вёсак, як думалася Валерыю Іванавічу, былі аб многім дасведчаны. Што ні кажы, а вёска ёсць вёска. Сам Самохін жыў у Мінску, а вось яго намеснік, старшы навуковы супрацоўнік Васіль Адамавіч Кацэба, абаснаваўся ў вёсцы Азярыцкая Слабада. І ўсе рабочыя Кургана Славы былі ў асноўным тутэйшыя.

Вясковы жыхар — асаблівы: разгаварыць яго без на тое важкіх падстаў няпроста. У даным жа выпадку асобу Самохіна даводзілася ўстанаўліваць спакваля. Гэта, бузумоўна, не задавальняла цікаўнасць жыхароў. Таму яны лічылі за лепшае або прамаўчаць, або, калі

нешта і паведамлялі, дык з агульна вядомых чутак. Сваіх жа меркаванняў не выказвалі.

Калі б не выпадковая сустрэча са знаёмым па вагончыку (чалавекам у дажджавіку), істотную інфармацыю наўрад ці ўдалося б пачарпнуць. Вёска Азярыцкая Слабада ачуняла ад начной дрымоты, праваджала за ваколіцу кароў... Лейтэнант ужо не ў першы раз выбіраўся на досвітку, каб заспець дома людзей.

— Чым абавязаны такім раннім візітам? — нечакана аклікнулі ззаду.

— А-а-а! Справы, ведаеце, — узрадваўся сустрэчы Валерый Іванавіч. Менавіта з гэтым чалавекам яму было аб чым пагутарыць.

— Вядомая рэч, ваш брат без справы не наведваецца. Тады, можа, у хату?

— Не, няма неабходнасці. Скажыце, чаму вы тады, у вагончыку, сумеліся, калі размова зайшла аб колькасці працуючых на Кургане Славы? — адразу, як кажуць, без уводнай, пачаў лейтэнант.

— Сумненне закралася. Распісваўся неяк у грашовай ведамасці... І падалося мне, што людзей там занадта густа. Ніколі на рабоце столькі не бачыў...

— Вы заўважылі тады, што ў адстаўніка Самохіна яшчэ шмат пораху... У якім сэнсе?

— Ды ў самым прамым. Такую, ведаеце, маладзіцу падхапіў! — у пажылога ўжо суразмоўцы ажно зазырчэлі вочы. — І ведаеце, хто яна? Жонка яго намесніка, Кацэбы. У школе тутэйшай працуе. Настаўніцай. Самохін падкоціць да школы на машыне — забярэ каханку... А то прагульваюцца вечарам удваіх за вёскай. У госці да Кацэбаў зачасціў — вя-ялі-ікі друг сям'і... — хіхікнуў і, прыкрыўшы далонню рот, азірнуўся. — Памойму, мужык не промах.

Аб тым, што жонка Кацэбы падгульвае з Самохіным, Валерыю Іванавічу ўжо намякалі вяскоўцы. Які ж вынікае вывад? Можна толькі здагадвацца, і не болей, што

часовымі рабочымі афармлялі падстаўных асоб. Усё гэта патрабавала доказу. Напэўна ж было ясна, што Самохін маральна неахайны чалавек. Што якраз і кідала цень на яго добрасумленнасць. А ці ведае Кацэба, у якіх адносінах яго жонка з Самохіным? Ва ўсялякім разе, здагадваецца, бо месца дзеяння — вёска, і ў часе, мяркуючы па ўсім, заляцанні Самохіна ўжо даволі працяглыя. Тады чаму церпіць Кацэба? Магчыма, спрабуе захаваць сям'ю, работу. Саўдзельнікам Самохіна ў махінацыях па рабоце, калі такія маюць месца, Кацэба наўрад ці можа быць. Бо ў дадзенай сітуацыі эпікурэйства для Самохіна вельмі рызыкоўнае. Хаця, калі Кацэба як след увяз... Пакуль гэта з вобласці меркаванняў.

І тут Валерыю Іванавічу прыйшла цікавая думка. У любым выпадку Кацэба ўнутрана настроены супраць Самохіна. Дык чаму не выкарыстаць яго? Хто, як не Кацэба, лепш ведае свайго непасрэднага начальніка? Але як выклікаць прыхільнасць Кацэбы, знайсці тую струнку ў яго душы, якая выдасць патрэбны матыў. Некалькі не задавальняў этычны бок справы... А хіба ёсць другія варыянты? Магчыма, і ёсць, толькі час не церпіць.

Пры сустрэчы Валерый Іванавіч не без задавальнення адзначыў для сябе, што прыкладна такім ён і ўяўляў старшага навуковага супрацоўніка Кургана Славы Васіля Адамавіча Кацэбу. Менавіта «навуковага супрацоўніка». Безумоўна, такія дэталі, як чарнявы, невысокага росту, саракагадовы — не мог дакладна прадугадаць. А вось што абавязкова павінен быць у акулярах, паглыбленым у сябе, нават у пэўнай ступені адхіленым ад людской марнасці, — вызначыў беспамылкова. Даверлівы да баязлівасці, таму хутка ўваходзіў у кантакт, і схіліць яго да сябе не ўяўляла асаблівай цяжкасці.

Каб надаць размове пэўны характар, лейтэнант пачаў здалёк. Маўляў, Курган Славы месца асаблівае, на

аддаленні, людзей шмат бывае... Таму праверка фінансавай дзейнасці адміністрацыі справа звычайная. І, бы між іншым, пацікавіўся:

— Што вы думаеце наконт Івана Мікалаевіча Самохіна?

— Энергічны, дзелавы... Займаемай пасадзе адпавядае. Да таго ж — чулы, абаяльны, культурны... З былых ваенных. Здаецца, маёрам у адстаўку выйшаў. На службе ў асноўным у зампалітах хадзіў. Армейская хватка, вядома, адчуваецца, але гэта толькі на карысць справе...

— Тут вось, Васіль Адамавіч, пагалоску пусцілі... Нібыта Самохін не раўнадушны да вашай жонкі, — лейтэнант уважліва паглядзеў на субяседніка. Але твар яго знешне быў спакойны.

— Ходзіць такая пагалоска... Ды я і сам здагадваюся, — голас Кацэбы стаў сцішаны, глухаваты. — Пасля дванаццаці гадоў сумеснага жыцця... Двое дзяцей нажылі. Восем гадоў у школу з ёй разам бегаў... Але шыла ў мяху не ўтоіш — само вытыркнецца...

«Дзіўны гэты чалавек, — разважаў Валерый Іванавіч. — Жыццю іншых можа даць ацэнку, а вось пра сваё ўласнае задумваецца ўсур'ёз толькі тады, калі пойдзе пагалоска. А да гэтага часу робіць выгляд, быццам нічога не здарылася. Абы ціха, спакойна жылося».

— Чуткі, здагадкі... Можа, гэта і няпраўда.

— Праўда, — як бы сам сябе пераконваў Кацэба. — Што Самохін бабнік, мне даўно вядома... Павесяліцца любіць: жанчыны, рэстаран, каньяк... Жанчын улагоджвае дарагімі падарункамі, бо не тыя ўжо гады, каб зачароўваць сваёй асобай. І маю спакусіў...

Споведзь Кацэбы была сумнай. Усё пачалося амаль з таго моманту, як Васіль Адамавіч трапіў з пераломам нагі ў адну з мінскіх бальніц. Жонка зачасціла на Курган Славы — прыходзіла пазваніць мужу. Як высветлілася ў гутарцы з Валерыем Іванавічам адзін з фатогра-

фаў, на пяты дзень яна ўжо зблізілася з Самохіным. Пасля, калі Кацэба «прагульваўся» на мыліцах па хаце ды падворку, Самохін на яго месца ўладкаваў яго жонку. Маўляў, грошы не зашкодзяць. Такая аргументацыя задавальняла Кацэбу. Пад прыстойнай зачэпкай папарыцца ў лазні (у Кацэбаў была свая) Самохін стаў штосуботнім госцем.

— Неяк мы парыліся разам, і я крыху затрымаўся... — усё больш паглыбляўся ў даследаванне Васіль Адамавіч. І цяжка было заўважыць, прыемна гэта яму ці не. Як падалося Валерыю Іванавічу, Кацэба шукаў для сябе нейкае апраўданне, душэўную раўнавагу. — Жонка гатавала вячэру. Заходжу, а яны цалуюцца... Я не прыдаў тады гэтаму сур'ёзнага значэння. Падумалася, дурэе ўдавец... Усё ж — жывы чалавек...

Кацэба на момант задумаўся, бы яшчэ раз у думках прыкінуў ход падзей. І загаварыў больш энергічна, з адценнем гадлівасці ў тоне:

— Прыехаў Самохін на легкавушцы раніцай, у выхадны. З шафёрам. Прапанаваў усёй сям'ёй махнуць па грыбы. Я спаслаўся на хворую нагу, адмовіўся. Жонка з дзецьмі ахвотна згадзілася. Пасля абеду шафёр прывёз дзяцей, а Самохін з ёй, маўляў, недзе заблудзіліся, дабяруцца на электрычцы...

З гэтага моманту здагадкі Кацэбы перараслі ў яўнае падазрэнне. Аднойчы выпіў і ў даволі бурнай форме выказаў жонцы свае «назіранні» ды вывады... Тая ж адпарыравала даволі пераканаўчым аргументам:

— Як ты мог усумніцца?! Ды гэты адстаўнік ужо зямлёй пахне. Я хацела, як лепш. Ён жа — твой начальнік, дабро для нас зрабіў...

І сапраўды, розніца ва ўзросце Самохіна і жонкі Кацэбы ажно ў дваццаць гадоў! Што ж тады садзейнічала іх збліжэнню? Так, увага, падарункі, практычнасць Самохіна... Але не толькі... Калі былі жывыя бацькі жонкі Васіля Адамавіча, яна адчувала сябе свабоднай жан-

чынай. Выхаванне дзяцей, гаспадарка — усё на іх руках. Пасля іх смерці самой трэба было ўсім гэтым займацца... І тут падвярнуўся Самохін. З'явілася перспектыва абаснавацца ў Мінску і зноў стаць свабоднай...

У маральным аспекце асоба Самохіна была высветлена. Цяпер — Самохін-кіраўнік.

— Васіль Адамавіч, а які аклад у Самохіна?

— Каля 180 рублёў.

— Як вы думаеце, ён на свае грошы весяліцца?

— Ды з такім размахам наўрад ці...

Заставалася азнаёміцца з дакументамі непасрэдна ў бухгалтэрыі Кургана Славы. Толькі Самохін аб гэтым не павінен ведаць. Такі варыянт мог прайсці адно праз Кацэбу.

— Дакументацыю? Магу даць, — замітусіўся Васіль Адамавіч. — Самохіна якраз не будзе на рабоце... У нас і бакоўка ёсць. Можна адасобіцца.

Назаўтра Валерый Іванавіч з'явіўся з фотаапаратурай. І праз дзесяць хвілін зняў фотакопіі з неабходных дакументаў.

Але і гэта яшчэ не гарантавала поспеху. Ён быў магчымы толькі ў тым выпадку, калі б Самохін дзейнічаў без аглядкі, перастрахоўкі, упэўнены ў беспакаранасці. Узяць, скажам, таго ж Сямёна Дзмітрыевіча Пажытку, які нібыта тры месяцы працаваў на Кургане Славы адначасова тэхнікам-сантэхнікам і вадзіцелем аўтацялежкі. У фотакопіі ведамасці на зарплату значылася, што яму выдалі 247 рублёў. А калі дапусціць, што яны падзялілі грошы з Самохіным? Тады, безумоўна, Пажытак не сазнаецца.

— Вы, Сямён Дзмітрыевіч, працуеце на Кургане Славы? — уважліва паглядзеў на суразмоўцу Валерый Іванавіч.

— Працаваў... Гадоў колькі таму.

— А вось тут, — лейтэнант дастаў фотакопію ве-

дамасці, — вы нядаўна атрымалі кругленькую суму.

На твары Пажыткі перамяшаліся здзіўленне і разгубленасць. Лейтэнанту ж упершыню ўсміхнулася надзея.

— Гэта не мой подпіс. Ніякіх грошай я не атрымліваў

— А 69 рублёў, што вось у гэтай ведамасці трохгадовай даўнасці?

— Таксама не меў, подпіс не мой...

Цяпер Валерый Іванавіч не сумняваўся, што стаіць на правільным шляху. І на размову з другім мясцовым жыхаром, Аляксандрам Паўлавічам Савіцкім, ішоў з большым аптымізмам.

— Кароўку, напэўна, маеце, — пачаў, бы між іншым, лейтэнант.

— А як жа без яе.

— Відаць, сенакос выдзяляюць?

— Дзе там... Усё болей дугой здабываем.

— Як гэта?

— Нядаўна вось у загадчыка Кургана Славы 700 кілаграмаў купіў.

— І многа заплацілі?

— Дваццаць пяць рублёў.

— Выходзіць, Аляксандр Паўлавіч, што самі косіце, а пасля, лічы, сваё ж сена купляеце?

— Ды не касіў я там ніколі.

— А як жа тады быць з вашым працоўным пагадненнем?

— Ніякага пагаднення я не заключаў.

— А тыя 53 рублі, якія вам заплацілі за касьбу, таксама не атрымалі?

— Нават здалёк іх не бачыў, не тое што...

— А гэтую заяву не вы пісалі?

— Не, і подпіс не мой.

— У заяве вы просіце загадчыка Кургана Славы выплаціць кампенсацыю за ўкрадзенае некім сена, якое

вы нарыхтавалі. А вось і ведамасць, на падставе якой вы атрымалі грошы за ўкрадзенае сена.

— Якія грошы?! Крый Божа!..

Адмовіўся Савіцкі й ад таго, што згодна з пададзенай заявай працаваў часова тэхнікам-сантэхнікам і атрымаў за работу 45 рублёў.

У найбольш заблытаным становішчы аказаўся жыхар вескі Азярыцкая Слабада Іван Сцяпанавіч Крыштаповіч. Яно нават межавалася з падазрэннем аб яго згаворы з Самохіным.

— Вы сцвярджаеце, Іван Сцяпанавіч, што два тыдні касілі бур'ян на прылягаючай да Кургана Славы тэрыторыі, — рабіў чарговую спробу дайсці да ісціны Валерый Іванавіч. — І атрымалі за гэта ўсяго 40 рублёў?

— І ні капейкі болей.

— Тады ўважліва паглядзіце на гэтую фотакопію ведамасці. Подпіс ваш?

— Мой.

— Але ж тут напісана, што вы атрымалі не сорак, а 140 рублёў?! — Як стала вядома крыху пазней, астатнія сто рублёў, налічаныя Крыштаповічу, па ўзгадненні з намеснікам дырэктара Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Баркуном былі выплачаны Самохіным працаваўшаму часова ў музеі нейкаму Рутэнбергу. — Вы таксама сцвярджаеце, што не заключалі працоўнага пагаднення на касьбу бур'яну. Тады чаму яно замацавана вашым подпісам?

— Я не ўнікаў у сутнасць падпісваемага. Думаў, так і трэба. Проста верыў людзям. Як гэта, каб на Кургане Славы, на такім святым месцы, ды ашуквалі?!

Такім жа чынам даверлівы Іван Сцяпанавіч паставіў свой подпіс яшчэ на некалькіх фіктыўных ведамасцях на атрыманне зарплаты.

Спіс апытаных набліжаўся да дваццаці. І ў большасці яны адмаўлялі свой удзел у напісанні заяў, заключэнні пагадненняў і атрыманні наяўных сум. Заста-

валася выявіць аўтараў фіктыўных дакументаў і падложных подпісаў. Але нават беглае супастаўленне почыркаў давала магчымасць заключыць, што пісалі ў асноўным два чалавекі. Экспертыза ўстанавіла больш дакладна: Самохін і вартаўнік Кургана Славы Кулінковіч.

Такое стала магчымым толькі пры яўным патуранні Самохіну і бескантрольнасці з боку адміністрацыі музея і работнікаў цэнтралізаванай бухгалтэрыі. На работу афармляліся падстаўныя асобы, якія практычна не працавалі. Міфічныя ж плошчы скошанай травы, ачышчанага снегу і лёду, укладзенага дзёрану ператварыліся ў рэальныя грошы для спрытнюг.

Умовы ж для гэтага былі створаны нават больш чым спрыяльныя. Часовыя рабочыя прымаліся без запісу ў іх працоўныя кніжкі. Афармленне на работу праводзілася праз Самохіна па прадстаўленых ім заявах і без непасрэднай гутаркі кіраўніка музея з прымаемымі рабочымі. Табель уліку рабочага часу не кантраляваўся. Ведамасць на зарплату і грошы на ўсіх рабочых пастаянна атрымліваў у касе цэнтралізаванай бухгалтэрыі Самохін. Ён жа праводзіў разлік, а ўсё гэта ўваходзіла ў абавязкі касіра цэнтралізаванай бухгалтэрыі.

Нарэшце Валерыю Іванавічу заставалася высветліць, хто ж пастаўляў Самохіну «рабочую сілу», як гэта рабілася, як разлічваўся загадчык з падстаўнымі асобамі, дый самім іх пастаўшчыком. Самохін не мог займацца гэтым, бо жыў у Мінску. Значыць, нехта з мясцовых. З тутэйшых быў і вартаўнік Кургана Славы Кулінковіч.

Каб аформіць фіктыўна чалавека на часовую работу, усё ж неабходныя былі даныя з сапраўднага пашпарта. Як яны здабываліся і кім? Гэта ўдалося ўстанавіць праз пенсіянера Рыгора Фёдаравіча Пажытку. А прыцягнуў ён увагу Валерыя Іванавіча даволі салíднымі сумамі, што значыліся ў ведамасцях супраць прозвішча Пажытка.

— Што вы, я ніколі не працаваў на Кургане Славы, — нямала ўсхваляваўся Рыгор Фёдаравіч.

— Тады адкуль з'явіліся такія дакладныя даныя з вашага пашпарта?

— Ды Кулінковіч, вартаўнік Кургана Славы, наведваўся, — яшчэ болей сумеўся стары. — Растлумачыў, што, маўляў, нейкую там работу выканаў адзін чалавек, і, разумееце, непажадана, каб яго прозвішча фігурыравала. Я ж пенсіянер, дык чаго ўжо мне асцерагацца. Вось і аддаў пашпарт, каб праз мяне афармілі... Хіба ж я мог уявіць...

— Ну, і колькі вам Кулінковіч заплаціў?

— Чырвонец, — зусім збянтэжыўся Пажытка.

Прамых доказаў вінаватасці Пятра Сямёнавіча Кулінковіча было дастаткова, таму ён і не імкнуўся выкруціцца. Больш ускладваў надзей на спагаду да сябе і несвядомае дачыненне да справы. Быў ён каранасты, дзябёлы, з хітраватасцю ў рухомых вачах і дагодлівым, сцішаным голасам.

— Я, вядома, здагадваўся, што незаконна афармляю людзей, — не адмаўляў сваёй віны Кулінковіч, — а вось якія канкрэтна прысвойваліся сумы, не ведаў. Самі разумееце, Валерый Іванавіч, адукацыя ў мяне ўсяго чатыры класы й пяты калідор. Дык дзе ўжо тут адразу ўцяміць. І служба ў вартаўніка начная, таму не вельмі ў курсе, што робіцца днём. Да таго ж я падначалены Самохіна. Ведаеце, месца нядрэннае... Не хацеў страціць... Вось і ўступіў у змову з Самохіным... Што я меў? Ды як калі: бутэльку, дзесятку...

Вядома, Кулінковіч прыбядняўся. Так, пасля ён прызнаецца, што атрымаў аднойчы 180 рублёў. Нагул жа: «...Сістэматычна складваў фіктыўныя, заведама падложныя працоўныя пагадненні, заявы, распісваўся па ўказанні Самохіна ў плацёжных ведамасцях ад імя падстаўных асоб, а налічаныя па фальшывых дакументах грошы прысвойваў. Усяго ўчыніў не

менш як 21 падложныя подпісы». (З абвінаваўчага заключэння).

Справа набліжалася да завяршэння. І хоць вялася яна даволі аператыўна, аднак давялося паскорыць. Прычынай таму з'явіўся званок нейкай уплывовай асобы.

— Нам здаецца, Валерый Іванавіч, — гучаў у трубцы ўладарны начальніцкі голас, — што вы не зусім правільна ведзяце справу. Я нават сказаў бы: прадузята. Мы прапануем згарнуць яе. Калі трэба, падашлём на дапамогу чалавека. Не забывайце — Самохін Мікалай Іванавіч карыстаецца вялікім аўтарытэтам не толькі ў музеі, але і ў міністэрстве...

— Пакуль ідзе следства, — абарваў уплывовага незнаёмца Валерый Іванавіч і паклаў трубку.

Так, заступнікі Самохіна заварушыліся. Значыць, пасапраўднаму запахла смажаным. Гэта падбадзёрвала Валерыя Іванавіча і адначасова прымушала як след усё прааналізаваць. Прыгадаліся і 100 рублёў, што вывелі на кіраўніцтва музея. Магчыма, гэта не такая ўжо і выпадковасць. А паводзіны Самохіна? Спачатку шукаў сустрэчы. Цяпер жа — пазбягае і, як паведаміў Кацэба, пачаў адкрыта, нават дэманстратыўна прыўдараць за яго жонкай. Магчыма, хоча падкрэсліць сур'ёзнасць свайго намеру. Усё ж нейкая маральная рэабілітацыя. Магчыма, гэта і не жэст адчаю, а дэманстрацыя нахабнасці: абнадзеілі ўплывовыя заступнікі. Што датычыць аўтарытэту і грамадскай вагі самога Самохіна... Што ж, мог сябе паставіць, нават прыкрыкваў на раённае начальства. Маўляў, дэлегацыя замежная на Курган Славы прыбывае. Кроў з носу, а належны парадак забяспечце. Інакш да абкама дайду.

Ясна было адно: пакуль абаронцы Самохіна і ён сам не разгарнулі «выратавальніцкай» дзейнасці па замятанні слядоў, неабходна спяшацца. Для гэтага патрэбна правесці кваліфікаваную праверку фінансавай дзейнасці кіраўніцтва Кургана Славы. Выклікалі рэвізора з

Міністэрства культуры БССР Веру Андрэеўну Жураўель. Яна даволі прынцыпова, з усёй адказнасцю і грунтоўнасцю паставілася да справы. І хутка ў руках Валерыя Іванавіча аказаліся ўсе неабходныя лічбавыя выкладкі. З гэтага моманту закончылася завочнае знаёмства з дзейнасцю Самохіна. Ён быў выкліканы для ўдакладнення асобных момантаў. Хваляваўся, пераконваў, што рабіў усё сумленна і правільна. І ўсё яшчэ спадзяваўся на «выратавальны круг» уплывовых асоб. Таму, калі нават, як кажуць, быў прыціснуты фактамі да сцяны, сцвярджаў:

— Ну, даводзілася афармляць часова на работу падстаўных асоб і заключаць фіктыўныя працоўныя дагаворы. Але ж па прапанове Кулінковіча. Грошы часткова выдаваў Кулінковічу, а часткова ў выглядзе прэмій і дапаўнення да асноўнай зарплаты выплачваў рабочым. Сабе ж нічога не прысвойваў. Парушэнні дапускаў па няведанні фінансавай казуістыкі, але ўсё ўзгадняў з адміністрацыяй.

Дырэктар жа музея П. С. Лавецкі паказаў, што аб злоўжываннях Самохіна не ведаў, а для прэміравання работнікаў Кургана Славы ён выдзяляў дадатковыя сродкі. Рабочыя Кургана Славы пацвердзілі, што ніякіх дапаўненняў да асноўнай зарплаты Самохін не выдаваў.

«...З мэтай крадзяжу грашовых сродкаў, злоўжываючы службовым становішчам, Самохін заключаў фіктыўныя працоўныя пагадненні з падстаўнымі асобамі, распісваліся разам з Кулінковічам замест падстаўных асоб у плацёжных ведамасцях, а налічаныя грошы паўторна прысвойваў». (З абвінаваўчага заключэння).

У выніку: «...Самохін Іван Мікалаевіч, працуючы загадчыкам філіяла «Курган Славы» Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і з'яўляючыся службовай асобай, злоўжываючы службовым становішчам з мэтай крадзяжу грашовых сродкаў, афармляў часова рабочымі на Курган Славы асоб, якія фактычна не працавалі, а

налічаную ім зарплату прысвойваў, выкраўшы 2946 рублёў...» С пастановы аб узбуджэнні крымінальнай справы).

Вядома, кропку ставіць было яшчэ рана. Работа оперупаўнаважанага накшталт першапраходніцкай. Ён прадстаўляе матэрыял, які патрабуе яшчэ шліфоўкі следчага і суда.

Суд не затрымаўся. Згодна з яго рашэннем Самохін атрымаў чатыры гады пазбаўлення волі, а Кулінковіч — паўтара гады папраўчых работ.

Калі Самохіна вялі ў камеру папярэдняга зняволення, у калідоры яго сустрэў былы начальнік Смалявіцкага РАУС Фёдар Яўсеевіч Глушакоў. Ён меў гонар ведаць Самохіна, калі той яшчэ пакрыкваў часам на яго з вышыні пасады загадчыка Кургана Славы.

— Што вы тут робіце, Іван Мікалаевіч? — запытаў нямала здзіўлены Фёдар Яўсеевіч.

— Думаў, што штрафам адкручуся, а тут — упяклі на чатыры гады, — Самохін быў амаль у шокавым стане.

З таго часу мінула шмат гадоў. Я размаўляю з Валерыем Іванавічам Курылёнкам у яго кабінеце. З капітанам Курылёнкам. Акно выходзіць на двор. Відовішча не з прыемных: пагнутыя ў дарожных аварыях машыны, матацыклы. Усе «калецтвы» навідавоку... Інакш з чалавечай душой.

Мяне цікавіў лёс Васілія Адамавіча Кацэбы: як склалася яго сямейнае жыццё.

— Зараз пазвонім на Курган Славы, — ажывіўся Валерый Іванавіч. — У мяне вось у запісной кніжцы й тэлефон захаваўся. Здаецца, Кацэба працуе на ранейшым месцы... — Ало!.. Хто гэта? — у вачах здзіўленне і замяшанне.

— Кулінковіч.

Я сяджу побач, і мне добра чуваць.

— Пётр Сямёнавіч?

— Ён самы.

— Гэта Курылёнак. Памятаеце?

— Яшчэ б...

— І кім жа вы працуеце?

— Вартаўніком.

— А Самохін?

— Той прайдзісвет раней за мяне адкараскаўся... Я б яму ўсе дзесяць даў. Гэтак мяне акруціць...

— Паклічце Кацэбу, — капітану не хацелася болей размаўляць з Кулінковічам. — Твар спахмурнеў, на ім лёг цень грэблівасці. — А, Васіль Адамавіч! — рэзка ажывіўся і павесялеў Валерый Іванавіч. — Курылёнак турбуе. Не забылі? Як жыццё?

— Дзякуй, паціху. Я вас часта ўспамінаю.

— Як сямейнае жыццё?..

— Разышоўся я тады з жонкай... Прасілася сысціся. Адмовіўся... Калі Самохін выйшаў з турмы, забраў яе да сябе... Зараз у мяне другая сям'я. Жыву ў Мінску.

— Сезонных рабочых па-ранейшаму выкарыстоўваеце?

— Ды не, штатныя спраўляюцца.

На момант Валерый Іванавіч уявіў Курган Славы. Ён падаўся яму незвычайна светлы, да празрыстасці: без ценю самохінскай патаемнасці.

## СУЗОР'Е ДАБРЫНІ

Разараны бульбяны палетак нагадваў рэшткі вогнішча. Бы з неба сыпануў попел. Здавалася, што клубні вось-вось спякуцца. Зрэдку ўсхопліваўся віхор. Яго шалёны кругаварот, накшталт жорнаў, быццам перамолваў пясок у пыл касмічнага паходжання. І, нібы не гар тарфяніка даносіўся здалёк, а курэла само мліва глебы. Віхор жа выдаваў на пасланца вірлівай Галактыкі. Ён у які ўжо раз хіліў нас да здагадкі, што мы таксама

пыл, выключна — пыл. А сваім бязладдзем толькі набліжаем гэтае пераўтварэнне.

Старшыня ступіў разоў колькі й спыніўся. Туфлі патаналі ў мяккім, да непрыемнасці, пяску. Нібыта ў бязважкай масляністай масе. Незвычайна рухомай і пранікальнай. Яна як прасочвалася праз тканіну і драбнюткімі кляшчамі казытала шчыкалаткі.

На гэтае поле, што між хутарам і Слабадой, Уладзімір Аляксандравіч Скавародка зазірнуў па сваёй паўсядзённай звычцы: пацікавіцца, як справы. Яны ж ладзіліся. Машыну клубняў адправілі на БелАЗ...

Невялікі віхор усхапіўся паблізу. Нечакана. Быццам задрамаў і спудзіўся. Зноў чаплялася развага аб нікчэмнасці чалавечага жыцця. Ці то бездапаможнасць перад прыродай, ці то нядаўняе наведванне брата настройвалі на сум. Брат жа — знакамітасць! Алег Аляксандравіч Скавародка — член Саюза беларускіх мастакоў. Прызнаны чарадзей колеру. Праўда, абстрактнасць яго твораў блытае, не заўсёды можна ўлавіць іх сапраўдны сэнс. Але гэта не перашкаджала захапляцца незвычайным спалучэннем фарбаў. Нямала карцін падараваў яму брат. І ён часта падоўгу ўзіраецца ў іх незямную, але такую вабную і ўзвышальную сутнасць. Яны адкрываюць іншыя далягляды, дзе жыццёвыя нягоды становяцца дробязнымі, дзе пануюць хараство і гармонія.

Уладзімір Аляксандравіч заўважыў, што Алег бадай ніколі не праміне зручнага моманту, каб падкрэсліць выключнасць творчай працы. Не, не пахваляецца сваім дарам. Хутчэй імкнецца распаліць самалюбства брата. Маўляў, і цябе Бог не абышоў увагай. Вось і гэты раз размова зайшла аб зменлівасці, няпэўнасці сялянскай працы...

— Гэтак, гэтак ты цяпер патрэбен, велічыня, — горача запярэчыў Алег. — Бо кідаеш у ненаеднае горла абывацеля тоны мяса, бульбы, выліваеш цыстэрны ма-

лака... А калі не зможаш – ці пазбавяць такой магчымасці? Га? І ўвесь твой аўтарытэт карова языком зліжа. І неабходнасці ў табе ніякай не будзе. Проста — забудуць пра тваё існаванне. Мае ж карціны перажывуць нават маё грэшнае цела...

Тады Уладзімір Аляксандравіч моўчкі пагадзіўся з довадамі брата. Уражаны й троху прыгнечаны веліччу, дзівоснасцю яго твораў, якія, здавалася, з усіх куткоў майстэрні з дакорам і жалем глядзелі на яго. Цяпер жа — у акружэнні й пад уздзеяннем рэальных акалічнасцей яго свядомасць выказвала нязгоду: не, даражэнькі, без нас, маленькіх, непрыкметных, і твая творчасць — нуль! Бо толькі наша існаванне выклікае патрэбу ў ёй. Усё робіцца дзеля чалавека. Не будзь наўкола цябе ніводнага, ці стаў бы ты маляваць?! Як прыгожа і разумна ўладкаваны свет. Ці не дзеля выключна таго, каб мы маглі ўбачыць гэта і як належыць ацаніць? І, вядома ж, — зберагчы. Колькі хараства ў спелым буйным калоссі! Гэта ж у значнай ступені — твор чалавека. Хай і для патрэбы страўніка. Дык ці не абавязаны мастак, літаратар прыкмеціць і апець і ўвекавечыць усё лепшае ў звычайным чалавеку?! То ж ён — найвышэйшая субстанцыя існасці!

Але, на вялікі жаль, належнай павагай гэтая выключнасць не карыстаецца. Жорсткасць, абыякавасць вымушаюць чалавека шукаць гаючыя прытулкі для душы. Каб ўратаваць яе ад счарсцвення, цвілі самазадаволенасці.

Пра вечнае добра думаецца ля вады. Ноччу. Балазе сядзіба старшыні паблізу сажалкі. Адразу ж — за калгасным садам. І абмінуюць яе, асабліва калі нечым узрушаны, немагчыма. Бераг ледзь кранае струны хваль. З запруды ціха спадае вада. Амаль ніводнага водсвету. Хаты даўно сцішыліся. Да таго ж, іх вакол і нягуста. Толькі зоркі, цэлыя сузор'і глядзяцца ў зацемненае лю-

стэрка вадаёма. Такія далёка-высокія, а тут — побач, ля ног... Людзі ж — таксама зоркі. Аб'яднаныя ў сузор'і. Пераважна — дабрыні. Дабрыні, на якой і трымаецца свет. Лёсы многіх выдатных людзей узгадвае ў такія часіны Уладзімір Аляксандравіч. Ён здаўна цікавіцца іх жыццямі. І яны ўвасобіліся ў зоркі. Жыцці тых, хто скончыў зямны шлях. Зямныя маюць перад імі перавагу: могуць самі распарадзіцца сваёй добрасцю. Нябесныя ж — толькі праз нас, жывых, выпраменьваюць яе. Між імі непарыўная сувязь. І чым шчыльней яна, тым болей дабрыні на зямлі. Тым шчаслівейшае наша жыццё.

На дабрыню дэфіцыт. Заўсёды. Вельмі адчувальны ён і сёння. Мы, прызнацца, бадай што ўпершыню паспачувалі Гарбачову. І толькі тады, калі ён страціў спадарожніцу жыцця. Гэта зацяглая помслівасць уразіла Уладзіміра Аляксандравіча. А Гарбачоў жа толькі трапіў пад кола гісторыі, якое, як вядома, назад ходу не дае. І стаў ахвярай. Вядома, мог тармазіць. Але тады ахвяр маго б быць нашмат болей. І, мусіць добра, што менавіта Гарбачову выпала такая няўдзячная доля. Бо мог надарыцца і больш ваяўнічы кіраўнік.

Відаць, не надта разумна збочваць з наезджанай дарогі, калі новай бадай што не відаць. Апраўдана, можа, толькі пры пагрозе небяспекі. А яна ж была. Алкагольная атрута паралізавала грамадства. Гэта быў баль у час чумы. Людзі быццам прадчувалі нядобрыя змены. І без таго прынадныя да спіртнога, яны шалёна імкнуліся заглушыць надыход бяды. А тут — антыалкагольны закон! Ён толькі ўзмацніў неспакой і незадаволенасць. Людзі праглі глытка забыцця. І ў гэтым раз'юшаным імкненні таптаалі адзін аднаго ў бясконцых, знясільваючых чэргах. Забарона, нават з самым гуманным намерам, вылілася ў гнеў на яе ініцыятараў. Бо не пралягла найперш шлагбаўмам праз свядомасць. Апошняя ж абумоўлена як культурным убоствам грамадства, так і ад-

сутнасцю асобы. А гэта яна, асоба, здольная адпрэчыць тое, што прыніжае чалавечую годнасць...

Як толькі дзяржава прыкрыла спіртавы кранік, тут жа набрала сілу самагонная вытворчасць. І попыт на атруту зноў быў задаволены.

Грамадства вар'яцела ад празмернага ўжывання спіртнога. А Ўладзімір Аляксандравіч Скавародка тады толькі асвойваўся з пасадай кіраўніка калгаса «1-га Мая». Найбольшы неспакой выклікала прыахвочванне моладзі да ачмуральнага пойла. Механізатараў, жывёлаводаў... Забарона зверху не здымала праблему. Кожную руку, якая падносіла да вуснаў чарку, не перахопіш. Кожны самагонны «заводзік» не высачыш. А яны курэлі, курэлі... Зафіраньвалі гарам людскасць, будучыню.

«Які ж паратунак? — Старшыню агортваў пакутлівы роздум. — Прышпорваць вета, ці цярпліва ладзіць запрэжку разумных мер?». Абраў другі кірунак. На прыкід Уладзіміра Аляксандравіча — адно клопат аб дабрабыце сям'і можа прыпыніць алкагольнае катаванне. Бо гэтая турбота сама бліжэй да свядомасці. А калі ж яшчэ выключна сялянскі непакой! І пачаў надзяляць маладыя сем'і кароўкамі, парасяткамі. Нярэдка — прымусова. Кармамі таксама забяспечваў. І ўсё — за сімвалічную плату. Каб толькі праз асабістую гаспадарку забыліся на бутэльку, каб дзеткі не былі галодныя. Старшынёй рухала перакананне: «Не можа той, хто спазнаў смак у гаспадарлівасці, спакусіцца на змесціва чаркі».

Вядома ж, рызыкаваў. Моладзь, у большасці сваёй, не надта паспешлівая да добраахвотнага абцяжарання дадатковымі абавязкамі. Ды яшчэ такімі — неадкладнымі й тлумнымі. Таму і кантраляваў. Нязводна. Усіх новаспечаных гаспадароў.

Асабліва помны восеньскі ранак. Дзесяцігадовай даўніны. Гаротней аматараў спіртнога, чым у сям'і Грышовых, наўкола не было. Ён — трактарыст. Яна праца-

вала на ферме. І абодва — нявольнікі зялёнага змія. А дзяцей позіркам не ахопіш. Малеча, адно аднаго меней. Сэрца млела ў старшыні, калі бачыў іх. Ці нават прыгадваў. А як дапамагчы? Толькі праз бацькоў. Вось і кароўку выдзелілі. Думалася, прыхінуцца да хаты. Дзеткі малачком паласуюцца... Праўда, рагулю Грышовы бралі без пярэчання. Але выгляд мелі нейкі безудзельны, амаль безвыходны. Маўляў, даюць — бяры... І Уладзімір Аляксандравіч не паверыў у шчырасць іх намеру.

Таму наведаў Грышовых на наступны ж дзень. У хляве каровы не знайшоў. Наструніла нядобрая здагадка: «Няўжо прадалі?» Але тут жа пачуў сіплаватае баязлівае мыканне. Небарака была прыпята да дрыватні. Вылізанае асінавае палена злёгку бралася парай. Старшыня адвязаў карову і падвёў да сена. Тая так прагна стала жэрці, што, здавалася, вось-вось хруснуць сківіцы. Уладзімір Аляксандравіч пагладзіў худобу і ўслых супакоіў:

— Нічога, у крыўду не дам.

Вачэй не спускаў з Грышовых. І ўрэшце сям'я захавалася — навучыліся людзі жыць. А там і дзеткі на ногі сталі.

Так, дбаў ён і пра прытулак. Не адзін дзесятак дахаў ахінуў цяплом і ўтульнасцю. Людзі хінуліся да яго, верылі. Моладзь урастала ў зямельку — адчула яе вабнасць, увабрала яе сілу. Ці не таму і ўсе пасады, рабочыя месцы сёння занятыя. І не абы-кім.

У апошнія гады мясцовыя ўлады займаюцца «перацягваннем прыватнай даёнкі». Зразумела — з кожнага кіраўніка спаганяюць паасобку. Адсюль — сцэджвай толькі яму. А калі не, дык пазбаўлю рагулю ўсіх крыніц забеспячэння. На нейкі час вымушаны быў збочыць на гэтую ж сцяжынку і калгас «1-га Мая». Але тут жа спахапіліся, бо кароўкі сталі знікаць з падвор'яў.

У такім выпадку ці не лепей быць у нязгодзе з рэгіянальнымі інтарэсамі? Урэшце, калі будзе ўдосталь

прадукцыі, то яе ўсё роўна з удзячнасцю спажывуць людзі. Хай і не праз сельсавецкі ці раённы малаказабörнікі. Кіруючыся такімі меркаваннямі, прадалі людзям па сходнай цане каля 400 тон зерня. Забяспечылі сенам. Хто не мог прывезці, даставілі на калгасным транспарце. А заслужаных працаўнікоў задаволілі — бясплатна. Замянілі хворых каровак...

Часам жыццё так зняможа, затлуміць справамі, неўладкаванасцю, што хочацца ўцячы ад самога сябе. У нейкую бязважкасць памяркоўнасці, здаровага сэнсу, павагі, спагады... І тады Ўладзімір Аляксандравіч бінтуе сваю анямоглую душу разлогамі, даляглядамі Бацькаўшчыны. Завітвае да маці. У вёсачку Ассё, што на Лепельшчыне. Але дзеля кожнай болькі не наездзішся. Не выпадае. Дый навошта. Можа, толькі па кончай неабходнасці. Тады й болей гаюча.

Патрэбен быў іншы паратунак. Штодзённы. Спадарожны. І ён не абмінуў. Старшыня спачатку адчуў яго, а пасля і асэнсаваў. Добрасць. І справы, спароджаныя ёй. Паспрыяў чалавеку і атрымаў глыток палёгкі, бы сасмяглы вады. Удзячнасць людская супакойвае, лечыць, адпужвае скруху.

Вартасць жыцця Ўладзімір Аляксандравіч Скавародка акрэсліў для сябе даволі выразна: спагада, годнасць і максімальная рэалізацыя сваёй сутнасці. Яна ж у яго адметная. Нават знешне. Задуменны, часам да летуценнасці. Бы падуладны нейкаму іншаму вымярэнню. А то раптам узлятуць густыя чорныя бровы, быццам крылы птушкі. А ў вечаровым паўзмроку глыбокіх вачэй замігцяць дзве зорачкі. Гэтак загадкава, злёгку саркастычна: маўляў, вы ніколі не здагадаецеся, аб чым я думаю. Твар шырокі, засмужаны. Скроні густа перасыпаны млівам перажытага. Вятры нягод расхінулі прыкметныя залысіны. Голас сцішаны, лагодны. З дабрынёй.

На першым часе Ўладзімір Аляксандравіч вельмі шкадаваў, што прыняў калгас «1-га Мая».

— Толькі з-за адной мясцовай школы... — Усё яшчэ ўзрушана і помна ўспрымаўся ім гэты казус. — Каб ведаў, што дзесяцігодка ў такім занядбаным стане, ніколі не пагадзіўся б.

Пачатак старшыньства якраз супаў з першым верасня. Адзіннаццаць гадоў таму. Варатоўская школка мясцілася ў чатырох невялікіх драўляных пабудовах. Паўструхнелых, падлога ледзь ліпела— не намацаеш цэлай маснічыны. Толькі трыццаць вучняў...

То ж побач з калгаснай канторай. Акурат — вокны ў вокны. І глядзелі яны, як здавалася, з дакорам. І найперш, — на яго, Скавародку. Маўляў, калі ты прыйшоў надоўга, старшынька, то мусіш дбаць аб будучыні — дзетках.

Да гэтага калгас не мог адужаць будаўніцтва новай школы. І таму давялося намагацца Уладзіміру Аляксандравічу, каб арганізаваць справу. І ўсё атрымалася. Выстараўся на цагляную — у два паверхі. Сёння пад яе ўтульным дахам сто пяцьдзесят вучняў. У заўтра можна глядзець з надзеяй. А ў вокнах — няма і водбліску папроку. І старшыні болей не сорам узірацца ў іх.

Уласна, непасрэдна вопыту кіраўніцтва гаспадаркай У.А Скавародка не меў. Але падстава для ўпэўненасці была. Папярэдне некалькі гадоў адпрацаваў галоўным заатэхнікам у калгасе імя Арджанікідзе, затым — намеснікам начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі раёна. Па жывёлагадоўлі. Найболей жа Уладзімір Аляксандравіч разлічваў на набытае ў калгасе імя Арджанікідзе. Гэта там атрымаў ён цудоўную магчымасць спасцігаць справу поруч з выдатным кіраўніком гаспадаркі Вікенціем Антонавічам Казлоўскім. І па сёння ўдзячны Вікенцію Антонавічу, што запрыкмеціў яго яшчэ на апошнім курсе інстытута. Старшыня наведваўся ў навучальныя ўстановы асабіста, каб выглядзець здольных. І па густу.

Каленцы лёсу... Апантанасць гігантаманіяй завітала і ў наш раён. Узводзіць гіганты справа, безумоўна,

вартая, калі ўлічаны магчымасці. Нярэдка ж вытворчыя гмахі ўзвальвалі на плечы цягавітых гаспадарнікаў. У нас жа: хто вязе, на таго яшчэ болей ускінуць. Затое ініцыятарам меней клопатаў: запрог у план і паганяй спагнаннямі. А гэты, дужы, з апошняга высільваецца.

Будаваць адзін з гігантаў — свінагадоўчы комплекс на дваццаць чатыры тысячы галоў — выпала і Смалявіцкаму раёну. Заставалася толькі прыкінуць, на чый «воз» яго ўладкаваць. Самым пакоўным на той час быў — калгас імя Арджанікідзе. Адна з мацнейшых гаспадарак! І выбар быў зроблены акурат у такой адпаведнасці. Але ён ніякім чынам не мог задаволіць Вікенція Антонавіча Казлоўскага. Бо адзін гігант ужо муляў карак — буйнейшы ў рэспубліцы цяплічны камбінат. Хоць бы з ім саўладаць...

Іншага выйсця, як тэрмінова адмовіцца, не было. Часу ж для развагі амаль не заставалася. У лоб — не возьмеш. Сялянская кемлівасць выдавала адзіны варыянт; разумеў, не самы лепшы. Думалася, малады, самалюбівы. Але ж не кар'ерыст, здольны. Павінен зразумець і сцярпець. І крыху павагаўшыся, наважыўся пагутарыць са сваім заатэхнікам. Паклікаў у кабінет.

— Ты сядай, сядай... Размова будзе працяглай.

Калі ж Скавародка не надта ёмка прымасціўся на трэці крэсла, яшчэ раз уважліва паглядзеў на хлопца. Бы імкнуўся выверыць свае меркаванні. Канчаткова.

— Я цаню цябе, Валодзя, як здольнага, перспектыўнага спецыяліста. Нават — таленавітага...

Скавародка наструніўся, злёгку пачырванеў. Але чамусьці не радасць пераважвала, а трывога.

— Ты ўжо ведаеш, што на нас вось-вось узваляць свінагадоўчы комплекс... Як ты думаеш, пацягнем?!

— Не хопіць сіл...

— І я той жа думкі... Што ж тады рабіць?

— Адмовіцца.

— А падстава?.. Канкрэтная?

— Растлумачыць усё, як ёсць...

— Каму? Ніхто і слухаць не будзе. Для іх галоўнае збыць клопат і адрапартаваць. Я тут па сваіх каналах паспрабую адчапіцца. Ты ж таксама павінен пайсці на кампраміс.

— Які?

— Буду на цябе спасылацца, што яшчэ малады, нявопытны... Разумееш? Караций, як заатэхнік не здужаеш комплекс. То не крыўдуй, калі ласка. У цябе яшчэ ўсё наперадзе. Мая ж падтрымка гарантавана. Бо калі на нас спіхнуць гэты комплекс, то з-пад яго ніхто героем не выкараскаецца. Ты ж, для большай верагоднасці свайго аргумента, едзь у раён... Прыкінься гаротным, разгубленым...

Хітрыкі старшыні як спачатку ўразілі маладога Скаародку, так пасля і развесялілі. І ён зусім не крыўдаваў на Вікенція Антонавіча, бо разумеў, што гэты яго адчайны крок выкліканы невыкрутнасцю становішча. Яго ж спарадзіла камандная сістэма гаспадарання.

Галоўнае — пашчасціла адхрысціцца ад комплексу. А неўзабаве праект на яго будаўніцтва лёг на стол да старшыні калгаса «Ленінскі шлях» Анатоля Баніфатавіча Купрэйчыка.

Тым часам калгас «Ленінскі шлях» акрэсліўся ў гаспадарку па вытворчасці малака. Калгасныя рагулі хоць і не наступалі на пяты рэкардысткам эксперыментальных баз, але найболей з прадстаўніц радавых гаспадарак наблізіліся да іх. У калгасе ашчаджалі, сканцэнтравалі матэрыяльныя і фінансавыя сродкі, каб забяспечыць новы прарыў у магчымасцях малочнай галіны. Рыхтаваўся той «парахавы зарад», які павінен быў вывесці эканоміку гаспадаркі на болей высокую арбіту. Але тут навальнічнай хмарай насунуўся свінагадоўчы комплекс, які пагражаў сур’ёзна «падмачыць порах». І Анатоль Баніфатавіч хапатліва прыкідваў варыянты, як адвесці пагрозу.

Толькі збавенне з'явілася само. У асобе тадышняга старшыні калгаса «1-га Мая» Вячаслава Аляксандравіча Пратасавіцкага. Ён забраў у Купрэйчыка праект на будаўніцтва комплекса. Літаральна са стала. На што ж ускладваў надзеі гэты прадпрымальна-рызыкоўны кіраўнік? Першай справай — прэстыжнасцю пабудовы прыцягнуць дадатковыя сродкі на ўмацаванне самой гаспадаркі. Яна ж мела ў гэтым неадкладную патрэбу. Для Вячаслава Аляксандравіча надзвычай важна было здзейсніць задуманае. Яно ж — апярэджвала час. Менавіта ў кірунку перапрацоўкі й рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі. Уласнымі сіламі. Але гэтае імкненне старшыні не віталі мясцовыя ўлады. Бо яно абарочвалася незалежнасцю ад іх. Таму маглі ў любы момант прапанаваць саступіць месца. А з-пад цяжару комплексу, як уяўляў Вячаслаў Аляксандравіч, выслабаніць яго будзе надзвычай няпроста. Дый ахвотніка трапіць пад прэс такой адказнасці наўрад ці знойдуць. Да таго ж, калі клопаты па будаўніцтве «завяжуцца» на ім, Пратасавіцкім, то адолець гэты «вузел» будзе пад сілу толькі яму. Аднаму. Меліся кінуць калгасу і «выратавальны круг». Некалькі гаспадарак у падмогу.

Толькі не накавана было збыцца намерам Вячаслава Аляксандравіча. Трагічная выпадковасць насцігла яго на самым узлёце. Смяротны холад пазбавіў росквіту талент выдатнага, прадбачлівага кіраўніка. Яго справу выпала прадоўжыць Уладзіміру Аляксандравічу Скавародку. Дарэчы, абодвум ім даў бласлаўленне на хлебаробскі подзвіг Вікенцій Антонавіч Казлоўскі. То ж калгас імя Арджанікідзе, які ён узначальваў, атэставаў іх на ўменне кіраваць. І даволі грунтоўна.

Каленцы лёсу... Комплекс, ад якога з такой цяжкасцю адчапіліся ў калгасе імя Арджанікідзе, і не без удзелу У.А.Скавародкі, цяпер усім цяжарам узлёг на апошняга. Ужо ў калгасе «1-га Мая». А распад Саюза, які спарадзіў бязладдзе ў эканоміцы, прыкметна збавіў імпэт

мясцовых улад. Толькі былы першы сакратар райкама партыі Пётр Пятровіч Кулеш яшчэ арганізоўваў выезды «хуткай дапамогі». Але ін'екцыі — нашпігоўванні, аўралы, суботнікі — ужо не маглі выратаваць гіганта. Дарэчы адзначыць, што ў такім «лячэнні» Пётр Пятровіч быў надзвычай спрактыкаваны. Усё ж і ён вымушаны быў атрэсці рукі.

Паядынкі з абставінамі прайграваліся. Адзін за адным. І нарэшце, ужываючы спартыўную тэрміналогію, удалося патрапіць толькі ў адну восьмую фіналу. Свінагадоўчы комплекс, разлічаны на дваццаць чатыры тысячы галоў, ледзь абазначыўся трыма. Шылася адзенне на асілка, а нарадзіўся ўсяго толькі карлік. Між тым, і ўнушальны адміністрацыйны будынак, і шматлікія каркасы свінарнікаў, і кацельня, і водазабеспячэнне пад патрэбы гіганта так спаўна і не запатрабаваныя. Па сённяшні дзень. Не спатрэбілася і абсталяванне.

Што ж тычыцца «выратавальнага круга», то кожная гаспадарка ратавала сама сябе. Як магла. Гэтак жа, як і калгас «1-га Мая». Свінагадоўчы «недаростак», мо толькі памажнее на галоў з тысячу. Большага калгасу не адолець. Паціху дабудоўваюць распачатыя памяшканні. Прыстасоўваюць пад кароўнікі.

Ачуняць калгас мог, як бачылася Ўладзіміру Аляксандравічу, толькі ўзброіўшыся тэхнікай. Па гэтым жа паказчыку гаспадарка займала на той час адно з апошніх месцаў у раёне. Энерганасычанасць вытворчасці — гэта і зніжэнне сабекошту прадукцыі, і яе канкурэнтаздольнасць. Гэта магчымасць выжыць. Тым болей, што з трох тысяч шасцісот гектараў сельгасугоддзяў — каля чвэрці тарфянікаў. Забалочаных, асушаных і не зусім. Мускуламі й нават біцэпсамі гэтую зямліцу не ўлагодзіш. Неабходны маторы. І нямала. Але іх не накляпаеш. Трэба грошыкі. Інвестыцыі... Выратавальны змест гэтага слова сёння нам зразумелы, як ніколі раней. Між тым, яно лацінскага паходжання. І азначае літаральна —

апранаць. Задаволіць чалавека на працяглы час. Адсюль — доўгатэрміновыя ўкладанні капіталу. Селяніна ж зараз бессаромна раздзяваюць...

Зямля — не толькі прадмет працы. Але і сродак вытворчасці. У ёй заключана цудадзейная сіла. Поруч з чалавечай. І гэтая моц, каб супольна з намаганнямі людзей магла б спарадзіць важкі колас, клубень, павінна падсілкоўвацца. Заўсёды, векавечна... Падмацункі зрэдзь не спрыяюць дужасці.

Таму разавыя фінансаванні гаспадаркі не маглі задаволіць Уладзіміра Аляксандравіча Скавародку. А ўсе дамоўленасці з кіраўнікамі прамысловых прадпрыемстваў Мінска зводзіліся менавіта да іх. Бо дзяржзаказ на пастаўку сельскагаспадарчай прадукцыі злізваў апошнюю амаль падчыстую. І ў адказ на пытанне прамыслоўцаў: «А што ўзамен?» даводзілася толькі разводзіць рукамі. Самавіты ж інвестар, які б рызыкнуў на працяглае супрацоўніцтва, не надараўся.

Дапамог выпадак. Сустрэў земляка з роднай вёсачкі Ассё — Васіля Паўлавіча Кулакова. На той час намесніка дырэктара Беларускага аўтамабільнага завода. Па збыце. Паступова гаворка са сцяжынкі асабістых інтарэсаў саступіла на бальшак вытворчых спраў.

Тады магчымасці БелАЗа былі істотна абмежаваныя абставінамі. Волат не мог стаць на колы ды ўзяць накірунак на рынак. З-за недахопу камплектуючых. А іх пастаўлялі дзесяткі краін былога Саюза. Але, ачмурэлыя ад чаду самастойнасці, тыя зусім забыліся на саюзнага асілка. Ён жа, каб выжыць, вымушаны быў корпацца з драбязой шырспажыву. Бы дзяцюк, забаўляўся цацкамі. Дарэчы, цацкі й майстравалі.

І ўсё ж не маглі спаўна заняць людзей. Прастойвалі. Зарплата затрымлівалася... Аўтазаводцы звальняліся. Як захаваць кадры да лепшых часін?

— Нялёгка, — паспагадаў Уладзімір Аляксандравіч, блізка ўспрыняўшы горкую споведзь субяседніка. — І не адным вам. Толькі разам было б ямчэй...

— Што ты маеш на увазе? — Васіль Паўлавіч, як падалося Скавародку, насцярожыўся.

— Пара, як кажуць, накрыўку зрывае... Спусціць яе ў самы раз.

— Празрысцей можна?

— Калі ласка! На калгасных палетках і людзям вашым занятак знойдзецца, і заробяць нешта... Як-ніяк, а прахарчуюцца. У лік зарплаты. І цану скінем... Бяда аб'ядноўвае. Надзейней за яе нішто не сцэментуе. Хіба не ў гэтым наша ўзаемнае выратаванне?

— А што ж патрабуецца ад нас?

— Тэхнічнае забеспячэнне...

— Прапануеш нешта накшталт аграрнага цэха?

— Хай сабе і так. Людзі ж у вас пераважна вясковыя. Прыхінуцца да зямліцы — душой ачуняюць, сілы набяруцца... Нягоды хутчэй адужаюць.

— Мяне, лічы, пераканаў. Але ж не адзін я вырашаю. Мы апякліся ўжо на калгасе «Парыжская камуна». Разлічвалі на іх жывёлагадоўчы комплекс. Нават абсталяванне для мясаперапрацоўчага цэха набылі. Цяпер, вунь, іржавае.

— Дык нам жа яно якраз дарэчы, — незвычайна ажывіўся Уладзімір Аляксандравіч. — У нас таксама комплекс... Свінагадоўчы.

— Гэта, безумоўна, важкі довад. І ўсё ж...

— Зразумей, тады вы былі багаценькія... Падшэфны калгас падарункамі закідвалі. А цяпер — іншая сітуацыя. У адной запрэжцы будзем воз з нястачы выцягваць. Агульны... Паўлавіч, даражэнькі, закінь слоўца... Я не падвяду. Ты ж мяне ведаеш.

— Ведаю, ведаю.

Першая сустрэча з дырэктарам Беларускага аўтамабільнага завода Паўлам Лук'янавічам Марыевым

жаданай перспектывы не акрэсліла. Той пераважна слухаў, зрэдку ўдакладняў акалічнасці, але сваіх адносін да супрацоўніцтва не выказваў. Быў надзіва спасцярожлівы. Каб непадробная зацікаўленасць з боку Паўла Лук'янавіча, то можна было б усумніцца ў поспеху справы. А так ўсё тлумачылася адзіна грунтоўнасцю намячаемага мерапрыемства. Старшыня імкнуўся пераканаць Марыева, даказваючы, што аддача залежыць ад саліднасці інвестыцый. Ведаючы схільнасць прамыслоўцаў без прамаруджвання бачыць вынік, Уладзімір Аляксандравіч арыентаваў дырэктара БелАЗа на працяглае, цярплівае перамолванне ўкладваемых сродкаў. Такая спецыфіка сельскагаспадарчай вытворчасці, яе сезоннага характару.

Кіраўнік БелАЗа, спецыялісты прыглядаліся, прыкідвалі... Вывучалі ўсё да драбніц. Міналі тыдні, месяцы... Урэшце аўтазаводскі «пільнаскоп» выглядзеў неабходнае. І досыць...

Па рашучым настроі дырэктара Беларускага аўтамабільнага завода Уладзімір Аляксандравіч адчуў, што чарговы яго візіт у гаспадарку вызначальны.

— Дзе, Уладзімір Аляксандравіч, цэх мяркуеш будаваць? — без прадмовы распачаў гаворку Марыеў.

— Ды побач з комплексам, Павел Лук'янавіч.

— Зручна... Апетыт у аўтазаводцаў — сам ведаеш. Каля сямі тысяч страўнікаў. Праглынуць тваіх парсючкоў, бычкоў і вокам не міргнеш.

— Мяса закупім. Перапрацоўка выдаткі перакрые...

— А калі такі варыянт... Мы пастаўляем «БелАЗы» і запчасткі да іх на Кенгісепскі фасфатны руднік. Узамен жа да нас паступаюць фасфатныя ўгнаенні. Дык мы іх пераадрасуем на калгас. Увесь раён забяспечыце. З табой жа хай мясам, фуражом разлічваюцца.

— Выдатна! Раёну, раёну якая выгада! Угнаенні

ж усё роўна трэба купляць. І грошыкі за іх за межы рэгіёна сплывуць. А тут — усё ў нас асядзе.

З дапамогай Беларускага аўтамабільнага завода калгас падужэў тэхнічна. Раённыя серадняччкі яму ўжо не роўня. Узвысілі свой вытворчы ўзровень і асноўныя галіны гаспадаркі. І не дзіва — прыдбалі чатыры «Доны», чатыры корманарыхтоўчыя комплексы «Палессе», чатыры МАЗы, восем МТЗ, шлейф сельгасмашын!.. Па неабходнасці й асілкі-БелАЗы завітваюць на калгасныя палеткі.

Калгас забяспечвае аўтазаводцаў прадукцыяй мяснога цэха. Штомесяц два з паловай мільярды рублёў! І па семсот мільёнаў — малочнага! Гаспадаркі выдзелілі аўтазаводцам сто гектараў зямлі пад бульбяную плантацыю. Жадаючым калгаснікі вырошчваюць бульбачку для асабістых патрэб. Калгас рэалізуе вырабы цэхаў праз свае магазіны й лаўкі ў райцэнтры ды ў горадзе Жодзіна...

Чатыры гады супрацоўнічалі без усялякага дагавору. На джэнтльменскіх умовах. Дый што, жывучы ў адной сямейцы, дзяліць?!

...Ёсць у старшыні калгаса Скавародкі аддушына. Кожны ўдых з яе ўдзесяцярае сілы. Робіць творчай. Навука! Уладзімір Аляксандравіч і цяпер спалучае старшыньскую пасаду з работай у лабараторыі Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі. З'яўляецца навуковым супрацоўнікам. Кандыдат сельскагаспадарчых навук. Абараніўся даволі паспяхова. Калгаснікі, мабыць, і па сённяшні дзень памятаюць, як іх старшыня рыхтаваўся да гэтых адказных іспытаў. Табліцамі, дыяграмамі былі абвешаны ўсе сцены ў кабінеце. А між імі нястомна снаваў, размахваў рукамі, услых гаманіў сам з сабою Уладзімір Аляксандравіч. Не толькі дасканала спасцігаў матэрыял, але і адпрацоўваў жэсты, міміку, вымаўленне... То ж такія знаўцы справы будуць экзаменаваць! А колькі спецы-

яльных тэрмінаў, нязвыклых для вуха трэба засвоіць! І павінен свабодна карыстацца імі, бы з пялёнак яны табе знаёмыя. Ён дасягнуў пастаўленай мэты. Бліскуча! Цяпер з гонарам паказвае кандыдацкую дысертацыю. Невялікую па аб'ёме, ды надзвычай змястоўную. Выкладзена строга навуковай мовай. Што гаворка ідзе аб жывёле, толькі адным слоўцам у самым пачатку абмоўлена. Для недасведчаных — цёмны лес! Магчыма, замахнецца і на доктарскую. Тэма — на мяжы фантастыкі: як за адзін толькі год атрымаць ад адной каровы чацвёра цялятак?! Прычым — высокапародных!

Нябачная эканомія часу, сродкаў у справе ўзнаўлення статку. Сутнасць метаду — вымыванне яйцаклетак высокапародных кароў, якія страцілі, па розных прычынах гаспадарчую прыгоднасць, але не ўзнаўленчую. І перасадка эмбрыёнаў беспародным каровам, цялушкам. Для выношвання. Толькі кармі апошніх як след і атрымаеш станоўчы вынік.

Шырока прымяняў гэты спосаб Уладзімір Аляксандравіч, калі працаваў заатэхнікам у калгасе імя Арджанікідзе, калі вёў жывёлагадоўчую галіну раёна. Па яго ініцыятыве да гэтай работы былі прыцягнуты вучоныя Беларускага навукова даследчага інстытута жывёлагадоўлі. Зрухі ў лепшы бок былі значныя. Сёння ж, можа, толькі ў калгасе «1-га Мая» практыкуюць размнажэнне эмбрыёнамі. Бо ў гэтым зацікаўлены сам старшыня.

Жыццё на планеце Зямля будзе доўжыцца да таго часу, пакуль будуць захоўвацца ў людзях гены дабрасці. Менавіта дзеля гэтага зноў і зноў на жыццёвым гарызонце запальваюцца зоркі. Усе яны з'яднаныя ў Сузор'е Дабрыні. Прыкметна ззяе ў ім і зорка Ўладзіміра Аляксандравіча Скавародкі. Таму яго і вызначаюць дабрыня і людскасць, скіраваныя на здзяйсненне подзвігу дзеля шчасця сваіх землякоў.

## ШЧАСЦЕ ХВЕДАРА ПРЫВАЛАВА

Сучассе... Яно саткана са шматлікіх імгненняў. Для кожнага — сваіх. Адметных. Гэта — хісткая кладачка паміж двума берагамі плыні: мінулым і будучым. Толькі вымавіў слова — і яно абрынаецца ў бездань вечнасці, што, бы ненаедны монстр, няўмольна глытае па кавалачках-імгненнях нашыя жыцці.

Дубы й вербы ўсцяж Алесінскага тракту парадзелі. Прыкметна. Шматлікія парэшткі пнёў, бальзамаваныя сонцам, дажджамі й ветрам, доўга сведчылі аб існаванні колішніх прысадаў, пакуль іх і не выкарчавалі...

Алесінскі тракт не-не дый прыгадае суцішна-лёгкія крокі Якуба Коласа. Славуты пісьменнік настаўнічаў некалі ў тутэйшых мясцінах. Пачатковая школка месцілася па тым часе скрай вёскі Верхмень. Акурат у вярхоўі рачулкі Мены. Верхмень аднойчы меліся знесці. З гэтай прычыны новую школу пабудавалі ў Алесіне. Але назвалі Верхменскай, каб захаваць памяць пра народнага песняра.

Таксама помніцца тракту, як лёцьма праносіліся дрожкі пана Ваньковіча, калі той наведваў свае ўладанні. Зрэшты, муры ягоных пабудоў у Шыпянах не толькі захаваліся, але і сёння ўсё яшчэ служаць людзям. Трохпавярховы панскі бровар прымеркавалі пад кантору і клуб. У падсобных памяшканнях размясціліся сталоўка, бар, гасцініца, крама... Чырванацэглыя муры, бы адвечныя сведкі мінулага, сваёй трывалай надзейнасцю ўвасабляюць шчаслівую будучыню. І зусім не белымі ніткамі ўваткалася ў гэтыя гмахі супярэчлівая сучаснасць. Роўняддзю цаглянай кладкі, бы чароўнымі шыўкамі, здаецца, знітаваная сама вечнасць.

Пакінутае жытло, звычайна як і адзінокі чалавек, заўчасна старэе. Старшыня калгаса Хведар Іванавіч Прывалаў, можна сказаць, вярнуў сівым, абымшэлым мурам і хараство, і былую веліч. Увогуле ж працавітыя

шыпянцы высока цэняць працу людскую, бо ведаюць: некалі ўзводзілі гэтыя пабудовы такія ж працалюбы-ўмельцы, як і яны самі. І плёнам працы сваіх прашчураў яны не толькі любуюцца, ганарацца ды па-добраму зайздросцяць. Яны таксама і вучацца ў колішніх таленавітых майстроў.

У чым сэнс жыцця гэтага чалавека? Магчыма і ў тым, каб некалішнія добрыя справы людзей вярнуць з пылу забыцця ў сённяшнюю надзённасць. Карацей, хто не азіраецца, не адчувае ў сябе за плячыма цёплы подых дабрыні мінуўшчыны, хто глухі на сэрца і кароткі на памяць, той ніколі не выйдзе з пустотна-бездухоўнага лабірынту неахайнасці.

Сонечнае бязмежжа ліпеньскага неба ў стане белага напалу. Вішнёвага колеру «Ніва» на прасёлку — акурат распалены ў горане кавалак металу. Але вось дарога пашылася ў засень прырэчнага кустоўя. Хведар Іванавіч збавіў хуткасць. Высунуў з машыны руку, быццам хацеў зажменіць прахалоду. Машыну тузанула на адной выбоіне, другой. Падумаў: «Трэба ўзяцца і за гэтую дарогу... Калі не заасфальтаваць, дык хоць гравіем усыпаць як след...» Абсягі гаспадаркі нядаўна пашырыліся за кошт зямель суседняга калгаса. Не надта вялікі набытак — усяго адна вёсачка. Але ж там — людзі, і дарога мусіць быць роўная, сухая.

Нечакана ляшчыннік і вербалоз расступіліся. У аздобе кустоўя сцішылася невялікая прагаліна, на ўскрайку якой, акурат на ўзвышшы берага ракі, тулілася, амаль урослая ў зямлю, стрэшка, здалёк нечым падобная на птушку з параненымі крыламі.

Хведар Іванавіч мякка затармазіў, прыхапіў з сабой шклянку і ўмомант апынуўся ля стаўка, рупна акальцаванага бетонам і каменнем. Бруйна-вясёлая крынічка порстка пазвоньвала крышталікамі ледзянога настою.

Менавіта немітуслівa-імклівая рухавасць надае невысокай мажнаватай постаці лёгкасць. А ўсё ж пры-

валаўская адметнасць — ягоны пагляд: ветлы, асветлены думкай, якая, здавалася, вось-вось азорыцца нечаканай здагадкай ці нават рашэннем важнай праблемы. Яшчэ і такая асаблівасць — голас: сцішна-выразны, прыязна цёплы — ну роўна ручай, што ліецца з глыбіняў душы.

Крынічная прахалода затуманіла шклянку, але тут жа зноў вярнула ёй ранейшую празрыстасць. Глыток, другі — і смагі як не было, знікла дарэшты.

Прыгадалася... Неяк завітаў я ў кантору. І што ж там убачыў? Дзіўна, перад Хведарам Іванавічам на стале — трохлітровы слоік з празрыстай вадкасцю. Цікаўнасць адолела — спытаў тутэйшага «эскулапа», які — а гэта ўсе ведаюць — захоплены больш зёлкамі мясцовымі, чым нейкай там «хіміяй» прывазной:

— Канфіскаваная самагонка ці вада свянцоная?

— Ды не — вадзіца крынічная... Вось на аналіз хачу адправіць у лабараторыю. Старыя людзі кажуць, нібыта гаючая.

— І што — намер які ёсць?

— Найперш давесці да ладу крынічку трэба, бо хворым не вельмі зручна падступіцца... Дый каштоўнасць такая павагі патрабуе.

Пры чарговай сустрэчы з Хведарам Іванавічам не прамінуў нагадаць пра крынічку, і ён не хаваў радасці:

— Ды яшчэ якая лекавая — на срэбра надта багатая!

— Тут неблагі адпачынак можна наладзіць, — выказаў я сваё меркаванне. — Мясціна вельмі ж прыглядная. А паблізу, на беразе Ушы, і будыніна ёсць. Тая самая, дзе калісь паляўнічыя балявалі... Не спазніцеся — дзялку́ якому кінецца ў вочы — заграбастае.

— Не дамо... Самім спатрэбіцца.

І праўда, праз колькі часу схіл да крынічкі змяніў аблічча — некалішняя вузенькая сцяжынка цяпер збягае ўніз шырокімі бетоннымі прыступкамі. Паабапал іх

— парэнчы са сцэментаванага каменю і драўлянымі поручнямі на металічных падтрымках.

Гэтая мая споведзь заспела Хведара Іванавіча са шклянкай крынічнай вады яшчэ да памянёных пераўтварэнняў. Крынічка пад стрэшкай мне чамусьці ўвасобілася вёсачкай. І абедзве падаліся такімі мізэрна-незаўважнымі, дарма што адна сілкуе раку, а другая — краіну. І сапраўды — прыкмячаюць звычайна падчас грамадскіх «ператрусаў» адно селяніна. Як, зрэшты, кожны з нас пачынае клапаціцца толькі тады пра сваё сэрца, калі тое раптам занядужае. Вось і крынічку бадай ніхто не праміне адно ў спякоту, тым больш — калі вада яе гаючая.

Так, селяніна сёння было б кашчунствам не заўважаць — ён змогся, ушчэнт выбіўся з сіл. Канае... І да якой жа крынічкі прыпасці гаротнаму, каб акрыяць?!

Іншым Прывалавым, адрозным ад сённяшняга, старшыня калгаса Хведар Прывалаў сябе і не ўяўляў. Відаць, яму было наканавана стаць менавіта гэткім, іначай яго жыццё страціла б сваю сапраўдную існасць. Але ж помніцца яму і тое, як лёс ягоны плыўна зыбаўся, нібы лодка на віракруце. Ды ён аднак не разгубіўся, лодку не закружыла ў пенна-застойным шумавінні.

...Горацкую акадэмію Хведар Прывалаў скончыў з адзнакай. І шыпянскія палеткі хутка адчулі гэта. Малады аграном, падкаваны на ўсе чатыры, размаўляў з зямліцай на «ты». Праўда, з тагачасным кіраўніком гаспадаркі не было паразумення. І не толькі Прывалаў ад гэтага пакутаваў. Бяда, калі возчык не можа саўладаць з коньмі — запрэжка рассупоньваецца якраз ў самы нязручны момант. Неспрыяльныя ўмовы жыцця і працы вымушалі спецыялістаў пакідаць калгас. У ліку апошніх наважыўся «бегчы ў людзі» і Хведар Іванавіч. Ды ў райкаме партыі спахапіліся ўчас. Вельмі помная Прывалаву размова з сакратаром па ідэалогіі Уладзімірам Мікалаевічам Лемешам. Пазней яны пасябруюць. Але ўжо і тады Уладзімір

Мікалаевіч не хаваў сваіх прыязных адносінаў да маладога спецыяліста.

Сутулаваты, шыракаплечы, ён быццам саромеўся свайго прыкметнага росту. Нават знешне выдаваў болей на чалавека, які штодня заняты фізічнай працай. І сапраўды — гэта быў па сутнасці хутчэй практык, чым ідэолаг. І тады, пры іх першай сустрэчы, доўга, як паплавок на вадзе, не хадзіў кругамі, спытаў:

— І куды, Хведар Іванавіч, сабраўся ехаць?

— У Мурманск.

Прывалаў чакаў пытання: «Чаму менавіта ў Мурманск?..» Але замест гэтага пачуў бадай што пагрозлівае:

— На краі свету знойдзем!

— Дык я, выходзіць, некаму яшчэ трэба?.. Во, нават у райкаме пра мяне помняць.

— Колькі бралі зернявых з гектара, як прыйшоў у саўгас?

— Недзе за трынаццаць цэнтнераў.

— А цяпер — удвая больш!.. Не без тваіх намаганняў усё гэта ўзрошчана, так?

— Але я ўжо не магу... З такім кіраўніком, як наш, даруйце, толькі вошай разводзіць.

— Разумею... Аднак намераў тваіх не ўхваляю. Хм, ваш старшыня і года не парабіў... Нейкі ён зашораны чалавек — пра камуністычнае заўтра гаворыць пафасна, а сённяшні дзень ігнаруе. Чуў я, што ў яго ёсць звычка не распакоўваць клункі з пажыткамі пры чарговым пераездзе на новае месца.

— Ну так, бадай уся мэбля ўпакаваная, у кладоўцы... У хаце — шаром пакаці: ложак у спальні ды стол на кухні з двума крэсламі.

— Што ж, калі не паспеў абжыцца, то вельмі дарэчы... Ты, Хведар, быў прафоргам акадэміі. І ўжо, лічы, два гады ў аграномах пахадзіў. Словам, стаж кіраўніка такі-сякі маеш. А галоўнае — на чужым вопыце спасцігнуў якраз тое, як не трэба кіраваць. То, як ка-

жуць, табе і лейцы ў рукі... Правядзем сход, людзі за цябе прагаласуюць.

Пачатак старшынства Прывалава помны ўборачнай. Менавіта першым незапозненым жнівом. Тады ў калгасе не было камбайнаў «Донаў». Меліся адно старэнькія «Нівы». Бясспрэчна, з імі клопату ставала. Ды ўсё ж асноўная прычына была ў людзях — яны зняверыліся ў мажлівасці заможнага жыцця ў гэтай гаспадарцы. Малады кіраўнік шукаў выйсця. Што ён мусіў зрабіць, каб людзі паверылі яму? Чым можна было зацікавіць іх? Пернікам? Але сціплую зарплату ледзьве наскрэбвалі. Пугай? Дык яго папярэдніку «бізуновы» сродак анічога не даў — наадварот, як кіраўнік ён безастатку згарэў сінім полымем. Вядома, з людзьмі трэба і разам жыць, і працаваць. З людзьмі трэба *ладзіць*. У крайнасці ўпадаць не было як, а разумна спалучыць іх не выпадала. Што заставалася? І ён паспадзяваўся на памяркоўнасць і шчырасць сваіх падначаленых. І давер.

Сняданак, і без таго звыкла запознены, зацягваўся. Лыжка то чаплялася за край талеркі, то падоўгу завісала ў паветры.

— Што здарылася, Федзя? — непакоіла жонку.

— Жніво неўзабаве... Ці асілім? Камбайны дабітыя... Механізатары зняверыліся, абыякавыя.

— Пагавары з імі.

— Гаварылі ж... І летась, і пазалетась. І што з таго? Гінула збажына пад снегам! А сёлета і ўраджай неблагі... Так нам ніколі з галечы не выкараскацца.

— Ты без крыку да іх і запалохаў... Няўжо не зразумеюць?

— Душу ім аддаеш. Суткамі з іх клопатаў не вылазіш... Ачарсцвелі мужыкі. А вось іхнія жонкі, думаю, мяне падтрымаюць, — твар Хведара Іванавіча пасвятлеў.

— Што ты задумаў?

— Наладзім сямейны «агеньчык»... У клубе.

— Нябось з гарэлкай?

— А без яе хіба душа расхінецца, загамоніць?

— Ці не забыў пра антыалкагольны закон? Данясуць! А там і з пасады, на якой яшчэ як след і агледзецца не паспеў, зваляць.

— Іншага выйсця не бачу... Спіртное — так, для шчырасці.

...Жонкі механізатараў выглядалі шчаслівымі. Усе яны былі ў сваіх лепшых строях. Як на свята прыйшлі. І не дзіўна — ім не так часта даводзіцца пакрасавацца на людзях. І не адны заявіліся — кожная са сваім мужам. Столікі, засланыя абрусамі, поўніліся апетытнымі сялянскімі прысмакамі, печывам і яблыкамі. Гучала музыка.

І вось — мікрафон у руках старшыні калгаса:

— Шаноўныя жанчынкі, вы толькі гляньце на сваіх мужыкоў, слаўных нашых механізатараў. Бачыце, якія ганарлівыя?!. А што ж — мы й сеем, мы й жнём... Маўляў, без нас ні туды й ні сюды! Ды нешта ж тым часам і знядужалі вашыя кавалеры — прапала ў людзей павага да плёну працы сваёй. Ужо які год збожжам зямельку гноім. А гэта ж — наш дабрабыт. Дык пагаманіце з імі, жанчынкі! Дапамажыце і словам, і справай... Разам горы зрушыць можна. Не, на камбайны вам сядаць не трэба. Вы сваім мужа́м тыл надзейны забяспечце. Даволі па кустах у хованкі гуляць, святкуючы аднаасобна зажынкі, дажынкі... У адной купе лепей і п’ецца, і пяецца...

І што неўзабаве пачалося — удзячныя за давер і павагу, жанчыны спяшаліся выказацца. Трывала занатавалася ў памяці Прывалава:

— Іванавіч, даражэнькі ты наш! Ды мы ж іх ужо ж і накормім, і памыем, і спаць укладзем, прыгалубім, а калі што — пачубім... Хай толькі шчыруюць, добра працуюць — не толькі за сябе, але і за кожную з нас...

І механізатары не падвялі. Ухадзіліся са збожжавымі своечасова. Не горш за іншых. Хведар Іванавіч разумеў, што аднымі «агеньчыкамі» шлях да заможна-

га жыцця не высвеціш. На яго прыкід — роля кіраўніка грунтуецца бадай што на ўменні ствараць адпаведныя ўмовы працы непасрэдна для кожнага, хто жыве на тэрыторыі гаспадаркі. Калгаснік гэта альбо настаўнік, працаздольны альбо інвалід, пенсіянер. Толькі так можна вырашыць сацыяльна-эканамічныя праблемы вёскі. Толькі паляпшэнне жыццёвага асяроддзя гарантуе вытворчы ўздым. А яшчэ гэтае паляпшэнне абавязкова стане цвёрдым грунтам і для тых, хто прыйдзе на змену.

Ужо рэдка хто скажа дакладна, колькі гадоў мінула з таго незабыўнага «агеньчыка». Але ён так і свеціць маячком, што ратуе ад мелкаводдзя «карабель» Хведара Прывалава. Бо накірунак быў акрэслены дакладна: на першым плане — вырашэнне сацыяльных праблем: дарогі, жыллё і фермы, газіфікацыя вёсак. Задумкі здзейсненыя. А што далей?

— На чарзе — прамысловая перапрацоўка ўласнай сыравіны, — не без гонару зазначае Хведар Іванавіч. — Галоўнае — людзі. У жывёлагадоўлі й паляводстве патрэба ў іх змяншаецца. Дык што — лішніх з калгаса? Не — у перапрацоўчы цэх уладкуем... Так, будуць у людзей грошы, будзе і дабрабыт.

Адметная рыса Прывалава-кіраўніка — мэтанакіраванасць. Але дамагаецца намечанага не любой цаной. Канешне ж, улічвае чалавечы фактар. Тут спадзяванка на ўзаемнасць. Яе ж мацуе адданасцю справе. Таму не пакараў ніводнага спецыяліста. Прывалаўскае слова ў зайздроснай пашане: калі паабяцае што, то абавязкова выканае. Часам — і на шкоду сабе.

— Я шчаслівы чалавек, — адкрыўся неяк Хведар Іванавіч.— З калектывам поўнае ўзаемапаразуменне. Задуманае рэалізуецца. Работа па душы. Дзень прабягае неўпрыкметку. — Крыху задумаўся і дадаў: — Толькі я не ўсім задаволены... Мне давялося быць на стажыроўцы ў Германіі. Так, я наладзіў сувязі з дзелавымі людзьмі гэтай краіны. Вось там кожны ганарыцца сва-

ёй работай. І чалавека там цэняць за яго намаганні. Таму кожная кропля поту ў цане...

Не раз спакушалі Прывалава высокімі пасадамі. Усялякіх рангаў. Нават на дыпламатычную мецілі. Але ён нязменна аджартоўваўся, спасылаючыся на сваю нібыта прыроджаную прыземленасць. Прынамсі, кіраваўся непахіснай развагай: бясспрэчна, расліны ў гарах бліжэй да сонца, але ж іх карнявішчы ніколі не дасягнуць глебы, якая сілкуе яго, Прывалава.

Вітаў Прывалаў і фермерства. Шыпянскія гоні прыйшліся даспадобы ажно васемнаццаці вольным гаспадарнікам. А гэта — звыш трэці па раёне. Можаш — калі ласка! Толькі шануй зямельку, бяры з яе належнае. Ды лічаным гэтая ношка па плячы.

Цяга да падсобных промыслаў спаконвеку ў сялянскай крыві. Асабліва лясное багацце ўсцешвае селяніна. Ягады, грыбы, бярозавы сок — падмацунак не з якіх там заморскіх адкідаў, загорнутых у прыгожую ўпакоўку, а сваё ежыва, натуральнае. Выключна свой прадукт, адметна-традыцыйны. І таму калгаснікі дамагліся ад старшыні, каб узяў ажно каля трох тысяч гектараў лесу ў Смалявіцкім лясніцтве. І што — людзі не з сякерамі хлынулі ў лясны абшар, а з плугам. На дзевяці гектарах пасадзілі маладняк. Будуць і новыя пасадкі. Увогуле ж — спадзяецца Хведар Іванавіч на германскую безадходную тэхналогію перапрацоўкі драўніны. Завозіць абсталяванне. Пашырае вытворчыя магчымасці гаспадаркі. Мяркуе апярэдзіць мясцовы лясгас.

Хведар Іванавіч, прызнацца, ледзь выкройвае час адно на газеты ды на даведнік «Усё пра мёд» (дарэчы, сваім мядком ласуецца). Частуе і дзятву. Ну так — з апошняга дапамагае Верхменскай школе. Бо ўскладае надзеі на падрастаючае пакаленне. І верыць: яно будзе больш адукаванае, не развее набыткаў сваіх дзядоў ды бацькоў.

...Кволы вераснёўскі золак над нізовінай між Алесінам і Верхменем замілаваў і ўразіў Хведара Іванавіча. Кучарава-плыўкі туманец калыхаўся перад ім двума бухматымі воблакамі: адно — гойдалася нізка над зямлёю, другое — лёгка курэла ў вяршалінах дрэў.

Споверх казачна барвовіла ўзыходзячае сонца.

## ВЯРТАННЕ ДА ВЫТОКАЎ

Як толькі дрэвы пад веснавым небам пачынаюць праклёўвацца кволай лістотай, што адно і прагне сонечных промняў, наваколле ўвачавідкі ахарошваецца, зямное хараство становіцца падобным на ўтульна-духоўны абшар вечнасці.

Неўпрыкмет зялёна-бруістая плынь лета пераходзіць у аксамітна-стрункую мройнасць расплывіста-жухлай восені. Залатой. Дажджліва-сібернай. Задуменнай і адначасова нязвыкла сполашнай. Злыселыя чупрыны палеткаў пакрысе зацярушваюцца сняжком сівізны, якую праз некаторы час мяцеліцы-завірухі выдоўжваюць ажно ў суцэльныя збочдарожныя сумёты...

Рознай вызначылася сёлетняя восень для Хведара Яўгенавіча Шнітоўскага. Надта даняла ўборачная. Старшынскі клопат і раней быў, як здужаць. Цяпер жа і наогул — невымерны. Ім «спавіты» шэсць кітоўбрыгад, на якіх і мацуецца калгас «Ленінскі шлях». Кіты-волаты, здавалася б, і магутныя самі па сабе, і далёка не міфічныя, але без старшынскай увагі, без яго чалавечай спагады не маглі й тыдня праіснаваць. Галава Шнітоўскага проста расколвалася: як дамагчыся хоць бы й тых жа фінансаў, таго ж паліва, запчастак?.. Усяго гэтага пры агульнай нястачы бракавала не толькі яго калгасу.

...Ранак выдаўся тлумны, нервовы. На прыступках, у вузкім калідоры, нават у дыспетчарскай Дома механізатара сціснуліся ў чаканні людзі — жыхары нава-

кольных вёсак. Кожнага непакоіла ўласная бульбачка. Рупіла выкапаць за час спрыяльнага надвор'я. Скінуць з плеч галоўную турботу. Але з невялікага пакойчыка, дзе занараджвалі механізатараў, абнадзейвальных вестак не паступала. Хоць часу прайшло даволі. Здавалася б, з бульбай усё проста — выдзеленыя бульбаўборачныя камбайны выкарыстоўваюцца строга па спіску: сёння працуюць на сотках таго і таго, заўтра абслугоўваюць гэтага і гэтага... І вось — няўпраўка атрымалася: час ідзе, а камбайны як не паўдня прастойваюць то пры адным падворку, то пры другім...

Імкліва заходзілі да старшыні й гэтак жа імкліва выходзілі спецыялісты. Заклапочаныя, насупленыя. Штосьці не так. Нешта нядобрае адбылося. А толькі ўсяго і было, што Хведар Яўгенавіч, як кажуць, даваў прапясочку падначаленым. Усіх рангаў. Ён не прыхільнік рашучых мераў, заўсёды — памяркоўны, спакойны, нешматслоўны. Вось толькі позірк яго быў гэты раз свідруючы, да крыку напружаны — гатовы высвеціць, абудзіць парасткі сумлення ў сваіх суразмоўцаў. З-пад покрыву жыццёвых нягод, наносаў мітуслівых паўсядзённых клопатаў.

Так, яго цярпенне, здаецца, дало расколіну... Дакопкі яўна зацягнуліся. Застаўся нейкі дзесятак гектараў бульбы, што якраз і супакоіла спецыялістаў ды механізатараў: маўляў, паспеем — такая драбніца... Пра калгасны палетак як забылі ўсё роўна — камбайны згубіліся на людскіх участках.

— Паклічце людзей, — сказаў галоўнаму аграному Хведар Яўгенавіч. І тыя не прымусілі доўга чакаць — запоўнілі дыспетчарскую. — Што ж вы, даражэнькія, робіце? — Цень незадаволенасці ўсё яшчэ не пакідаў яго незласліва-ветлівы твар. Недзе пад кончыкамі вусоў знаёма цеплілася звыклая дабрыня. — Механізатараў маіх ганьбіце. Удзячнасць сваю ў бутэльку закаркоўваеце. Частуеце... Аднаго звольніў... Другому вымову даў...

— Дык сілком жа ніхто ў горла не лье, — заўважыў адзін з вяскоўцаў.

— А вось чаму я плату за камбайны не патрабую?.. Зусім не дзеля таго, каб вы спойвалі механізатараў. Пенсіянераў шмат, а саляры не так і многа ў нас — на ўсё грошы трэба. Тэхніка ненадзейная... А вы, значыць, за чужы кошт удзячнасць праяўляеце... Дык што, можа мне браць з вас плату за такія паслугі?

— Павялося ўжо так, — вінавата адгукнулася пажылая жанчына. — Не мы першыя... Няхай бы хто з гэтых тваіх «смактуноў» адмовіўся, паказаў прыклад іншым... Дык жа не адмаўляецца.

— Аднак жа і не надта патрабуе, — голасна ўставіў свае тры грошы яе сусед. — Правільна кажаш, Яўгенавіч, мы балуем хлопцаў... Мы! Прызнацца, я гатоў адваліць любому з іх кілі дзве сала, дык жа не возьме!

— Словам, людцы, не спяшайцеся... Вось выкапаем калгасную бульбу, а пасля ўсе камбайны аддамо ў ваша распараджэнне, — рашуча заявіў Хведар Яўгенавіч. — Пад уласны кантроль бяру.

— Даў бы толькі боžанька добрае надвор'е, — пачулася прымірэнча ў адказ.

Легкавушка спрытна вынырнула з мехдвара і тут жа заламіла направа, узяўшы кірунак на Мікалаевічы. Дакладней — у бок пасёлка, што бялеў на пагорку сучаснымі пабудовамі з сілікатнай цэглы. Большую частку шыкоўных падворкаў агінала шырокая вуліца. Забудаваная пераважна па адзін бок. Па другі — луг. Адсюль і назва — Лугавая. Пачынаючыся ад невялікага вадаёма, вуліца ўзбягае на пагорак, за якім люстраніць возера ў вянку кустоўя, акаймаванага бярозкамі. Усе яны ў восеньскай барве — гарэць у промнях сонца акурат тонкія парафінавыя свечкі.

Гэты куток прыцягваў Хведара Яўгенавіча не толькі сваёй адметнай прыгажосцю. Заварочваў ён сюды часцяком, каб адвесці душу, а яшчэ і таму, што насельні-

камі яго былі ў пераважнай большасці маладыя, рупныя й сціплыя працаўнікі калгаса. Яго апора і надзея. А ўсведамленне гэтага саграvала і супакойвала. І ён не проста праязджаў па вуліцы Лугавой, а нібы ўсёй істотай сваёй датыкаўся да гаючай крыніцы чалавечай супольнасці.

На момант прытармазіў ля мікалаевіцкай фермы. Безгаспадарчасць не кінулася ў вочы. Стужка асфальту, быццам канвеер бясконцых турбот, павяла далей — на Старыну, Масцішча... Там чакалі болей неадкладныя справы. Мінуў сад, сажалку з невялікай балацявінай...

Своеасаблівыя, незвычайныя вясковыя дарогі. Вось гэтая хоць бы, як бы й нязначная на першы погляд, палявая, а ўсё ж такі — заасфальтаваная. Затое суседні бальшак задавольваецца гравейным пакрыццём. Тлумачэнне простае. У свой час прасёлкі былі амаль непралазнымі. Таму і ўгрунтавалі ў першую чаргу менавіта іх. На цэнтральныя дарогі махнулі рукой — пацерпяць, зоймемся імі пазней. І тое іх «пазней» дачакалася збяднелага нашага «сёння».

...Мясціна гэтая даволі вабная. Узлесак паблізу паваротгкі на бальшак. З аднаго боку пад ногі яму кінута прамавугольная рагожына іржышча, з другога — дыван канюшынішча. У аксаміт ялінаў украпаны залаты бісер лісця бяроз. Гэтым ранкам і сапраўды ўзлесак падаўся казачным. Ён акрыўся тумановай касынкай і выглядаў з-пад яе таямніча-загадкава і ўрачыста. «Што гэта? Няўжо недзе ў вершаллі дрэў падвешаны ліхтар?..» — Хведар Яўгенавіч спыніў легкавушку. Лёгка пераскочыў неглыбокі раўчук. Пад нагамі мякка зашаргацела троху прысохлае ўжо лісце. Болей ліпавага і кляновага. Хутка пакарабаціцца, агрубее, пацьмянее. Яго падхопіць сцюдзёны вецер, і яно крабамі зашкрэбае па стылым асфальце.

Хведар Яўгенавіч зірнуў угару. Праз тумановы полаг прабіўся сонечны прамень і пражэктарам высвеч-

ваў вершаліну ліпы. Ярка-залацістая, прыкметна парадзелая макаўка адбівала святло ўніз, і наўкола разлівалася відната, бы ў асветленай сотнямі свечак хароміне. Востры пах цвілі й сырасці п'яніў і бадзёрыў. Улоўлівалася нешта агульнае ў бадай што на вачах спароджанай і яшчэ неакрэплай клейкай лістоце, і ў гэткай жа самай лістоце, але ўжо кранутай подыхам восені. Моманты нараджэння і скону былі аднолькава прыгожыя і велічныя. Тыя ж — свежасць колеру, чысціня і пяшчота.

Хацелася думаць аб вечным, неабсяжным. Лісце... Ці яно на самай вершаліне, ці на самым нізе — аднолькава патрэбнае дрэву. Пэўна ж, адсюль — і дрэва жыцця. І людзі, роўна як і лістота, пакідаюць яго ў свой час. Карэнне дрэва жывяць сокі зямлі. Дрэва жыцця вечнае Бацькаўшчынай. Сыны й дочкі мацуюць яе сваімі справамі. Хведар Яўгенавіч удумна кіўнуў галавой: «А мая справа — праца на зямлі... Тут я прыношу найбольшую карысць». Халадок роспачы працяў душу. Маланкай асвяціў не такое ўжо і даўняе...

На пачатку перабудовы калгас «Ленінскі шлях» быў якраз на пад'ёме. Адна з буйнейшых і мацнейшых гаспадарак раёна. Нават не ўступаў некаторым базавым гаспадаркам, якія знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні. Узначальваў калгас таленавіты кіраўнік — Анатоль Баніфатавіч Купрэйчык. Меў свой гонар і адметны погляд на рэчаіснасць. Поруч з ім Шнітоўскі прайшоў сапраўдную акадэмію гаспадарання. Спачатку ў якасці галоўнага інжынера, затым давялося пабыць некаторы час намеснікам па камерцыі. Перабудовачны вірус усё адчувальней знясільваў калгас. Анатоль Баніфатавіч з болем успрымаў гэта. Як чалавек, які болей за два дзесяткі гадоў жыцця аддаў умацаванню гаспадаркі, не мог сцярпець такой ганьбы. Пачаў актыўна шукаць выйсце, каб узняць калгас на новы віток развіцця.

Сперш паспадзяваўся на супольныя стасункі з канцэрнам «Амкадор». Паверыў, бо вельмі хацеў верыць у шчырасць намераў кіраўніцтва «Амкадора» дапамагчы калгасу. На першы погляд устаўны фонд канцэрна не ўяўляў пагрозы, бо ўсяго на два працэнты перавышаў калгасны. Але, як высветлілася пасля, дастаткова было ўсунуць у неспатольную пашчу гэтай акулы, узначальваемай «новымі беларусамі», толькі адзін палец, як зубатае страшыдла тут жа ўсхадзілася адхапіць усю руку. Вядома ж, знакаміты кіраўнік калгаса па тым часе быў добрай прынадай.

Нарадзілася фірма «Амкадорагра». Спачатку Анатоль Баніфатавіч быў першым намеснікам кіраўніка гэтага прадпрыемства, а праз некаторы час яго аддалілі ажно на шостае месца... Нарэшце і зусім загадалі зліквідаваць фермы!

— А як жа зямля, людзі? — запярэчыў Анатоль Баніфатавіч.

— Рабі, што сказана!..

Не росквіт калгаса рупіў драпежнікаў-набрыдаў — іх прынаджвала зямля. Так зручна размешчаная — чыгунка, аўтамагістралі, побач сталіца... А гэта — грошы, грошы, грошы!

...Хведар Яўгенавіч схамянуўся. Варухнуў нагой лісцё. Яно на момант падалося чырвонцамі, доларамі. Хоць ты хапай гэтае шархоткае дзіва і крычы: «Маё дабро, мае грошы!..»

Невядома, што сталася б, калі б не абралі Хведара Яўгенавіча кіраўніком аграфірмы. Абралі-такі. І адразу ж паўстала рубам пытанне: ці здацца на міласць драпежніка — ці вырваць з яго звыроднай пашчы гаспадарку? Спыніўся на другім. Нямала выдаткаваць сіл і нерваў давялося. І не аднаму яму. Самую дзейсную дапамогу адчуў з боку шматвопытнага і мудрага Міхаіла Мікалаевіча Надзеіна. Былога намесніка старшыні райвыканкама. Агульнымі намаганнямі вярнулі част-

ку грошай і матэрыяльных каштоўнасцей. І ахвяравалі — давялося зрабіць і такі кульбіт! — каля васьмідзесяці гектараў зямлі пад дачы. Затое адрадзілі калгас. Вярнуліся да вытокаў.

Вось так і было выпакутавана цвёрдае перакананне — зямлёй гандляваць нельга! Злачынна і амаральна! Гэтак жа, як паветрам, вадой. Даброты зямныя для ўсіх — і для тых пакаленняў, што былі, і што ёсць, і што будуць. Адвечныя агульначалавечыя крыніцы жыцця, створаныя не намі. Гэта — Бацькаўшчына. І прыватызаваць яе ніхто не мае права. У адваротным выпадку чалавек з самага нараджэння будзе пазбаўлены таго, што дадзена яму Богам.

Недзе з самай вершаліны ліпы лёгкі вятрыска сарваў змарнелы лісток і стаў кружляць яго і так, і сяк. Бадай бязважкім пёркам лісток ціха плыў у паветры. Велічна-ўрачыстае імгненне — паміж быццём і сконам!

А што ж чалавек? Ці гэтак жа бескарысліва і незаўважна ахвяруе сабой дзеля росквіту Бацькаўшчыны? Не кожны. А між тым ад чалавека адно і патрабуецца: быць удзячным і захоўваць неацэнны скарб сусвету — Зямлю і ўсё жывое на ёй. Навошта мастак піша карціну? Каб прынесці асалоду людзям. Значыць, наваколле таксама для чалавека. Усё існуе для нечага і некага. Інакш — яно страчвае ўсялякі сэнс.

Хведар Яўгенавіч заспяшаўся. Чакалі неадкладныя справы.

Кароткае далучэнне да прыроды ўзвысіла над паўсядзённасцю. Ачысціла душу. Яго сціпласць, роднасць з прыродай набылі яшчэ большую асэнсаванасць. Калі не можаш нічога зрабіць, дык навошта красамоўнічаць наконт сваёй немачы? Таму здзейсненая справа, нават малая, але карысная, каштоўней за самыя шчырыя абяцанні й мудрыя развагі. Гэтым бадай што і тлумачыцца нешматслоўнасць Шнітоўскага на нара-

дах. Можа, той-сёй успрымае такое як недахоп? Калі так успрымае — памыляецца. Проста Хведар Яўгенавіч з павагай ставіцца як да сваіх слухачоў, так і да самога сябе. Гэткія ж у яго адносіны й да «уазіка». Неяк ён сказаў мне:

— Машына — мой другі кабінет. Можна лічыць — асноўны. Тут у мяне і тэлефон, і тэрмас з каваю... У канторы затрымліваюся рэдка. Для мяне найперш — парадак. Хіба самавіта, калі кіраўнік руліць новай машынай, а з-пад бруду нумароў нябачна?.. Заняты надта? Ды проста ўнутрана чалавек не сабраны, неахайны... Свінчук духоўны, апушчэнец.

Легкавушцы Хведара Яўгенавіча больш за тры гады. А знешні выгляд такі — быццам толькі што з канвеера. Сам жа ён — абавязкова паголены, акуратны. Ні табе «бурбалак» на каленях, ні «гармонікаў» на лытках.

Слоўны рахунак старшыні не абцяжараны «моцнымі выразамі». Уважыць кожнага, унікне ў патрэбу, не адмовіць у дапамозе. Падвязе, калі надарыцца хто спадарожны...

Не зачэпішся за беспарадак і на гаспадарчых дварах калгаса. Гэта — не станцыі метро. Але штодня прыемна воку.

Здавалася, дрэва Бацькаўшчыны гаманіла лістотай. Заклапочанай лёсам Радзімы. Зверху да нізу — у адзін голас! Выразна вымяркоўвалася — краіне патрэбны гаспадар! Як у сям'і. Гэта — не Захад, дзе і першы муж, і другі, і палюбоўнік сумесна ладзяць сям'ю. Павінен быць канкрэтны чалавек, які б нёс адказнасць за сёння і заўтра нашай Айчыны. Прэзідэнт! Надзелены ўсёй паўнатой улады.

Сёння акрэсліліся дзве сілы. З аднаго боку — кучка драпежнікаў імкнецца прыбраць багацці да сваіх рук. Стаць нацыянальнай буржуазіяй. З імі й тыя, хто

«клапоціцца» аб «незалежнасці». Яны прапіхваюць да ўлады сваіх прадстаўнікоў. З другога ж боку — Прэзідэнт і яго паплечнікі. Адстойваючыя сацыяльны накірунак развіцця. Імкнуцца забяспечыць дастойнае жыццё большасці.

Народная гаспадарка ўяўляецца млынам. На лопасці яго ледзь льецца вада — сродкі, якія ў пашчах акул. Яны выкарысталі бязладдзе, інфляцыю, каб разбагацець. Прадаць народныя каштоўнасці й займець валюту. Зашчамілі яе і прагнуць запусціць у справу. Але — калі запануюць іх драпежныя законы. Калі паставяць нас на калені перад грашовымі ідаламі. Калі мы прададзім душы залатому цяльцу. Калі ж мы не схочам гэтага, то ў іх нічога не атрымаецца. Таму найперш неабходна запусціць на поўную сілу млын вытворча-гаспадарчай рупнасці. Ахвяраваць сваімі намаганнямі й шчырасцю. Натхніцца на стваральную працу. У гэтым адзінае выратаванне!

Менавіта «новыя беларусы» нашпігоўваюць нас фільмамі з заходняй памыйніцы. Каб унушыць, што чалавек, яго духоўныя каштоўнасці — нуль перад мехам храбусткіх паперак. Маўляў, толькі ў стойле дабрабыту можна спасцігнуць усё высокае і боскае. Але ж спакуса мецць яшчэ болей вытраўляе ўсё тое, што з’яўляецца чалавечай сутнасцю. Драпежныя сілы зацікаўленыя ў тым, каб мы пахавалі яе, гэтую сутнасць, у прыватызацыйных норах. Бо норы праглынуць наш час, адведзены на набыццё культурных, духоўных скарбаў.

Павінна верхаводзіць душа, а не страўнік. Царкоўнікі даказваюць гэта ўсім сваім жыццём. Не зважаючы на шматлікія складанасці й пакуты. Відаць, у тым і заключаецца вялікі сэнс і тайна быцця.

...Помніцца раённы семінар. Спароджаны клопатам аб зімоўцы жывёлы. Экзамен трымаў калгас «Ленінскі шлях». Рыхтаваліся? Безумоўна. Якая ж гаспадыня сустракае гасцей, не прыбраўшы ў хаце? Хоць і так не со-

рамна. Але ж заўсёды хочацца засяродзіць увагу на лепшым. Паказаць нешта асаблівае. А чым не адмета племянная конеферма? У раёне іх нягуста. А тут вось — у брыгадзе Чэрнікаўшчына. Айчынныя пароды. Коні гладкія, дагледжаныя. Усяго ў калгасе іх каля дзевяноста. Карысць? Відавочная. Большую частку буракоў з поля на конях перавезлі. На прысядзібных участках, на фермах без коней не абысціся.

— Чуў, конную спартыўную школу збіраецеся арганізаваць?— пацікавіўся старшыня райвыканкама Пётр Георгіевіч Буцін.

— Маем намер, — стрымана адказаў Хведар Яўгенавіч.

— Задумка добрая. І ў выхаваўчым, і ў эстэтычным плане таксама. Конь — спрадвечны спадарожнік і памочнік селяніна... І раз'ядноўваць іх — значыць, абяднняць духоўную палітру вёскі.

Даспадобы прыйшлася кіраўніку раёна і ўтульная брыгадная хатка. І наогул, паўсюдна адчувалася гаспадарлівая рука ініцыятыўнага кіраўніка брыгады Міхаіла Гемскага. Энергіі ў яго праз край — хапае нават яшчэ і на тое, каб загадваць клубам. Таму і душа калектыву, яго рухавік.

Што і казаць, падбору сярэдняга звяна старшыня надае шмат увагі. Бо гэта той стрыжань, на якім мацуюцца дысцыпліна і эканоміка. Не нарадуецца таксама, што талковы чалавек узначаліў і Мікалаевіцкую брыгаду. Чарга за астатнімі...

— А вось гароднінасховішча не давялі да ладу, — заўважыў Пётр Георгіевіч.

— Сродкаў у абрэз, — прызнаўся Шнітоўскі. — Дый кароўнік прыспешвае. Найперш у людзей дах над галавой павінен быць. А бульбачку саломкай укрыем... Перазімуе.

Як відаць, калгас «Ленінскі шлях» — гаспадарка трывалая. І палеткі родзяць. І статак — не худзізна

якая. Дый не зменшылі амаль. Цяжкасці ж агульнавядомыя. Які сэнс спасылацца на іх? У тым, што дзяржава клапоціцца пра вяскоўцаў, Хведар Яўгенавіч пераканаўся, будучы на Ўсебеларускім народным сходзе. Агульнымі намаганнямі крызіс будзе пераадолены. Ды ўжо і самі калгаснікі, трэба сказаць, не сядзяць склаўшы рукі. Арганізавалі падсобныя промыслы. А гэта — падмога адчувальная: свае сталярны й швейны цэхі, майстэрня пластмасавых вырабаў, малаказаводзік... Дальнімі аўтаперавозкамі тавараў займаюцца.

Душой і сэрцам прыкіпеў да гэтых мясцін Хведар Яўгенавіч Шнітоўскі. Ён ужо і не ўяўляе, як можна абысціся без шматлікіх пагоркаў на палях, увенчаных каронамі бярозак. А на іх жа ў свой час быў «замах» — пасяўныя плошчы пашыралі. Але не кранулі, захавалі адметную прыгажосць. Колькі сіл і ўвагі ўкладзена, каб уладкаваць сажалкі, вадаёмы... І возера, што пад Смалявічамі, адстаялі. Цяпер калгаснае. Пачалі паціху крынічкі злучаць. Каб прыток свежай вады забяспечыць.

Праімчаліся верхам на конях хлапчукі — аб'езджваюць. Так і рупіць асядлаць рысака самому. З трынаццаці гадкоў з конькмі — рабіў возчыкам падчас летніх канікулаў. Таму і па сённяшні дзень коні — яго захапленне і клопат. Душа да іх горнецца.

Добрая, чуйная душа ў Хведара Шнітоўскага. І спародзіць яна новыя добрыя справы. На карысць людзям.

## РОДАМ З БАТУРЫНКІ

Як толькі змыкаў ацяжараныя бяссоннем павекі, неадчэпным кашмарным прывідам выплывала з цемры сцірта саломы. Яна насоўвалася ўсё бліжэй і бліжэй. І ўсё болей нахілялася ў яго бок... Здавалася, вось-вось абрынецца — прыдушыць пыльна-затхлай масай!

Ён уздрыгваў — паўгарачка, паўтрызненне на момант сплывалі, а пасля зноў з мроі паўставала ўсё

тая ж, саламяная, построаш. І чаго гэтая нахаба да яго прычапілася? «А-а-а... Старая знаёмая. Здаецца, заўчора... Так, у полі заглухла машына. І пакуль шафёр корпаўся — я ці не з паўгадзіны заставаўся сам-насам пры саламянай гары, на ўзбочыне. Восеньскія вятры й дажджы бязлітасна расхрысталі й абскублі яе. Ажно ўчарнела. Як і мяне — гады, несправядлівасць і неспагада. Але ж галоўны скарб — не салома, а зерне, і яно даўно ўжо ў сховішчы. А што ў маім сховішчы — у маёй душы?! Цемра і пустэча!»

Саламяная гара адхінулася і пачала імкліва аддаляцца. А яму падалося, што сам ён пачаў падаць у бездань сваёй душы. І з жахам заўважыў, што няма за што ўхапіцца. Псеўдасябры пакінулі яго, бы пацукі тонучы карабель. Ды праз нейкі момант яму расхацелася чапляцца... за жыццё. Ахапіла салодкае прадчуванне таго, што чакае яго там, унізе... Раптам з цемры выбеглі людзі, з факеламі... Яны выгуквалі: «Мы адстаялі свайго старшыню!». Гэта былі яго аднавяскоўцы.

Падзенне запаволілася. І прыпынілася зусім, калі пачуў: «А як жа без мяне мая Батурынка?..» Дык гэта ж яго ўласны голас... І моцна застагнаў.

— Што з табой, Віця?! — побач з яго ложкам стаяла ўстрывожаная жонка.

Мроя адступіла. Чуўся адно халодны пот на ілбе. У пакоі гарэла святло. Ён заўважыў — прачнуліся Іра і Люда, дочкі. Заварушылася маці. Агульны неспакой сям'і крануў яго. Цёплы раўчук удзячнасці за спагаду прабіўся ў ахалоджана-змарнелую ў паўдрымотным прывідзе душу.

— Не турбуйся, Вера, — ціха звярнуўся да жонкі. — Нічога не здарылася... Пайду крыху прайдуся, падыхаю.

— Куды?!. Глыбокая ж ноч.

Але ён моўчкі й нетаропка пачаў апранацца, і яна адно цяжка ўздыхнула. Яго каржакаватая, моцная по-

стаць, здавалася, яшчэ болей ссутулілася. Звычайна добры, з лёгкай хмурынкаю твар, прыкметна схуднеў, асунуўся. І без таго глыбока схаваныя, прыжмураныя ад працяглага знаходжання на сонцы вочы запалі яшчэ болей. Замест жывога, спагадлівага — абыякавы, сухі позірк. У густой чупрыне наўздзіў прыкметна засваволіла сівізна.

Ён мімаходам ускінуў пацёртую скураную куртку і выйшаў з хаты.

— Божухна, за што ж яго так?! — не вытрымала жонка. — Харомаў не нажыў, капіталу ніякага... Усё стараўся для людзей... За што ж?!.

Яна падышла да акна, адсунула фіранку і пачала напружана ўзірацца, выхопліваючы постаць мужа, які ледзь выцемніваўся ў прасветлінах паміж кустоўем і прысадамі. Доўга так стаяла, хоць і не бачыла мужа. Нарэшце адступілася і знясілена прысела на канапу.

Вікенцій Антонавіч няспешна, бы нехаця, брыў да возера, што было адразу за агародамі. Злёгку пахрабуствала прамерзлая трава, шаргацела сухое, стылае лісце. У прыродзе ўладна ўсталявалася позняя восень. З азёрнай роўнядзі цягнула прахалодай.

Ён прыткнуўся плечуком да бярозкі й заціх. Гэта ж колькі разоў быў на гэтым возеры? Калі палічыць, то, бадай што, хопіць пальцаў адной рукі. Быў... Дакладна ўжо і не помніць калі — ці то ў жыццёвую нягоду, ці то ў якое вялікае свята... Возера рукатворнае. Той-сёй, калі распачалі капаць катлаван, плявузгаў, што старшыня, маўляў, для сваёй уцехі купальню робіць. Ды толькі зноў памыліліся. Атрымалася — лепшае месца для адпачынку вяскоўцаў. Побач — танцпляцоўка, прысады...

Дык колькі ён залюстраніў і аздобіў прыродных азёр за дваццаць гадоў старшынства? Нямала... Кінуў позірк на возера. Па халодна-чорнай роўнядзі праклаў шырокую баразну водбліск ад нейкай крыніцы святла. Няў-

жо ад таго прыдарожнага ліхтара, што на слупу вясковай вуліцы? Так і ёсць.

Гэтак жа сама — нечакана, прыветна-сцішана — выплылі з памяці яго далёкія гады. Цёплая хваля ўспамінаў растапіла лёд, што лоўжыўся на сподзе душы. Утварылася азерца — акурат чароўнае люстэрка, праз якое і патрапляе сталы чалавек у казку свайго маленства.

...Вікенцій разам з лепшым сябрам Толікам (Анатолем Баніфатавічам Купрэйчыкам) вырашылі стаць штурманамі далёкага плавання. Жылі яны ў суседніх вёсках. Дзялілі й радасць, і нягоды. Апошніх сталася болей. Вікенція рана напаткала самастойнасць. Ён быў адзіны мужчына ў сям'і — страціў бацьку амаль з дня свайго нараджэння: той як пайшоў у 1940 годзе ў войска, так ужо дахаты й не вярнуўся. Служыў у Прыбалтыцы, дзе і застала вайна. Трапіў у акружэнне. Прарвалі... Нейкі час ваяваў пад Ленінградам. Пасля прыйшло паведамленне, што прапаў без вестак. І застаўся Вікенцій бязбацькавічам. Ужо ў школьныя гады спазнаў цяжар мужчынскай працы, стаў разважлівы й кемны не па гадах. Таму маці ўспрыняла рашэнне сына звязаць свой лёс з морам як належнае.

І падаліся сябрукі ў Калінінград. Паспяхова здалі два экзамены. Застаўся апошні — сачыненне. У кубрыку той ноччу было нязвыкла ціха. Але Вікенцію не спалася. Даймаў невыразны смутак нявызначанасці. Мірсціліся маці, вёска, аднавяскоўцы... І раптам тужлівае прасвятленне апякло душу: «Як жа без мяне мая Батурынка? Я ж буду хадзіць у далёкія плаванні. Месяцамі, а то і гадамі не будзем бачыцца....» І так закарцела дадому, што ледзь стрымаў слёзы. Упершыню адчуў, што ніякі ён не «марскі воўк» — вясковая ў яго душа, крынічна-азёрная.

Хуценька ўскочыў з пасцелі й падбег да Толіка. Той таксама не спаў.

— Давай збяжым! — шапнуў сябру як не ў самае вуха.

— Як гэта?.. У нас так усё добра складваецца. А ты — збяжым...

— Перадумаў я... Не хачу... — Вікенцій пачаў блытана, але пераканана-палка тлумачыць і спавядацца. — Чужое ўсё тут... Вёска бліжэй мне. Не верыш?

— Чаму ж — веру!.. Я і сам так думаў, — прызнаўся Толік. — Але ж уцякаць няёмка неяк... Дый грошай у нас няма на білеты.

— Тады — правалім апошні экзамен!

І правалілі.

...Вікенцій Антонавіч з посмехам прашаптаў: «А як жа без мяне мая Батурынка?» Ці не яго гэта выратавальны круг? Ці не знак вернасці й найпершага клопату ў жыцці? Батурынка... Яна і ёсць яго зямны карабель. Душы ягонай калыханка.

Ён схамянуўся — недзе праспяваў першы певень. Край неба пачынаў прыкметна святлець. У душы паранейшаму царавала пусташ няпэўнасці. Ён пачуваў сябе падстрэленым птахам, у якога да ўсяго яшчэ разбурылі гняздоўе.

Толькі пад шчымлівым дажджом расстання прарастае зернейка любасці да роднага гняздоўя. І толькі расстанне правярае сілу каранёў, якія мацуюць повязь з Бацькаўшчынай. Момант «уцёку» з марскога вучылішча стаў для Вікенція Казлоўскага момантам усведамлення сваёй хлебаробскай сутнасці, маўклівай клятвай вернасці свайму — батурынскаму вытоку.

У першыя дні вайны, калі пажар шугаў над Батурынкай, і яго, Вікенція, жыццё было на валаску ад смерці, маці, спатыкаючыся, падаючы, прыбегла з ім у лес, які й стаў па тым часе адзіным паратункам. Туліліся ў зямлянцы. Спазналі й холад, і голад... Былі пасляваенныя вандроўкі па вёсках Аношкі, Сасновая. І — непасільная праца маці, каб здабыць колькі пудоў хле-

ба і купіць у Слабадзе хаціну, якую перавезлі ў Батурынку. Паставілі хаціну на былым котлішчы. Самі ж амаль забылі смак хлеба. Яго замянялі «пышкі» з паўгнілой, счарнела-глёўкай бульбы, што перазімавала на калгасным полі, і капаць такую праўленцы ўжо не забаранялі.

Матчына хата датрывала ажно да 1967 года. Збуцьвела дарэшты. І яе месца заняў сціплы шчытавы домік. З невялікай дабудовай ды такой-сякой аздобай ён, зрэшты, задавальняе сям'ю Казлоўскіх і па сённяшні дзень.

Небасхіл насычаўся барвай. Здавалася, нехта павольна раскручваў дыван у гонар з'яўлення Яго Вялікасці Сонца.

Ад чарговага ўспаміну твар Вікенція Антонавіча ажывіўся... Калгасны сход дасягнуў вышэйшага напалу. Сход, на якім меліся прыпыніць яго дваццацігадовае старшынства. Прадстаўнікі райкама высільваліся, падкідваючы ў залу ўсё новыя і новыя «абвінаваўчыя аргументы». Але ўсе яны былі нязначныя, ускосныя. Накшталт таго, што водаправодныя трубы аказаліся на пару сантыметраў карацейшыя, чым значылася ў паперах. Ці бачыце, старшыня асабіста не памераў. Значыць — загнаў некаму колькі труб... Нажыўся! Адчувалася, што нямала «папацелі» розныя камісіі й асабліва прадстаўнік абласнога аддзела па барацьбе з раскраданнем сацыялістычнай уласнасці. Так, былі пэўныя недакладнасці ў дакументацыі, недаўлікі... Але ніяк не скіраваныя ў кішэнь старшыні. Калгас яму ўяўляўся вялікай, дружнай сям'ёй, у якой адносіны будаваліся на ўзаемадаверы. Калгаснікі адвяргалі «довады» райкамаўцаў проста і не без досціпу — з адметным сялянскім гумарам:

— Пачакайце, пачакайце!.. Калі, па-вашаму, старшыня абдзіраў калгас, як ліпку, дык чаму ж гэта наш калгас адзін з перадавых у раёне?

— Вікенцій Антонавіч такі ж багацей, як і мы... Не раскашуе. На ашчаднай кніжцы ў яго толькі на колы да аўтамабіля!

— Палац сабе не ўзвёў!..

— Па курортах не лётае!

— Вы проста сляпыя! — гарачыўся райкамавец. — Яго махінацыі хутка ўсплывуць!

— Няма чаму ўсплываць!..

— Ды ён жа наш — батурынскі. Мы верым яму, ведаем яго. І плыць нам з ім у адным чоўне да скону дзён...

Калі сталі галасаваць, то не ўзнялася ніводная рука. Маладыя калгаснікі, вяртаючыся са сходу, палілі факелы й радасна выгуквалі: «Адстаялі!.. Адстаялі свайго старшыню!»

Вікенцій Антонавіч прысеў на лаўку. Над возерам клубіліся нізкія пахмаркі туману. Возера нагадвала кубак, напоўнены ўспененым сырадоем. Сіліўся прааналізаваць сітуацыю — хацелася як хутчэй выйсці з няпэўнасці, набыць хоць нейкую душэўную раўнавагу.

...Гэта была сярэдзіна васьмідзесятых. Распраўляла крылы перабудова. Туман сумнення ахутваў калгасны лад гаспадарання. Вышукваліся «тармазы» перабудовачнага працэсу. Нярэдка — штучна. Заварушыліся і мясцовыя «перабудоўшчыкі». У асноўным — прышлыя. Штуршком да актыўнай «дзейнасці» паслужыла звальненне некаторых з іх. Трэба сказаць, пакрыўджаныя настолькі абурыліся «кансерватыўнымі» парадкамі ў калгасе і так захапіліся перабудовачнымі ідэямі, што палічылі другараднай справай выкананне сваіх непасрэдных абавязкаў. Вікенцій Антонавіч не мог гэтага цярпець, бо сам дарэшты выкладваўся на рабоце і няўхільна патрабаваў гэтага ж і ад усіх калгаснікаў. Яго разумелі й падтрымлівалі. Што якраз і садзейнічала не толькі маналітнасці, але і дысцыплінаванасці калектыву. Стваралася своеасаблівае біяполе даверу і адказнасці.

Гарачлівых крыкуноў-нецярпліўцаў, вядома ж, ставала і да перабудовы. Адно да часу сядзелі прытоена, цікавалі й чакалі сігналу зверху. Сам жа Вікенцій Казлоўскі цвёрда трымаўся аднаго прынцыпу — пры ўсіх зменах людзі аднолькава хочуць есці. Таму ў любым выпадку трэба развіваць гаспадарчую вытворчасць, ашчадна, з любоўю ставіцца да зямлі.

І ўсё ж мясцовыя «перабудоўшчыкі» такі сігнал атрымалі. Разлік быў даволі просты — самы дастойны для нападу той, хто нясе найбольшую адказнасць і працуе самааддана, без аглядкі.

А што ж партыя, «розум, гонар і сумленне...», у складзе якой Вікенцій Антонавіч з 23-гадовага ўзросту? Тым часам «мозг і сіла класа» распалася як бы на дзве: на партыю бюракратычных вярхоў, якіх клапоціць толькі асабісты дабрабыт, і партыю радавых камуністаў, якія па-ранейшаму верай і праўдай служаць камуністычнай ідэі, народу. Першая — гэта вершаліна дрэва, крона з пладамі, другая — карані дрэва, яго жыццеаснова. Ад празмернай эксплуатацыі карнявой сістэмы, плады сталі чарвівець, загніваць...

«Перабудоўшчыкі» ж, бы тыя матылі, насіліся са скаргамі. Бюракраты ўспрымалі матыліны пошапт за голас народа і праяўлялі празмерную «ініцыятыву» у здзяйсненні, як ім здавалася, перабудовачных задум. На самай жа справе — паўсюдна «ламалі дровы». Абы выслужыцца перад партыйнымі генераламі з Масквы й захаваць наседжаныя месцы. Чым траўміравалі сапраўдных камуністаў, разбуралі асновы жыцця, вытворчасці. Належнага ж клопату аб народзе «высокашараговыя» не праяўлялі, адно прыкрываліся напышліва-глупотнымі лозунгамі ды заклікамі да перамогі камунізму.

Менавіта між камянёў гэтых бюракратычна-матыліных «жорнаў» і трапіў Вікенцій Казлоўскі. Бо, каб даказаць нежыццяздольнасць калгасаў і тым самым дагадзіць «прарабам перабудовы», якраз і трэба было

разбурыць у першую чаргу моцныя гаспадаркі. Вось і пачалі бэсціць іх кіраўнікоў, пазбаўляць пасад.

Вікенцій Антонавіч не разгубіўся і гэты раз. Больш таго — ён адчуў новы прыліў сіл. А разам з тым — упэўненасць і адначасова злосць. Не, ён не стане марнавацца, нішчыць сябе. «Мы ж — карані... Вечныя. А яны, там, на макаўцы, часовыя. І рана ці позна асыплюцца... Хутчэй бы!» З-за небасхілу мерылася вось-вось выглянуць сонца. Туман курэў над самай вадой і прыкметна радзеў. На фоне палымнеючага ўсходу ствараласся ўражанне, што дагарае ноч...

Дагарала яна і ў душы старшыні, нядаўна яшчэ такой спустошанай. Цяпер жа — поўнілася святлом надзеі новага дня.

Вікенцій Антонавіч борздка падаўся дахаты. Па яго таропкай хадзе Вера Елісееўна адчула, што настрой у мужа змяніўся ў лепшы бок. І калі Вікенцій Антонавіч увайшоў у хату і на яго супакоены твар лінула з люстра зыркая хлынь святла, ён прыжмурана зазірнуў жонцы ў вочы й пасміхнуўся...

Вера Елісееўна паклікала снедаць. Ціха прысела насупраць. Вядома ж, лепшыя лекары — работа і час, аднак ёй хацелася хоць нечым суцешыць мужа, сказаць яму колькі цёпла-гаючых слоў. Вымавіла ж толькі гэтыя:

— Чуеш, табе трэба знайсці работу...

Хацела яшчэ нешта дадаць, але муж зразумеў яе клопат і памяркоўна кіўнуў:

— Дзякуй... Прыму да ўвагі.

Вікенцій Казлоўскі зрабіў ужо адну спробу ўладкавацца. І пра гэта не сказаў жонцы, змоўчаў. Не было на тое прычыны.

А між іншым — прасіўся па спецыяльнасці. Заатэхнікам. Ды асуджанаму партыяй на абласным узроўні «кісларод» перакрылі як мае быць. І хто ён цяпер? Карупцыянер, амаль мафіёзі... Адмовілі з ходу, без

лішніх апраўданняў. Зразумець іх можна. Вядома ж, хоць і не вераць у бязглуздае абвінавачванне, але тыя, хто наверсе, абкамаўцы, невядома як зрэагуюць... Дый час зменлівы. Сёння — гнаны, а заўтра — жаданы. Людзі героя ў ім убачаць — аддадуць перавагу яму, ахвяры пераследу. Навошта ж рызыкаваць?

Работа, работа... Чаго не маеш, аб тым і думаецца. Прызнацца, не хацелася пакідаць Батурынку. Увогуле ж — і немагчыма пакінуць яе. Гэта пэўна. Уладкавацца б дзе паблізу, паблізу... Вось так. Абарвалася струнка напятая цеціва яго дзейнасці. З таго і рупіць як найхутчэй звязаць яе. Шукай жа, шукай канец абрыву!.. Дзе гэта ён — няйнакш адляцеў некуды ўбок.

...Вікенцій Казлоўскі прыкіпеў да сялянскай працы яшчэ ў школьныя гады. Найвялікшай асалодай і гонарам для яго было пачуць ад мужыкоў: «Ты толькі паглядзі, як ладна акучвае!». Ці: «І калі ён навучыўся так зграбна класці воз?!». Імкненне раўняцца на дарослых, прыкметна паскорыла яго сталенне. Сялянская жылка змалку пульсавала ў ім ва ўсю моц. Васьмікласнікам быў прызначаны падчас летніх канікулаў узважваць зерне ў калгасе. Далёка не кожнаму дарасламу давяралі такое, а тут — хлапчанё, з-за вагаў не відаць...

У дзевятнаццаць — Вікенцій Казлоўскі ўзначаліў брыгаду. У 100 чалавек! Дарослыя звярталіся да яго ласкава, даверліва: «Сынок!..» Аднагодкі ж называлі Вікенціем Антонавічам. Складаная сітуацыя. А тут яшчэ родныя, знаёмыя... Паспрабуй захаваць нейтралітэт і справядлівасць! Але трымаўся малайцом, бо кожнага ўшаноўваў па працы. Аднак імкненне быць першым і спагада да людзей не давалі супакойвацца. Гэта ж не жартачкі — жанчына за дзень павінна была зжаць сярпом 15 сотак жыта, а мужчына — зваліць у пракос 40 сотак травы! І брыгадзір сапраўды паспагадаў людзям — прыстасаваў лафетную жняярку. Ды нядоўгай

была палёгка — старшыня забраў жняярку: маўляў, не бунтуй народ: чым твае лепшыя за астатніх?

І тады ён зразумеў, што пры ўсёй яго кемлівасці й працавітасці — без навукі ніяк не абысціся. Адукацыя — не толькі веды. Адукаваны чалавек мае таксама і належны аўтарытэт сярод сваіх падначаленых, пашану.

Ну, канешне ж, Вікенцій Антонавіч Казлоўскі завочна скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Працаваў заатэхнікам у калгасе імя Каліініна, пасля — у аб'ядналым узбуйненым калгасе імя Арджанікідзе. Два гады быў намеснікам старшыні калгаса. Давялося павучыцца і ў школе кіруючых кадраў.

З лютага 1967 года бярэ выток яго дваццацігадовае старшынства. Гаспадарка дасталася — не мёд. У калгасе імя Калініна на той час не было ніводнай тыпавой пабудовы. Скрозь — прымітыў, часовыя злёпкі. Бездарожжа... Гектар высільваўся толькі на 6,7 цэнтнера зерявых і 65 цэнтнераў бульбы.

І што ж — пачаў з будаўніцтва дарог, меліярацыі зямель. Узвёў два жалезабетонныя масты, якія цясней злучылі калгас у адно цэлае. Выкапаў два возеры. І калі праз сем гадоў гаспадарку далучылі да калгаса імя Арджанікідзе, ужо збіралі па 25-26 цэнтнераў зерявых з гектара і па 140 цэнтнераў бульбы. Неўзабаве Вікенція Казлоўскага абралі кіраўніком гэтага калгаса. Гаспадарка была эканамічна адсталая. Але праз колькі гадоў яна трапіла ў лік перадавых у раёне. Стабільна пачала займаць першыя месцы па ўраджайнасці збожжавых і па вытворчасці мяса. Як з рога — пасыпаліся ўзнагароды. Вікенцій Антонавіч таксама быў удастоены ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, медаля «За доблестный труд», Ганаровай граматы Вярхоўнага Савета БССР.

А яшчэ, перадавы калгас першым у раёне пабудаваў 22 кіламетры газаправоду, цяплічны камбінат на 6

гектараў зімніх і 3 гектары плёначных цяпліц, паказальны пасёлак Слабада, буйны свінагадоўчы комплекс на 3 тысячы галоў, кацельню магутнасцю 116 гігакалорый (самая магутная на той час у раёне была ў 16 гігакалорый). Узвялі шмат жылля, аб'ектаў сацкультбыту...

Зрэшты, Вікенцій Антонавіч Казлоўскі за гэты час абараніў дысертацыю кандыдата эканамічных навук на тэму: «Сацыяльна-эканамічныя фактары павышэння прадукцыйнасці працы ў жывёлагадоўлі». І не толькі абараніўся — у значнай ступені пацвердзіў тэарэтычныя выкладкі на практыцы. Дастаткова адзначыць, што валавы даход калгаса ў дзесятай пяцігодцы значна вырас.

Вехі працоўнай дзейнасці віравалі ў памяці знакамітага чалавека, бы ў калейдаскопе. Здавалася, сёння ён кідаў выклік сваім колішнім зайздроснікам, якія так несправядліва абышліся з ім. Яго хацелі зламаць маральна, але менавіта маральна ён быў дужэйшы за тых бесхрыбетных бездараў ад улады. Яго ўнутраны голас бунтаваў: «Недзе ж вы й сёння ёсць... Адны ў дэмакраты перамахнулі, купаюцца ў пене пустаслоўя, другія — стаіліся, чакаюць свайго часу... Трэція — па-ранейшаму кіруюць, не зважаючы на свой пенсійны ўзрост».

Ён мог зразумець таго-сяго з гарачлівых скаргапісцаў. У іх была асабістая крыўда на яго — звольніў! Прыехалі па «дабрабыт і шчасце», думалі смачныя галушкі самі ў рот паляцяць, адно паспявай хапаць, а тут — трэба з дня ў дзень самаддана працаваць. Той, хто змалку не ўцягнуўся ў працу, хто прывык на жыццё глядзець лёгка, ці ж здольны вытрымаць напругу ў штодзённа-працоўным калаўроце?.. Вось і сыходзілі злосцю. І ўсё — ад бяссілля процістаяць маналітнаму калектыву. Перабудова ж дала ім шанец выбавіцца з «ланцугоў калгаснага прыгнёту». І вось — не без дапамогі партбюракратаў і быў узведзены гнюсны паклёп у ранг праўды.

Калі ж скаргапісцы зразумелі, што іх намаганні выльюцца толькі ў вымову для В.А. Казлоўскага, яны тут жа звярнуліся па дапамогу ў газету «Правда». Прыехаў карэспандэнт — «разабраўся». Пры развітанні паківаў пальчыкам абкамаўскім дзеячам: маўляў, калі не прымеце меры, будзе артыкул у «Правде». Затрэсліся бедалагі ў сваіх утульна-шыкоўных крэслах. Умомант з іх памяццю «нешта стала» — забыліся на заслугі камуніста Казлоўскага. І наогул, хто ён такі, каб з ім цацкацца? Ёсць факты — і досыць... Першы сакратар абкама партыі ўпарта адмаўляў у сустрэчы. Дапамог выпадак. Неяк Вікенцій Антонавіч быў у другога сакратара, калі да яго па нейкай справе зайшоў Сам. На просьбу Казлоўскага толькі прабурчэў: «Нам няма пра што гаварыць». Бы кіпнем абдаў. Праз колькі дзён — яшчэ адзін удар: бюро абкама па яго персанальнай справе! Адразу ж далі зразумець, што пасадныя крэслы ім даражэй за ўсё. І Вікенцій Антонавіч вымушаны быў «здацца» — саступіў «па стану здароўя».

Калі грымнула «дальнабойная артылерыя», то «мясцовай пяхоце», хочаш не хочаш, а трэба дружна ўздымацца па камандзе. І райкамаўцы ў трэці раз пайшлі ў атаку на калгаснікаў. У трэці раз сабраўся агульны сход — і зноў калгаснікі супраць зняцця з пасады іх старшыні. Гэты раз не вытрымаў Вікенцій Антонавіч:

— Дзякуй, даражэнькія, за падтрымку... Але далей нам упарціцца няма сэнсу. Рашэнне бюро не адменіш. Як бачыце, абласныя партыйцы не з вамі, бо яны — супраць мяне. Яны, па ўсім відаць, заадно з нашымі «перабудоўшчыкамі». Як кажуць, падабралася кампанія. Даруйце, калі што рабіў не так... — І ўжо гаварыць не змог: камяк горычы падкаціў да горла — зацяў голас.

«Калі глыбей браць, дык я шмат чым не дагадзіў абкамаўскай эліце... — сам-насам разважаў Вікенцій

Антонавіч. — Ага, вось, вось... Калгас імя Арджанікідзе — вароты ў Смалявіцкі раён. І не так гасцінна, як хацелася б пашанотным асобам, яны расчыняліся перад імі. Так, частаваў. Але сціпла, не па-царску. І тым не менш — дамагаўся выгод для свайго калгаса. Нават у намесніка міністра па будаўніцтву з Масквы выцыганіў жалезабетонны склад. Эксперыментальны. Ён і сёння стаіць...» А яшчэ і таму, бо заўсёды меў сваю думку. Неяк на райкамаўскай нарадзе непрацяглае выступленне закончыў так:

— Прашу, не вучыце нас, як працаваць... Мы самі не горш ведаем. Вы нас толькі дзяржзаказам забяспечце. І ўсё, больш і не трэба нічога.

— У Казлоўскага рогі прарэзваюцца, — з’едліва зазначыў тадышні першы сакратар райкама партыі С. Лінг. — Мы даўно заўважаем, што табе цесна ў калгасе...

Праз кароткі адрэзак часу ён ужо быў у абкаме, пры чарговай сустрэчы з Казлоўскім прапанаваў:

— Вікенцій Антонавіч, чаму б табе не пайсці начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі раёна? Вопыт багаты, знаёмствы ў вярхах ёсць... І раёну дапаможаш. Не хвалюйся, доўга не затрымаешся і там — як цыган па драбінах угару пойдзеш.

— Ды куды мне — я стары конь... Ужо ж і гэты воз не па мне, — аджартаваўся, але тут жа прыкінуў: свой раён за кошт другіх выцягнуць? Не, мне спадручней распараджацца тым, што нажыта ўласным гарбом. А што кар’ера? Няма лепей — сумленна працаваць для сваіх людзей. Гэта ў канчатковым выніку карысна для ўсіх. Дый, калі шчыра, як жа мне без маёй Батурынкі?

Во, ледзь не забыў... Яшчэ прапаноўвалі Вікенцію Казлоўскаму, каб звольніў двух будаўнікоў. Відаць, тыя добра насалілі мясцовым «перабудоўшчыкам». Маўляў, звольніць — і скаргапісцы адстануць, пакінуць у спакоі. А за што ж ён іх павінен быў звольніць,

калі лепшых за іх не адшукаць? Зноў парушыў прынцып партыйнай бюракратыі: «Ратуй сябе, тапі іншых». Зрэшты, нікога ён не ўтапіў. І не даўся, каб самога ўтапілі. Ён верыў, што час усё і ўсіх расставіць на свае месцы.

...Вікенція Антонавіча Казлоўскага прытулілі ў калгасе імя Леніна. Сустрэлі, як роднага. Свае ж людзі — суседзі. Спачатку працаваў заатэхнікам, затым — намеснікам старшыні, а з 1987 года — абралі старшынёй. З трох кандыдатур выбіралі. Прагаласавалі аднагалосна за яго. І не прагадалі. Вызначыўся як самы гаспадарлівы ў раёне.

З усяго перажытага вынес такі прынцып: калі дзяржава не клапоціцца аб дабрабыце сялян, то трэба брацца за гэтую справу самім. І браўся ў меру сваіх сіл і магчымасцей. І атрымлівалася ўсё, да чаго імкнуўся.

## ПРАЛЕСКІ

Генадзь Міхайлавіч выйшаў з хаты. Звыкла накіраваўся да іншамаркі. Асабістай. Набыў з рук на дзесятым годзе карыстання. Колеру крыху недаспелай вішні. Як ні круці, а на колах ямчэй уладкоўваць клопаты. Найперш, зразумела, — калгасныя. Іх, зрэшты, не размяжуеш: калектыўныя, прыватныя турботы... Калі ж пешшу, ашчаджаючы машыну, то і справы будуць плесціся. А хто ў выйгрышы? Ёсць і калгасны транспарт, толькі сур’ёзнага рамонту патрабуе. Дый калі да яго падступіцца? Ніводнай на тое хвіліны з паўсядзённай клапатні не выхапіш.

За колькі крокаў да веснічак Генадзь Міхайлавіч прыпыніўся. Падалося, што нехта зірнуў на яго... Адтуль — з агародчыка. Прыгледзеўся. Пад сцяной хаты, дзе веснавы прыпар ужо злізаў запознены снег, віднеліся яны... Пралескі... Генадзь Міхайлавіч падышоў.

Прысеў. Злёгку правёў па малюсенькіх пялёстках шурпатымі пальцамі. Нібыта пагладзіў.

— Прывітанне, — прашаптаў ледзь чутна.

Твар пацямнеў, наліўся тугой... І глухі боль, бы аддалены гром, пракаціўся па ўсёй істоце. З кожным успамінам нарастаў. Распінаў грудзі, гнаў наўгалоп сэрца...

Пралескі... Дробныя кветачкі, быццам кропелькі блакіту, выпырснутыя з вачанят яго сына. Сяргейкі. Ужо дзевяць гадкоў бацька ўзіраецца ў гэтыя расінкі. І нязменна ўлоўлівае ў іх вінаваты позірк сына.

З якой падрабязнасцю і яснотаю помніцца той дзень. Здаецца, ён ніколі не адыходзіў. Толькі цень мітуслівых, тлумных клопатаў заслоніць на нейкі час спякотныя ўспаміны, але дастаткова драбніцы, якая б нагадала пра сына, і засень часовага забыцця імгненна расхіналася. Ды кожны ўспамін — гэта сустрэча з дарагім чалавекам. Хай усё яшчэ і надта балючая...

Шасцігадовы Сяргейка прынёс жменьку пралесак. З карэньчыкамі. Ледзь пераступіў парог, як весела прашчабятаў:

— Я пасаджу іх каля хаты... Там многа сонейка.

— У агародчыку месца хопіць, сынок, — паўжартліва адгукнуўся бацька.

Першыя веснавыя кветкі ў руцэ дзіцяці. Як гэта хораша і значыма. Кветкі... Адраджэнне, пачатак жыцця. І прыгажосць.

Бацька паімкнуўся падацца ўслед за сынам. Але загіпсаваная нага нагадала пра сябе, і не схацеў лішні раз вярэдзіць яе. Гэта ж такая недарэчнасць — няёмка ступіў і саслізнуў з драбін...

Сяргейка неўзабаве вярнуўся. Пакорпаўся крыху на кухні: зацурчэла вада, бразнула лыжка — памыўся, падсілкаваўся... І зноў — за парог. І тут — бы спахапіўся:

— Тата, я да Сашкі!

Кажуць, чалавек здольны прадчуваць бяду. Магчыма, асобныя людзі ў нейкім выключным стане і здатныя прадбачыць няшчасце. Толькі ж і яны, відаць, канчаткова не ўпэўненыя, што яно абавязкова здарыцца. Тым болей — немагчыма прадказаць дакладны час... Гэта за межамі магчымасцей чалавека.

Што ж тычыцца Генадзя Міхайлавіча, то нічога кепскага яму гэты дзень не прадвяшчаў. Саша — суседскі хлопчык. Аднагодак яго сына. Яны часта разам бавілі час.

Хлопчыкі падаліся на ферму. Паганяцца за галубамі. Птушка згаладала за зіму. І ў кармацэху жывілася. Былі галубы надзвычай рахманыя. Падпускалі блізка — амаль на выцягнутую руку. Людзі не крыўдзілі галубоў, і тыя хінуліся да іх, былі даверлівыя. Асабліва шмат зляталася да чана, у якім запарвалі пойла цялятkам. Зерне не надта здрабнялася... Перападала тое-сёе і галубам.

Пузаты чан самазадаволена пабулькваў варывам. Пахла цестам, нават крыху духмяніла спечаным хлебам. Ад чана наўкола распаўсюджвалася цяплынь... Улоўліваліся хатні зацішак і ўлагоджанасць.

Сяргейка з Сашкам ганяліся за галубамі. У іх і ў думках не значылася злавіць птушку і пазабаўляцца ёй. Гэта была гульня. Накшталт даганялак. Каб утаймаваць энергію, даць волю азарту, паказаць свой спрыт...

Вось адзін голуб усеўся на балцы й якраз над самым чанам. Толькі хвост тырчыць. І не бачыў, што робіцца ззаду. Вельмі зручны момант, каб непрыкметна падкрасціся. Сяргейка нягучна ўзбіраецца на чан, не зводзячы вачэй з птушкі. І ўжо амаль дацягнуўся рукамі да шызага хваста, як няшчыльна прыкладзеная накрыўка па-здрадніцку каўзанулася пад нагой, стала дыбкі...

Жудаснае імгненне... Боль, страх, роспач... І неймавернае жаданне жыць... Галасна паклікаў:

— Сашка!

Але што мог той... Побач жа ніводнага дарослага. Маленькае цела тузалася, вырывалася з пашчы кіпеню. А дзве кволыя рукі сябра ратавалі... З апошніх сіл...

— З гарачкі ён прыбег яшчэ дамоў, — з цяжкасцю выціскваў словы Генадзь Міхайлавіч. — Стаў вось тут, на парозе і так вінавата паглядзеў на мяне. Бы прасіў прабачэння. Не хацеў, каб я злаваў, што так здарылася. Ніколі не забыць мне гэтага позірку... Знялі вопратку... Выклікалі «хуткую... А праз тыдзень Сяргейкі не стала. Незадоўга як адысці, спытаў у маці: «Я паміраю, праўда?..» Як яна, бедная, перажыла ўсё гэта?... Я болей не магу...

Генадзь Міхайлавіч устаў і прайшоў у пярэднюю. Яго твар звяў, звычайны выраз знік... Калі пакута мае аблічча, то гэта было яно.

Хай даруюць мне Генадзь Міхайлавіч Гемскі ды яго жонка Вольга Іванаўна, што я ўзрушыў іх боль. Вымусіла неабходнасць. І гэта ў пэўнай меры выбачае мне. Інакш нельга было б зразумець, раскрыць майго героя. Накірунак яго думак, імкненняў... Урэшце — сэнс яго існавання. Сутнасць менавіта яго пралесак — паваротнага моманту лёсу, нават кропкі адліку жыцця.

Зноў мы сустрэліся толькі праз тыдзень.

Нарэшце — доўгачаканы дождж. Спорны. Але не навальнічны: без грозных памагатых — бліскавіцы й грымотаў. То ж толькі яна, навальніца, па-сапраўднаму асвяжае паветра. Яе крэсіва, высякае азон — цуда-кісларод, які лагодзіць лёгкія, амалоджвае істоту, п’яніць прагай жыцця...

Гэты ж дождж быў прыпраўлены прыпарам: яго пахамі й млявасцю. Ды яшчэ аднекуль з балота прасочваўся даўкі гар падпалу. Нават не наталялася спаўна вільгаццю сасмяглае наваколле. Яно нагадвала не надта прыбраны пакой. Толькі змочана падлога, а сцен, столі, мэблі так і не кранула рука гаспадыні.

...Прыпыніўся сенакос. Затрымаўся дома ў нязвыклы дзённы час і Генадзь Міхайлавіч Гемскі. Галоўны клопат, корманарыхтоўка, кіраўніка вытворчага ўчастка Чэрнікаўшчына калгаса «Ленінскі шлях» на нейкі час сцішыўся.

Мы ўладкаваліся на кухні. Жонка Генадзя Міхайлавіча прыхварэла. Хворасць задаўненая. Навярэджаныя хапатлівай, натужнай працай рукі пачалі адмаўляць. Нават дапамога абласной бальніцы спатрэбілася. Вольга Іванаўна ўзначальвае ферму. Пад непасрэдным кіраўніцтвам мужа працуе. А цяпер і яе турбота на яго плечы ўзлягла. Узначальвае... Гэта толькі для недасведчаных. На самай жа справе — і падаіць, і дагледзець, і посуд памыць даводзіцца. Ды не аднойчы. Умовы ж не офісныя. Сырасць, паветра на аміяку настоена...

— Тата, я паесці прыгатавала, — дзелавіта паведаміла дачка Насця. Яна ж — за гаспадыню.

— Ага... Але я пакуль не хачу.

— Я — да сяброўкі...

Насця ўжо дзевяць школьных прыступак адолела. Паступаць у сельгастэхнікум збіраецца. На ветурача.

У хату па нейкіх сваіх справах зазірнуў сын Генадзя Міхайлавіча Руслан. Даўгавязы, хударлявы хлопец. Да гэтага пад павеццю з матацыклам корпаўся. Праз хвіліну наважыўся выйсці.

— Пачакай, — супыніў бацька, — на вячэрнім даенні пабудзеш. Прымеш малако. Адправіш на завод. Я — па хатах. Буракі размяркоўваць. Палоць час.

— Добра.

— А што, хай прызвычайваецца, — задуменна зазначыў услед сыну бацька. — Лічы, заатэхнік ужо. Выпускныя экзамены ў тэхнікуме здае. Паспяхова. У сельгасакадэмію надумаў паступаць.

— А ў вас якая адукацыя? — дастасоўваю пытанне.

— Сярэдняя спецыяльная... Заатэхнік. Загадчыкам фермы пачынаў.

— Не позна падвучыцца яшчэ. Усяго толькі за сорак.

— Я і сам прыкідваў. Здароўе ёсць. Галава не набакір. Вось і сын незадаволены маім адукацыйным узроўнем. Кажа: «Чаму ты, бацька, не вучыўся далей?» Адказваю: маўляў, не меў магчымасці, час іншы быў. Але ж гэта не зусім так. Хутчэй — неабходнасці ў навучанні не бачыў. Дый упэўненасці не было... Іншая справа — яны, дзеці. Мы для іх — арыенціры. І супаставіць могуць, і свае магчымасці прыкінуць. Таму і вера ва ўласныя сілы цэментуецца. Перспектыва ясней уяўляецца.

Нават непаглыбленае знаёмства з сям'ёй Гемскіх высвечвала ўзаемаразуменне, лад і павагу, якія ляжаць у яе аснове.

Адметна і тое, што дзеці абралі бацькоўскі накірунак у будучай дзейнасці. Хоць мелі выдатную магчымасць неаднойчы пераканацца на прыкладзе бацькоў, якія цяжкасці падпільноўваюць наперадзе. Ці не таму, што бацька і маці ўсур'ёз ставяцца да сваіх абавязкаў. Узамен жа — маюць павагу людскую і ўладкаванасць ніштаватую. І сэнс жыцця. Без гэтай сутнасці яно, жыццё, не склейваецца. Існасць жа простая — мець магчымасць максімальна, з найбольшай карысцю рэалізаваць свае здольнасці. І дзеці Гемскіх яе маюць. Правераную самымі блізкімі людзьмі.

Я ўсё ніяк не намерваўся закрануць тую, балючую тэму. Нават ускосна. Толькі ж таптацца вакол не выпадала. Дый усё роўна не абысці. Таму наважыўся.

Балазе, Генадзь Міхайлавіч не з кволых. Зграбны, моцна складзены. Галавасты. Своеасаблівы выраз твару. Бы дваякі. Знешні — накшталт хмаркі. Самотна-задуменны. А той, другі, хаваецца за ёй. І выбліскває ўсмешкай. Шчырай, пранікнёна-ветлай. Воля і дабрыня ўдала спалучаюцца ў ім. А голас — пашукаць! Грудны, басавіты... Нагадвае гулкасць ранняя, калодзежнае

водгулле. Нібыта сам абсяг надзяліў, каб гаманіў за яго. Нездарма ж рэжысёр, што ладзіў святкаванне юбілею Смалявіч, абраў на ролю гетмана Астрожскага яго, Генадзя Міхайлавіча Гемскага. Маналог у яго выкананні дыхаў непадробнай даўнінай. Быццам дух таго далёкага стагоддзя вярнуўся на імгненне да нас.

— Такое выпрабаванне не вымусіла вас збочыць? — сцярожка пачаў я. — Вы нават адмовіліся ад спіртнога. Хоць яго ўжыванне ў вашым становішчы ў пэўнай ступені было б апраўданым. Многія ж імкнуцца знайсці збавенне ад нягод на дне пляшкі. Ці не было ў вас такога жадання? І што стрымала?..

Я разумеў бестактоўнасць такой цікаўнасці. Але спадзяваўся на выбачэнне. Вось, думалася, прыклад іншага выйся з тупіка. Хай ведаюць яго і многія з тых, хто захлынаецца ў гарэлцы й роспачы. І, магчыма, ухопяцца за яго.

— Жаданне?.. Было. Толькі вачаняты майго Сяргейкі... Яго вінаваты позірк... Быццам то мой адлюстраваўся ў яго вачах. Калі б не нага, то я мог быць побач з сынам. І бяды не здарылася б...

Голас Генадзя Міхайлавіча сцішэў, надтрэснуў. Але гэта ўжо быў не ранейшы скрушлівы стан. Магчымасць выказацца, шчырае суперажыванне не змякчылі боль...

— Як жа я мог дакрануцца да чаркі?.. Упасці. Здрадзіць сыну. Не быць вартым яго — светлага і чыстага. У кожным падлетку мне бачыцца ён... Мой Сяргейка.

— Сумленне не дазволіла?..

— Вось-вось. Вы разумееце.

Як не зразумець жадання бацькі пражыць жыццё за сына. Бо яго ўласнае яму з таго моманту ўжо не належыць. Апусціцца ж — азначала скарыцца, прызнаць сваю нікчэмнасць, магчымасць нейкай патэнцыяльнай вінаватасці.

— На сарачынах сына прыгубіў у апошні раз. І ўжо дзевяць гадоў — ні глытка. І ніякага жадання... Дый да гэтага асаблівай цягі не меў.

— Белай варонай у застоллях няёмка быць?

— Варонай?!. Вожыкам без калючак. Не верылі, што сам кінуў. Маўляў, хворы... Нават той-сёй пагаворваў, што, маўляў, у экстрасэнса ад алкагольнай залежнасці лечыцца.

— А як сябе паводзіце ў застоллях?

— Застольных кампаній не цураюся... Адпачываю, як і ўсе. Толькі на цвярозую галаву.

Сёння шмат разважаюць аб роўнасці, справядлівасці. У нейкім матэрыяльным дастасунку, магчыма, і можна наблізіцца да жаданага. А як жа быць з лёсам? Вазьміце расліннасць. Здаецца, уся пад адным сонцам. І ніякай табе валтузні. Ды не... То зацененая, то на пагорку выгарала, то ў нізовіне вымакла — няроўная... Але ж усё цягнецца да сонца. Бо толькі яно, сонца, забяспечвае жыццё на зямлі. Ці не гэтай найгалоўнейшай мэце павінны й мы служыць?!. Толькі ў ёй адзінай заключаецца вялікі сэнс нашага існавання.

Яшчэ шмат вёснаў прычакае Генадзь Міхайлавіч. Каб зазірнуць у кропелькі блакіту пралесак. І каб — нарэшце! — не прыкмеціць у іх вінаватага позірку сына...

— А цыгарэткі ўсё ж смокчаце?

— Ды суслю... Працяглы час не дыміў... І зноў, во, уцягнуўся... Коней даём напракат. Асядланых, спакойных. Зразумела, не задарма. І жадаючых прагуляцца верхам ёсць. З Мінска наведваюцца... Моладзь пераважна. Дык вось, дзяўчо не ўтрымалася ў сядле... На маіх вачах. Праўда, абышлося. Перахваляваўся, вядома... І закурыў. Давядзецца зноў кідаць, — падсумаваў спакойна Генадзь Міхайлавіч.

На першым часе, як не стала сына, Генадзь Міхайлавіч Гемскі шукаў паратунку ў клопатах. У абавязках загадчыка фермы іх было недастаткова. Знаходзіў. Але ці то яны былі чыста фізічныя — не паланілі думак і пачуццяў; ці то проста зводзіліся да нікчэмнай мітусні. Знаходзіцца ж у бяжважка-хісткім, не загружаным стане

было немагчыма. Нават у нейкай меры небяспечна. Акурат у парожняй лодцы на разгайданых навальніцаю хвалях. Жыццёвыя нягоды маглі ў любы момант падхапіць, панесці, перакуліць.

Такі стан Генадзя Міхайлавіча не застаўся па-за ўвагай старшыні калгаса «Ленінскі шлях» Анатоля Баніфатавіча Купрэйчыка, які найперш абапіраўся на спецыялістаў. Ушчыльную ўнікаў у іх патрэбы. Але да панібрацтва не даходзіла. Трымаў у строгасці й на толькі ім вызначанай адлегласці. Менавіта на той, якая дазваляла патрабаваць, не зважаючы на рангі й асабістыя прыхільнасці. Зыходзячы з уладкаванасці й магчымасцей кожнага. Прычым, здольнасці не закаркоўваў пасадай. Бы віно ў бочцы. Маўляў, перабродзіць — мацнейшым будзе. А даваў выйсце. Наспела яно і ў адносінах да Генадзя Міхайлавіча. Цяпер жа было якраз дарэчы.

— Брыгаду ўзначаліш, — з уласцівай лаканічнасцю ці то прапанаваў, ці то загадаў Анатоль Баніфатавіч.

— Брыгаду, дык брыгаду, — з ходу пагадзіўся Генадзь Міхайлавіч.

— Што ж так абыякава?.. Калгас падавай? Не спяшайся — усяму свой час.

Гэтае прызначэнне выклікала выбух актыўнасці, што якраз і прыглушыла асабістае, абязболіла душу. І ў самы патрэбны момант...

Напачатку знеслі невялікую трухлую хаціну — брыгадзірскую. І за кароткі час з'явілася новая. Метражная — дванаццаць на сем. Будавалі прыхваткамі — у выхадныя. Паляводаў жа ў брыгадзе — ніводнага. Арганізаваў вясковых мужчын.

Неўзабаве брыгадзірскую прыстасавалі пад клуб. Балазе, воддаль ад фермы, наводшыбе, на пагорку. Загадваць клубам стаў сам Генадзь Міхайлавіч. На грамадскіх пачатках. Раздабылі музычнае прычындалле. Нават сёе-тое прынеслі сваё. Ды так загучалі, што моладзь з суседняга калгаса «1-га Мая» прывабілі.

Услед узяліся за агароджу вакол фермы. А то кругом — ні кала. Няйнакш — абібоцкая вотчына. Нават воку непрыемна. Амаль па дваццаць чалавек выходзілі па выхадных. Рыхтаваць жардзіны, слупкі. На працягу месяца. Пасля абносілі ферму жардзянікам...

Найбольшае супакаенне, задаволенасць Генадзь Міхайлавіч зведаў, калі аддаў належнае Яго Вялікасцю Каню! Спрадвечнаму спадарожніку, паплечніку селяніна. Самай ачалавечанай жывёліне. Селянін спаконвеку ўскладаў на каня свае надзеі. Дзяліў з ім цяжкасці, нягоды, радаваўся ўмалотнаму коласу. Зацемна ўставаў і цёмначы пакідаў баразну. Яны поруч ішлі, конь і чалавек. І разумелі адзін аднаго. Моўчкі... І не па сваёй волі селяніна адлучылі ад каня. Насілкам. Ён страціў частку сваёй духоўнасці. Са стратай уласнай зямлі — не стала і самога селяніна. Дык хто ж ён сёння, вясковец? Служка страўніка?!. Але ж трэба клапаціцца і аб «ежы» духоўнай. Наперадзе вечнасць. Не толькі ў замагільным сэнсе. Але і дзеля будучыні.

З дзяцінства Генадзь хінуўся да коней. Гэтаму спрыялі абавязкі бацькі. Міхаіл Аляксандравіч даглядаў калгасных коней. Часам хлопчык прытуляўся да цёплай пысы каня. Той казытаў пяшчотна-мяккімі губамі. Дыхаў спакоем. Магутнае цела яго абдавала вострым пахам поту. Незвычайным. А вочы?.. Глыбокія. Сама спагада, цярплівасць і бясконцая ўпэўненасць. Міжволі засаромеешся сваіх цяжкасцяў. Што яны — супраць паклажы, якую цягне конь! Але ж і выгляду не падасць.

Гэтым беларускім вупражным пашчасціла. Дваццаці пяці. У адной палове былога кароўніка размясцілася канюшня. У другой — манеж. Жыллё прыстасавалі. Уцяплілі падвойнай цаглянай сцяной. Ахайныя акенцы заладжаны шчыльна і глыбока. Удосталь адмерваюць святла. Надаюць утульнасць і абжытасць. Зграбна змайстраваныя стойлы. Прасторныя. Дарэчы, тут яны — дзеннікі! Кармушкі металічныя. Змяшчальныя. На дне

нават значацца аўсяныя зярняты. Дзеннікі й праход дагледжаны. Уражанне адназначнае — коні не абыдзены клопатам і ўвагай.

Кладоўка ж не звычайная цесная каморка, а даволі ладнае, утульнае памяшканне. Па-гаспадарску развешана і раскладзена вупраж. Беражліва захоўваюцца сёдлы. Асабняком адно — трафейнае. Нямецкае. Яго набылі першым, і з рук. За семдзесят долараў.

Пах тут усталяваўся характэрны, адрозны. Сырамяці гужоў, супоняў, аброцяў, скуры сёдлаў і конскага поту.

— Гэты пах недзе адтуль, з майго дзяцінства, — апавядае Генадзь Міхайлавіч. — Адвячорак... Табун коней віхрам праносіцца па вясковай вуліцы. Імклівасць, сіла. Прыгажосць. Сцеражыся, народ! Зайздрасцю свецяцца вочы падлеткаў. Вось бы зараз — верхам! Гэта ж так ганарова! Паказаць свой спрыт, смеласць... Фарсануць перад дзяўчаткамі. І якраз жа — на жвавым жарабку важна красуецца пастух. Ганарліва наструнены. Пастрэльвае час ад часу пугай і задаволена зыркае па баках. Мы ведалі мянушкі кожнага рабочага каня. Звычкі, нораў... Магчыма, гэтая блізкасць з чацвераногімі рабіла нас байчэйшымі, ямчэйшымі...

Мне імпануюць людзі, якія не цураюцца сваёй першароднасці. Імкнуцца захаваць яе. Толькі так можна напоўніць зместам і сэнсам сённяшні дзень. Такім мне бачыцца і кіраўнік вытворчага ўчастка Чэрнікаўшчына калгаса «Ленінскі шлях» Генадзь Міхайлавіч Гемскі. Хай асаблівай патрэбы ў кані сёння і няма, але гэты аазіс у сялянскай душы павінен квітнець. То ж ім яна жыве і цешыцца між збяднелых жыццёвых гоняў. Паказаць звычайную беларускую вупражную пароду ва ўсёй яе прыгажосці. Аддаць ёй належны клопат, а з ім і даніну духоўнасці сялянскай. Такім

высокародным намерам кіруецца Генадзь Міхайлавіч.

Дзяўчаткі з ратамскай конна-спартыўнай школы прыехалі пагасцяваць да сваякоў, аж пачулі, як тут коней шануюць, і яшчэ большай увагай скакуноў агарнулі. Пачысцілі, памылі, падстрыглі хвасты й грывы. Навучылі прыгожа хадзіць, скакаць, браць перашкоды. Ніводнае народнае гулянне без чэрнікаўшчынскіх скакуноў-прыгажуноў не абыходзіцца. Тут і тройка, і вазок. Размаляваныя, аздобленыя бляшкамі, вышыўкамі; агучаныя бомкамі, званочкамі, бразготкамі. Ахвотнікаў пракаціцца, асабліва дзяцей, хоць адбаўляй. А колькі цікаўных збіраецца на спартыўныя прадстаўленні! Гэта ж трэба! Такі грацыёзны поступ, лёгкі, спавольны трушок, імкліва-зладжаны галоп. Перашкоды не пераскокваюць, а, здаецца, пералётваюць. Размашыста, упэўнена. Глядзяць людзі — дзівяцца: няўжо такое магчыма ў іх, тут?!

...Ва ўзгоднены час Генадзь Міхайлавіч не з'явіўся. Відаць, неадкладныя справы затрымалі. І я падаўся на ферму. Уласна, з ім я меўся пагутарыць пра коней. Яны ж стоўпіліся за жардзянікам усцяж металічнай кармушкі. Конюх Іван Бараноўскі падкідваў кошанку няспешна, зацікаўлена адказваў на мае пытанні. Голас яго, відаць, застуджаны, то гучаў выразна, то раптоўна зводзіўся на шэпт.

— Сабралі спартсменаў, акрабатаў... — шчыраваў Бараноўскі. — А па-мойму — гэта звычайныя рабочыя коні. Праўда, ёсць стройныя, зграбныя... Вунь, як тая кабылка. — Паказаў рукой. — Але ж усё роўна не іхняя гэта справа — гарцаваць... Панадзіліся наезнікі. Перадыху няма.

— Гэта ж добра, што на расхоп... Відаць, прыбытак даюць?

Я тут жа і пашкадаваў, што згадаў аб выгадзе. Мой суразмоўца ўспрыняў гэта як папрок. Адказаў стрымана:

— Не ведаю... Не чуў аб прыбытку. — Адлучыўся на хвілінку ў канюшню. Вярнуўся з поўнай торбачкай хлебных скарынак. Пачаў частаваць коней. Тыя спасцярожліва бралі губамі ласунак.

— Бач, які спрытны... Яшчэ хочаш? Усім пакрысе. — І — да мяне: — Назбіралася аб'едкаў... Мякіш жарэбчыку аддаю... Вунь ён — згубіцель!.. Кабылу прытоўк. Насмерць... Асцярожна, а то прыблуда гэты можа ўкусіць.

Я адхінуўся ад няскладнага, нязграбнага каня.

— Затое сілы, хоць адбаўляй... За дваіх цягне.

— А чаму прыблуда?

— Ды ўкралі ў нас каня, а гэты неўзабаве прыблудзіў... Няйнакш такім чынам нейкі разумнік замену зрабіў. Быццам, і не зусім злодзей. Спачатку спасу не было — хвастаў, шаляніца, загрызаў коней. А пасля суняўся. Толькі зрэдку находзіць.

— Ці не добрае абыходжанне падзейнічала?

— Не крыўдзім... — Адчувалася, што пра кожнага са сваіх падапечных Бараноўскі можа баяць бясконца. — Хіба гэта жарабец? — ткнуў пальцам у бок непаглядна-га, апатычнага канякі. — Свае функцыі не выконвае. Жарабіцы не падпускаюць, кусаюць... Вось той, што побач з ім, быў ніштаваты вытворнік... Прыгажун! Злягчалі. І дарма... Паспяшаліся.

У гэты момант ціха падкаціла іншамарка колеру недаспелай вішні.

— Вадакачка падвяла,— яшчэ здалёк патлумачыў Генадзь Міхайлавіч. — Давялося чыніць... Ну што, Іван, як там мой?

— Ды хоць зараз пад сядло, — весела адгукнуўся Бараноўскі.

— Часам ускочу ў сядло — і з ветрыкам... Здараецца, так набаліць... Як не мая душа, чужая... Прамчышся — і адпусціць. Ураўнаважыцца ўсё. А наогул — самы рэнтабельны ў калгасе — конь... Ён і на падвор'і, і на дачы патрэбен. Пракат арганізавалі... А калгасы як па-

чыналіся? Сялянскія рукі ды каняка. Адзінаму трактарчыку былі рады.

— Расцягнуць калгасы... Вам не здаецца, Генадзь Міхайлавіч?

— Такая небяспека ёсць... Сёння спецыяліст ужо вочы ў бок адводзіць, калі калгаснік крадзе. Пры сонейку ясным. Маўляў, не цягне, а бярэ належнае... Вось якая логіка. Тут да мяне адзін прыватнік, фермер, неяк наведаўся. І ледзь не на вушка: маўляў, у мяне тут складзік, фермачка пустуюць. Дык ён можа купіць. З некім там у яго ўсё дамоўлена— толькі б мая згода. Дык я так пужануў яго, што доўга за сем вёрст аб'язджаць будзе маю гаспадарку... Эйш, убачыў — пустуюць. Гэта ж усё калгаснае. Потам і мазалём людзей нажыта. Кожнага доля ёсць...

— Што і казаць — зневажаюць селяніна.

— І вымагаюць!.. Ды хто? На днях да раённых забеспячэнцаў звярнуўся — шпагат для ўвязкі цюкоў сена скончыўся. Дамовіўся. Да загадчыцы склада іду з накладной. І яна — мне: «Прададзена!» Як высветлілася, у яе, у горадзе, кароўка ёсць. Дай сянца... Давялося да начальніка звярнуцца — шпагат прывёз. Дык вось, чым задавальняць патрэбы нейкіх прахадзімцаў, я лепш акажу дапамогу таму, хто без яе не абыдзецца. У Чэрнікаўшчыне, непадалёку ад мяне механізатар Сцяпанаў жыве. Малады, рупны. Хаціну хоча сваю мець. Яму б крыху будаўнічымі матэрыяламі дапамагчы й атабарыўся б чалавек... А так — з'едзе...

Як можа, Генадзь Міхайлавіч спрыяе людзям. А яны ўдзячнасцю не абмінаюць. Летась і з другога ўкосу людзям сена даў. Першы ж з-за дажджоў быў слабы. Сёлета за сотку дагледжаных буракоў — дзве сенакосу дае.

Плынь людская... Неабсяжны разліў. І поўняць яго, асвяжаюць непрыкметныя крынічкі — звычайныя людзі, але дзейныя, актыўныя, рупныя. Не нейкія там абстракт-

ныя, абагуленыя літаратурныя персанажы. А канкрэтныя Іваны, Мар'і. Са сваёй адметнай духоўнасцю. З той, што працуюць, жывуць па загаду сумлення. І святы абавязак наш, журналістаў, данесці да нашчадкаў набыткі сялянскай душы. Канкрэтнай! Бо імі мацуецца грамадства. Нават векавое дрэва заслугоўвае персанальнай увагі.

Што ж тычыцца кветак, то ў іх кароткі век. Але ўсё ж самай дарагой кветкай для Генадзя Міхайлавіча Гемскага назаўсёды застанецца — пралеска. Чароўная кветка лёсу.

## АПАЛЕНЫЯ ВАЙНОЙ

*Гэты чалавек не завітае больш у рэдакцыю раёнкі. Ён памёр. Але, як сёння, чую яго прыглушаны, задышлівы голас. Даймала астма. У апошні час Іван Сямёнавіч Ігонін выкладаў маляванне ў школе. І аднойчы падзяліўся са мной сваімі ўспамінамі аб вайне. Думаю, яны зацікавяць чытача. Бо гэта гісторыя. А яе трэба не толькі ведаць, але і адчуваць — сэрцам, душой. Менавіта гэтаму і садзейнічае споведзь Івана Сямёнавіча — удзельніка Вялікай Айчыннай.*

### Рахунак адкрыты

Памяць... Ясна бачу дні й ночы вайны, хоць прайшло з таго часу шмат гадоў. Кожны бой, адступленні, наступленні...

Мы не сумняваліся ў нашай перамозе. Не! Мы думалі аб тым, ці доўга будзе працягвацца гэты кашмар. Паўгода, год? Здавалася — не вытрымаюць нервы, сэрца. Але ні аб нервах, ні аб сэрцы думаць не даводзілася. Увесь арганізм знаходзіўся ў нечалавечым напружанні.

Аднойчы мы спыніліся паміж Донам і каратаякскім садам (Каратаяк — невялікі раённы цэнтр у Варонежскай вобласці), побач з хмызняком. Сталі акопвацца. І раптам пачулі посвіст куль. Сумнення не было — дзесьці засеў варожы снайпер. Камандзір узвода і, акрамя мяне, яшчэ трое салдат пайшлі прачэсваць сад і хмызняк. Найбольшую надзею ўскладалі, вядома, на мяне, бо я ў адрозненне ад астатніх меў дзесяцізарадную вінтоўку Токарава (СВТ).

Паміж садам і хмызняком вілася сцяжынка. Ідзем, страляем. Наўздагад. Здаецца, нікога не відаць. Трое маіх таварышаў павярнулі ўжо назад, а я вырашыў прайсці яшчэ метраў дзвесце.

Раптам мне падалося, што нешта мільганула ў кустах. Я выстраліў. Пастаяў троху — і пайшоў па сцяжынцы да павароту. Як бачу — ляжыць збоч сцяжынкі ў суконным фрэнчы фашыст. Галавой у мой бок. Падкраўся ззаду. Штурхануў нагой. Маўчок. Забіты...

Наш узвод рухаўся да месца дыслакацыі асноўных сіл. Неўзабаве мы наткнуліся на кулямётныя чэргі. Разрыўныя кулі фантанчыкамі ўздымалі зямлю. Мы заляглі. Са мной побач быў асяцін. Я неяк недарэчы прыгадаў, як ён раніцай накручваў на ногі новыя анучы. Праз момант асяцін быў мёртвы: разрыўная куля прабіла каску. І тут жа пад маімі грудзьмі ўзрыла зямлю такая ж самая куля, разрыўная. Я пачаў задыхацца. Здалося, грудзі мае разварочаныя. Паварушыўся, памацаў. Усё ў парадку.

Варожы буйнакаліберны кулямёт біў з вялікага прыдарожнага куста. Не падняць галавы. Мы адказваем адзіночнымі вінтовачнымі стрэламі. Фашысты кінулі гранату. Яна даляцела да нас і не паспела разарвацца, як нехта з нашых байцоў схапіў яе і кінуў назад. У фрыцаў кароткае замяшанне. Мы выкарысталі гэта: пачалі кідаць адну за адной гранаты. Вось з’явіліся першыя немцы з паднятымі рукамі. Параненыя. А колькі іх яшчэ

там? Кулямёт маўчаў. Працягваем перастрэлку. Камандзір узвода паслаў групу байцоў у абход. Здаліся яшчэ двое немцаў. Мы кінуліся да куста. Кожух кулямёта быў разбіты. Некалькі немцаў збеглі. Так закончыўся яшчэ адзін дзень вайны 1942 года.

## Рупарыст

1943 год. Другі Прыбалтыйскі фронт. Тады я быў у разведроце рупарыстам. Здаецца, і непрыкметная служба, але небяспечная. Уявіце сабе — трэба кожны дзень раніцай, у абед і вечарам, і кожны раз тройчы «крычаць» немцам зводку Саўінфармбюро. Загадзя выбіраеш мясцінку. А як толькі сцямнее, выкопваеш акоп і замаскіроўваеш. Вось і становіцца гэты акоп тваім рабочым месцам.

Раніцай, калі яшчэ не ўзышло сонца, бяру вінтоўку, рупар, зводку і дабіраюся да акопа. Чакаю, пакуль добра развіднее, і прыступаю да работы. Зводку я загадзя некалькі разоў прачытаў, і тэкст яе мне добра знаёмы. Гэта звычайная зводка Саўінфармбюро, адна з тых, якія штодзённа друкаваліся ў газетах. Розніца толькі ў тым, што мая напісана рускімі літарамі, але словы нямецкія. Я стаю ў акопе за кустом. У левай руцэ трымаю рупар, а ў правай — вінтоўку з навешанай на штык каскай. Перад вачыма зводка, якую паклаў на зямлю і прыціснуў каменьчыкам. Пачынаю гаварыць і ў такт тузаю вінтоўку, каб фашысты падумалі, што каска ў мяне на галаве: «Ахтунг, ахтунг! Геносэ дойчэ зольдатэн...» Звычайна паведамляюцца населеныя пункты, з якіх выбілі немцаў, колькасць забітых фашыстаў, захопленых гармат, збітых самалётаў. Пасля раблю невялікую паўзу і паўтараю зводку. Немцы тут жа засякаюць мяне — на касцы з'яўляюцца дзве дзіркі. Здымаю каску і чапляю пілотку. Затым чытаю зводку трэці раз. Але падмануць нямецкага снайпера няпроста... Заканчваю чытаць. Азіраюся. Неабходна непрыкметна выпаўзці са свайго акопа.

У нашай разведроце былі тры рупарысты. Тых, хто выходзіў са строю, замянялі новымі. А выходзілі яны часта. Фашысцкія снайперы з вялікай настойлівасцю «палявалі» за намі. Нямецкае камандаванне не хацела, каб яго салдаты ведалі сапраўднае становішча на савецка-германскім фронце.

## Першае раненне

Параніла мяне ў Каратаяку. Гарадок гэты колькі разоў пераходзіў з рук у рукі. Цяжка нам даводзілася. Сілы былі на мяжы намаганняў. А немцы адчувалі сябе вельмі самаўпэўнена. Набліжаліся да Волгі. Рваліся ўзяць Сталінград.

Мы ляжалі ў акопах, зробленых у насыпе чыгункі. Нясцерпна пякло сонца. Хацелася піць, а больш за ўсё — курыць. Наскроб у кішэнях нейкага смецця, скруціў цыгарку. Прыкурыць няма чым. Запалак мы даўно не бачылі. Кожны курыльшчык меў пры сабе крэсіва — невялікі збіты кавалачак крэменя, сталёвую пласцінку і скручаную ў вяровачку вату. Каб прыкурыць, трэба было ўдараць па крэмені пласцінкай, іскры падалі на вату. Вата пачынала тлець — вось і прыкурвай.

Так і ляжалі мы ці сядзелі ў акопах. Розныя думкі лезлі ў галаву. Усё больш аб доме. Мы былі ўпэўненыя, што немцы не палезуць, бо не ведалі нашыя сілы. Наперадзе — балота, чарот і пярэдні край немцаў. Ззаду — Дон. Справа і злева па чыгуначным насыпе — немцы. Вораг заціснуў нас. Здушыў. Мы нават забітых таварышаў па-чалавечы пахаваць не маглі. Патронаў мала. У мяне засталося толькі два. І тры гранаты. Трэба «пазычаць» боепрыпасы ў ворага.

Перакурыў. Чакаю. І кожны чакае, што прыйдзе падмога. Сібіракі. Так нам абяцалі. Вось тады трымайся, немчура!

Нечакана з-за насыпу ў нашы акопы паляцелі гранаты. Гэта немцы непрыкметна падышлі балотам. Па-

кінуўшы свае акопы, хто гранатамі, хто апошнімі патронамі, мы змаглі адбіць атаку. Асабліва добра дзейнічаў наш кулямётчык Музраеў (калмык). Ён паставіў кулямет на чыгуначнае палатно і амаль ва ўпор расстрэльваў фашыстаў.

Я кінуў свае тры гранаты, узяў вінтоўку, выстраліў, і вінтоўка адказала — засеў у ствале патрон. Выцягнуў шомпал. Прачышчаю. І тут на палатно насыпа выскачыў немец. Крычу яму: «Гад! Ідзі сюды!». І яшчэ нешта. Гляджу яму ў твар. На рукі не звяртаю ўвагі. Ён бачыць, што я нічога яму не магу зрабіць, з размаху кідае ў мяне гранату і сам скочваецца з насыпу. Я мітнуўся ўбок. Граната выбухнула ў мяне ззаду. Асколкі ўпіліся ў паясніцу. Правёў рукой — кроў... Музраеў не даў уцячы фашысту — скасіў трапнай чаргой. Камандзір аддзялення Царук таксама надзіва трапна страляў. Нямецкай групе захопу не ўдалося ўзяць языка і высветліць нашыя сілы. Мы выстаялі. Яшчэ на адзін дзень вораг быў затрыманы. А гэта галоўнае.

Вечарам мы былі на беразе Дона. Там стаялі лодкі. Мы селі. Ціха пераплылі раку і ўсю ноч дабіраліся да медсанбата. Дваццаць дзён я залечваў раны.

А потым — зноў на перадавую.

### Баі за Каратаяк

Мы атрымалі заданне фарсіраваць Дон, замацавацца на процілеглым баку, каб потым захапіць раённы цэнтр Каратаяк.

Было ўжо каля дзевяці раніцы. Сонца сляпіла вочы. Ад паху трупаў пяршыла ў горле. Агонь з боку немцаў быў настолькі шчыльны, што, здавалася, з гэтага пекла выйсці жывымі немагчыма. Вада ў рацэ кіпела ад снарадаў і куль. То адна, то другая лодка з салдатамі й боепрыпасамі разляталіся ў трэскі.

Мяне выклікаў камандзір роты й загадаў перавезці групу байцоў на другі бок Дона, а на зваротным шляху забраць двух параненых...

Адзін ляжаў, шырока раскінуўшы рукі. Кроў на ім запяклася вялікімі плямамі. Ён быў мёртвы. Другі, паранены ў жывот, крычаў ад нясцерпнага болю. Баец пазнаў мяне і стаў прасіць, каб я застрэліў яго. Немцы заўважылі нас — адна міна гахнула побач, другая... Падбеглі двое нашых разведчыкаў. «Хутчэй у лодку!» — крыкнуў адзін.

Пераплылі Дон, аднеслі параненага ў санчасць.

Наша рота амаль поўнасцю пераправілася на другі бераг. Заставалася толькі невялікая група байцоў з узвода разведкі. Ужо вечарэла, калі мы селі ў лодку. З боку немцаў агонь сціх, і мы спакойна пераплылі раку. Камандзіры ўзводаў далажылі аб наяўнасці байцоў, боепрыпасаў. Ад роты засталося 43 чалавекі. Страты значныя. Перад намі стаяла задача — пад покрывам ночы бясшумна ўвайсці ў горад.

...Стомленыя, мы павольна ішлі па маставой. Купалы мясцовай царквы ледзь залаціліся. Дзесьці праспяваў цудам уцалелы певень. І ўсё забылася. Знікла адчуванне небяспекі. Быццам і не было кашмарнага дня, разрываў бомб і снарадаў, смерці таварышаў. У памяці ўсплылі карціны далёкага дзяцінства. Мы ўвайшлі ў памяшканне школы, і адразу ж многія заснулі. Мне не спалася. Падняўся і пабрыў па калідоры, зазірнуў у адзін клас, у другі. Кругом параскіданыя сшыткі, кнігі... Успомніліся мая школа, мастацкае вучылішча, таварышы, настаўнікі...

Пачулася каманда атрымліваць сухі паёк: сухары, кансервы. Усё гэта было хутка з’едзена. Захацелася піць. Калодзеж быў у цэнтры вуліцы. Двое байцоў дабеглі да яго, але не паспелі набраць вады, як былі забітыя. Дзесьці знаходзіліся нямецкія снайперы. Пачалі сачыць і заўважылі ў адным з дамоў, побач з калодзежам, засеўшых немцаў. Мы ўчацвярых падпаўзлі да дома і гранатамі закідалі фашыстаў. Цяпер вада была нашай.

Хутка нас сабралі й паставілі задачу ачысціць горад ад немцаў. Пайшлі ўзводамі праз сады й агароды.

Фашысты не чакалі нас. Убачыўшы перад сабой рускіх салдат, яны, кінуўшы ўсё, уцякалі. Нават апрануцца як след не паспелі. Уцякалі хто ў чым...

Да паўдня ачысцілі амаль увесь Каратаяк і выйшлі на поле, засеянае кукурузай і сланечнікам. Сталі акапвацца. Побач са мной завіхаўся Музраеў. Салёны пот еў вочы. Хацелася піць і спаць. Мы выкапалі невялікае паглыбленне, каб можна было схаваць галаву, і пачалі чакаць. Гарачыня, бяссонныя ночы, нервовае напружанне — усё гэта змарыла нас, і мы заснулі...

Скрозь сон чую нейкую нярускую гамонку. Прачынаюся — усё ціха. Дзе нашы? «Музраеў! Музраеў!» — ціха паклікаў я. Музраеў не адказваў. Няўжо забіты? Я паклікаў мацней. Музраеў прачнуўся. І ў гэты момант у нас паляцелі гранаты. Немцы думалі, што мы далёка, і перакідвалі гранаты. Мы пачакалі. Стала ціха. Паўзком выбраліся з небяспечнай зоны й садамі дабраліся да першых дамоў горада. Знайшлі камандзіра аддзялення Царука. «А мы падумалі, што вас ужо няма ў жывых», — сказаў ён.

Вуліца, дзе мы размясціліся, была акрайняя ў Каратаяку. Справа і злева ад нас — нікога. Дом, у якім я абаснаваўся з напарнікам Малафеевым, знаходзіўся ў завулку. Дом тануў у зеляніне. Мы адчынілі вокны. Я стаяў ля акна, як нечакана перада мной паказалася нямецкая каска, а пасля — спужаныя вочы фашыста. Я выстраліў — фашыст акурат перад вясніцамі паваліўся...

Было ціха. Сонца ўжо садзілася за дахі дамоў. Паглядзеў на вуліцу. Ідуць трое — наш кулямётчык і два немцы. Апошнія нешта цягнулі ў плашч-палатцы, а наш баец нёс на плячы кулямет. Ішлі, не хаваючыся, лічачы, што гэтая частка горада нікім не занята. «Вось дык здорава, — падумаў я. — Наш кулямётчык дваіх прыхапіў». Пасля гляджу — праходзяць наш дом. Ага, дык гэта ж нашага кулямётчыка ў палон узялі й вя-

дуць яго ў якасці языка. Мы з Малафеевым адкрылі агонь. Немцаў забілі, кулямётчык прыбег да нас. А што ж у плашч-палатцы? Камандзір аддзялення Царук загадвае мне выпаўзці на дарогу і праверыць. Я дапоўз, праверыў — пяць буханак хлеба і столькі ж банак кансерваў. Вельмі дарэчы! Цягну. Немцы заўважылі мяне. Кулі адскокваюць ад каменнага бруку, але ніводная не дастала. Мы падмацаваліся, і на душы стала весялей.

Усё наша аддзяленне сабралася разам. Сталі раіцца, як быць далей. Дзе ж нашы? Вырашылі, што тут нам больш заставацца нельга. І вось — ідзем па начных вуліцах горада. Шукаем сваіх. Раптам з цемені выплыла фігура афіцэра. Ён загадаў заняць абарону і чакаць да раніцы. Аказалася, яшчэ ў многіх дамах знаходзіліся немцы. Раніцай, калі прыйшла падмога, мы пачалі дом за домам ачышчаць ад ворагаў.

## Аперацыя «Партрэт»

У сакавіку 1943 года я ваяваў на 2-м Прыбалтыйскім фронце ў 1195-м стралковым палку 360-й стралковай дывізіі. Пасля Сталінграда нашы воіны адчувалі сябе больш упэўнена. Настрой падняўся. З немцаў пыху збілі. Нахабнасці ў іх паменшала.

Неяк выклікае мяне начальнік асобага аддзела. Навошта, думаю, яму спатрэбіўся? Пастукаў у дзверы. Капітан чысціў пісталет. У доме было холадна і няўтульна. На стале — патроны, брашуры. Капітан спытаў, ці атрымліваю я пісьмы з дому. Пацікавіўся настроем. Спытаў таксама, чым я займаўся да вайны. Я адказаў, што вучыўся ў Іванаўскім мастацкім педагагічным вучылішчы, з трэцяга курса пайшоў на фронт. Тады ён узяў брашуры са стала і, аддаючы іх мне, сказаў: «Намалюеш партрэт Гітлера, падпішаш па-нямецку: «Твой забойца» і вывесіш перад немцамі. Памер партрэта — тры на тры метры. Паспрабуем

падзейнічаць на псіхіку нямецкага салдата. Думаю, немцы сталі падатлівейшыя пасля Сталінграда».

— На чым і чым маляваць? — спытаў я.

— Вы атрымалі заданне — выконвайце!

Я адказыраў і выйшаў. Далажыў камандзіру разведроты аб атрыманым заданні й цяжкасцях, звязанных з яго выкананнем. Той выклікаў двух салдат і загадаў спілаваць вялікую сасну, абсекчы сукі й распілаваць на трохмятровыя пацурабкі. Затым гэтыя пацурабкі раскалолі на плашакі, якія абчасалі сякерамі. Атрымаліся дошкі. Збілі ў шчыт. Пэндзаль зрабілі з абрэзанай грывы каня, які вазіў кухню. Сабралі сажу з коміна нашай зямлянкі, дадалі вады й мукі. Атрымалася чорная фарба.

Вугалем я хутка намаляваў галаву Гітлера. Зрабіў адпаведны подпіс. Пасля прыгатаванай фарбай абвёў контуры, узмацніў неабходныя месцы — і партрэт гатовы.

Ноччу нас пяць чалавек паслалі выставіць партрэт фюрэра перад немцамі. Хай ведаюць фрыцы, хто іх сапраўдны забойца! Шчыт быў вельмі цяжкі. Неслі яго і думалі: хоць бы немцы не пускалі асвятляльных ракет. Але, на наша шчасце, усё абышлося. Вось мы ўжо на самай сярэдзіне нейтральнай паласы. Не можам знайсці падыходзячага акопа. Днём, здаецца, бачылі... Нарэшце знайшлі. Засыпалі акоп напалову снегам і ўткнулі жэрдкі са шчытом...

Пачало світаць. Што ж будуць рабіць немцы? Маўчаць. Спроб зняць партрэт таксама не робяць. Мабыць, разумеюць, што мы ахоўваем яго. Так прайшлі суткі, другія. На трэція да нас у траншэю прыходзіць капітан — начальнік асобага аддзела. Знайшоў мяне. Злосны.

— Што скажаш, мастак? Не дзейнічае на немцаў наша наглядная. Яны разумеюць толькі адну мову — сілу. — Ён паляпаў па кабуры нагана і выйшаў.

Мы паабедалі. Гадзіны праз тры немцы нечакана распачалі мінамётны абстрэл. Міны клаліся побач са шчытом. Нарэшце адна патрапіла ў партрэт фюрэра. Быў фюрэр — і няма яго. Кавалак жэрдачкі адзінока тырчаў пасярод варонкі. Нашы салдаты доўга пасля смяяліся. І было з чаго: немцы «расстралялі» Адольфа Гітлера.

Мяне цікавіла: чаму яны не адразу разматлэшылі партрэт? Пасля зразумеў: ніхто не хацеў браць на сябе адказнасць...

## Другое раненне

Калінінскі фронт. Мы вызвалялі Вялікія Лукі. У нашай роце ўсё менш і менш людзей. І вось зноў наступленне. Камандзір аддзялення перабягае з ручным кулямётам ад варонкі да варонкі. Я за ім. Другі нумар забіты. Няма каму зараджаць дыскі. Камандзір просіць мяне дапамагчы. Трэба, дык трэба. Мы прасунуліся кіламетраў на пяць. Наперадзе вёска. З ходу яе не ўзяць. Нашы рассыпаліся. Заляглі. Варожы кулямёт сячэ. Не падняць галавы. Неабходна патушыць кулямётную кропку немцаў.

Мы ўстанавілі на бугарку свой кулямет. Далі некалькі чэргаў. Скончыліся патроны. Я ўзяў дыск і пайшоў збіраць патроны. Хто колькі дасць. А што дасі, калі ў кожнага па 15 — 20. Давалі й наказвалі: «Біць толькі прыцэльным агнём». Усё ж 45 патронаў сабраў. Працягваю дыск і паказваю, дзе знаходзіцца нямецкі кулямётчык...

У гэты момант па нас паласнуў варожы кулямёт. Куля трапіла мне ў правае перадплечча і прайшла навылет. Быццам хто палкай перабіў руку. Дыск выпаў. Зашумела ў галаве. Адбегся да стога сена. Стаю, а ногі падкошваюцца. Павольна прысеў на стылую зямлю. Падбег таварыш, зямляк з Іванава. Спытаў, ці ёсць бінт. Не было ў мяне бінта, і ён абарваў ніз маёй кашулі й туга перавязаў руку...

Месяц праляжаў у шпіталі. У сваю часць патрапіць не змог, накіравалі ў іншую. І зноў — баі, атакі, халады, трывогі... Ваенныя будні канца 1943 года.

## Трэцяе раненне

Смаленшчына: Жукава Сяльцо, Воўчыя Горы. Мы выбілі немцаў з вышынькі. Змораныя, выматаныя, літаральна валіліся з ног. Да мяне падышоў інструктар палітаддзела з прапановай напісаць заяву аб прыёме ў члены партыі. Кандыдатам я быў прыняты пад Вялікімі Лукамі.

Неўзабаве я атрымаў заданне спусціцца з вышыні на нейтральную паласу, дасягнуць акопа і весці назіранне за немцамі. Узяў з сабой аўтамат, тры дыскі, тэлефонны апарат. Сцямнела. Спускаюся ўніз. Іду па нейтральнай зоне. Вось і акоп. Ён мелкаваты. Давялося паглыбіць.

Было 17 кастрычніка — мой дзень нараджэння. Праўда, тады я забыў аб гэтым. Толькі пасля ўспомніў. Ноччу стала халаднавата. Ціха. Званю, што ўсё спакойна. Працягваю назіраць. Праз некаторы час пачулася гудзенне танкаў. Акопваецца пяхота. Паведамляю начальству, што заўважыў два танкі й каля роты немцаў. Данясенне прынята. Працягваю назіранне.

На світанні з'явіліся варожыя самалёты. Пачалі бамбіць нашыя тылы. Пасля ўдарылі нямецкія дальнабойныя гарматы. Фашысты адкрылі масіраваны агонь па ўсім пярэднім краі. Гляджу на нашу вышыньку. Здаецца, там нікога жывога не засталося. Сувязь абарвалася. Што ж рабіць мне? Вырашыў — дабірацца да сваіх. Кулі, быццам тысячы пчол, свішчуць над маім акопам. Паспрабуй уздымі галаву — адразу зробяць з яе сіта. Але выбару няма — зрываюся з месца і бягу ўсё хутчэй, але сілы пакідаюць. Вось ужо нашы траншэі. Яны пустыя. Значыць, адступілі, пакінулі вышыню! Засталіся толькі забітыя. Я прыпыняюся, і ў гэты

момант непадалёк разрываецца снарад — асколак трапляе ў правае бядро...

Мяне вынеслі з поля бою. Пасля аперацыйнага стала давялося амаль паўгода правесці ў шпіталі.

## Песня

1943 год. Мы вызвалялі смаленскую зямлю. Баі былі жорсткімі. Але нам уздымала настрой перамога нашых войск пад Сталінградам. Настрой жа ў немцаў пасля гэтага прыкметна ўпаў. Цяпер возьмеш языка ці палоннага, паглядзіш на яго — не той, што ў першыя гады вайны: стаіць і палахліва мырмоча: «Гітлер капут!» Вельмі ўжо здорава немцы прамаўлялі гэтыя словы. І зразумела чаму — страх за сваю шкуру. Дый нашы афіцэры й салдаты навучыліся ваяваць. Зброі, танкаў, самалётаў стала больш. І дзейнічаць мы сталі больш упэўнена. Але канца вайны яшчэ не было відаць.

Памятаю, нехта прынёс у нашу зямлянку матыў і тэкст песні на словы А. Суркова «Зямлянка». Якая песня! Можа, яна не вельмі трывожыць чалавека, які не пабываў на фронце, але для нас, салдат, хто сядзеў у акопах і траншэях, хто кожную мінуту хадзіў паблізу ад смерці, — гэтая песня была гімнам душы. Яна хапала за сэрца. Здавалася, што яна пра цябе, што ты яе сваім сэрцам спяваеш...

І вось — сядзім у зямлянцы й спяваем гэтую песню. Адзін з байцоў падняўся, узяў кацялок і, напяваючы, пабег уніз да раўчука. Там біла крынічка. Вада чыстая, смачная. Не паспеў ён дабегчы да крынічкі, як разарваўся снарад і смяротна параніў салдата. Неяк адразу прыгадаліся словы песні: «А до смерти четыре шага...»

## Тры цагліны

Хоць сакавік і вясенні месяц, але ночы ўсё ж халодныя. На ветры, на голым полі ў маленькім акопчыку не

сагрэешся, але чамусці не замярзалі. Грэлі сябе думкамі аб цёплай печы, білі кулакамі па баках, грэліся гарачым супам, прыціскаючы кацялок да грудзей.

Тады мы вялі баі на Смаленшчыне. Немцы нам спакою не давалі, але і мы іх «турбавалі» добра. Баі, холад, недасыпанне выматвалі нас. Марылі аб цёплай, мяккай пасцелі й глыбокім сне. Прысядзеш ці прыляжаш, забудзешся на ўсё і спіш. І нават сны каляровыя бачылі...

Сяджу аднойчы, скурчыўшыся у сваім маленькім акопчыку, і думаю, як бы сагрэцца і хоць на колькі хвілін заснуць. Ноч. Гараць дамы, злавесна асвятляючы мясцовасць. А тут яшчэ немцы пачалі бязладны абстрэл нашага пярэдняга краю. Потым стала ціха. Толькі часам застракоча кулямёт. З нямецкага боку ўзвілося некалькі ракет, і ўсё стала відаць, як днём. Гляджу на дагараючыя дамы, паўразбураныя печы, і ў мяне нечакана з'явілася ідэя пагрэцца гарачымі цаглінамі. Засунуў за пазуху і грэйся...

Падпоўз да дагараючай хаты й спрабую набраць цаглін. На фоне агню мяне заўважылі й пачалі страляць. Я лёг, перачакаў абстрэл. Пасля сунуў тры цагліны за пазуху і вярнуўся ў свой акоп. Сеў, сагнуў калені, супакоіўся...

Тры цагліны! Яны так грэлі мне душу — здавалася, што няма большага шчасця, чым сядзець вось так, з цёплымі цаглінамі за пазухай, і думаць пра сваю хату, пра сваіх блізкіх... Усё забылася.

## Не змог

Дрэвы скідвалі апошняе лісце. Імжэла. Скупыя, сумныя фарбы прыроды.

Мы пачалі акопвацца. Метраў за 150 ад нас знаходзіўся бярозавы гай. Акопваліся не спяшаючыся. Грунт быў цяжкі: гліна, гравій. Наш шанцавы інструмент дрэнна спраўляўся з ім. І ўжо калі ў зямлю зары-

ліся недзе па пояс, як пачулі посвіст куль. Выстралы даносіліся з боку бярозавага гаю. Стралялі людзі ў маскхалатах, падобныя да нашых разведчыкаў. Мы крычалі, махалі рукамі, паказваючы: куды ж вы па сваіх страляеце? Але страляніна працягвалася. У нас з'явіліся раненыя... Ясна, што гэта былі ніякія не нашы разведчыкі, а фашысты. І наш камандзір прыняў рашэнне выбіць іх адтуль.

Бой быў надзіва жорсткі, але кароткі. У склад варожай разведкі, акрамя немцаў, уваходзілі чэхі, румыны, венгры, французы. Тых, хто спыніў супраціўленне і здаўся ў палон, трэба было весці ў тыл. Але некаторыя параненыя самастойна ісці не маглі — ім дапамагалі тыя палонныя, якія маглі свабодна рухацца. Калону палонных, прыкладна з 30 чалавек, павялі ў тыл. Хто ішоў, апіраючыся на плячо суседа, хто — на палку. І толькі адзін палонны заставаўся сядзець на зямлі, апусціўшы параненыя ногі ў кювет. Не стагнаў. Аказаць дапамогу мы яму не маглі: не было чым. Ротны звяртаўся да палонных, каб хто-небудзь узяў яго. Але браць яго ніхто не хацеў. Як нам здавалася, не бралі яго не таму, што ён быў паранены ў абедзьве нагі, а таму, што — немец, фашыст. Гэта яны, фашысты, прымусілі са зброяй у руках выступіць супраць рускіх, французаў, венграў, чэхаў, балгар і румын...

Ротны загадаў мне і яшчэ аднаму салдату вярнуцца і дапамагчы параненаму. Немец сядзеў, цяжка дыхаючы, чакаў развязкі. Нам трэба было спяшацца. Вечарэла.

— Канчаем яго, няма чаго з ім няньчыцца!.. — сказаў мой напарнік і накіраваў яму ў карак ствол карабіна.

Я падышоў да немца. Ён павярнуў да мяне худы, бледны, пакрыты шчэццю твар. Фашыст ён быў на самай справе ці проста звычайны салдат, затурканы камандзірамі, хто ведае. Але ён не здаваўся мне мужным,

злосным, ненавідзячым. Я паглядзеў яму ў вочы. Яны былі блакітныя, з вялікімі зрэнкамі, запоўненыя слязьмі. У яго вачах я прачытаў просьбу аб літасці. Усё гэта адбылося за лічаныя секунды. Пасля немец адвярнуўся, абхапіў галаву рукамі, апусціў яе да каленяў і падрыхтаваўся да смерці. Ён чакаў стрэлу. Але яго не было. Я адвёў ствол карабіна ўбок і сказаў свайму напарніку, што перад намі — не вораг, а палонны, і ён мае права на жыццё. Бяззбройнага грэх забіваць. Тым больш параненага.

## Імгненне

Служыў я тады ў Мінску, у палку сувязі. Вайна была ўжо на подступах да Берліна. Адчувалася, што яна вось-вось скончыцца.

Выклікае мяне камандзір роты:

— Удваіх з чырвонаармейцам Чурыкавым будзеце абслугоўваць кальцавую тэлефонную лінію вакол Мінска. Неабходна забяспечыць надзейную сувязь.

Вясна 1945 года выдалася ранняй і цёплай. Кальцавая лінія не вельмі дастаўляла нам клопатаў. Ды неяк загадалі праверыць ізалятары на слупавой лініі, бо знізілася чутнасць, парушылася сувязь.

Надвор'е было добрае, настрой — выдатны. Пакінуў Чурыкава ў казарме, а сам узяў інструмент і пайшоў. Зброі на такія абходы мы з сабой не бралі.

Няспешна абыходзіў старыя траншэі, варонкі й акопы, штораз пазіраючы на ізалятары на слупах. Прайшоў ужо кіламетраў ці не з пяць па лініі, як раптам убачыў зграю вялікіх галодных сабак — несліся яны проста на мяне. Што рабіць? Паперадзе, скалячы зубы, ляцеў рыжы з памятай поўсцю аўчар. За ім з грозным брэхам імчала яшчэ каля паўтара дзесятка такіх жа раз'юшаных аўчарак. У мяне былі жалезныя кіпці. Да слупоў не дабегчы. Дагоняць. Мне стала крыўдна да слёз за сваё бяссілле. Паглядзеў на новы зруб на ўскрай-

ку вёскі, на мужыкоў, якія будавалі хату, — далёка. І крычаць дарэмна — не пачуюць... Сабакі ўжо блізка — недзе ў пяцідзесяці кроках. Яны саб'юць мяне з ног і пачнуць разрываць шынель, гімнасцёрку, дабяруцца да цела... Вось ужо добра відаць рэбры важака зграі, абцягнутыя аблезлай скурай. І ў апошняе імгненне я нечакана знайшоў адзінае выйсце: «Узяць яго! Узяць яго!» — раптам закрычаў я да важака, паказваючы ў бок вёскі. Спачатку важак спыніўся, не зразумеўшы сітуацыі. Ззаду замарудзілі астатнія сабакі. Але вось важак спахапіўся і пабег у той бок, куды паказваў я рукой, а за ім — і ўся зграя...

Я ішоў спустошаны, аслаблены. Паступова супакойваючыся.

## *Змест*

*СВЯТЛО ЗЯМНОЕ (Уступнае слова Л. Дайнекі)* ..................... 5

*АПОВЕДЫ. ЗАМАЛЁЎКІ*

*Чужыя* ........ 8
*Мельнічыха* ........ 12
*Гарачыя цвікі* ........ 16
*Апошняе дзівацтва* ........ 18
*Вернасць зямлі* ........ 21
*Град над полем* ........ 26
*Крыўда* ........ 33
*Калі ты селянін...* ........ 35
*Як будзем жыць, суседзе?* ........ 39
*Танец на грацкоўі* ........ 41
*Кладкі дабрыні* ........ 44
*Ціхоня* ........ 47
*Адзінота* ........ 50
*Не скарыўся* ........ 53
*Светлы сум бярозавы* ........ 54
*Пастаянная прапіска* ........ 55
*Вяртанне* ........ 57
*Салавей у горадзе* ........ 58
*Павуцінкі-ліхтарыкі* ........ 59
*Недзе паблізу...* ........ 61
*Шпакі* ........ 62
*Спілавалі дрэва...* ........ 63
*Жыцця вытокі* ........ 64
*Імгненне* ........ 65
*Дуб-заступнік* ........ 66
*Не абаранілі* ........ 67
*Адмовіліся* ........ 67
*Чорныя рабіны* ........ 68
*Заступіліся* ........ 68
*Кісліцы* ........ 69

*Побач з добрым чалавекам* .......... 70
*Развітанне* .......... 71
*Помсцяць* .......... 71
*Уладкаваліся* .......... 72
*У палоне* .......... 73
*Трэці* .......... 74
*Гусі над возерам* .......... 74
*Хмары-плямы...* .......... 75
*«Цяпліца» для рыб* .......... 77
*Урачысты гай* .......... 77
*Няма апраўдання...* .......... 79
*Вавёрчына сталоўка* .......... 82
*Адстала* .......... 83
*Суседзі* .......... 84
*Месца пад сонцам* .......... 85
*Галубіная прафілактыка* .......... 87
*Кантрасты* .......... 88
*Неспадзеўная сустрэча* .......... 89

*НАРЫСЫ. УСПАМІНЫ*

*Пацічоўскі мерыдыян* .......... 94
*Ідзіце за мной!..* .......... 117
*Выбар Ганны Іванаўны* .......... 129
*І жыве яго Карпілаўка* .......... 141
*Жыць сёння* .......... 148
*Адраджэнне* .......... 155
*І ўваскрэснуць у справах сваіх* .......... 174
*Веснавы снег* .......... 183
*Патаемны камень* .......... 190
*Сузор'е дабрыні* .......... 207
*Шчасце Хведара Прывалава* .......... 223
*Вяртанне да вытокаў* .......... 232
*Родам з Батурынкі* .......... 243
*Пралескі* .......... 256
*Апаленыя вайной* .......... 270

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Адам Выгодскі**

Сузор'е дабрыні
Кніга прозы

Рэдактар *А. Масарэнка*
Карэктар *Л. Ражкова*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*
Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*